МІКОЛА ВЯРШЫНІН



# І РОЗДУМ, І СМЕХ, І ЛЮБОЎ...

МІКОЛА ВЯРШЫНІН

# І РОЗДУМ,
# І СМЕХ,
# І ЛЮБОЎ...

(Сатыра, гумар, мемуары, пераклады, лірыка; вершы, прысвечаныя аўтару)




Мінск
"Беллітфонд"
2006 г.

УДК 882.6–7
ББК 84 (Беи) 6
В 99

Вяршынін М. П.
В 99 І роздум, і смех, і любоў... : вершы / Мікола Вяршынін. – Мінск : «Беллітфонд», 2006. – 348 с.

ISBN 985-6576-90-3.

У сваю чарговую кнігу аўтар уключыў зусім новыя творы, а таксама больш значнае з раней напісанага. Некаторыя раздзелы значна дапоўнены. У зборнік уключаны байкі, фельетоны, гумарэскі, сатырычныя паэмы – усё гэта на самыя розныя тэмы: вострыя жыццёвыя надзённыя праблемы, вытворчасць, узаемаадносіны людзей, каханне, сям'я, побыт, мода, адпачынак, гультайства, антыалкагольная тэматыка... Вясёлыя мемуары – усмешкі пісьменнікаў, смешныя і нясмешныя сітуацыі. Пераклады з украінскай мовы вядомых пісьменнікаў, сатырыкаў-гумарыстаў. Лірычныя вершы, напісаныя ў розныя гады – Радзіма, натхненне, сяброўства, родныя мясціны, уласны лёс. А яшчэ – вершы, прысвечаныя аўтару прыхільнікамі яго творчасці, людзьмі самых розных узростаў і прафесій.

У зборнік увайшло найлепшае з лепшага і ўсё найноўшае ў повязі часоў і падзей, змен жыццёвых арыенціраў. Адлюстраванне нашага былога – і сённяшняга дня. І смелы позірк у будучыню.

УДК 882.6-7
ББК 84 (Беи) 6

ISBN 985-6576-90-3

© Вяршынін М. П., 2006
© Афармленне «Беллітфонд», 2006

*прафілакторый сатыры і гумару*



# ВЕРШЫ З ПЕРЦАМ І СОЛЛЮ

Усіх чаруе лірыка сабой,
Высокімі пачуццямі пранізвае.
Задзірлівы ж паэт ірвецца ў бой
І сатырычнага канька закілзвае.

Сатыра – кліч душы, а не прыгон:
Хто дрэнна сядзе – тут жа і пакаецца,
Бо вельмі наравісты конь-агонь:
Усё імкнецца скінуць і брыкаецца.

Ад крытыкі няма нікому зла,
Мы ўсе сатыру хочам бачыць колкаю.
Ды каб яна такою і была,
Не падразайце лепш яе іголкі.

Сатырыку ўсё трэбы прыкмячаць,
Сваіх пазіцый не здаваць ніколі.
Бо калі сатырыкі маўчаць,
Гуляе беспакарана зло на волі.



# СВАЕ – СВАЙМУ

У лесе кожны дзікі звер
Каб не хадзіў пануры,
Рашылі жыхары: цяпер
Збудуем Дом культуры.

Бярвенне, дошкі ёсць у нас,
Цэмент патрэбен вельмі.
Дастанем – і ў рабочы час
У лапы возьмем кельмы.

На працу кожны можа стаць
У строй рабочы недзе.
А вось цэмент хутчэй дастаць
Давай пашлём Мядзведзя.

Паехаў той і доўга быў,
Як быццам справы рухаў.
Аднак нічога не прабіў,
Няма ніякіх зрухаў.

– Усё, што трэба, я рабіў,
Настырнасці меў многа.
Ламаў сталы і морды біў –
Не памагло нічога.

...Што ж, сіла не дапамагла –
Мо хітрасць дапаможа.
Ліса вось спрытнаю была,
Уладзіць справу зможа.

Але вярнулася яна
З пустымі ўсё ж рукамі.
– Я шчыравала ноч да дня,
Вы зразумейце самі.

Я хітравала, як магла,
Ды дзе ж знайсці мне выйсце?
Сябе начальству аддала,
А не было карысці.

...І сілай, хітрасцю не ўзяць,
А план гарыць, хоць рэжце.
І вырашылі ўсе паслаць
Асла яны, нарэшце.

Той падарункаў не вазіў,
Вярнуўся сам шчасліва.
Вагон цэменту адгрузіў
Асёл ўсім на дзіва.

– Звяртаўся я да іх на "ты",
Кантакт мы добры мелі,
Бо там сядзяць мае браты –
Мяне і зразумелі.

## ПРА МУХ І ПРА ЗУБРОЎ

Прасілася на працу неяк Муха.
У аддзеле кадраў Зубр сустрэў яе.
– Што за душой ты маеш, цакатуха?
Ты пакажы нам здольнасці свае.

Мо, ёсць дыплом ці вопыт, можа, сіла,
А да станка хацела б ты, ці не?
Тут Муха кажа: – Я б вас папрасіла
Ўлічыць, што хабаток ёсць у мяне.

– Так, так, дык кажаш, Муха, хобат маеш?
Такія кадры – золата для нас.
Работу неблагую атрымаеш:
Грузіць дэталі будзеш нейкі час.

А потым паглядзім, мо і павысім,
Як справы пойдуць у цябе на лад.
За працу толькі ты як след бярыся,
Мы ж добры пакладзем табе аклад.

Праходзіць час, а праца – ані з месца,
Пагрузка не кранаецца зусім.
Хоць Муха шчыра тужыцца і пнецца,
Але ж вядома, колькі ў Мухі сіл.

Тут вырашылі Муху зацікавіць
Матэрыяльна: можа, будзе плён.
Ды не пайшлі, вядома, лепей справы,
Хоць пасля гэтага прайшло шмат дзён.

Уздзейнічаць надумалі на Муху
Маральна, і сабралі тут жа сход.
Але не ўбачылі у працы зрухаў
Праз дзень, праз месяц, нават і праз год.

---

Там справы дрэнь, дзе месцы пазаймаюць
У аддзеле кадраў волаты-Зубры.
А Муху... на пагрузку пасылаюць.
Бывае й так.
Да часу, да пары.

## ЛЕС І ПРАГРЭС

Сабраўся ў лесе форум вельмі важны,
З'езд жыхароў – і Птушак, і Звяроў.
– Сяброўства і адзінства мы пакажам,
Каб потым доўга не збірацца зноў.

Ды кожнага патрэбна нам давесці:
Харчуйцеся пладамі і травой.
Адзін другога не павінны есці,
Драпежнікі заплацяць галавой.

Тут Воўк завыў: – Ды без Ласёў мне здохнуць!
Ліса: – Я есці ўсмак Зайцоў люблю!
Мядзведзь: – Мне ад адной маліны ссохнуць!
Каршун: – Прачыстку Птушак я раблю!

А Вожык, хоць і сам Лісы баіцца,
Сказаў: – Я не магу не есці Змей.
Змяя, што скурай яркаю іскрыцца,
Шыпела: – Як мне не глытаць Мышэй?

Слабейшыя – у роспачы і гудзе
Гвалт узнялі – і Птушкі, і Звяры:
– За дэмакратыю змагацца будзем,
Даволі ўжо, цярпелі да пары!

Аднак жа час дыктуе перамены,
І рэзалюцыю аб згодзе прынялі.
Ніхто не мог чакаць яе адмены.
Якія ж потым вынікі былі?

Воўк за Ласямі кінуўся імкліва,
Ліса Зайцоў душыла ў хмызняку.
Мядзведзь задраў Казулю – і не дзіва.
Рысь скочыла на карак Барсуку.

---

Які ў жыцці,
такі і ў байцы сэнс:
Тут – лес.
Які ў ім можа быць прагрэс?

## КІРАЎНІЧЫ КАЗЁЛ

Дырэктарам маслазавода
Казёл усім надзіва стаў.
Яго казліная прырода
Была прычынай кепскіх спраў.

Там Конь галоўны быў канструктар,
Ён грывай трос і ў справах рос.
Умела ўсё рабіў і хутка,
Работы воз упарта вёз.

Гусак – тэхнолаг. Ён паважны,
Разумны, добры, дзелавы.
У працу кідаўся адважна,
Быў плён з талковай галавы.

Сабака – той з усімі ў згодзе,
Забеспячэнец, а не госць.
Шукаў, вынюхваў і знаходзіў,
Чаго няма і дзе што ёсць.

Казёл – і злы, і нават хіжы –
Сам меў заступніка – Быка.
Настырна, паступова выжыў
Каня, Сабаку, Гусака.

Бо абыходзіўся сурова,
Да іх чапляўся часцяком:
То нізавошта дасць вымову,
То дэпрэміруе цішком.

Адных Казлоў цяпер шануе:
"Разумнікаў не трэба мне.
Аднапляменнікаў вазьму я –
Самому будзе спакайней".

---

Відаць, вы зразумелі самі:
Казлу –
лепш кіраваць Казламі.



# СВАЁ МЕСЦА

Баран збег ад Авечак, Бараноў –
Заўжды і ганарысты быў, і ўпарты.
Таму пайшоў у статак да Кароў –
Лічыў, што лепшага ён лёсу варты.

З Каровамі быў толькі пару дзён.
Яны ніякай дружбы з ім не мелі.
Бо мыкалі, ды толькі бэкаў ён,
І Барана ніяк не разумелі.

Пасля да Коней кінуўся Баран,
З Каровамі не мог больш сустракацца.
Ды Коні зразумелі той падман:
Не ўмеў Баран іржаць, не мог брыкацца.

Хацеў сярод Свіней затым пажыць,
Але яго сустрэлі хваравіта:
Не рохкае, і ў брудзе не ляжыць,
І не пусцілі да свайго карыта.

Вярнуўся ў свой авечы статак зноў.
Паспакайнеў, і больш не задаецца.
Бо той, хто нарадзіўся Бараном,
Заўсёды
Бараном
і застаецца.



## НЕЗВЫЧАЙНЫ ЮБІЛЕЙ

Была ў Лясной канторы завядзёнка:
Калі пра юбілей ішла гамонка,
То кожны нёс на густ свой пачастункі,
І розныя рабіліся дарункі.

І вось пранеслася раптоўна чутка,
Што і ў Лісы дзень нараджэння хутка.
І Леў сабраў шырокую нараду
(Ён быў заўсёды гэткім святам рады).

– Сябры! Ліса ж у лесе – ветэранка.
Хай Вожык яблыкі збірае ўранку,
Вавёрка – па кашу арэхаў і грыбоў,
Дзік – жалуды з-пад волатаў-дубоў.

Мядзведзь – больш мёду...
І яшчэ зазначу,
Што ў Салаўя адказная задача:
Спявак сярод яснога ён народу,
Няхай складзе пра юбілярку оду...

На юбілеі Леў сказаў прамову,
І Рыжую расхвальваў адмыслова...
Праныры той, Лісе, нібы царыцы,
Паднеслі залатыя завушніцы.

А Салавей, спявак мясцовы і паэт,
Здзівіў цудоўнай одай цэлы свет.
Была ў радках тых прыгажосць і сіла,
А Ліска нават аж слязу пусціла.

Пасля – банкет. Там –螺рознае начальства,
Багаты стол, які не ўбачыш часта.
А Салаўю і тым Звяркам, хто рангам невысокі,
Паставілі ўсяго ... бярозавага соку.

Чаму ж Лісе была такая ўвага
І ўсім незразумелая павага?
Хоць меркаванняў тут было багата,
Галоўнае – што Леў Лісе быў сватам.



ЛІСА — слёзы

## РАЗМОВА З-ЗА КУСТА

Схаваўся Заяц за кусты,
А міма Воўк бяжыць.
Касы і кажа: – Слухай, ты!
Кажы, ці хочаш жыць?

Бяжы у вёску ды Зайцам
Капусты прынясі,
Інакш хадзем са мной, а там
Пра літасць не прасі.

Здзівіўся Шэры: – Ты... пужаць?
Ды Заяц тут не змоўк:
– Хадзем за куст...
Хвілін праз пяць
Адтуль ледзь выпаўз Воўк.

Вось за кустом сеў Заяц зноў.
Глядзіць: Мядзведзь ідзе.
– Дай сакавітых качаноў,
А не – за мной хадзем!

Мядзведзь раз'юшан: – Дам разгон,
Нахабнік ты такі!
Праз пяць хвілін ледзь выпаўз ён,
Ды чухае бакі.

Наўцёк пусціўся ён хутчэй
Далей ад той бяды.
А тут бяжыць Ліса яшчэ.
– Гэй, Рыжая, сюды!

Капусту з вёскі мне нясі, -
Муштруе ён Лісу.
Яна заенчыла: – Касы,
Вядома, прынясу.

І морквы прыхаплю якраз,
Ты ж, Зайчык, дабрадзей.
Ліса заўважыла ў свой час:
За кустам Леў сядзеў.

---

Не трэба сіла й галава,
Калі за спінай маеш Льва.

## КАЗА – КАРОВА

Каза прыйшла да Старшыні
І кажа: – Выдай мне даведкі,
Што не Каза я – сам зірні –
Карова я, ёсць нават сведкі.

Той не сцярпеў – зарагатаў:
– Відаць, жывёла ачумела.
Няўжо я дрэнна бачыць стаў,
Ці ты жартуеш так няўмела?

– А што? Шэсць літараў усяго –
Цяпер Кароў тваіх надоі.
І я даю не менш таго:
Тры літры з тлустасцю двайною.

– Яно-то так, дык што рабіць,
Палепшыць як такія справы?
– Карове, каб Каравай быць,
Не абы што патрэбна – травы.

Пасуць іх з намі ўсю пару
У лазняках, а што там есці?
Нам дык прасцей: грызём кару,
Або лісток ухопім дзесьці.

Так што даведку мне давай,
Бо малака зусім не дам я!
Тут Козы іншыя з хлява
Прыскочылі: – І нам таксама!

Вось Старшыню Казёл сустрэў,
І падступае гэтак злосна:
– Ты што зрабіў? Я захварэў,
Ад гэтых жартачак мне млосна!

Бач, Коз з Каровамі зраўняў,
Яны вялікі гонар маюць,
І мне як быццам не радня,
Гаспадаром і не ўспрымаюць.

Нашто ў цябе і галава?
Патрэбны справы, а не словы.
Даведак колькі ні давай,
З Казы не зробіш ты Каровы!

# ВУЧОНЫ КІТ

## (байка)

Вучоны Кіт у інстытуце водным
Работай навуковай кіраваў.
З работнікамі не бываў лагодным,
І зранку ўсім заданні раздаваў:

– Ты, Акунёк, састаў вады даследуй,
А Камбала – пра грунт мне звесткі дай.
Ты, Скумбрыйка, раслінны свет уведай,
Сялёдчык – колькі солі, нагадай.

З'яўляўшыся на працу раз у месяц,
У акіян надоўга Кіт знікаў.
Адсутнічаў ён на рабочым месцы
(Яго ніхто, дарэчы, не шукаў).

А Рыбкі працавалі без утомы,
Стараннасцю здзіўляючы сваёй.
А вынік працы быў усім вядомы:
Пісаў Кіт дысертацыю па ёй.

І розныя яны выгоды мелі,
І розны да работы быў настрой,
Бо Рыбкі толькі водарасці елі,
Кіт ласаваўся чорнаю ікрой.



# АХВЯРЫ ГУЛЬТАЙСТВА

У лесе дзень працоўны быў,
Работа рухалася ўмела.
І кожны нешта там рабіў,
Варона ж на суку сядзела.

Паблізу Заяц шустра бег,
І дакараць пачаў Варону:
– Не працаваць – вялікі грэх,
Мы круцімся ўсе без прыгону.

Варона здзекліва ў адказ
З вяршыні дрэва так сказала:
– Бо многа дурняў сярод вас,
Разумных жа, як я, ёсць мала.

Падумаў Заяц: – Дык нашто
Мне больш за ўсіх ужо старацца?
Пад куст уверх лёг жыватом:
– Хай іншым застаецца праца.

Бяжыць Ліса: – Чаму ляжыш?
Работа ў лесе ўсіх чакае.
– Дык прыклад пакажы ўсім ты ж,
Калі разумная такая.

Ліса прылегла на траву:
– Прагулаў мне чаго баяцца?
Не лепш, не горш за ўсіх жыву,
Ці ж я дурнейшая за Зайца?

Тут паляўнічыя ішлі,
Што пастраляць заўжды любілі.
Здабычу лёгкую знайшлі –
Лісу і Зайца ўраз забілі.

Варона сведкаю была,
На гэта зверху пазірала.
– Лес не пазбаўлены ад зла,
Калі тут ёлупняў нямала.

Кар! Без мазгоў жа трэба быць,
Каб так загінуць вось ганебна.
Бо каб нічога не рабіць,
Сядзець высока нам патрэбна!



## "ВЕРАБ'ІНАЕ" КАХАННЕ

**(байка)**

Ляцелі птахі да мяне на госці –
Сямейка Вераб'ёў, з-за іх не спаў.
А ім было хоць падзяўбці чагосьці,
І я што меў – ім клаў і падсыпаў.

Ды раптам я заўважыў: што за ліха,
Бо да абодвух іх даўно прывык.
А прылятала толькі Вераб'іха,
А гаспадар яе я к быццам знік.

Яна, вядома, дужа сумавала
Ад іх сямейных вельмі цяжкіх спраў.
І мне было тут клопату нямала,
Бо я за іх сям'ю перажываў.

Пасля зірнуў – зляцеліся, як з неба,
Буркуюць на балконе на маім.
Ды толькі гамана – не так, як трэба,
У кожнага гаворка аб сваім.

Яна шчабеча: – Ты знайшоў другую,
Кахала ж, ды жыццё маё змусціў.
І думаў ты, што я адна звякую.
Нягоднік, шэльма, здраднік, ціў-ціў-ціў!

А ён сядзеў засмучана і ціха,
Віноўна апусціўшы галаву.
Апраўдваўся ледзь-ледзь прад Вераб'іхай,
Маўляў: – Прабач ты мне, ціву-ціву!

Палётала яна, паціху змоўкла,
І знікла злосць у сэрцы і крыві.
І сустракаю разам іх я зноўку,
І ёсць маленькія ў сям'і іх Вераб'і.

---

Каб моцная была заўжды сям'я,
Не будзь падобным да такога Вераб'я.

## КАНЦЭРТ

### (байка)

Галодны Воўк пабег на паляванне,
І неўзабаве Зайца напаткаў.
– Вось, – кажа, – будзе добрае сняданне, -
Падняў за вушы: – Я цябе шукаў!

Ад страху Заяц з шэрага стаў белым,
У пашчу Воўка лезці не хацеў.
– Паслухай, Воўча, я спяваю ўмела,
Яшчэ й танцую хвацка для гасцей.

Цябе пацешыць я хачу, аж млею,
Апошні свой канцэрт дам у жыцці.
Старацца буду, пакажу, што ўмею,
Пасля мяркуй: ці з'еш, ці адпусці.

Падумаў Воўк, згадзіўся: вось праява!
Але нікуды Заяц не ўцячэ.
Той на пянёк ускочыў вельмі жвава,
Пачаў спяваць, скакаць, крычаць яшчэ.

Паблізу паляўнічы там праходзіў,
Пачуў ён шум і зняў ружжо з пляча.
Такога век не бачыў у прыродзе:
Танцуе Заяц, Воўк – за гледача.

Прыцэліўся тут хутка паляўнічы,
Спусціў раптоўна ўзведзены курок.
Драпежніка хацеў знянацку знішчыць,
Ды прамахнуўся. Шаснуў Воўк убок.

Тут спала ўся з Ваўка саманадзейнасць:
– Начорта мне такая самадзейнасць!

## АХВЯРА ХАРАКТАРУ

Двару патрэбны вартаўнік,
Каб добры меў і зрок, і слых,
Раптоўна злодзей каб не ўзнік,
Каб не пускаў у дом чужых.

Дварнягу кормяць ад душы,
І лашчыць жа яго сям'я.
Дык лепш вартуй, мацней брашы.
Ёсць будка цёплая свая.

Звычайна і бывае так,
Ды гэты быў зусім дурны.
Паспіць, пасля наесца ўсмак –
Гаспадара рве за штаны.

І з часам усё больш дурэў:
Ганяў свіней, ганяў курэй.
Палохаў нават і дзяцей,
Кусаць гаспадара хацеў.

А гаспадар што ні рабіў,
Усё было наадварот...
Ён псіну гэтую прыбіў.
Са злосці выкінуў за плот.

---

Калі дурны – умер свой псіх,
Не кідайся – хоць на сваіх.



## ТАЎСТАСКУРАЯ СВІННЯ

Як толькі Гусі сталі есці,
Прыйшла суседская Свіння.
Зямлю капала лычам дзесьці,
Ды прыцяглася, як штодня.

Гусей нахабна расштурхала,
А ёй што есці – усё адно.
Было самім тым Гускам мала,
А ўжо відно карыта дно.

Паела ўсё, што перапала,
Парохкала, затым лягла.
А Гусі бок яе шчыпалі,
Віноўніцы такога зла.

Але стараліся дарэмна,
Хоць ёсць для помсты шмат падстаў.
Ёй не балюча, а прыемна,
Як быццам нехта казытаў.

“Калі свайго я дамагуся,
Мяне нішто ўжо не кране.
Шчыпайце ўсе – я не баюся,
Бо скура тоўстая ў мяне”.



## ПРА СВАЁ І ЗА СВАЁ

Варона на суку сядзела,
І вось зламаўся гэты сук.
Яна падняцца не паспела,
І вобземлю раптоўна – грук!

Спазнала гукаперайманне
За свой працяглы вельмі век.
Спачатку гаўкала старанна,
Бы над сабой адчула здзек.

А потым мяўкала адчайна,
Ды гэта не дапамагло.
Тады, як хуліган звычайны,
Загнула маты – во было!

Нарэшце, каркнула, як трэба -
Тут і прапаў пякучы боль.
І паднялася ўраз пад неба.
Дык здагадайся, ў чым жа соль?

Няцяжка зразумець высновы:
Чужое лепш не выбірай.
І думай ты на роднай мове,
На роднай мове й размаўляй.

# МІНІ-БАЙКІ

## ПА ПТУШЦЫ І ПАЛЁТ

Любіла Муха так хваліцца ўсім бясконца:
– За птушкамі і я магу ляцець да сонца.
Заўважыў мудра Жук: – Я б паляцеў таксама,
Ды наш з табой палёт увесь ля гнойнай ямы.

## НЕ ПРАБЛЕМА

Галодная Ліса залезла ў сад,
Ды не змагла дастаць там вінаград.
Ну, не бяда, бо дойдзе ўсё да ладу:
Кум Ліс дастане, – ён – загадчык склада.

## "УЮН"

У шальмаўстве заўжды меў рост:
Абжуліць хоць каго.
І ні за жабры, ні за хвост
Не улавіць яго.

## ПАПАЎСЯ

Бег Воўк за Зайцам, ды самлеў:
Насустрач выскачыў... сам Леў.
Воўк меў нямала сумных спраў,
Бо скуру Леў з яго садраў.

## КАБ – ЗДАРОЎЕ І ЖЫЦЦЁ

Хоць жыццё нам – не пацешкі,
Хто ж мы будзем без усмешкі?
Трэба і сатыра, жарт,
А без іх – чаго ты варт?
Многа больш тым удаецца,
Хто жартуе і смяецца.
А пахмурным – мала ёсць:
Чарната, худоба, злосць.

## НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

Як за незалежнасць мы змагаліся
Праз дзесяцігоддзі і вякі!
Ды нягоды скрозь перажывалі ўсе,
Ў ход пускалі зброю й кулакі.

Лезлі адусюль да нас захопнікі,
І на скрыжаванні ўсіх дарог
Край мой часцяком слязьмі быў поўненькі,
Ды трымаўся ўсё ж народ, як мог.

І задумы бачылі падманныя,
Жорсткасць, лютасць ворагаў усіх.
Хоць спакойныя, ды не рахманыя –
І наскокі адбівалі іх.

У Вялікім Княстве ж уладарылі,
Што Літоўскім звалася тады.
Толькі аб сваёй дзяржаве марылі,
Як стаім на свеце, мы заўжды.

У Саюзе братнім нас запэўнілі,
Быццам незалежны ўжо наш край.
Толькі гэта выйшла бруднай пенаю,
Бокам вылез наш савецкі "рай".

Хоць надзеі добрыя даўно былі,
Спадзяваліся, аднак, дарма.
Прыпаўзла бяда да нас з Чарнобыля –
Вінаватых быццам бы няма.

Толькі ўсё ж пакуль што не загінулі,
Ды разлікі нашы – на сябе,
Бо ранейшыя сябры нас кінулі –
Кожны пад сябе цяпер грабе.

Калупаемся, як быццам гномікі,
Гномы ж тыя ў казках, што там ім!
Цяжка крочыць наша эканоміка,
Кланяцца цяпер патрэбна ўсім.

Мо, дамовы, пагадненні розныя
Прывядуць да вельмі важкіх змен....
У паездкі едзем мы сур'ёзныя –
Ў Францыю, Германію, Бахрэйн.

Дзеячы як быццам ёсць і сталыя,
Нетры ёсць, нямала моцных рук.
Дык чаму ж мы гэткія адсталыя,
І калі ў жыцці надыдзе зрух?

Думае народ наш – і палітыкі,
Што нярэдка варты вострай крытыкі.
Хоць падзьмула раптам нейкай свежасцю,
Што рабіць нам з гэтай незалежнасцю?

1990-я гады.

# СЁННЯШНІ ДЗЕНЬ

Краіна завіхаецца,
У рынак уціскаецца –
Такі кругаварот.
Ды з "поспехамі" нашымі,
А тэмпы чарапашыны –
Іх хопіць на шмат год.

Нічога не купляем вось,
Пакупка ў доме – рэдкі госць,
Даношваем, што ў хаце ёсць,
І краю не відно.
А як жа сем'ям маладым?
Каб не пайшлі ўсе мары ў дым,
Не ўпалі каб на дно.

Праблем залішне маем мы,
Дзяцей не нараджаем мы –
Усё наадварот.
Малыя нашы рублікі,
Старэе ўся Рэспубліка,
І меншае народ.

Даклады робяць добрыя,
Прыбыткі ж нашы дробныя –
Як бы пасля вайны.
Тады мы спадзяваліся,
Паволі падымаліся,
І лепшыя йшлі дні.

Аб'явяць большы мінімум,
Ды тут падкінуць міну нам
Вытворцы, гандляры.
Імгненна душаць цэнамі,
І зноў нас робяць беднымі,
Так гінем да пары.

Затраты, кажуць, большыя,
Не заціскайце грошы вы,
Іначай за мяжу
Тавары хутка павязём,
І дэфіцытам загрызём –
Хоць сядзьце на дзяжу.

...Душою неспакойныя,
Худыя мы і стройныя
Ад гэтага жыцця.
Хай пройдзе гэта каламуць!
Дай Бог дні нашы працягнуць,
Пазбегнуць забыцця.

1990-я гады.

## ЦЭНЫ

Штодзень усюды перамены.
Іду, любуюся на цэны.
Ды дзе карысць ад любавання?
Купляць зусім няма жадання.

Але прыдбаў бы штось, вядома,
Бо небагата часам дома.
У чым найпершая патрэба?
Мы не абыдземся без хлеба.

Падумаеш – на мяса ласы,
Не шкодзяць нават і каўбасы.
Гароднiна і садавіна
Быць на стале заўжды павінна.

Ляжаць былыя дэфіцыты,
І падыход да іх адкрыты.
Ды ўсё такое дарагое –
Не ўзяць ні тое, ні другое.

У нашых крамах зрух карэнны,
Кусаюцца адчайна цэны.
Пякуць і цiснуць цяжкім прасам:
Вось кілька даражэй за мяса.

Не шкодзіла б купіць, дарэчы,
І неабходныя нам рэчы.
Што важнае ўзяць – не параіш,
Бо грошай век не назбіраеш.

І дробных рэчаў кошт вялікі,
Адразу кідайся ў разлікі.
Трусы ды майкі, і шкарпэткі –
Нялёгка скарб набудзеш гэткі.

Ні нарадзіцца, ні жаніцца,
Мінулы час нам толькі сніцца.
Праблема нават пахавацца –
Хоць бессмяротным заставацца.

А хтось не спіць і дні, і ночы,
Падняць зноў цэны рэзка хоча.
І на сабе спазнаць мы рады
Саветаў "клопаты" і Урада.

Віткі інфляцыі ўсё ўюцца,
А цэны скачуць, не здаюцца.
Ды ёсць яшчэ на хлеб і квас.
Улады
думаюць пра нас....



## ПРА ВЫДАТКІ І ПАДАТКІ

Яшчэ такога не было.
Як дрэннае насланне,
На фонд зарплаты налягло
Падаткаабкладанне.

Падаткаў столькі – проста жах!
Зарплата йдзе ж з задышкай.
Вось адлічэнні на соцстрах –
Працэнтаў трыццаць з лішкам.

Як быццам міма ўсё цячэ,
Ад нас бяжыць адчайна.
Працэнтаў васемнаццаць шчэ –
Падатак надзвычайны.

Чамусьці робіцца ўсё горш,
Скрозь – змрочныя адбіткі.
Працэнтаў дваццаць да таго ж –
Падаткі на прыбыткі.

Павевы ёсць тут новыя
Па лініі адметнай.
На вартасць дадатковую –
Дай дваццаць пяць працэнтаў.

З грашыма вольнасці не май,
І курс трымай прыкметны.
І пяць працэнтаў выдзяляй
У фонд пазабюджэтны.

Яшчэ замнога будзе змен,
І мер нямала прымуць.
У фонд рэгулявання цэн
Працэнты тры адымуць.

Адзін працэнт яшчэ бяруць,
Каб паляпшаць дарогі.
І на занятасць столькі ж пруць,
Бо беспрацоўных многа.

Як след бы гэта скарыстаць!
Ды лепш нам не жывецца.
І вельмі хочацца спытаць:
– Дзе ж гэта ўсё дзяецца?

## ПЕНСІІ

Старэчых клопатаў нямала,
Ім нават краю не відно.
Бо пенсіі ўсе падраўнялі,
Усім даюць амаль адно.

Хто працаваў старанна, шчыра,
А хто – зусім наадварот.
Стаж у адных – гады чатыры,
У іншых – цэлых сорак год.

Хто на высокай быў пасадзе,
Хто – і зусім на радавой.
Адзін з фізічнай працай ладзіў,
Другі – шурупіў галавой.

Калі раней рублёў сто дваццаць
Давалі, ці сто трыццаць два,
Дык мог пенсіянер трымацца,
І не балела галава.

А сёння пенсія такая –
Галечу як перамагчы?
Нам гэтай пенсіі хапае,
Каб толькі ногі валачы.

Жаданнні ж у старэйшых – дробязь:
Працягнем неяк, хоць верць-круць.
І супакойваецца боязь –
Своечасова хоць даюць.

На пенсію такую сходзіш
Раз-два у краму, на базар.
Што найтаннейшае знаходзіш,
Найнеабходнейшы тавар.

Не разгуляйся, еш у меру,
Аддзення, рэчаў не купляй.
І як пражыць пенсіянеру?
Чакай, што Божа прыме ў рай.

Працуе чалавек, пацее,
І да ўсяго ўжо ён гатоў.
Дзяржава мо пабагацее,
Не хутка – дык праз шмат гадоў?

1990-я гады.

## МАЛАНКА І ГРОМ

Мужык, адпачыўшы да ранку,
Рашыў гаспадаркай заняцца.
Глядзіць – шаравая маланка
Уляцела і кружыць па хаце.

Не ведаў мужчына той страху:
– Што носішся, як на гулянцы?
Схапіў качаргу і з размаху
Як лясне па гэтай маланцы!

Страшэнны тут выбух пачуўся,
Нібы нехта стрэльнуў з гарматы.
Хто позна спаў – хутка прачнуўся,
І – ні мужыка, ані хаты....

Бязглузда, без толку, без ладу,
Калі з качаргой – ды на ўладу.
У ўлады магутная сіла.
Глядзі, каб цябе не скасіла.

## ГОРШ НЕ БУДЗЕ

Цяжка нашай Беларусі,
А жыццё – скрыпіць, ідзе.
І сказаць я вам бяруся:
Горш не будзе нам нідзе.

Палячу ў далёкі Космас,
Хоць у Афрыку пайду –
Абміну сваю я млоснасць,
Лепшае жыццё знайду.

Тая Афрыка – край званы,
Што раней была "ў хвасце".
Малпы там ядуць бананы,
А на дрэвах хлеб расце.

Ці ў Амерыку, Канаду,
Аўстралійскі цёплы край
Паімчу не па загаду –
Кажуць, там – ну, проста рай.

І жывуць так добра людзі,
І багатых вельмі шмат.
Нам усюды горш не будзе,
Не захочацца назад.

Толькі думка ёсць такая,
Думка сумная мая:
Дзе і хто мяне чакае,
І каму патрэбен я?

Голас сэрца ўсюды чутны,
Ува мне гучыць штодня:
Тут народ мой шматпакутны,
Як і ўся мая радня.

На каго свой край пакіну,
Каб пусцела і зямля?
Уратуе хто краіну,
Хто ўсё зрушыць, як не я?

Падтрымаем працай важкай
Мы Радзіму ў гэты час!
А жывем настолькі цяжка,
Што не будзе горш і ў нас.

Беларусь лёс не пакіне:
Ёсць гісторыя свая.
Раз народ мой не загіне –
Значыць, выжыву і я.

1990-я гады.

## СУЧАСНЫ ПАРТРЭТ

### (фельетон)

Квадратныя плечы,
Шырокі і твар,
Багатыя рэчы,
Каштоўны тавар.

Звышмодны абутак,
Аб'ёмны пінжак.
Хіба бачыць смутак,
Хто ходзіць вось так?

Кароткая стрыжка,
Суровы пагляд.
Стос грошай, як кніжка,
Даляраў зашмат.

І сотавы мае,
Як звон, тэлефон,
Бо сувязь трымае
Шмат з кім часта ён.

Вылазіць вось з "ВОЛЬВА",
Прытым не адзін.
Паходкаю вольнай
Ідзе ў магазін.

Купляе найлепшы
Каньяк, сервелат,
І торт даражэйшы,
Яшчэ – чакаляд.

Шыкоўныя дамы
У машыне сядзяць –
Не жонкі, не мамы,
З пагардай глядзяць.

...Артыст ці спартсмен,
Што дамогся удач?
Хто ён? Бізнесмен
І сучасны фірмач.

## НЯЎДАЛАЯ БУДОЎЛЯ

Узводзілі хлебазавод –
Нялёгкая задача.
І не адзін, вядома, год,
І надышоў час здачы.

Усё камісія глядзіць,
Прыдзірліва прымае.
І добра зроблена наўздзіў,
Заўваг яна не мае.

Вось першы ўвесь прайшлі паверх –
Адзначылі, як трэба.
Пасля хацелі йсці наверх
І там адчуць пах хлеба.

Другі паверх закрыт зусім,
Дзе лесвіца – не бачна.
Шукалі – выбіліся з сіл,
Няма – ўсё адназначна.

Прараб тут свой адказ знайшоў:
Рабілі дзірку ў столі.
Затым забыліся, нашто –
Замазалі паволі.

Загад камісіі такі:
– Сцяну дзяўбіце збоку,
І лесвіцу вы, лайдакі,
Вядзіце ўверх высока.

Завод нарэшце давялі –
Распараджэнне глаўка.
І сталі ўсе чакаць, калі
Хлеб пойдзе да прылаўка.

Чыгунка побач, як назло –
У шуме ўсё і ў гудзе.
А меркаванне ў іх было –
Бліжэй разгрузка будзе.

Муку з вагонаў браць бліжэй –
Лічылі зручным месца.
Дык выпякаць хлеб – найцяжэй,
Бо не падходзіць цеста.

Бо рэйкі ходзяць так і сяк,
Зямля наўкол трасецца.
Хлебазавод той даўся ў знак,
Другі ўжо ў іншым месцы.

А ў гэтым што?
Таварны склад.
Мільёны грошай плачуць.
...Хто ходзіць перадам назад –
Мазгі не перайначаць.

## ПЛАН І ПАДМАН

Штогод здаём металалом,
План выканаць не проста.
За год мы дзесяць тон даём,
А план наш – дзевяноста.

І немагчыма больш знайсці,
Куды з тым планам дзецца?
Нам кажуць: – Трэба вам расці.
Шукайце, вы ж – не дзеці.

А дзецьмі быць куды прасцей –
Цягаюць, што не трэба.
У полі ж лом той не расце,
Не падае ён з неба.

Але – на пошукі хутчэй!
З дэпо мы крадзем рэйкі,
І арматуру вось яшчэ
З будоўлі цягнем нейкай.

Раз удалося, два і тры –
Пагналі нас ганебна.
Усюды сталі з той пары
Вартаўнікі са стрэльбай.

– Зніміце план, бо ён – падман,
Куды йдзе ў нас майстэрства?
– Не можам зняць, бо гэты план
Зацверджан міністэрствам.

Пайшло далей, і церпіць дом,
І родная кватэра:
Цягаем з дому ўсё, здаём
Без сораму і меры.

Хто халадзільнік прывалок,
Хто – розныя каструлі,
Тапор, напілак і замок,
І што маглі – цягнулі.

Ажно курыў з падэшваў дым –
Пакажам гарт рабочы!
А завалілі мы між тым
Асноўны план, вытворчы.

І не пазбегнуць нам заган
І промахаў, бясспрэчна,
Калі даецца часам план
Бяздумна, недарэчна.

## ПАКАРАННЕ ЗА СТАРАННЕ

Завод гібеў – не тыя словы!
І не было належных мер.
Тады туды талковы новы
Прыйшоў галоўны інжынер.

Выкараняць пачаў прычыны,
Чаму завод зусім адстаў.
Падняў спачатку дысцыпліну –
Ніхто не сноўдаўся без спраў.

Узняў ён дрэваапрацоўку –
Там столькі плошчаў і станкоў!
А мэблю робяць для сталоўкі,
Аконных рам шмат і сталоў.

І механічны цэх нядоўга,
Але з напругай падымаў.
Паставіў там усіх на ногі –
Праблем з вытворчасцю няма.

Прыйшоўшы на завод, адразу
Шляхі ў прагрэс шукаць пачаў.
На шматмільённыя заказы
Дамовы ўсюды заключаў.

Сказаў работнікам: – На страты
Ніколі згоды не дадзім.
І падыму ўдвая зарплату
Я праз паўгода вам усім.

Наўкол – настрой, ва ўсіх – натхненне,
Галоўны інжынер – герой!
Дырэктар з незадавальненнем
Паклікаў позняю парой.

– Ты што прыліп тут, як кароста?
Звальняйся – дзесяць дзён даём.
– За што і як, і гэтак проста?
– Не хочаш проста – будзе гром!

Боль галаўны, адны турботы:
Дырэктар некага знайшоў.
Загад быў: “За развал работы”.
Галоўны нехаця пайшоў.

І праўда: сябра ўзяў дырэктар,
Хоць той – не спец, а балбатун.
І зноў ідзе работа з крэктам,
І зноў – развал, бяздзейнасць, тлум...

Хто ў працы ходзіць коса-крыва –
Падзякі мае за “старанне”.
А вось за ініцыятыву
Нярэдка будзе пакаранне.

# МАЙСТРЫ РАЗВАЛУ

На фабрыцы слаўнай былі дружбакі –
Высокага рангу кіраўнікі.
Ніколі яны не бывалі ў журбе,
Пра фабрыку "дбалі", а больш – пра сябе.

Выгоды свае не прагледзець абы.
Кватэры і дачы раслі, як грыбы.
Цягнулі рублі, як вадзіцу з крыніц,
А родная фабрыка падала ніц.

Убачылі раптам, што справам там – край.
Дык, значыцца, хутка манаткі збірай.
Куды б паляцець ім, як восам на мёд?
І пераплылі на суседні завод.

Пасады ўсе важныя там занялі
І выгляд рабілі, што ў працы былі.
Але стала бачна: "худнее" завод,
І стаў як участак ён недзе праз год.

Па змове агульнай калегі-дзялкі
Найлепшыя хутка прадалі станкі.
Спрытнюгі сарваць кучы грошай змаглі,
Ды больш іх на ўласныя ўклады ляглі.

І лепшыя кадры завод разгубляў,
Яны разышліся ад брыдкіх тых спраў,
Бо плана няма і зарплаты няма,
Каму ж па душы працаваць задарма?

Гамоняць у цэху вось два сябрукі:
– Начальнікаў многа, а толк з іх які?
Яны ўжо гатовы ўцячы і ад нас,
Збягуць на будоўлю буйнейшую ўраз.

Адзін вёў расповяд, адказ даў другі:
– Апісваюць шэльмы-вароны кругі.
Не будзе карысці ад хеўры такой.
Прапала будоўля! – махнуў ён рукой.

Змагаецца шмат хто за план і за вал,
А іншыя з радасцю робяць развал.
Ім хочацца жыць багацей, весялей.
Усё расцягаюць, і бегма далей!

## АДЭКАЛОН І ПЫЛ

Ў цырульні ветлівасць пануе:
Пастрыгшы вас і пагаліўшы,
Цырульнік, галаву схіліўшы,
Вам асвяжыцца прапануе.

Каб зберагчы адэкалон,
У вочы пырскае вам ён,
Пакуль вы супраць сваёй волі
Яму не крыкнеце: – Даволі!

Але, папырскаў хоць і мала,
Хоць толькі ў вочы вам трапляла,
Аднак за той адэкалон
З вас возьме больш чым коштам ён.

Выпадак гэты мо нязначны,
Калі б то быў сам па сабе.
Ды аналогія тут бачна,
Карэнні цягнуцца глыбей.

Той-сёй рабіць як след не хоча,
А толькі пыл пускае ў вочы.
Яму б увесь дзень лынды біць,
А грошы дай што мае быць.



# РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ

Іван Іванавіч унёс рацпрапанову:
Знайшоў ён спосаб прынцыпова новы
Для зваркі важных у машын дэталяў,
Што ўсіх даўно і вельмі хвалявала.

Для доследу ж металу трэба многа,
І тут ужо на склад вядзе дарога.
Але загадчык склада кажа ўпарта:
– Метал дам, калі буду я сааўтар!

І зноў жа дослед – гэта не пацеха,
Патрэбна, каб памог начальнік цэха.
Падтрымка трэба, што ні гавары.
Параілі: "Сааўтарам бяры!"

Ў лабараторыю дэталі трэба несці,
Аналіз швоў як след у іх правесці.
Там кажуць: "Мы гатовы слацца лістам,
Ды толькі сам не будзь ты эгаістам.

Работы вельмі шмат займацца гэтым,
Ды папрацуем жа для добрай мэты.
Карысную табе мы робім справу,
Ды з нашым шэфам раздзялі ты славу".

Рацпрапанова, зробленая ўмела,
Па ўсім заводзе вельмі нашумела.
Ды аўтары чатыры ўжо ўзяліся,
Іван Іванавіч апошні быў у спісе.

А ганарар за тую распрацоўку
Размеркаваны быў даволі лоўка:
Хоць у сааўтараў і большая зарплата,
Ды нельга мала ім плаціць па штату.

А наш герой не меў да грошай прагі,
І ён на гэта не звярнуў увагі.
У яго другая распрацоўка на прыкмеце...
Цікава, а ў сааўтары хто меціць?

## ПРА КУЛЬТУРУ

Маладыя – гэта цуд,
Дзіўныя натуры.
Ды разважым трохі тут
Мы аб іх культуры.

Моладзь ветлівая ў нас,
Слаўных спраў шмат мае.
Ды, на жаль, яшчэ падчас
Рознае бывае...

Вось аўтобус ці трамвай
Падыходзіць жвава.
Хлопцы ціснуцца давай,
Джынсы труць рухава.

Тут старыя з багажом,
Маладыя ўлегцы.
Маладняк імчыць бягом,
І імкнецца сесці.

Ці не ўступіць месца? Не,
Лепш схавае вочы.
У газетку нос уткне
І ўставаць не хоча.

А размовы – проста жах,
Дзікунова мова.
Пацалункі на вачах –
Гэта ўжо не нова.

Перамен даволі шмат,
Час пульсуе моцна:
Цыгарэты – у дзяўчат,
Патлы – больш у хлопцаў.

...Зап'янее без пары,
Курыць, ходзіць млява.
Скажаш – гыркне: – Гэй, стары,
Не твая тут справа.

Ёсць даволі ў нас такіх –
Дрэннага прыплоду.
Выкарчоўваць будзем іх
З нашага гароду!



## ТУЛЯГА НА РАБОЦЕ

Быў заўжды Туляга млявы
Да працоўных спраў.
Незвычайны шлях да славы
Ён аднак абраў.

Перакур. І тут задача:
Глянуўшы убок,
Першым майстра ён убачыў –
Скочыў за станок!

І не ўгледзеў майстар толку,
Даракас ўсіх.
А спацеў Туляга толькі,
План "дае" за ўсіх.

У сталоўку йсці не хоча,
Хоць абед настаў.
Зірк – начальнік цэха крочыць,
Да станка зноў стаў.

А такога вось учынку
Не заўважыць грэх.
А як быў у адпачынку,
Дык зайшоў у цэх.

Тут глядзіць: стаіць дырэктар –
Да станка хутчэй!
Але ўпаў, касцюм свой спэцкаў,
Новенькі яшчэ.

Смех таварышаў ён слухаў,
Дружны смех людзей.
Не прыводзіць паказуха
Да дабра нідзе.

## МАНАЛОГ БЮРАКРАТА

Пытанне важнае у нас,
І вырашаць яго ўжо час,
Але не рэзка і не груба:
Падняць яго, паставіць рубам.

На небывалай вышыні
Усё лепш відаць, як ні зірні.
І завастрыць на ім увагу,
Каб заслужыць сабе павагу.

Пытанне трэба “абкатаць” -
Не з пальца нам яго смактаць.
Затым прааналізаваць,
Як трэба арганізаваць.

Разбіць па пунктах зноў і зноў,
Праверыць потым сто разоў,
І разглядзець з усіх бакоў –
Пытанне не для прасцякоў.

Патрэбна ўсё абмеркаваць,
Што лішняе – забракаваць.
Яшчэ і правентыляваць,
Памылак розных мінаваць.

Па костачках іх разабраць,
Хоць часу многа і патраць.
Пералапаціць бы як след,
Ці шмат станоўчых там прыкмет.

Зрабіць належныя высновы,
Заключныя сказаць нам словы,
Што шмат карысці ад таго,
Пасля зацвердзіць бы яго.

І адпаведнае рашэнне
Прыняць і з сэнсам, і значэннем.
І напісаць бы пратакол,
Пасля – начальніку на стол.

І ў канцы – паставіць кропку,
А копію – на сцену кнопкай.



# “ДАБРАЧЫННЫ”

Я не люблю, хто хваліцца праз меру,
Таму што сам прымаю ўсё на веру.
Другі балбоча і направа, і налева.
Без лішняй сціпласці скажу я пра сябе вам.

Не верац людзям іншыя, хоць рэж ты.
Дае мне прадаўшчыца ў краме рэшту.
Выходжу, зачыніўшы шчыльна дзверы.
Я ёй паверыў, а другі б праверыў.

Паводжу я сябе належным чынам.
Вось хуліган штурхнуў маю дзяўчыну.
І я змаўчаў, як не заўважыў быццам.
А хто другі, відаць, пачаў бы біцца.

Ну, што з таго, што я, маўляў, мужчына,
І не кахае больш мяне дзяўчына?
Навошта мне патрэбна ў бойку лезці?
Міліцыя ж заўсёды побач дзесьці.

Я па двары йду – сушыцца бялізна,
Дык не падумаў нават і прыблізна.
А нехта зняў бы і прадаў за пляшкі.
А я – прайшоў, хоць і стрымацца цяжка.

Аб будучым заўжды рупліва дбаю:
Ледзь грошы атрымаў – кладу на кніжку.
Дзяўчатам карамелькі я купляю,
Другі, нядбайны, ім купляў бы “Мішкі”.

Раз на рабоце просяць: – Затрымайся,
Бач, план “гарыць”, трывогу трэба біць!
Другі б паслухаў, што гаворыць майстар,
А я – не эгаіст, дам іншым зарабіць.



Вой, гляньце, што за дрэнная прыкмета:
На дошцы гонару няма майго партрэта.
Выходзіць, некаму мяне зацерці – мэта.
Другі б змаўчаў, а я ім дам за гэта!

Працоўных зневажаюць бюракраты,
Я крыўды ў сэрцы ўжо даўно нашу.
Другі мо пасадзіў бы іх за краты,
А я – я толькі скаргу напішу!



## УХВАЛА ПІВУ

"Піце піва – гэта спажыўна і карысна.
Толькі – наша, беларускае".
*(З радыёперадач і газетных рэклам).*

...Я асабіста ўпадабаў найбольш – "Рэчыцкае",
Розных сартоў і найменняў. Усё яно такое мяккае,
духмянае, моцнае, пеністае, сакавітае, прыемнае.
Яго хочацца.

Хто з мужчын не любіць піва,
Хто з жанчын не піў яго?
Вось пітво – ну, проста дзіва,
Пакаштуеш, дык – ого!

Дапякае сонца ўлетку:
Што – напітак, што – той квас?
Піва прагнеш кожнай клеткай –
Напатоліць смагу ў час.

Пасля добрай вечарыны
Ўранку стогне галава.
Вельмі хочам з той прычыны
Мы чароўнага пітва.




Пасля лазні мы як вязні:
Выцек з нас ракою пот.
Тут з піўнухі мы вылазім –
Надта ж моцна сохне рот.

А як піва са смятанай
Размяшаўшы, нехта п'е –
Цягне да жанчын адчайна,
Сілу мужыкам дае.



Па грашах не вельмі важка,
І не сядзем мы на мель.
Піва куфель ці то пляшка –
Радасны, прыемны хмель.

А як ёсць даволі часу,
І сябе няма дзе дзець,
Можам мы з піўком сам-насам
Цэлы вечар прасядзець
(Не па-п'янаму балдзець).

З воблай, сырам ці з гарохам,
Сярод дня або ўначы
Папівай сабе патроху,
І, як соску, ты смакчы.

Не абыдзецца ніколі
Без яго ніводзін пір.
Піце піва ўсе – і ўволю:
То – здароўя элексір.



## САМАПРАВЕРКА

Ён некралогі правяраў –
Жыццё ж бяжыць, цячэ.
Бо ўпэўніцца ўвесь час жадаў,
Што сам жывы яшчэ.

## ЗМІКІЦІЎ

**(гумарэска)**

Мікіта быў характарам вясёлы,
Вялікі майстар алкагольных спраў.
Таму не сумаваў амаль ніколі,
Штодзень ён немалую чарку браў.

Аднойчы ён да жонкі прычапіўся:
– Бач, галава трашчыць, адна бяда.
А сёння і не піў, і не напіўся,
Дык грошыкаў на пляшачку мне дай.

А жонка тут жа залемантавала:
– З табою вечна вэрхал, а не мір.
Табе, п'янюк, заўжды гарэлкі мала.
Калі ўжо ты пяройдзеш на кефір?

А той упёрся ўраз, як бык шалёны:
– Ты ж ведаеш, як выпіць я люблю.
Рабі, што кажуць, я – не твой прыгонны,
Іначай нешта я з сабой зраблю.

Пасля пайшоў у сенцы, скочыў лоўка,
Для самагубства трэба што, узяў.
І закруціў вакол сябе вяроўку,
Ды гэтак акуратна падвязаў.

Змікіціў ён: – Каб мінавалі мукі,
Аблегчу сам свой лёс, пакуль жыву.
Вяроўку не на шыю, а пад рукі,
Схіліў набок, як мёртвы, галаву.

А жонка выйшла ў сенцы – вось дык дзіва!
Павешаны, убачыла, мужык.
Загаласіла на ўвесь двор жахліва,
І ўсе яе пачулі страшны крык.

Якія ж можна тут пряняць ёй меры,
Як давядзецца жыць ёй без яго?
Шукаць пабеглі міліцыянера,
Каб разабраўся, што дзеля чаго.

Суседка Ганна, спрытная кабета,
Прачула пра сямейны той скандал.
Падумала: – Я скарыстаю гэта.
Палезла да суседзяў у падвал.

Жыве праз хату – гэта недалёка.
Выносіць з кубла сала, кумпякі.
А гаспадар як невідушчым вокам
Глядзіць: – Мы з жонкай – вось дык прасцякі!

Сказаў: – Кладзі назад маё ты сала,
Хай гэты страшны грэх цябе міне,
Бо ва ўдавы маёй дзяцей нямала,
Хто ж будзе ўсіх карміць іх без мяне?

А на яе напала раптам млоснасць,
Бо за крадзёж затрымана яна.
Са страху нават страціла прытомнасць,
Упала, праляжала да цямна.

З двара прыходзіць жонка з участковым,
Ён нож бярэ – вяроўку разразаць.
І думае Мікіта бесталковы:
– Ды дзе мне паратунак тут узяць?

Як упаду, зламаю, пэўна, ногі –
Высакавата трохі я павіс.
Дык учапіўся за таго з трывогі,
І грымнуліся разам дружна ўніз.

Не скончылася тым бяда ў іх ўся:
Нагнаў усім выпадак той тугу.
Мікіта – сам ён цэленькі застаўся,
А міліцыянер зламаў нагу.

За "жартачкі" быў у Мікіты смутак,
З бутэлькамі ўжо больш не сябраваў.
Бо загрымеў аж на пятнаццаць сутак,
Ды рады, што турмы хоць мінаваў.

## ХТО – КАГО

Стаяў на дарозе інспектар ДАІ,
Падумаў – вадзіцеля тут жа "даі"!
Але "пагарэў" ад выгодных тых спраў:
Не ён жа мяне – я яго правяраў.

Як браў – весяліўся, канешне, не раз.
Цяпер засумуе на доўгі ўжо час.
Не ўсё пад сябе, што няможна, грабі.
Дык вось пасядзі – і высновы рабі!



# ПАЦЯРПЕЎ

Калі прыйшла карова ўвечар з пашы,
Дык трэба падаіць яе было.
А гаспадыня – лёс яе прапашчы –
Ўзяла ды захварэла, як назло.

І паглядала жаласна і слёзна –
У яе душы замоўклі салаўі.
Настойліва так просіць і сур'ёзна:
– Схадзі ты сам, кароўку падаі...

Пад бабу прыадзеўся ён, нябога:
Спадніца, хустка і фартук яшчэ.
"Калі мне памаліцца і на Бога,
Дык ад мяне кароўка не ўцячэ".

Узяў вядро і хутка ў хлеў пакрочыў,
Падлазіць, каб як трэба падаіць.
Яне ж не хоча напускаць на вочы,
Нагой брыкае, роўна не стаіць.

Як ні хадзіў, ні лазіў быццам лоўка,
А стукне – ад вядра не бачны след.
Тады знайшоў ён моцную вяроўку,
І прывязаў нагу яе як след.

Брыкаецца другою, як падлезе,
Вядро ляціць далёка, хоць ты плач.
Другую прывязаў ён, як жалеззем:
– Дасі ўжо малака мне, ты прабач.

Палез з вядром, даіць імкнецца з гартам,
Вядро стаіць няўпэўнена між ног.
Яна ж хвастом у твар – дурныя жарты,
І вытрымаць ён гэтага не мог.

І гаспадарчы поспех меў найменшы,
Аж узмакрэў ад цяжкіх гэтых спраў.
І са штаноў ён выцягнуў раменьчык
Ды хвост каровін зверху падвязаў.

А жонка ўсё ж прыйшла – такі ўжо нораў,
Прытым сям'я і клопаты адны.
Прывязана за ногі й хвост карова,
Ён бегае, і падаюць штаны.

Заенчыла яна і застагнала:
– Няўжо ты ад мяне зусім адвык?
Ці ўжо табе любімай жонкі мала?
Дык бачыш, што надумаў, подлы бык!

Калі праведаюць пра гэта людзі,
То будзе ганьба і табе, і мне.
А ведаеш ты, што за гэта судзяць?
Праседзіш да канца жыцця ў турме.

І ляманту было на ўсю там хату –
Ўвесь вечар, ноч шумела davідна.
Наслухаўся знявагі ён багата.
За што?
І што падумала яна?




Трыумф і трыумфатар

# НАВАЛІЛІСЯ

Вось здараюцца сустрэчы –
Так няўдала, недарэчы!




– Аддавай хутчэй, дзядок,
З падарункамі мяшок!

І ў тваёй лядовай хатцы
Трэба будзе разабрацца.



– Дзед, пайшоў ты ў забыццё:
Ці карціна, ці жыццё?

І да нас ты прывыкай.
Хутка прыйдзем зноў. Чакай.

...Бандзюкоў так дакарай:
– Прыме пекла, а не рай.

Паглядзіць Бог, хто ёсць вы –
І – "качайце" там правы!

Можа, будзе весялей
На патэльні і ў смале?



## БЛАГОЕ ПАДАБЕНСТВА

Па вуліцы ішоў дзяцюк аброслы,
Іх клічуць валасацікамі ў нас.
За ім бабуля слоў снавала кросны,
Рухава тупала, пыталася ўвесь час.

– Вы – бацюшка, прабачце, што пытаю?
І хуценька перахрысціла лоб.
Здзівіўся той і аж змяніўся ў твары,
І буркнуў: – Не, бабуля, я – не поп.

– Дык, можа, ты геолагам завешся,
І жыў сярод балотаў ці ў тайзе?
А там, вядома, дзе ж ты пастрыжэшся?
Ён у адказ: – А што цябе грызе?

– Э-э, не стрыжэшся – тут, напэўна, смутак,
І за сабой не сочыш нездарма.
Відаць, што ты сядзеў пятнаццаць сутак?
Ён злосна кінуў: – Села б ты сама!

– Такіх людзей яшчэ не сустракала;
Цябе ж спужацца можна сярод дня.
Ды дзе ж ты так зарос, бядак нядалы,
Мо грыву ты пазычыў у каня?

Дык хто ж ты? Дзесьці бачыла, дый годзе!
Не зразумець: ці д'ябал, ці святы...
Ага, прыпомніла: у нас на агародзе
Ёсць пудзіла – ну, рыхцічак, як ты!

## Я – І БАРАДА МАЯ

Мой узрост за многіх меншы,
З модай я ў нагу іду.
І каб быў за ўсіх маднейшы,
Адпусціў я бараду.

Вось гуляю і шыкую,
Хвацкі выгляд у мяне.
За прычоску ды такую
Будзе гонар мне ці не?

Ды зрабілася жахліва:
Пазнаюць мяне не ўсе.
Хто ж і ведаў – што за дзіва! –
Абыходзяць па крысе.

Як у госці я прыехаў,
Запыталі: – Ты ці не?
А пасля было шмат смеху:
Падмянілі мо мяне?

Неяк скочыў у машыну –
Кашальком адчайна трос.
А шафёр без дай прычыны
У міліцыю падвёз.

Выпусцілі, бо прасіўся,
І са скуры нават лез.
Кажуць: – Хлопча, пагаліся
Ці збягай хутчэй у лес.

Пачалася неяк бойка,
Сам не ведаю, чаму
Нехта крыкнуў: – Стукні лоўка
Барадатаму таму!

А каханая дзяўчына
Мне сказала: – Не прыйду.
Цалавацца немагчыма,
Маладзейшага знайду!

...Я галюся ўжо заўсёды,
Бо адна была нуда.
І ва ўсіх маіх прыгодах
Вінавата барада.



# ЯК Я КІНУЎ ПІЦЬ, КУРЫЦЬ

Піў я часта і бязбожна,
А курыў дык і ўначы.
Бачу: так загнуцца можна.
Як сябе перамагчы?

Я ад слабасці аж млею,
Апаноўваў часам страх:
Не дажыць да юбілею –
Гэта быў бы проста жах.

Ныюць страўнік, ныркі, печань,
Ціск высокі, кашаль б'е.
Як жа мне лячыцца нечым,
Гнаць хваробы прэч свае?

Закадзіравацца трэба,
Ампулы ў сябе зашыць,
Ёсць гіпноз – усё ганебна:
Пад прыгнётам гэтым жыць.

Досыць бэсціцца, даволі –
Да бясконцае пары.
У мяне ж ёсць сіла волі,
І нашто мне дактары!

І пакуль яшчэ не згінуў,
Не сышоў за бедака,
Звычкі згубныя я кінуў...
Першага красавіка.

Не лічыце гэта жартам,
Не падумайце – падман.
Ланцугі парваў я раптам,
І з душы прагнаў дурман,

І развіўся нюх сабачы:
Чую пах "вясёлых" спраў.
Як п'янюг, курцоў убачу,
Дык я б іх пазабіваў!

На здаровых вечна попыт,
Хутка буду сам такі.
Пераймайце ўсе мой вопыт –
І курцы, і п'янюкі.

Ад такой вось перамены
Па жыцці іду смялей.
Спадзяюся, што сустрэну
Стогадовы юбілей!

## АДНОЙЧЫ БЫЎ І Я ЖАНАТЫ

Таварыш мой, пытаеш ты,
Чаму дасюль я халасты.
І я аднойчы жонку меў,
Аб тым вядома толькі мне.

Прыйшлі мы, памятаю, у ЗАГС,
Там запісалі хутка нас.
А жонка – мара, ад такой
З нас кожны страціў бы спакой.

Але як выйшаў за парог,
Я на нагах стаяць не мог.
Апанаваў раптоўна жах,
Пачаў я вянуць на вачах.

Браточкі, што я нарабіў?
Ды я ж, як вецер, вольны быў.
Куды, бывала, захачу,
Туды, як птушка, палячу.

Цяпер ужо не паляціш.
Як кажуць, будзе гладзь і ціш.
Бо звяжа крылы мне сям'я.
Ды кім жа стаў, нарэшце, я?

І як ужо мне зараз быць,
Што з гэтай жонкаю рабіць?
І не змірыцца мне. Чаму ж
Не кавалер я больш, а муж?

Халодны пот мяне прабіў,
Пачаў будзільнік звон.
І я бясконца рады быў,
Што гэта –
толькі сон!



Жыццё –
высокае прызванне.
Што – заляцанне,
і – каханне?
Бушуюць юныя гады.
Пакуль жывы –
ты малады!



*Юбілейная сустрэча. Сёстры Жана і Леаніда, сваячка Рэня. Сяброўка – Жэня. 50-годдзе. Палац культуры МТЗ.*

20 траўня 1990 г.

## МНЕ Б ТАКОГА ЖАНІХА

Вельмі б моцна пакахала
Жаніха такога,
Каб гадоў было не мала
І не вельмі многа.

Не хачу, каб быў прыгожы,
Мне найлепш – высокі.
На руках насіць ён зможа,
Са мной пойдзе ў скокі.

Хай зусім не выпівае,
Будзе сам вясёлы.
За работай паспявае,
А за мною – болей.

І не трэба мне, каб ён
Меў сваю машыну –
Разлучацца на шмат дзён
Не шукаў прычыны.

Каб не быў раўнівы дужа –
Думаю я гэтак.
Каб былі ўсе думкі ў мужа
Пра мяне, пра дзетак.

Хай жыве ў маёй кватэры –
Спакайнейша буду:
Раззлаваўшыся без меры,
Не ўцячэ нікуды.

Вось які мне трэба хлопец,
Возьме – не здзіўлюся.
А як смеласці не хопіць –
Я на ім жанюся!



# ЯК СВАТ БЫЎ ВІНАВАТЫМ

Хоць быў той хлопец у гадах,
Але зусім нясмелы.
Перад дзяўчатамі меў страх,
Нязграбны сам, нягеглы.

Сустрэў аднойчы сябра ён,
І просіць – ледзь не плача:
– Мяне з дзяўчынай пазнаём,
А я табе аддзячу.

...Дзяўчына – цуд, ды ён не сох,
Бо не кахаў спрадвеку.
Ні "бэ", ні "мэ" сказаць не мог,
Ні нават – "кукарэку".

Яе б да сэрца прытуліць –
Так і трымціць дзяўчына.
А ён на зоркі ўсё глядзіць,
І лыпае вачыма.

Дзяўчына марна бавіць час,
Вядома, не хацела.
Была ва ўзросце ўжо якраз,
І замуж ёй карцела.

Гады ёй траціць для чаго,
І ў дзеўках заставацца?
Яна пакінула яго,
А ён пачаў злавацца.

– Пакрыўдзіць я сябе не дам,
Зняважу перад светам!
На таварыскі суд падам,
Хай разбяруць яе там.

А ты знаёміў – толькі б з рук,
Яшчэ назваўся сватам.
...Вось так. Не ўмешвайся, сябрук,
Сам будзеш вінаватым.



## ПЕРАГРУЗІЛІ

Выклікаюць раз Нупрэя,
Прапануюць: – Выручай:
Падмацуй ты, ёсць ідэя,
Таварыства "Ураджай".

– Позна гэтым мне займацца,
Бо на пенсію праз год.
– Нецяжкая гэта праца,
Падтрымай, дзядуля, спорт!

Не забыў ён словы тыя...
– Зноў спатрэбіўся нам ты ж:
У здаровым калектыве
Падтрымай "Чырвоны крыж".

Дзед быў добры па натуры.
– Даручэнне хочам даць:
Нельга помнікі культуры
Без аховы пакідаць.

Тым не скончаны прыгоды:
– Таварыства ёсць яшчэ
Ратаваць людзей на водах,
Уступай, Нупрэй, хутчэй.

– Ды навокал, гляньце, людзі,
Ні ракі, ні ручайка.
– Не бядуй, няма, дык будзе
І канава, і рака.

І пайшло далей: без згоды
Усклалі ўсё на аднаго.
Каб ахоўваў і прыроду,
"Заахвоцілі" яго.

Не хацеў ён гэтай славы,
І на пенсію пайшоў.
Хай спіхаюць тыя справы
На другіх таварышоў.

## УСМЕШКА

Калі запросяць на вяселле
Ці наваселле, юбілей,
То мы, падняўшы чарку зелля,
Дружней гамонім, весялей.

І падарункі мы прыносім,
Сказаўшы многа добрых слоў.
Прыняць са шчырасцю іх просім,
І зычым шчасных шмат гадоў.

Ды не заўжды на густ патрапіш...
Бывае часта так наўдзіў:
І час, і грошы ты патраціш,
Агледзішся – не дагадзіў.

Нашто ўжо падарунак – кветкі!
Вось прынясеш іх цэлы куст,
Але памылішся нярэдка,
Бо зноў жа ў кожнага – свой густ.

Найлепшы падарунак – кніжка,
Яна ўпрыгожыць кожны дом.
Шукаеш цэлы месяц з лішкам,
І вось – прыносіш рэдкі том.

Раман – ого! Любы ацэніць!
Ад радасці сам не астыў.
А юбіляр ці наваселец
Больш паважае... дэтэктыў.

А вось прыношу я з натхненнем
Заўжды патрэбны парасон.
Ды кажуць мне з нездавальненнем:
– Такі ў мяне даўно ёсць ён!

Так што ні купіш – не дагодзіш,
Удзячнасць за усё адна.
Дарэмна грошы пераводзіш...
Няйначай – падавай слана?!

Цяпер, калі іду на госці,
З сабой нічога не бяру.
Каб не пакрыўдзіць там кагосьці,
Усмешку я заўжды дару.



*Вясковае вяселле. Адпачынак на прыродзе. Песні, гульні, танцы.*
*Смех. Нагуляцца ўсім – не грэх!*
*Будзем разам ноч да дня, пагуляем давідна!*

# ВЯДЗЬМАРКА
## (фельетон)

Сонца свеціць, ёсць і хмарка,
Не падобны дзень на дзень.
Жонка ж у мяне – вядзьмарка,
Як спаткаў яе і дзе?

Не адразу распазнаеш,
Будзе радасць ці бяда.
А пасля ўжо ёсць, што маеш,
І грызе цябе нуда.

Цэлы дзень яе шукаю –
Не прыходзіць, знікла дзесь.
А калі ўжо не чакаю –
Раптам – шась, і маю стрэс.

Я з дзвярэй, яна ж – у дзверы,
Сам за дзверы – тут яна.
А пасля шуміць без меры –
Хоць да ночы, давідна.

Абыходжу дом свой бокам,
Каб з сябрамі пасядзець.
Бац – яна бяжыць з падскокам,
Лоб у лоб, не ўпаў я ледзь...

Падымаю з сябрам чарку –
Ціха, жоначкі няма.
Тут ускоквае вядзьмарка –
Хваляваўся нездарма.

Паўгадзіны крыку, шуму –
Не кватэра, а турма.
А пасля – і хто б падумаў –
Закусь падае сама.

Жоначка ў мяне такая –
Ад яе хоць уцякай.
– Уваход забі цвікамі,
І нікога не пускай!

– Хто ў радні ў вас быў вядзьмаркай? -
Сваякоў пытаў не раз.
– Ну, былі, але знахаркі –
Так іх клікалі ў той час.

Чорнай магіі мегера –
Звады, плёткі малаціць.
А зласлівая праз меру –
З рук яе ўсё паляціць.

Развярнуць усё імкнецца,
Што і трэба – кіне прэч.
Да чаго ні дакранецца –
Знікне ў момант тая рэч...

Разбяруся, хоць не шпарка –
Будзе новая сям'я.
Развядуся вось з вядзьмаркай,
І – з нармальнай буду я.



# ДРЭННАЯ СХОВАНКА

**(гумарэска)**

У многіх – ці не ўсіх мужчын
Грашовы прынцып ёсць адзін:
Каб жонцы ўсё не аддаваць,
А на расходы прыхаваць.

Калі ж усё ёй аддасі –
Не спадзявайся, не прасі.
Хоць на каленях доўга стой,
Але рубель не вырвеш свой.

І ведаю даўно ўжо я:
Заначка ў кожнага свая.
Хаваць як хто і дзе прывык:
Хто – пад падкладку ў чаравік,

А нехта ў люстру, на балкон
На захаванне на шмат дзён.
Пасля забыцца можаш ты –
Ад хітрасці і прастаты.

Але ці варта так дурэць?
У люстры можа ўсё згарэць.
У чаравіку ўсё сатрэш,
Бо па грашах сваіх ты прэш.

...А гэты вёў уласны рэй,
Лічыў, што сам – за ўсіх мудрэй.
На грошы схованка была...
Пад крышкай дачнага стала.

...Наскочылі рабаўнікі,
І вынік сумны быў такі:
Забралі ўвесь яго прыкол
І мэблю (з ёй, канешне, стол).

Ад гэтых вось паганых спраў
Ён валасы са злосці рваў.
Не прагуляў жа, не прапіў.
Яго інфаркт ледзь не схапіў.

Калі б ад жонкі не хаваўся,
Дык пры грашах бы заставаўся.

## ПАДАБЕНСТВЫ

Жыў у нас адзін малойчык,
Мы дзівіліся з яго:
Ён па прозвішчу – Іотчык,
Ётчык – родны брат яго.

Сумняваліся нямала,
Бо нам гэта ўсё наўдзіў.
– Можа, маці падгуляла?
Кажуць: – П'яны поп хрысціў.

І яшчэ ёсць двое родных –
Два крутыя берагі.
Дык адзін – Мікола Гроднеў,
Гроднікаў Васіль – другі.

– А чаму – я ў іх пытаю, –
Да таго дайшлі калі?
– Маці ў нас была святая, –
Літары паблыталі.

Вось стаю я на прыпынку.
Побач – трое, ўсе з радні:
Маці, з ёю дзве дзяўчынкі,
Толькі розныя яны.

Расказала, што блізняты,
Гэта – род, а не гульня.
Ды такія вачаняты,
Што не разабраўся я.

І адрозніць быў ахвочы,
Хто – чужы, а хто тут – свой:
У адной – блакітны вочы,
І аж чорныя ў другой.

Запытаў: – Што за праява,
Мо, ад розных мужыкоў?
– Не, звычайная ў нас справа:
Ад сваіх яны бацькоў.

Я, як маці і ўсе продкі,
Ад гульбы далёкая.
Муж з маленства чарнавокі,
Я ж, бач, светлавокая.

Не звярнула ўбок я недзе,
Толькі з мужам дзень пры дні.
Дочачкі – не ад суседзяў,
Добра, што ад нас яны.

Трохі ж розныя, як бачыш,
Ды не ўсім жа растлумачыш.
Сам бы Бог не парашыў,
Хто – грашыў, хто – не грашыў.

## "ПАЗАЙЗДРОСЦІЛІ"

У вёсцы Маня – адзіночка,
Ды не вялікія гады.
Як толькі праміпае ночка –
Выходзіць хлопец малады.

Суседзі пільна назіраюць,
Бо кавалер той – не адзін.
І плёткі розныя збіраюць,
Што характэрна для жанчын.

Назаўтра – тая ж зноў карціна,
І паслязаўтра – тая ж зноў.
Мужчына новы ці хлапчына
Сагнаў дурную ў Мані кроў...

Выходзіць Маня ўранку з хаты,
Пацягваецца – трэск касцей.
– Хіба ж я ў гэтым вінавата,
Што не адбіцца ад гасцей?

Ад стомы я зусім самлела,
Жывога месца ўжо няма.
Так стогне, ные, цісне цела,
Але цярпела нездарма.

– Ды ты ж загульваеш без меры, -
Суседкі кажуць. – Не гудзі.
Цябе заездзяць кавалеры,
Што ноч, то новы. Ну, глядзі!

– Во, бабы! Ім усё здаецца,
Балбочуць толькі дзень пры дні.
Адно здаровае ёсць месца –
Дык пазайздросцілі яны!

## ПРАВУЧЫЎ

### (гумарэска)

Абкрадалі часта дачу,
І цягалі, што было.
Гаспадар рашаў задачу,
Як спыніць такое зло.

Стрэльбы, ведама, не мае,
Не ва ўсіх жа ёсць яна.
І сабаку не трымае –
Не жыве ён там штодня.

Як жа тут абараніцца?
Ды прыдумаў нешта ўсё ж:
– Дам рабаўнікам напіцца,
І каму з нас будзе горш?

У бутэлькі з-пад гарэлкі
Ён наліў дэнатурат.
– Ад гарэлкі розум мелкі,
Кожны злодзей будзе рад.

Тыя хутка завіталі:
– Гаспадар дзесь дома спіць!
Што найлепшае – сабралі,
І паселі дружна піць.

Тры мясцовых беспрацоўных –
Што ж у іх талковага?
Там каналі бессэнсоўна –
І сын участковага.

І ад болю так крычалі,
І стагналі, і раўлі,
Што іх ледзьве адкачалі
І ў прытомнасць прывялі.

Хоць мог быць і суд ганебны –
Для зачэпак мала спраў:
– На рамонтныя патрэбы
Тую хімію я браў.
(Ім у рот не налівай).

І каб я не кукарэкаў,
Буду сам намнога злей.
Знішчу гадаў, недарэкаў –
Развяду на дачы змей!

# БАДЗЁРАСЦЬ САМ САБЕ ШУКАЙ

## (гумарэска)

Птушкафабрыкі бушуюць,
І рэклама ўжо гудзе.
Яйкі вывелі – усе чуюць –
Не было такіх нідзе.

Невялікія такія –
Як арэхі грэцкія.
Ну, вядома ж, не людскія,
З маркай "Маладзецкія".

І з дабаўкаю селена,
Ёд і штось раслінная,
Вітаміны для ўзмацнення –
Новыя і дзіўныя.

Ад хваробаў розных лечаць,
Ліквідуюць шмат прычын.
Сілу нам даюць, дарэчы,
Што выдатна для мужчын.

Думаем, што ўратаванне –
Кожны стане малайцом.
Ужывём пад вечар, з рання –
Для жанчын каб быць байцом.

І ўсе будзем мы, як пеўні,
Аж падскокваць і лятаць.
І штодзень не раз, напэўна,
"Курачак" сваіх таптаць...

Яйкі піў адзін штодзённа,
Многа грошай перавёў.
Ды, як быў, застаўся й сёння,
І купляць не хоча зноў.

Сам са слабасцю не знайся,
Яйкі ж – не адзінае.
На свае лепш спадзявайся,
А не на курыныя.



Рисунок Славы КЛИМЕНКО.

## ЗАМУДРАЯ ЖОНКА

### (гумарэска)

Няўдачы часам лёс дае.
Расповяд пра жанчыну.
Дык абакралі дзесь яе –
У краме ці на рынку.

Сцягнулі з сумкі гаманец,
У ім – нямала грошай.
Пакупкам на той час-канец,
А страта – цяжкай ношай.

– Няхай бяда так не шкрабе, –
Сказаў ёй муж. – Прыдбаеш.
Ёсць адукацыя ў цябе,
І розум добры маеш.

Прыдумай, што рабіць далей,
Каб грошай не губляла.
А злодзеяў лавіць смялей –
Ёсць спосабаў нямала.

Яна кумекала, што як –
Ліквідаваць няўвязку.
Праблему вырашыла так:
Дастала недзе пастку.

У сумцы носіць кожны дзень –
Каб злодзей ухапіўся.
А той праходзіць, нібы цень –
Ніводзін не ўчапіўся.

– Давай прадуктаў купім мы, –
Муж кажа. – Дзе ў нас грошы?
– У сумцы знойдзеш. Сам вазьмі,
Любімы мой, харошы.

У сумку толькі той палез –
Заенчыў, заскуголіў.
Руку як быцам сціснуў прэс –
Нароў так, як ніколі.

Ледзь разам з жонкай расшчапіў
Стальную тую пастку.
Пасля ён цэлы вечар піў,
Каб болю зняць хоць частку.

– Адукаваная мая,
Ледзь свет мне не закрыла.
Разумніца! Як бачу я –
Занадта замудрыла.

Перш, чым тых злодзеяў знішчаць,
Рашыла ты з мяне пачаць.



# ПАПАЎСЯ... НІЗАШТО

## (гумарэска)

І планы ж у сям'і былі –
Рашалі што ёсць сілы.
Нарэшце, шафу набылі –
Сучасную купілі.

За клопатам адным – другі,
Няпросты, нават горкі.
Здабытак гэты – дарагі,
Яму патрэбна зборка.

Работа гэтая самім –
То лішнія дакукі.
Не зробіць муж, не зробіць сын –
У іх не тыя рукі.

Навесці жонка хоча лад,
Абдумала ўсё зранку:
Падвербавала на "падрад"
Ці сябра, ці каханка.

З'явіўся той і ўсё сабраў,
Трамвай жа побач грукаў.
Ад гаспадарчых добрых спраў
Няма ніякіх зрухаў.

Усё развальваецца ўраз,
Збірай нанова мэблю.
Бядак так мучыўся ўвесь час –
Дык колькі шчэ патрэбна?

Апошні раз сабраў, сказаў:
– У шафе пастаю я.
Як вытрымае – добры знак,
Маё ўжо сэрца чуе.

Тут муж у дзверы пазваніў –
Ніяк не мог прамазаць.
У шафы дзверы расчыніў –
Адтуль мужык вылазіць.

Муж да падлогі як прыкут,
І зазлаваў без краю:
– Хто ты, скажы, што робіш тут?
– Трамвая вось чакаю!



Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА.

## НЕ ДА ЖАРТАЎ

Сяджу ў пад'ездзе нашым з дзедам,
Шаноўным і мажным суседам.
Прыгадваем часы былыя,
І языкі у нас не злыя.

Глядзім – шыбуюць вось дзве дамы,
І міма нас праходзяць прама.
Адна старэйшая, другая –
Яшчэ даволі маладая.

Сукенкі чорныя ў абедзьвух,
І чаравічкі – я падглядзеў.
І ў кожнае – бярэма кветак,
Ды ружы – я здзівіўся гэтак!

На лаве супраць нас прыселі,
Спяшаліся – аж упацелі.
Пытаюся: – Дык што, вы – з дачы,
Вам ружы прадаваць – задача?

На ранак лепш было б вам з рання.
– Не, мы ідзем на пахаванне.
Усталі – і ў пад'езд наш крочаць,
Ісці да некага там хочуць.

Сігналяць, ды няма адказу.
Дзед устрывожыўся адразу:
– А хто памёр – мы штось не чулі,
А ведалі б, ды не адчулі.

– Як хто? Жучкоў, усім вядомы.
– Няма такога ў гэтым доме, –
Узняў дзед хутка галаву. –
Я трыццаць год у ім жыву.

Які паверх яго, кватэра?
– Кватэра нумар сорак пяць.
– Дык я ж у ёй жыву, халера!
Вы што, прыйшлі мяне хаваць?

Тут далучыўся я да шуму:
– Не сустракаў такога глуму,
Каб так цярпець мог чалавек.
Ну, гэта, выбачайце, здзек!

Кабеты стогнуць: – Вось дык ліха!
Пусціце, знойдзем мерцвяка.
Зайшлі. За імі – дзед паціху
Ледзь чутна ззаду паскакаў.

Жанчынкі тыя неўзабаве
Імчаць з пад'езду – шлях прамы.
Пытаюся: – У чым жа справа?
– Мы пераблыталі дамы!

Услед за імі дзед нясецца,
Махае кульбай, маты гне.
Пускае пену і трасецца:
– Ламалі дзверы у мяне.

Я не люблю, каб хто мне гадзіў,
Дык вось па спінах іх "пагладзіў".

---

Як быццам недарэчны жарт,
А дзеда ледзь не ўзяў інфаркт.

## НЕ КРЫЎДЗІ БЛІЖНЯГА

**(казка-быль)**

Злавіла рыбку залатую
У рацэ старая неяк раз.
Што з ёй рабіць – яна мяркуе,
А тая свой наводзіць сказ.

– Я – вельмі дробная спажыва.
Прашу цябе – мне волю дай.
А толькі застануся жыва –
Мне тры жаданні загадай.

Бабуля скеміла: – Удача!
Не бачыла такога ў сне.
Прыдумала і тры задачы:
– Зрабі дваранкаю мяне.

Яшчэ – прыгожай, маладою,
Каб пакахацца без пакут.
Каб захапіліся ўсе мною,
Зайздросцілі і там, і тут.

Затым хачу, каб кот мой Вася
Зрабіўся слаўным малайцом,
І каб са мною заляцаўся,
Не пакідаў мой родны дом.

Няма таго назаўтра дома –
Крутнулася зямная вось.
Стаяць выдатныя харомы:
І слугі, коні – ўсё там ёсць.

А гаспадыня – быццам з казкі,
Замілаванне і любоў.
Пяшчотных слоў чакае, ласкі –
Бо маладосць вярнула зноў.

Стаіць малойчык – рукі ў бокі.
Імя – Васіль, як добры знак.
Прыгожы, статны і высокі,
І кажа строга-злосна так:

Твая жальба не хутка пройдзе,
А будзе многа гаркаты
(Замяўкаюць усе каты),
За тое, што ў мінулым годзе
Мяне скастрыравала ты!



## "НАСТАЎНІК"

**(гумарэска)**

Прыехаў ён з вёскі
Да блізкіх сваіх.
Характар меў свойскі,
Душой не прыціх.

Не бачыў іх доўга,
Самота вяла.
Дарога, трывога –
І радасць прыйшла.

Сустрэча, як свята,
І тостаў шмат зноў.
І стол быў багаты,
І многа размоў.

– Жыццё чым мацуеш,
Як справы, сям'я?
Ты дзе, кім працуеш?
– Настаўнік там я!

– Сябе не замучыць, –
Мяркуе радня. –
Бо дзетак жа вучыць
Штогод – дзень да дня.

Радні не задача:
– Ён слаўны – ого!
На працы пабачым
Яго мы ўсяго.

Прыехалі вольна
Яны ў нейкі час...
Вядзе іх не ў школу –
Чамусьці ў калгас.

Імпэт іхні знік –
Той, што быў да пары,
Бо ён – настаўнік…
На жывёльным двары.

Калі не ўпраўляе
Жарэбчык ці бык,
Дык ён падпраўляе,
Каб – шчыльна ўпрытык.

Падумаць лагічна –
Не ганьба, не стрэс,
Бо тэхналагічны
Такі ў іх працэс.

Хоць гонару мала,
Трымае характар.
Прафесію мае –
Асемінатар.

## НЯЎДАЛАЕ РАБАЎНІЦТВА

**(гумарэска)**

Да старога падвалілі
У позні час рабаўнікі.
Пад блатных яны "касілі",
Кулакі, як малаткі.

– Дай "лапатнік" – патрабуюць.
Ён рыдлёўку ім прынёс.
– Кашалёк! – яны бушуюць. –
Хочаш зарабіць у нос?

"Вугалок" цягні нам хутка,
Недарэка ты такі!
Ён прыцёг праз тры мінуткі
Два стальныя вугалькі.

– Здзекуешся з нас, старэча,
Што, нягоднік, прывалок?
Чамадан, што поўны рэчаў –
Вось што значыць “вугалок”.

Аддавай хутчэй “капусту”! –
Зноў настойваюць яны.
– У скляпе маім – не пуста,
Дам чатыры качаны.

– Не шалопае нічога.
“Зелень”, гад, нам даставай!
Ён нясе ім кропу многа:
– Вам прыправы цераз край.

– Ну, мужык, баран дуб – дубам,
Ад яго хоць уцячы.
Мы валюту патрабуем –
Ён нам кідае харчы.

– Мо прынёс бы шчэ цыбулек?
“Бабкі” ўсе, што ёсць, гані!
Ён прыводзіць трох бабулек:
– Не старыя шчэ яны!

– “Камяні” давай, чорт прагны! –
Вымагаюць грозна зноў.
Са двара ён крэкча, цягне
Поўну тачку камянёў.

– Што ты прэш, цяльпук заўзяты?
Не шурупіш – проста жах!
Срэбра, золата, брыльянты –
Што на пальцах і ў вушах.

– Хлопцы, лепш мяне б звязалі,
Вас зусім не зразумеў.
Тое ўсё, пра што казалі,
Не купляў я і не меў.

– Ты па фене не батаеш.
– Што за дзіва, што за рэч?
– Па блатному не матаеш –
Дык ідзі з дарогі прэч!

Блін, прыдурак ты праклятый,
Дарам дойдзем да турмы.
Да разумных і багатых
Лепей пойдзем зараз мы!



## АДПАЧЫНАК НА ТУРБАЗЕ

**(фельетон)**

Папаўнеў я штосьці адразу,
Трэба скінуць лішні груз.
Я падаўся на турбазу –
Даў пуцёўку прафсаюз.

Там харчы – дыета нібы,
Не раскормяць дужа нас:
То катлетка, а то – рыба,
Каша манная штораз.

Як захочаш чым заняцца,
То заўсёды там адно:
Раз ці два на тыдзень – танцы,
Часам – рванае кіно.

Ёсць і сонейка, і мора,
А настрой наш – як калі:
Пырскаў дожджык, як на гора,
Хвалі з нафтаю былі.

Зруснасць, скажам, на здззіўленне:
Пляж – нібыта дзікі пляж.
Толькі галька і каменне,
Як ты зможаш, так і ляж.

Дзён праз колькі – ажыўленне,
Аж гудзе наўкол народ.
Нам паддалі ўраз натхнення,
Мы сабраліся ў паход.

Рэчмяшкі ўзялі за плечы,
Дружна зрушыліся ўсе,
А пасля стаў нехта енчыць
І стамляцца пакрысе.

Паказалася стаянка,
Цягнем дровы не касцёр.
Вельмі слаўная палянка,
Для прывалу тут прастор.

Вось зварылі дамы нашы
Суп такі – не ўзяць у рот,
А яшчэ спалілі кашу –
Падцягнула ўсім жывот.

Хлопцы скемілі, нарэшце,
Згаладалі, як ваўкі:
– Гэй, дзяўчаты, мяса рэжце!
Згатавалі шашлыкі…

Частаваліся з дарогі,
Паглядалі на жанчын.
Заляцанні, жарты, рогат
Па прычыне, без прычын.

А назаўтра – зноў на базу,
Як нічога не было.
Па-ранейшаму адразу
Ціха, сумна ўсё пайшло.

Крыху ўсё ж дайшло да толку:
Скінуў лішнюю вагу,
А цяпер худы настолькі –
Па скачках браць прыз магу.

Зараз водпуск зноў чакаю,
Бо трымаюся ледзь-ледзь.
Санаторый вось шукаю,
Каб хоць трохі папаўнець.



ТУРБАЗА "ВОЗЕРА НАРАЧ", 1971 год.



# НАЕЛАСЯ

## (гумарэска)

Не сумуе без прычыны,
Весялее Ганна зноў,
Хоць няма ў яе мужчыны.
Ёй за пяцьдзесят гадоў.

Ды заўважылі суседзі,
Што таўсцее ўся кругом.
Мо гуляее з некім недзе
Па начах ці светлым днём?

– Ці ты, Ганна, загрубела? –
Запыталіся ў яе.
– Гэта добра я пад'ела,
Мне здароўя Бог дае.

На дражджах нібыта ходзіць.
Потым – дзіва нейкае:
Па двары каляску водзіць –
Там дзіця маленькае.

Жвава рухаецца, порстка,
Паўната дзе дзелася?
І смяялася ўся вёска –
Ганна так аб'елася!

Так ніхто і не дапетрыў,
Дзе і ў чым разгадка ўся:
Ці яе надзьмула ветрам,
Ці хто падлабуніўся?

Кажа: – Хіба дзеці – гора?
Многа часу не міне –
Будзе трое ці пяцёра –
Пазайздросціце вы мне.

Пэўна ж, подзвіг мой не згіне,
Смела йду я на рэкорд.
Стану маці-гераіняй
На дзесятку шостым год!

## ПАШКАДАВАЛА
### (гумарэска)

Захацеў ён загуляць,
Дык прыдумаў свята.
Па сваіх кішэнях – мац!
Грошай небагата.

Колькі трэба ўсё ж нашкроб,
Гужаваў да ночы.
І ад стомы чухаў лоб,
І заплюшчваў вочы.

Дзеля чэрава свайго
Жлукціў – спіну гнула.
Пажаваў – абы чаго,
І яго – прамкнула.

А прачнуўся – ціск упаў,
Сны дурныя бачыў.
І трывожна, мала спаў,
Выгляд жа – сабачы.

Галава – як чыгунок,
Рукі – як вяроўкі.
З ложка ўстаць ніяк не мог,
І пачуцці змоўклі.

Стогне, ные, аж раве:
– Жонка, дай пахмелкі,
Хоць сто грамаў – сэрца рве –
Беленькай гарэлкі.

Тая рыкае: – Ляжы,
Ты, п'янюк пракляты.
Лепш ад выпіўкі бяжы!
Крые мужа матам.

– Надакучыў ты ўжо мне
За ўвесь час нямала.
Муж узяў ды… струпянеў.
"Хуткая" прымчала.

Доктар зведаў, як было.
Кажа ёй сурова:
– Вось наклікала ты зло,
Не знайду і слоў я.

Здзек зрабіла ты нашто,
Лаялася дужа?
Шкодавала грамаў сто –
Страціла ж ты мужа.

Вып'еш гора ты да дна,
І не зыркай строга.
А цяпер вось пі адна,
І шукай другога.

Нельга рэзаць, як нажом.
Хоць і ёсць прычыны.
Навучыцеся ж ужо
Зберагаць мужчыну!



## ДОЛЯ ГУЛЬТАЯ

Ідзе запрашэнне ад бацькі:
– Прыедзь, сынку, сена накосіш.
Пара гаспадаркай заняцца,
І мяса ж кумпяк ладны просіш.

Працуй сам, не будзь дармаедам,
Парэзаць яшчэ трэба дровы.
А той у адказ: – Не прыеду.
Здаецца мне, я нездаровы.

Пісьмо бацька зноў піша ў горад
Далёкаму роднаму сыну:
– Калю парсюка, дык не гора.
Прыедзь і вазьмі свежаніну.

І швайка заточана востра,
І ёсць чым смаліць – калі ласка.
Прыедуць браты твае, сёстры,
І ты паспяшайся, Міхаська.

А вось пісьмо бацьку ад сына:
– Начальнік я, вельмі заняты.
Шмат часу займае й машына,
Я – аўтааматар заўзяты.

Вы ўжо без мяне закаліце,
Са смакам з'ядзім усё ўзімку.
А мне "задні мост" лепш пакіньце,
"Паддон" шчэ – намёк на грудзінку.

Зноў бацька свой ліст піша сыну:
– Даўно парсюка разабралі.
Табе я не многа пакінуў,
У кубел паклаў вельмі мала.

Выкручвацца добры ты майстар,
Ды справу прайграў вось якую!
Ты можаш узяць за гультайства
"Кардан" і "трубу выхлапную".

## АДКУЛЬ БАМЖЫ БЯРУЦЦА

**(фельетон)**

Ідуць па горадзе бамжы,
Бамжыхі разам з імі.
Як іх убачыш, хоць бяжы,
Не стрэцца лепей з імі.

Не мыюцца мо цэлы год,
Адзенне – як са звалкі.
Наўкол стаіць такі смурод,
Брыдуць паходкай валкай.

Кантэйнер смецця тут стаіць –
Выцягваюць што можна.
Прад ім гатовы ўпасці ніц,
Глядзяць наўкол трывожна.

Астаткі ежы, пляшкі там,
Кардон, яшчэ папера.
– Што пагрызу, а нешта здам! –
У іх такая вера.

З “чарнілам” потым баляваць –
Пасля з іх кожны млявы.
А дзе ж, спытайце, начаваць? –
Падвалы і канавы.

Адкуль бярэцца гэта муць –
Шукаць прычыны трэба.
Яны ў капусце не растуць,
Не скіне бусел з неба.

Карэнні, дзе пусціла зло,
Адкуль праблема ўстала?
У кожнага ж было жытло,
Дык як яно прапала?

Гультайства, п'янства і загул –
Даўгі, распіскі, звады.
Кішэнь трасе – там круглы нуль,
Ад кампаньёнаў – здрады.

Гуляў і піў жа не дарма –
Разлічвацца патрэбна.
Кватэры цераз год няма,
Такі фінал ганебны.

На выгляд кожны ледзь жывы,
Бо над сабою здзекі.
Фізічна – не калекі вы,
Духоўныя – калекі.

Як правучыць бамжа таго,
Ды іншых – хто без справы?
Трымайся дома ты свайго,
І працай узбагаць яго –
Не дойдзеш да канавы.



# А ПРЫЧЫМ ПРЫЧОСКА ТУТ?

Вось шуміць, гудзе вяселле,
І ракой ліецца зелле,
І бушуе маладосць,
У настроі кожны госць.

Больш за ўсіх гамоніць лысы,
Невысокі, белабрысы –
Мужычок сярэдніх год,
Хоць вадзі з ім карагод.

Добра чарку выпівае,
І падскоквае, спявае.
І раскажа анекдот –
Аж глядзяць яму ўсе ў рот.

Запыталі ў маладога:
– Дзе, скажы, знайшоў такога?
Ён, напэўна, твой сваяк.
– Невядомы мне дзівак!

І цікавяцца кабеты:
– Дык адкуль жа чыжык гэты?
Пэўна, з боку маладой?
– Не, ніякі мне не свой!..

– Не сусед і не знаёмы,
А гуляе вось, як дома –
Без ніякіх там правоў.
Сам прыйшоў, ці хто прывёў?

Позна.
Змрок над хатай вісне.
Нехта ўбачыў:
лысы цісне
У глыбіні глухой двара
Жоначку... гаспадара.

Той угледзеў, раскумекаў:
– Што ты творыш, недарэка?
Прэч адсюль, бо ўраз прыб'ю
Я за жоначку маю!

Лысы быццам прахапіўся:
– Вой, прабачце, я напіўся,
Пераблытаў з п'янкі штось,
І мая ж тут недзе ёсць.

– Што ж сваю ты не чапаеш,
А чужую спакушаеш?
Лысы конь, будзь разумней!
Ці з чужой табе смачней?

З той пары нярэдка кажуць,
А ў народзе скажуць-звяжуць,
Што ад лысых скрозь – нуда,
Часта нават і бяда.

А жанчын за кошак маюць,
І ліслівы ход трымаюць.
Па характару – каты,
І распушваюць хвасты.

Ёсць адна з даўнейшых версій:
Лысым век ты не даверся.
Навядуць на вочы муць,
Нават жонку адбяруць...

Партыя ж была ў нас піва –
І ніхто не бачыў дзіва.
А як будзе да таго ж
Лысых партыя – не горш.

Самай масаваю будзе,
Стануць перці валам людзі.
Можа лысіна з'яднаць,
Валасатым – не здагнаць!

Валасатыя ж – усе,
Быццам бы ва ўсёй красе.
А вось лысыя – ў крэдыт,
Лысых – проста дэфіцыт!



## "ПРЭМІЯ" ЗА СКВАПНАСЦЬ

**(гумарэска)**

Прайшла падпіска на газету,
І вынік падвялі пры гэтым.
За вернасць доўгую газеце
Дзед сельскі конкурс выйграў дзесьці.

Загадчыца вясковай пошты
Уручыць павінна – ды не грошы:
Электрачайнік – прыз быў важны,
Дзед заслужыў яго адважна.

Яна ж прысвоіла пацiху:
Стары не ўведае – не ліха.
І раскашуецца, шыкуе:
Вось адхапіла рэч такую!

А ў дзеда – тры сыны і ўнукі,
А ім без чайніка – дакукі,
Бо чай гатуюць як папала,
А прэмія як бы прапала.




Цягнулася нядоўга свята,
Скандалаў ёй было багата.
Цяпер ужо зусім не рада:
За прагнасць – выгналі з пасады.

Які ні быў бы ты начальнік –
Не адбірай ні хлеб, ні чайнік.
Ад сквапных думак адрачыся.
Чужым жа – лёгка апячыся.

## ПА САКРЭТУ ЎСЯМУ СВЕТУ

Дзве сустрэліся сяброўкі –
Ёсць павага і любоў.
Кажа з іх адна: – Не войкай,
Падзялюся я з табой.

Ёсць раман з мужчынам вартым,
Муж не ведае аб тым.
Я ж маўчу пра тое ўпарта –
Мне нашто агонь і дым?

Я ад цяжкасцей не рада.
Можаш мне дапамагчы?
– Чым, скажы мне? – Хоць парадай.
Тая кажа: – Што ж, маўчы.

– Дзякуй. Толькі не расказвай
Ты нікому мой сакрэт,
Бо разваліцца адразу
Ўся сям'я, шмат будзе бед.

Зберагчы сям'ю хачу я,
Разбярэмся самі мы.
За маўчанне заплачу я:
Падарунак вось вазьмі.

Узяла. Пасля прыходзіць –
Мо праз тыдзень ці праз два.
Сумна гаману заводзіць:
– Ачмурэла галава.

У мяне ёсць свой вірунак,
Не трымаю я мяжу.
Забірай свой падарунак,
Бо ўсё роўна раскажу.



## ПРАПАНОВА І АДМОВА

– Мо жаніх для вас патрэбны?
Ёсць такія сябрукі:
Курыць, п'е – ну вось які.
Тая: – Гэта мне ганебна:
Дома ёсць ужо такі.
Што пайшлі за мужыкі!

## БАБУЛЬКА Ў АЎТОБУСЕ

– Куды спяшаюцца так людзі?
Сядзелі б дома – лепш было б.
У гэтай таўкатні і гудзе
Не выцерці ад поту лоб.
І напіраюць злева, справа,
Аж галава баліць мая.
Спяшаю я – другая справа:
Да сына ў госці еду я.

## ЯК СПОРТ УРАТАВАЎ

**(гумарэска)**

Шахматыст Барыс выдатны –
Майстар спорту, чэмпіён.
І да чарачкі быў здатны,
Выпіваў нярэдка ён.

Ды аднойчы так набраўся –
Бачыць неба перастаў.
І дадому не дабраўся –
Выцвярэзнік домам стаў.

А дзяжурны там пытае:
– Па прафесіі вы хто?
– Шахматыст. – Хвальба пустая,
Не паверу нізашто.

Сам я ў шахматы гуляю,
Тут фігуры, дошка ёсць.
Выйграю – вам заяўляю,
Вы ў мяне – жаданы госць.

– Не хваліцеся праз меру! –
Загарэўся і Барыс.
Сам я зараз вас праверу,
Нос апусціце вы ўніз.

...Прагулялі ноч заўзята,
Стаў дзяжурны носам рыць.
Атрымаў дзесятак матаў,
І пачаў сам матам крыць.

А Барыса ўсё ж дадому
Ён у "варанку" падвёз.
Па-братэрску, не па-злому
За плячо і рукі трос.

– Слухай ты мае парады,
І завітвай, як дамоў.
Буду я заўсёды рады –
Трэніроўкі будуць зноў!

## УСЁ – НААДВАРОТ

Спыталі ў хлопца, што сядзеў ля плоту:
– Ці многа сёння ты зрабіў работы?
І вельмі неахвотна той азваўся:
– Я – састарэў, а дзед заленаваўся.

# ДЗІВАК

## (студэнцкае даўніпняе)

Мы не забыліся яго.
Жыў з намі хлопец дзіўны:
Мы ўсе кахалі – хто каго,
Ён пазбягаў дзяўчыны.

Таўсты, нязграбны, як мядзведзь,
Насаты, непрыгожы.
Павольна рухаўся ледзь-ледзь,
Што ж недарэка можа?

Ў кіно займаў ён кожны раз
У заднім радзе месца.
Прасіў, здаралася, у нас
Даць сала – хлеб даесці.

Бывала, грошай нестае,
Дык браў дзеля блізіру
Адну катлетку, да яе –
Тры порцыі гарніру.

І, хоць амаль мужчынам быў,
Цукеркі еў без меркі.
"Спорт" незвычайны ён любіў –
Цыгаркі
гэтай маркі.

Свяціўся розумам, аднак,
Што мы не заўважалі.
Перамагаў і так, і сяк
Жыццёвыя скрыжалі.

Хоць пацяшаліся ўвесь час
Над ім мы ўсе нямала,
Дзяўчына лепшая не нас –
Яго ўсё ж пакахала.

Яму пашчасціла найбольш –
Пакінуў нас "з насамі".
Былі ў той час, відаць, усё ж
Мы дзівакамі самі.





## НАВАГОДНІ "ЖАРТ"

### (гумарэска)

Ужо Новы год падступае да нас.
Бакалы падымем усе ў хуткі час.
Сяброў, сваякоў прыйдзе цэлая раць.
А ёлкі няма – не паспеў шчэ дастаць.

Іду цераз парк, і прыспешваю крок.
А з ёлкай ля сцежкі стаіць мужычок.
Трымае рукой за вярхушку яе,
І кажа, што ёлачку ён прадае.

– А колькі каштуе? – Дзесятку ўсяго.
Ну, што ж, я з гатоўнасцю ўзяў у яго.
Мільгнулі, гляджу, за нагою нага,
Паціснуў уперад шпарчэй як мага.

А свята такое бывае не часта.
Дамоў прынясу навагодняе шчасце.
Няхай жа святочна агнямі цвіце.
Хачу на плячо ўзяць, дык ёлка ж… расце.

Тут я разгубіўся: абжуліў дзялок!
Як раптам з'явіўся, імгненна і ўцёк.
І кляў моцна шэльму таго недарма:
І грошы прапалі, і ёлкі няма.

Але ад свайго я ўсё ж не адступіў,
І ёлку пасля на базары купіў.
А той прайдзісвет правучыў мяне так –
Навука для дурняў і для разявак.



## ПРА ЦЕШЧУ

### (гумарэска)

У кампаніі вясёлай
Гамана цячэ, бяжыць.
Ды адзін, на выгляд кволы,
Мовіць: – Як, браткі, мне жыць?

Так абставіны прыперлі,
Што не да вясёлых спраў.
Цешча ж у мяне памерла,
Я нядаўна пахаваў.

Думкі розныя пры гэтым:
Ці то радасць, ці праклён.
Зразумеў адзін адметна:
– Хрэн з ёй, з цешчай! – кажа ён.

А другі сказаў: – Я чую,
Што з сябе ты скінуў здзек.
Ад душы цябе віншую!
Ты шчаслівы чалавек.

Трэці кажа: – Добра, дрэнна,
А якой яна была?
Праклінаць яе дарэмна,
Не ўчыняла, можа, зла?

Даў чацвёрты ўсім параду:
– З цешчай навядзеш масты –
Дык і жонка будзе рада,
З ёю ладзіць будзеш ты.

Любяць хай цябе абедзьве,
Бо не дзенешся нідзе ж,
А інакш дзве будуць ведзьмы,
Сярод іх сам прападзеш.

Згода ў хаце, мір і ласка,
Жонка, цешча – проста рай,
Дзеці разам – ну, як казка,
І на лёс не наракай.



Малюнак Святланы РЫЖЫКАВАЙ.

# ПРАПІЎСЯ

## (фельетон)

Ён пайшоў у двор аднойчы,
Пад вяровачкай штаны.
Чысціню навесці хоча,
Выбівае дываны.

Мужычок падскочыў нейкі:
– Дзе, скажы, тут магазін?
Трэба пляшкі дзве гарэлкі –
П’ю з табою, не адзін.

– Гастраном ёсць недалёка,
Усяго дамы праз тры.
– Не, лепш ты схадзі падскокам.
Грошы дам, ідзі, бяры!

Мне ж усё тут незнаёма.
– А хто будзе выбіваць!
– Ну, як хто? Ды я, вядома.
Прыйдзеш – будзем выпіваць.

Ён схадзіў. Вярнуўся жвава,
А таго прастыў і след.
Што за цуд, што за праява?
Перад ім закрыўся свет.

Запытаўся у суседзяў,
Што гулялі там без спраў:
– Можа, нехта з вас угледзеў,
Дзе дзяцюк, што выбіваў?

– Ты папаўся, чалавеча,
Нарабіў табе ён зла.
Дываны ўзваліў на плечы,
І машынка падышла.

Мы і скеміць не паспелі.
Азірайся сам, не спі.
Абмішуліў, чорт, умела –
Са слязьмі гарэлку пі...

Дома – грозная гамонка,
Моцна грызліся яны.
Плакала, стагнала жонка,
"Плакалі" і дываны.

Часта ёсць такая з'ява:
Бокам вылезе халява.



Малюнак Аркадзя ГУРСКАГА.

## МАЕ ВУСЫ
### (гумарэска)

Даўні сябар мне сустрэўся,
Прыглядзеўся да мяне.
І здзівіўся, і сумеўся:
– Вусы трэба, а ці не?

І сказаў даволі строга:
– Ты пакуль што не стары.
Не выдурвайся, нябога,
Прычакай свае пары...

А ў мяне – мае жаданні,
Густ даўно я маю свой.
А як ёсць пераканнні,
На шляху маім не стой.

Выгляд маю хвацкі, моцны,
Вусы ёсць пры ўсім маім.
Падабаюцца і жонцы,
І суседачкам усім.

Пагляджу ў чароўны вочкі,
І гусарам быць хачу.
Ці то шыйку, ці то шчочкі
Вусамі паказычу.

Ну, а сябар націскае:
– Слухай, ты ж яшчэ не дзед.
Вось праблема, ды якая!
Пагаліся, выйдзі ў свет.

Не спрачайся, хлопец, дужа,
Пражывеш ты без прыгод.
Выглядаць жа будзеш, дружа,
Маладзей на дзесяць год.

Што, без вусаў будзе цяжка?
Зразумей выгоду сам:
Грошай дам табе на пляшку,
І прытым – на закусь дам.

Я развважыў: ён – не злыдзень,
А імкліва час цячэ.
Адгадую я праз тыдзень
Вусы лепшыя яшчэ.

---

Хто бязвусы, хто – вусаты,
З барадой, без барады,
Жартаўлівы, змрачнаваты –
Не наводзіў бы нуды!

Светлы – вочы, светлы – вусы,
Мы – такія, беларусы.
А калі скляпаем жарты,
Мала хто нас будзе варты.

# ПРА МУЖОЎ І ЖОНАК

## (фельстон)

“Накачаўшыся” праз меру,
У пад’езд ледзь увайшоў.
У суседнюю кватэру
Звоніць моцна, як дамоў.

Адчыніў той, стаў здзіўляцца:
– Што так позна лезеш ты?
– Як чаго? Хачу кахацца –
Аж ад стомы, нематы.

– Як, з маёй каханай жонкай?
Не шукай сабе прыгод!
Адказаў ён гучна, звонка:
– З ёй жыву ўжо дваццаць год.

– Ну, сабака, злодзей, шэльма,
Здзекавацца захацеў?
Сдануў сусед, ды вельмі –
Дурань з лесвіцы зляцеў.

Прыволокшыся дахаты,
Жонку ўбачыў – што казаць?
– Дзе ты быў, гад сукаваты,
Мо цябе мне павязаць?

– Пераблытаў нешта дзверы...
– Не, усё наадварот.
Ды і хто б табе паверыў,
Памаўзлівы чортаў кот?

Ты зблудзіць заўсёды рады,
Што спадніца – то гульба.
Дагуляўся аж да здрады,
Пра сям’ю б хоць зрэдку дбаў!

– У суседа і суседкі
Загудзеў. Хацеў гуляць.
– Не шукай сабе лепш сведкаў.
Атрымай пад дых. Не гадзь!

Ты не муж мне, а драпежнік.
Правучу я сёння вас.
І яна схапіла венік,
Да суседзяў бегма ўраз.

– Пэўна, мой у вас напіўся,
Вельмі ж рада я таму!
...Муж за жонку заступіўся –
Перапала і яму.

– Ты – лапух, яна ж гуляе
З недарэкам вось маім.
Кожны фігу атрымае,
Пакажу я вам траім!

Бойкі там было нямала –
Так перасварыліся!
Жонкі – валасы парвалі,
Мужыкі ж – змірыліся.



# СПОВЕДЗЬ П'ЯНТОСА

## (гумрэска)

Ён стаіць, каб здаць шклотару,
І расповед свой вядзе:
– Не глядзіце вы на твар мой,
Шмат такіх ёсць дзе-нідзе.

Нас сабралася ж учора
Трое – ўсе мы сябрукі.
З "недапою" кожны хворы,
Выгляд, бачыце – які.

Нашкраблі рублёў патрохі,
Трос кішэнь і я, бядак.
Нехта выцягнуў з панчохі
У роднай жонкі, хто – дзе як.

Ды сабралася нямала –
На дванаццаць пляшак ёсць.
Столькі "Фаустаў" прыдбалі!
І з душы прапала млосць.

Дружна сёрбалі, са смакам,
З дробнай закуссю былі.
Насцябаліся, сабакі,
І дадому паплылі.

Вось і я дахаты крочу.
Азірнуўся незнарок –
Тры бульдозеры грукочуць,
І зганяюць снег набок.

Не паспеў адскочыць жвава –
Падчапіў каўшом адзін,
Ды адкінуў да канавы –
Я зваліўся, быццам блін.

А дадаў другі бульдозер,
Ён далей шчэ шыбануў.
Я амаль што на дарозе
Ў снезе брудным патануў.

Трэці ж дык зусім засыпаў,
І мяне як бы няма.
Я дадому мірна клыпаў –
Ледзь не згінуў сам дарма.

Тут міліцыя – вось трасца:
Пройдуць міма, а ці не?
Там тырчыць нага чыясьці –
Дружна выцяглі ... мяне.

Хоць маглі і прычапіцца,
Толк які займацца ім?
Дык завезлі ж у бальніцу –
У рэанімацыю.

Ну, а там, хоць і шукалі,
Ды ўрачоў жа не знайшлі.
Можа, тыя загулялі,
Ці ў адгулы ўсе пайшлі?

Што рабіць са мной, нарэшце,
З гэтакімі справамі?
Дык знайшлі яны мне месца –
У труперню сплавілі.

...Я ляжу, як лёд, халодны –
Голы, нешта мацаю.
Пада мною стол бетонны,
Сам зубамі клацаю.

Выбірацца мне патрэбна,
Я на волю – аж пішчу.
Бо загіну тут ганебна,
На той свет шчэ не хачу.

І разгледзеў са здзіўленнем
На сцяне ўсё да драбніц:
Там вісіць маё адзенне,
І абутак мой стаіць.

Апрануўся я, абуўся,
На хаду знімаю стрэс.
І на волі апынуўся –
Праз акенца ледзь пралез.

– Ну, дык што, п'янюк праклятьі,
Рады хоць, што не памёр?
Пэўна, ты пабег дахаты?
– Не, на краму я папёр!




## КАРА... ЗА ПАЦАЛУНАК

### (гумарэска)

Прабіваюць нас пачуцці,
Ці то жартам, ці ўсур'ёз.
Часта можам мы адчуць іх
Ці са смехам, ці да слёз.

...У аддзеле Бора Рахман
На дзесятку сёмым год.
Сам вясёлы, не рахманы,
І не ведае нягод.

Аляксндра ёсць Пятроўна,
У маім яна бюро.
Вельмі дыхае няроўна,
Хітраватае нутро.

Падгуляць жаданне мае,
А кабета пекная.
Выгляд строгі ўсё ж трымае,
Быццам незачэпная.

Ну, а я – такі падкольшчык,
Ад прыроды жартаўнік.
Крытыкую – не падпольшчык,
Быць сур'ёзным не прывык.

І кажу цішком Барысу:
– Нашу Шуру пацалуй,
Ды пры ўсіх зрабіць бярыся,
Будзе пляшка – ты танцуй!

У яе ён цмокнуў шчочку,
Быццам нават неўпрыкмет,
Як маленькая прымочка –
Не застаўся нават след.

Цалаваў яе б ён моцна –
Хоць бы ў вусны, ды ўзасос...
Не зрабілася ёй млосна,
Да таго ён не дарос.

Ды мяне адразу выдаў:
– Бачыш, я пацалаваў,
Лішні клопат хоць надыбаў,
Дык бяры і пляшку стаў!

Прыкрасцей было мне многа,
Апынуўся я на дне,
Не сказаўшы анічога,
Премію знялі з мяне.

Бо яна забушавала:
Падбухторшчык – я, маўляў.
Пацярпела, ледзь стрывала,
Гонар у яе ж упаў.

Хто, падумаў, гонар мае?
Ашалелі там яны.
Ці яна была дурная,
Ці начальнік быў дурны?





## БРЫДКАСЛОЎЕ

**(фельетон)**

Будаўнік, сусед Валодзя –
Голас гучны, як трамбон.
Ды з культураю не ў згодзе,
У яго ёсць свой жаргон.

Мацяршчыннік ён заўзяты.
Сказ прамовіць – там шэсць слоў,
Дык з іх пяць – заўсёды маты,
Так працягвае і зноў.

Запытаўся я аднойчы:
– Ты – вядомы кіраўнік.
Як гаворыш ты з рабочым,
Слоў запас прыемных знік?

А ў цябе – сваё начальства,
Як жа ты гамоніш з ім?
– Дык яны ж гнуць маты часта,
Лічаць жа мяне сваім.

– Бескультурны ты свядома,
Грубіяніш і крычыш.
Як жа размаўляеш дома,
Можа, ціхі там, як мыш?

– Ну, – адказвае, – ты скажаш,
Дома нельга так рабіць.
Словы брыдкія як звяжаш –
Можа ўся сям'я пабіць.

На будоўлі ж як трымацца?
Не забуду аднаго:
Як не ўмееш мацюкацца –
Не прызнаюць за свайго.



Думаў я: вось ты – мужчына.
Бескультур'я ў чым сакрэт?
Не ў прафесіі прычына –
Выхавання дрэнны след.

Каб не ўпаў зусім ты долу –
Мо цябе паслаць бы ў школу,
Можа, у дзіцячы сад?
Ці падвучаць там?
Наўрад!

## ХАТНІЯ ПРЫГОДЫ

### (гумарэска)

Круг сяброў у іх не вузкі –
Ад суседзяў і ад спраў.
І адэкалон французкі
Нехта ім падараваў.

Жонка хваліць і як ахне:
– Лепшага нам не знайсці.
Ён выдатна гэтак пахне –
Цэлы месяц не прайсці.

І паставіла бутэльку
На стале на самы край.
Муж зірнуў пасля: – Гарэлка!
Добра вып'ю – вось дык рай!

Не пабачыў, што ў каробцы,
А схапіў – адпала дно.
Захапіла дух малойцы –
На падлозе ўсё відно.

Як прыбраць сляды злачынства –
Будзе шум і будзе гвалт.
А для жонкі – гэта свінства.
І ці пройдзе ўсё? Наўрад.

Выцер ён катом падлогу,
Шмараваў туды-сюды,
Не было каб звягі многа,
І ад жоначкі – бяды.

Моцны пах знікаў патрошкі,
Мяўкаў кот да нематы,
Да яго не йшлі ўжо кошкі,
Абягалі і каты.

Так і мышкі пазбягалі,
Пацукоў няма даўно.
Паўцякалі ўсе з падвала,
Іх і следу не відно.

Кот і мышы сыдуць самі –
Невялікае там зло.
Ды каб вывесці духамі –
Вельмі дорага было.



## ПРЫГОДЫ ДАЧНІКА
### (гумарэска)

Дачу ў прыгарадзе маю:
Ёсць гарод, шмат яблынь, груш.
Для работы там трымаю
Саламяны капялюш.

Дачу ўлетку рамантую,
Парыць – хоць ты лезь пад душ.
І ад спёкі тут ратуе
Саламяны капялюш.

Паглядзець узімку дачу
Просіць жонка: – З’ездзі, муж!
І задаў тады задачу
Саламяны капялюш.

З’ездзіў я і зноў дахаты,
Шлях няблізкі, дык пайду ж.
Замест шапкі зухавата
Начапіў свой капялюш.

Тут віхура, холад дзікі,
Не было шчэ гэткіх сцюж.
Каб згарэў ты разам з дзіркай,
Саламяны капялюш!

Хутка ўжо чыгунка будзе,
Дык варочацца чаму ж?
Ды калі ж убачаць людзі,
Прасмяюць мой капялюш.

Скінуць нельга з той прычыны –
Лысы, змерзну, дый нядуж.
Так стаяў я з паўгадзіны,
Праклінаў свой капялюш.

Што ж, вярнуўся, бо нялоўка
Галаву студзіць сваю ж,
І ад злосці ўзяў рыдлёўку,
Закапаў свой капялюш.



## НАШТО МНЕ РАЙ!

Па жыцці адчайна крочыш,
А пасля глядзіш – і край.
І пара заплюшчыць вочы.
Каб спытаў хто сярод ночы:
– Ці ты ў рай, ці ў пекла хочаш?
Я б сказаў: – Нашто мне рай?

Жыў я проста, небагата,
І было не часта свята,
Толькі шмат надзённых спраў.
Сябраваў і часам біўся,
І не часта я маліўся,
Чарку браў, жанчын кахаў.

Жыў не свята, не бязбожна,
І не краў, а браў, што можна –
Хто ж адкіне ад сябе?
На людзей не зыркаў строга,
Не пакрыўдзіў сам нікога,
А звярут біў па ілбе.

Дык хіба ж у рай мне можна,
Хоць туды імкнецца кожны?
Грэшнік я, як ні глядзі.
Дык і што рабіць там буду?
Звычкі ўсе свае забуду:
Нюхай кветачкі, сядзі.

Ну, а ў пекле проста вельмі:
Папякуся на патэльні,
Пасяджу крыху ў смале.
Адыду пасля ад болю,
І сябе я задаволю,
Звычкі ўспомню ўсе свае.

Каб было не вельмі цяжка,
Адшукаю недзе пляшку.
Чэрці скажуць: – Во, жыве!
Патанцую і прысвісну –
Дзесьці грэшніцу прыцісну –
Прасвятлее ў галаве.

Дык прыкінь, магутны Божа:
Награшыў я многа, можа.
Заслужыў, дык пакарай.
А жыву я так, як людзі.
На тым свеце – будзь, што будзе!
Пры жыцці мне дайце рай.

# ЭПІГРАМЫ – ШЧЫРА, ПРАМА

## СЯБРУ ГАДОЎ МАЛАДЫХ – ВАЛЯНЦІНУ БАРЫСЕВІЧУ



*Літаратары – хлопцы-трактаразаводцы Валянцін Барысевіч і Мікола Вяршынін.*

Папрацуе, пагужуе,
Сэрца стук майго пачуе.
Не парвецца дружбы ніць,
Як гукну – дык прыляціць.

Ён пісаў спачатку вершы –
Творчы той этап быў першы.
Шмат начэй амаль не спаў,
І аповесць жа скляпаў –
А часопіс друкаваў.

І ён мае свой характар,
На людзей не прэ, як трактар.
Разумее кожнага –
Беднага, заможнага.

Працаваць здаўна прывык,
І ва ўсім – перадавік.
І нідзе не прападзе,
Бо –
    ў Вярхоўным ён судзе.

## СМЕЛЫ РЭДАКТАР

Уладзімір Саламаха
"ВОЖЫКА" падняў з размахам.
Хоць тырчаць з яго іголкі,
"ВОЖЫК" для яго – не колкі.
Не баіцца ён ніколькі,
Пэўна, будзе многа толку.
Змог за працу моцна ўзяцца –
Хай нягоднікі баяцца!

## АНАТОЛЬ КАЗЛОЎ

Сам – разважлівы, спакойны,
Па жыцці – заўжды прыстойны.
Размаўляць прыемна з ім,
Ён вядзе уперад "ЛіМ".

Многа гонару не мае.
Тых, хто здольны – падтрымае.
Праўду прама ў вочы скажа,
А бяздарны – не "падмажа".

## МІКОЛА ШАБОВІЧ

Ён – выкладчык, перакладчык,
І вядомы шчэ дакладчык.
Сам мажны, шыракатвары,
Для дзяўчат, жанчынак – мара.

Лірыку шмат піша дзён,
Эпіграмаў майстар ён.
І пародыі яшчэ –
Кожная – шчыпіць, пячэ.

## КАСТУСЬ ЖУК

У яго свая рэакцыя:
– Што мне бегаць у рэдакцыі?
Апісаў у кнігах многае,
Дык нашто пішу другое я?

Ці сталею, маладзею я,
Свежаю жыву надзеяю.
А як стукнуць тэмы новыя –
Завастру пяро сваё зноў я.

## ВАЛЕРЫ АЛІСЕВІЧ

Душой – інтэлігент, цяпер – рабочы,
Да творчасці – заўсёды быў ахвочы.
І на жыццё не закрывае вочы,
А крытыкне, што дрэнна – двойчы, тройчы.

## ЯЎГЕН ХВАЛЕЙ

Па жыцці ідзі смялей,
Жэнька, будзь ты весялей,
І наперад кроч прамей,
Ад няўдачы не хмялей,
Ты ж на тое – і Хвалей.
Не журыся, не хваліся,
Не бушуй і век не біся,
Чарку прымеш – не напіся.
Хоць – Хвалей, табе ўсё можна,
Жыць – не свята, не бязбожна.

## СЯРГЕЙ КІШКО

Ён ідзе надзейна ў творчасць,
Завадчанін, там – вытворчасць.
З лірыкай ужо спазнаўся,
І з сатырай зачапляўся.
(З моладдзю раней займаўся).

Як пісьменнік – малады.
Вострыць ён пяро заўжды.
Крытыку маю прымае,
І харчамі падтрымае
(Сувязь з вёскаю ён мае).

А мая ўся прапанова –
Каб пісаць ўсё нанова.
Мы гаворым прынцыпова:
Рыфма, рытм, адметна-слова,
Каб было ўсё адмыслова.

Вершы, песні і гітара,
Думак ветрык, а не хмара.
Стаць паэтам добрым – мара.
Дача, жонка, тры сыны –
Дык натхняюць і яны.

## БУНТО НІКОЛІ НЕ БУНТУЕ

Часопіс жаночы "Алеся"
Не пройдзе ніхто, нізашто.
Сустрэне нас там і прывеціць
ТАМАРА ПЯТРОЎНА БУНТО.

Салідная важная дама,
А выгляд – як кроў з малаком,
Гаворыць і шчыра, і прама,
І жарты ўжыве часцяком.

Для нас і сяброўка, і маці,
Не маюць значэння гады.
І ведаем, як з ёй трымацца,
Хоць з нас хто стары, малады.

Трымаецца годна на працы,
Цудоўную мае сям'ю.
І многа чым можа займацца,
Вядзе гаспадарку сваю.

І аўтараў пыме лагодна.
Што можна – ухваліць у друк.
Звычайна з ёй аўтары згодны,
Адчуюць цяпло яе рук.

І аўтаркі ўсе паважаюць,
І аўтары любяць яе.
Бо ўвагі, павагі ўсе маюць,
Настрою ж усім паддае.

Ласкавай усмешкай праводзіць,
Ніколі не будзе крутой.
Такая яна ўся ў народзе –
ТАМАРА ПЯТРОЎНА БУНТО!

## ВАСІЛЬ МАКАРЭВІЧ

Моцна піша ён радкі,
А радкі – як кулакі.
Сам дасць дыхту шмат каму,
А яны – дадуць яму.
І нікога не баіцца,
І спакой яму не сніцца,
І гатоў за творчасць біцца.
Не ўвядзе нікога ў зман.
У яго – свой творчы план.
Мо – напіша і раман?

## АНАТОЛЬ ЖАЛЯЗОЎСКІ

Анатоль вось Жалязоўскі –
Ён не хітры і не коўзкі,
Па жыцці сам – просты, свойскі.
І Літфондам кіраваў,
І ў Саюзе меў шмат спраў.
Быў – намесік старшыні,
І заўжды – на вышыні.
І празаік, і паэт,
Чытачам раскрые свет.
Пра сябе пакіне след.

## УЛАДЗІМІР ПРАВАСУД

Правасуд прынес на суд
Байкі, што найноўшыя.
І да праўды ён прыкут,
Ёсць знаходкі творчыя.
І раскрые ўсім жыццё,
Сам не пойдзе ў забыццё.
Слова трапнае нам скажа,
А як скажа – дык як звяжа.

## СКАРГА ЖОНКІ

– У якім ты быў напрамку?
– Ды пісаў вось эпіграмку.
І задумаў байку зноў,
Шмат знайшоў патрэбных слоў.
– Ну, да вечара ад ранку –
Толькі байкі, эпіграмкі.
І калі ўсё праміне?
Аж забыўся пра мяне!



# САТЫРЫЧНЫЯ ПАЭМЫ

## ДАЧА, ДАЧА – ВОСЬ НЯЎДАЧА!

### (сатырычная паэма)

Надакучыла басцяцца,
Дарагія і харчы.
Захацеў за дачу ўзяцца –
Крызіс свой перамагчы.

Інжынер сказаў знаёмы:
– Ты, мой сябар, мне павер,
Што я ўсё павінен дома
Мець, калі я – інжынер.

Не хачу я дачы сёння,
Хоць інфляцыя грызе.
Ходзіць дачнік твой, як сонны,
І працуе ў баразне.

У мяне свая ёсць ноша:
Думак рой, пяро скрыпіць.
Мне хапіць павінна грошай,
Каб я мог усё купіць.

...Што ж, мой сябар думку мае,
Ён, магчыма, і правы.
Ну, а я свой курс трымаю,
Раз на дачу ёсць правы.

Мне далі пятнаццаць сотак –
Не лянуйся, а працуй.
Можна цэлы мець маёнтак –
Засявай, збірай і жуй.

Ды нялёгкая ўсё ж справа –
Электрычкі не відаць.
Дык бяжыць аўтобус жвава
Кіламетраў сорак пяць.

Мой участак скрозь тарфяны –
Вельмі лёгенька капаць.
І не трэба гной паганы
Там гадоў, напэўна, пяць.

Адшукаў, прыгнаў я трактар –
Трэба ж пырнік заараць.
А пасля і культыватар
Стаў бур'ян той выдзіраць.

Вось засеяў я паўполя,
Усё, што мог, там пасадзіў.
І зрабіць не здолеў болей,
Ураджай чакаў наўздзіў.

Мой участак ля канавы –
Быццам добра, ёсць вада.
Толькі схілы злева, справа.
Зверху шчэ – адна бяда.

Я падняў сцёк у канаву,
Нанасіў яшчэ зямлі,
Каб прыродныя праявы
Змыць зямлю там не змаглі.

Ды надзея не збылася,
Не адбыўся светлы рай,
Бо зусім стаіць вада ўся,
Вымакае і ўраджай.

І ўзяла сваё стыхія,
Бо прарваў мой сцёк паток.
Торф змывае, гліну мые,
Застаецца што – пясок.

Падлічыў я страты груба,
Простым рсчыркам пяра:
Пасадзіў мяхі два бульбы,
А сабраў жа – паўвядра.

У стручку – зярно фасолі,
А рэдыс – пайшоў у ствол.
Памідор мой рос паволі,
Агурок упаў на дол.

Памідораў – дзесяць недзе
Я сабраў – што да пары.
Лепшыя ж – znялі суседзі,
"Дбайныя" гаспадары.

Мой гурок і не падняўся,
Гэтак, як і буракі.
Не дала пладоў зямля ўся,
Лёс быў дачніка такі.

Лёс няўдалы і суровы,
Зразумеў пасля я ўжо.
А капусту ўсю каровы
Пазгрызалі, як нажом.

Зарасло маё ўсё поле –
Не пасевы, а падман.
Хоць нярэдка жонка поле,
Падымаецца бур'ян.

А культурныя расліны
Мы акучвалі не раз.
Пладаносіць бы павінны,
А раслі ледзь-ледзь у нас.

Ставіць там хацеў хаціну –
Гаспадаркі дробнай штаб.
У тарфяніку б загінуў,
Бо халупа паплыла б.

Памяняць хацеў участак,
Шмат разоў аб тым прасіў.
Прапаноўвалі мне часта,
Ды не лепшае зусім.

Ці такое ж вось балота,
Ці каменную зямлю.
Вымакае, сохне потым,
Ці не ўбіцца. Што зраблю?

Транспарт – цяжкасці такія,
Што падумаць нават – страх:
На вакзале нас пакіне.
Браць білет – ну, проста жах.

А паездка, дык падзея:
Добра, што хоць завязе.
І ніколі не сядзеў я,
На адной стаяў назе.

Бо аўтобус той маленькі,
Як найменьшы гарадскі.
І людзей улезе жменька –
Дзеці, дачнікі, бацькі.

Шлях назад, і зноў не сесці,
А прыватнік не бярэ.
А як вырашыць падвезці,
То тры скуры ён здзярэ.

Тут нам не да адпачынку,
Так цярпеў не я адзін,
Прастаяўшы на прыпынку
Тры, чатыры, пяць гадзін.

Шмат было сумненняў потым,
А падумаю ўначы –
Прабівае раптам потам.
Як ад жудасці ўцячы?

А кабета мне сказала:
– Так шкадую я мужчын!
Ды ўсяго ім, бачыш, мала,
Так і гінуць без прычын.

Бо на дачах паміраюць,
Там прыходзяць ім канцы.
А пасля ўсё забіраюць
Новыя мужы-ўдаўцы...

Можна здохнуць ад работы,
Лаемся цішком і ўслых.
Бо няма ад той турботы
Выхадных і прахадных.

Можа, дача тых мацуе,
Дзе магутная сям'я.
А ў мяне-то хто працуе?
Толькі жоначка і я.

І расходаў вельмі многа
Не хацелася мець мне б:
Дрэўцы, пляшкі і дарога,
Хатку стаў, рабі і склеп.

І не маю я машыны,
Так прыцісне – хоць крычы.
Ураджай жа з той прычыны
Хоць на спіне валачы.

Што не вырасла нічога –
Гэта можна святкаваць.
А каб вырасла, ды многа –
Як прывезці, захаваць?

Як няма, ці ёсць, ды мала –
У кватэры пакладу.
Ну, а так – няма падвала,
Без яго я прападу.

...Проста вырашыў задачы –
Над сабой навошта здзек?
І адмовіўся ад дачы –
Зноў я вольны чалавек!

Не найлепшае ўсё ж выйсце,
Каб ад радасці скакаць.
Што ад голаду карысці?
Я пачну апілкі грызці –
Дошкі буду выпускаць.



## ДАРОГА НА ПАРНАС

**(сатырычная паэма на літаратурныя тэмы)**

Пісаць даўно я налаўчыўся,
Каб думкі перадаць магчы.
Заўжды ў старэйшых я вучыўся,
А маладзейшых сам вучыў.

Затым, нарэшце, выйшла кніжка,
І спаў з душы нялёгкі груз.
Мне раілі без перадышкі
Адразу ціснуць у Саюз.

Ды сціпласць вось была такая –
Заела, хоць не варта "спаць".
Другую кніжку прычакаю –
З дзьвюма надзейней уступаць.

Рэкамендацыі ў тым часе
Хто захацеў – давалі мне.
І першую – на радасць – класік,
За што тады я гонар меў.

А чалавек – цудоўны, шчыры.
Прасіў яго я – не сакрэт.
Бо ён – мой бацька па сатыры,
Ў літаратуры ён – мой дзед.

А там раздумалі: – Глядзі ты,
Падскочыў вашай галавы.
Эге, ды ён занадта спрытны,
Нашто палез да Крапівы?

Другі – быў парадыст вядомы,
Рэкамендацыю мне даў.
– Ты загубіў сябе свядома! –
Пасля знаёмы прыгадаў.

– Сябе падсек пад корань чыста,
Запамятай на іншы раз.
А дзе хто любіць парадыстаў?
Ды ён усіх аблаяў нас!

Стары паэт славуты – трэці,
Хто падтрымаў мяне тады.
Сказаў мне: – Май жа на прыкмеце,
Хто варагуе з кім заўжды.

Вось гэты з тым даўно не ладзіць,
Той – у камісіі даўно.
Дык ён табе й яму падгадзіць,
Абое ляжаце на дно...

Не прабіваўся я штосілы,
А друкаваўся – вось і ўсё.
Мяне тады ж і "пракацілі" –
Мне не хапіла галасоў...

Пісаў, не апукаўся ніжай,
Ды мэта не была бліжэй.
Чым болей выдаваў я кніжак,
Тым уступаць было цяжэй.

Так хоць і кінь тут па баку ўсё,
Для іншых гэта – проста здзек.
Хоць лоб разбі – пішы, друкуйся,
Але не ўступіш ты павек.

Вось так жыву па-за Саюзам,
І не сумую вельмі я.
Ды хоць служу аддана Музам,
Цяжэй бывае мне ўдвая.

Той піша прымітыўна, проста,
Але яму адкрыты свет,
Бо лічаць, што вышэйшы ростам,
Бо мае членскі ён білет.

Вось выступім – ён гонар мае,
Хоць што чытае – проста дрэнь.
Ды значна болей атрымае,
Таму што член, а я – не член.

А класік мне сказаў лагодна:
– Ісці нялёгка па жыцці.
Шмат кніжак – гэта ўжо не модна,
Без кніжак шмат лягчэй прайсці.

Пасля падборкі больш-менш ладнай,
Ці калектыўны зборнік ёсць –
Глядзяць часцей за ўсё спагадна,
І важкае заўважаць штосьць.

Лягчэй за ўсё прабіцца "шэрым",
І безаблічным лёгка там.
Не будзь жа баявым без меры,
І не друкуйся часта сам.

Таленавітых жа – не любяць,
Бо шмат каму ты – канкурэнт.
Зайздроснікі цябе загубяць
І знішчаць, разаб'юць ушчэнт.

А “шэрыя” не скажуць гучна,
Яны дзе трэба – там лізнуць.
Іх падтрымаць заўсёды зручна,
Іх вастраслоўя не пачуць.

Сатырык вечна дасць заяўку,
Ды фокус выкіне – ого!
Мо на каго калісь ты гаўкнуў,
Ці, можа, гаўкнеш на каго.

Рэкамендацыі ў “вялікіх”
Ты лепш ніколі не бяры.
Прасі ў “сярэдніх” і бязлікіх,
Каб сам не грымнуўся з гары.

Ствары сабе ты лепей лобі –
Цябе ілбамі хай праб’юць.
Для іх жа гэта – проста хобі,
Як быццам чарку каўтануць.

...Між тым хачу сказаць вам шчыра –
Даўно заўважыў, балазе:
Не той конь – гумар і сатыра,
Што да Парнаса давязе.

Літаратурных бюракратаў
Ніяк не мог я абысці.
Мо буду год праз сто прыняты,
Аднак жа лепей –
пры жыцці.

1990 г.






– Каб мой Пегас не быў худы.

# НАША ІСЛАЧ – РОДНЫ ДОМ
## (іранічная паэма на калялітаратурныя тэмы)

Водпуск – радасная з'ява.
Трэба весці ўлік грашам.
Часу нашага праява –
На курорт не з'ездзіць нам.

Так сціскае рэчаіснасць –
Эканоміць праз гады.
Дык дом творчасці ёсць "Іслач" –
Нас прытуліць ён заўжды.

Гаспадар там – Жалязоўскі,
І Лысуха – гаспадар.
А працуюць па-геройску,
Каб быў дом, як божы дар.

Ціхаплынная рачулка
Агінае мудры лес.
У пакоях спаць не мулка,
А спакой знімае стрэс.

Мы – сябры, заўсёды ў згодзе,
Літаратары ў гурме.
Адпачынак свой праводзім
У нясумнай гамане.

Паўлаў – мудры і паважны,
Ды між тым у дошку свой.
Не сказаць, што вельмі важны,
Проста – хлопец з галавой.

Ён тэорыю такую
Смела нам прапанаваў:
– Памяркоўна я мяркую:
Не загніцеся ад спраў.

Дні са тры – за чарку ўзяцца,
Так, каб носам не дзяўбаць.
Адпачыць затым, ўзняцца
І пра творчасць рупна дбаць.

Гэтак знімеце напругу,
Што было са мной не раз.
І працуйце без натугі,
Водпуск – гэта вольны час.

Сам гульбу кідае першы –
Ці праз тры, ці менеі дзён.
А пасля кляпае вершы,
Карэктуры правіць ён.

Старшыня Васіль Зуёнак
Не спускае Ваську з рук.
Хоць даўно малы з пялёнак,
Што ты зробіш – родны ўнук.

У сталоўку хадзяць разам,
Паасобку ж – не з рукі.
Як паснедаюць – адразу
Ў лес шыбуюць грыбнікі.

Што хацелася б зазначыць,
Васька больш збярэ, чым дзед,
Бо маленькі – лепш убачыць,
Не паспее дзед услед.

І Нічыпар тут Пашкевіч
Па пуцёўцы сярод нас.
Ходзіць справа, ходзіць злева,
Ды па-свойму бавіць час.

І шчыруе ён бясконца.
Не паспіць – бяжыць у лес.
Хоць яшчэ не ўстала сонца –
У гушчар ужо залез.

Кілаграмамі цягае
Найсмачнейшыя грыбы.
Ад таго здабытак мае –
Эканомія нібы.

Надыходзіць сіні ранак,
І прачнецца толькі свет –
Ён забыўся на сняданак,
І забыўся на абед.

А пасля, як можа, цягне,
Тых грыбоў мяшок у Менск.
Не багацця ж, пэўна, прагне –
Гаспадарка мае сэнс.

Ды замучыла нудота
Ад напружання таго.
Неяк трапіў у балота –
Ледзьве выбраўся з яго.

Макарэвіч Вася з намі,
Ды забыўся, як назло:
– Будзьце мне, браткі, сябрамі!
Сёння дзень які, чысло?

Хто казаў, што ён працуе,
Хто сцвярджаў, што п'е каньяк.
– Не, здароўе, бач, мацуе,
Проста – піша многа так.

Як апоўнач, так апоўдзень
З рук не выпусціць пяра.
У пакой яго як зойдзеш –
На стале папер гара.

Доўга думалі і ўсе мы,
Чым заняўся ён, васпан.
Можа, ўзяўся за паэму,
Ці шкрабе сабе раман.

Над радком упарта б'ецца,
І чыя ж у тым віна?
Мо ад працы хістанецца,
А, магчыма, ад віна.

І ў абед на гэтай пашы,
Як ніколі і нідзе,
Акадэмік з ім Івашын
Шчыра гутарку вядзе.

А Івашын – ён не першы,
Не апошні, як відно.
Кашу есць і піша вершы,
І ўспаміны заадно.

Хваліцца прытым, як другу,
Што пяро ў яго – не лом.
Можа, выдасць саматугам
З лепшых твораў першы том.

П'юць гарбату, цэдзяць каву –
Маладзей за маладых.
Падружыліся наславу –
Не разліць вадою іх.

А Скарынкін без дакукі
Ўсім пускае ў вочы дым.
На дзяўчат паклаўшы рукі,
Нешта ціха шэпча ім.

Не адмовіцца ад зелля,
Бы яму – усюды дом.
Нават трапіў на вяселле –
Стаў амаль гаспадаром.

Браніслаў Спрынчан – вясёлы,
Хоць і чарку не бярэ.
Толькі ўсё ж даволі кволы,
Кажа: – Чарка рот дзярэ!

Ён у вершах досыць хвацкі,
Лінія ў яго адна.
На вясёлыя заняткі
Не спакусім Спрынчана.

А затое любіць есці –
Налівае суп гарой.
Гушча ўверх прэ – не пранесці –
Ёсць тады ў яго настрой.

Вось Грахоўскі, ён – старэча,
Восемдзесят тры гады.
Кажа ўсё, аднак, дарэчы,
І пры памяці заўжды.

Так бы нам зусім трымацца,
Гнаць хваробы са двара.
Не самлеў ад доўгай працы,
Помніць Леніна, цара.

І расповяд на гадзіны
З маладзейшымі вядзе.
Слухаць мы яго павінны,
Што было, і як, і дзе.

Не па звестках і анкетах –
Сам раскажа нам ужо,
На якіх бываў банкетах
На Радзіме, за мяжой.

А нарады і паездкі
Не мінаў ніяк, нідзе.
Чалавек магутны гэткі,
Ведаў слаўных шмат людзей.

Крытык жа Іван Кудраўцаў –
Чалавек – ні даць, ні ўзяць.
Картаў ён вялікі знаўца,
Цяжка майстра абгуляць.

Не адцягнеш і за вушы:
Карты лепей за віно.
Козыр сёння – непітушчы,
Кінуў Бахуса даўно.

Аж свярбіць гуляць у карты,
Прагне вечна аднаго.
Ды няма, бадай што, вартых
Для кампаніі яго.

Мо Нічыпару праставіць,
У гульню каб уцягнуць?
Толькі той не гне паставы,
Кажа: – Гэта – каламуць!

– Можа, скажаш, не гуляў ты?
– Я гуляў да трыццаці.
– Ты такі гультаяваты?
– Сам у карты малаці!

Да мяне ішоў, нарэшце,
Гвалціў часам на гульню.
Дурняў дваццаць даў мне дзесьці,
Дзесяць – я вярнуў яму.

У дыскусіях штодня ўсё
Капыловіч тут Іван.
Так палітыкай заняўся:
Што ёсць праўда, што – падман.

З Паўлавым нямала спрэчак,
Не згаджаецца ніяк.
Хоць дарэчы, недарэчы,
Нагаворыцца ж усмак.

Сам я ставіўся з любоўю
Да грыбных ды іншых спраў.
Ды ў зялёны кут з мальбою
З сябрукоў ніхто не браў.

Можа, думалі, што лесу
Там не хопіць нам на ўсіх.
На руках, на словах, неслі,
Не адпрэчваліся ўслых.

Ну, а ўранку ўсе ўцякалі,
Я ж адзін у лес ішоў.
Можа, болей нахапалі?
Не, сваё я ўсё знайшоў.

Павяла з сабой дзяўчына –
Думаў, поспех будзе ў нас.
Толькі збегла без прычыны,
І блудзіў я доўгі час.

Быць нядобра мяккацелым.
Як даверыўся я ёй?
Спакусіць, няйнакш, хацела,
Ды падвёў мяне спакой.

Выбягалі зранку з дому
Грыбнікі на ўсе бакі.
Браць стараліся, вядома,
Лепш за ўсё – баравікі.

Спадзяваліся дарэмна,
Што пусты мой будзе кош.
Я шукаў грыбы нядрэмна,
І збіраў заўсёды больш.

Кожны з іх участкі лесу
Ведаў добра і даўно.
Без разбору лесу лез я –
Дзе грыбоў і не відно.

Ды паказвалі мне шапкі
І ўставалі на ўвесь рост,
Быццам Ванькі і Агапкі –
Адчувае іх мой нос...

Рэчка – быццам ледзяная,
Бо крынічная яна.
Мала хто ахвоту мае
Дакрануцца там да дна.

Глыбіня – ледзь па калена,
А да горла – мала дзе.
Загараюць людзі ленна,
Плаваць жа ніхто не йдзе.

Толькі Паўлаў плаваў смела,
І ныраў, як быццам морж.
Так вады хацела цела!
Млець, пацець – намнога горш.

Я мужчынам быць павінен.
І з разбегу ў рэчку – скок!
Пакупаўся ў канцы жніўня,
Дый у верасні – разок.

Мы пад дрэвам адшукалі
Шасцярых сабачанят.
З Паўлавым ім ежу клалі,
Кожны быў бязмежна рад.

Чорны, белы, шэры, руды –
Колеры з усіх бакоў.
Вось, глядзі, прыроды цуды:
Ад шасці, відаць, бацькоў...

Хто з сабою ўзяў запасы –
Ўвечары не сумаваў.
Час не цінуў цяжкім прасам,
Адпачнём ад важных спраў!

І сяброўскіх шмат гамонак
Там цякло, нібы рака –
Пра паэзію і жонак –
Зразумееш дружбака.

Гаспадарчы двор прыцягваў,
Мы туды йшлі без прынук,
І як хто хацеў працягу –
Рэстаранчык быў "Тук-тук".

Ён усе працуе суткі –
Той маленькі магазін.
Абслугоўвалі нас хутка,
Хоць работнік быў адзін.

Ды не трацілі рублёвак
На пакупкі ўсе дзяды.
Ні гарэлкі, ні настоек,
Ні напояў, ні вады.

І казалі: – Грошай мала.
Дзеці, ўнукі смокчуць з нас.
Прапануеш, дык стагналі:
– Лясне пенсія ўся ўраз!..

Што ж, без шуму і без трэску
Я ўкладу ва ўсё душу.
Байку склаў і гумарэску,
Фельетон шчэ напішу.

...Так мы тут адпачываем,
І працуем, і жывём.
Пульс няблага адчуваем,
Здаравеем з кожным днём.

Дом наш на пявевах часу
І ў арэнду аддаём.
А падумаеш сам-насам:
Як інакш мы пражывём?

---

Наша "Іслач" – родны дом!

1995 г.



## ПАСТСКРЫПТУМ

Такі ўдалы надарыўся час – між летам і восенню. І такія розныя, цікавыя людзі – што рэдка бывае – пры ўсіх натхненнях і захапленнях, пры ўсіх выдатнасцях і недахопах, што нельга не напісаць мяккую іранічную паэму аб творцах – і пра іх, і пра сябе.

Усміхнемся і раздумаем разам!

## ЯК ЛЯЧЫЎСЯ Ў БРУЙСКУ Я

**(сатырычная паэма на санаторныя тэмы)**

**Мастацкае і дакументальнае**

Я хвароб нажыў нямала:
Печань, страўнік, сэрца грук.
І мяне накіравалі
Ў санаторый – горад Бруйск.

А было рэкламы многа:
Санаторый – лепш няма!
Хоць далёкая дарога,
Вас жа лечаць задарма.

Па шляху ж удзень прыезду
Я прастуду падхапіў.
Быў мужык – стаў як бы дзедам,
Барабанам кашаль біў.

Пехатой ішоў я ў поце
Кіламетраў, можа, пяць.
Перасохла надта ў роце,
Стаў мароз і вецер браць.

Паглядаў я сумна ў неба,
І ад сумак спіну гнуў,
Каб не мець ні ў чым патрэбы.
Лез са скуры і цягнуў.

Мог бы я пад'ехаць хутка
Без дарожных кепскіх спраў.
Ёсць аўтобус і маршрутка –
Мне ж ніхто не падказаў...

На выгоды, як звычайна,
Спадзяваўся я дарма:
Тэлевізара і ванны,
Халадзільніка няма.

Не хацеў ніхто сяліцца
У адзін са мной пакой:
Я – туберкулёзнік быццам,
Каб не рушыў іх спакой...

А дыягназ іх прывычны
Я даўно ўжо зразумеў.
Пішуць мне: "Бранхіт хранічны",
Хоць я й простага не меў.

Узяліся там за справу:
– Нам прастуда – пшык адзін!
Колюць злева, колюць справа,
Як каню, пеніцылін. –

З ранку самага да ночы –
Аж чатыры мне разы,
Шмат таблетак – лезуць вочы,
І трох відаў, я ж – адзін.

І настолькі накалолі,
Што я сесці ўжо не мог.
І сказаў тады: – Даволі,
Бо ўжо хутка прыме Бог.

А далей – гарчэй здаецца,
Разумею ж – не тупы:
На маім на мяккім месцы
Павылазілі струпы.

Нехта кажа: – Гладзь бутэлькай,
Што з пластмасы – і з вадой.
Не, падумаў, гэта мелка,
На сваіх патрэбах стой!

Зноўку новыя нягоды,
Як хваробу пакараць?
І квадратнай сеткай ёдам
Сталі зад мой націраць.

Энергічна лечаць, моцна,
Дык яшчэ я больш уліп:
Ад далоняў і ад локцяў
Павыскокваў моцны сып.

Алергічнае – прызналі,
Ды метода ў іх свая:
Гэтак захімізавалі –
Іскрамі страляю я.

І стаў млявы, а не свежы,
Дзе ўжо той адрэналін?
Бо не бралі, як належыць,
Пробу на пеніцылін.

Алергіі век не ведаў –
Дык лячэннем давялі.
Так працягваліся беды,
Сып жа выгнаць не маглі.

Хоць што ўрач – па-свойму майстар,
Лінію сваю ён гне...
У гарадскі скурвендыспансер
Тут жа сплавілі мяне.

– Ты, вядома, не калека –
Грэх такім цябе лячыць.
Хай дадуць, што трэба, лекі –
Будзем мы пасля лячыць...

Еду. Каб туды дабрацца –
Не ад радасць ж скакаць.
І саромлюся пытацца,
Як дыспансер адшукаць.

Сам сабе заўжды я – крытык,
Сорам хай мяне міне:
Мо палічаць – сіфілітык,
Разбягуцца ад мяне.

Ну, знайшоў, зайшоў, аж плакаў.
Як свайго, змаглі прыняць.
– Не, – кажу, – я не гуляка,
Памажыце сып прагнаць.

Прыпісалі мне таблетак,
Нейкую яшчэ там мазь.
З імі я вярнуўся гэтак,
Можа, будзе толк якраз?

Пасадзілі на дыету –
Цяжкі крыж ядзьбы нясеш:
Нельга есці тое, гэта,
Цытрусавых вось не еш.

З чым прыехаў, з чым застаўся –
Зразумець так цяжка мне.
І ад ветру ўжо хістаўся –
Змарнаваўся і схуднеў.

Маладыя і бабулі
Мчаць на танцы, як аўто.
Што мне тыя гулі-булі,
Танцы-шманцы мне нашто?

...Да канца прыйшла пуцёўка,
Падлячыўся я ледзь-ледзь.
Пры растанні доктар войкаў:
– Як прыцісне, дык прыедзь!

А навошта мне такое –
Думка сумная мая.
Бо лячыў зусім не тое,
Для чаго прыехаў я.

Падлячылі – назаўсёды (?!),
Да хвароб, аднак, прыліп.
Як прыехаў –дык прыгоды:
Зноў жа выскачыў той сып...

Намаркоціўся даволі,
Клопатаў меў цэлы воз,
Бо набыў хваробаў болей,
Чым туды я іх прывёз.



# ЧАМУ АБРАЎ Я ГЭТЫ ЖАНР

Я пра жыццё разгаварыўся,
Дык раскажу ўсё дачыста.
Чаму, спытайце, гумарыст я,
Чаму сатырыкам я стаў?

Прамы характарам я ўдаўся,
І думак не хаваў, таму
Я шмат каму не падабаўся,
І падабаўся шмат каму.

Калі ў "Пражэктар камсамольскі"
Накіравалі, то штодзень
На хітрых, прагных, злых і коўзкіх
Наводзіў крытыкі прамень.

Калі па тэхніцы бяспекі
Я інжынерам працаваў,
За парушэнні і агрэхі
Нікому спуску не даваў.

Я быў дзетдомавец, рабочы,
Студэнт і звыш трох год салдат.
Глядзець і ўсё казаць у вочы
Мяне выхоўваў інтэрнат.

Які ж абраць мне жанр, я думаў,
Характар паказаць увесь?
І палюбіў сатыру, гумар
За сацыяльны іхні сэнс.

Было б куды прыемней кветкі
На ніве лірыкі ірваць.
Ды сустракалі дрэнь нярэдка –
Камусьці трэба ж ваяваць

Супроць праяў былога часу,
Якімі хтосьці даражыць,
І найнавейшых выкрутасаў,
Што нам перашкаджаюць жыць.

Сатыра – жанр найбаявейшы,
А гумар трэба ж удвая.
Таму лічу: у гэтым вершы –
Праграма творчасці мая.





# МЕМУАРЫ

## (пісьменніцкія жартачкі)



# ЗУСІМ СУР'ЁЗНА – І ДАКУМЕНТАЛЬНА

## РЭКАМЕНДАЦЫЯ

Я, Атраховіч Кандрат Кандратавіч /Кандрат Крапіва/, член Саюза пісьменнікаў з 1934 года, членскі білет №4031, ведаю Міколу Вяршыніна па яго зборніках сатырычных вершаў "Без віны вінаватыя" і "Не сышліся характарамі", а таксама па іншых творах , што друкваліся ў часопісах і газетах. Апублікавана яшчэ не так многа, але і ў гэтым дастаткова яскрава праявіліся асаблівасці таленту маладога паэта-сатырыка: здольнасць прыкмячаць у жыцці і ў людзях ненармальнае і несумненнае, бязглуздае і ўродлівае – усё тое, што не адпавядае нормам паводзін савецкіх людзей у грамадскім і асабістым жыцці. Да ўсяго гэтага аўтар выказвае свае непрымірымыя адносіны ў сваіх байках , вершаваных фельетонах, эпіграмах, гумарэсках.

Мікола Вяршынін працуе інжынерам на трактарным заводзе, штодзённа знаходзіцца ў шматтысячным працоўным калектыве, сустракаецца з многімі людзьмі, мае магчымасць назіраць за імі ў розных жыццёвых сітуацыях, што знаходзіць адлюстраванне ў яго творчасці. Апроч таго, ён кіруе на заводзе літаратурным аб'яднаннем, актыўна ўдзельнічае ў яго рабоце, дапамагае выяўленню новых талентаў.

Я рэкамендую прыняць Міколу Вяршыніна ў члены Саюза пісьменнікаў, маючы асновы спадзявацца, што ён стане сапраўдным майстрам абранага ім жанру.

*К. Крапіва,*
*віцэ-прэзідэнт Акадэміі Навук БССР.*
*09.11.1977 г.*

## *РЭКАМЕНДАЦЫЯ*

Вяршыніну Мікалаю Пятровічу для ўступлення ў Саюз пісьменнікаў СССР ад члена Саюза пісьменнікаў СССР з 1950 года ВАЛАСЕВІЧА Эдуарда, членскі білет № 12046.

Вяршынін М.П. нарадзіўся 20 мая 1940 года ў г. Чэрвені Мінскай вобласці. Бацькі загінулі ў пачатку вайны, выхоўваўся ў дзіцячым доме. Служыў у пагранвойсках. Скончыў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум, Белдзяржуніверсітэт і універсітэт марксізму-ленінізму. Працаваў рабочым на Мінскім падшыпнікавым заводзе, інжынерам на гэтым заводзе, старшым інжынерам на Мінскім трактарным. Зараз – вядучы інжынер навукова-вытворчага аб'яднання "Прагрэс".

Друкавацца пачаў у 1964 годзе у рэспубліканскіх газетах і часопісах, а раней – у армейскіх і заводскіх газетах, у 1972 годзе ў выдавецтве "Беларусь" выйшаў першы зборнік сатырычных і гумарычтычных вершаў пад назвай "Без віны вінаватыя". У 1977 годзе выдавецтва "Мастпацкая літаратура" выпусціла ў свет другую кніжку – "Не сышліся характарамі". У 1981 годзе ў серыі "Бібліятэчка "Вожыка" выйшаў трэці зборнік – "Дагуляўся". І ў 1982 годзе выдавецтвам "Мастацкая літаратура" была выпушсана чацвёртая кніжка – "Нашто мне жаніцця".

Усе зборнікі рэцэнзаваліся на рэспубліканскім узроўні: першы зборнік – па рэспубліканскаму радыё, у газетах і часопісах, астатнія тры – на старонках газеты "Літаратура і мастацтва" і многіх іншых: "Мінская праўда", "Вячэрні Мінск", "Звязда" і г.д. Рэцэнзіі былі станоўчыя.

Апрача таго, творы аўтара увайшлі ў 11 калектыўных зборнікаў. Сярод іх – універсітэцкія кніжкі, "Дні паэзіі", зборнік з серыі "Библиотечка "Крокодила" і кніжкі сатырычнай прозы.

М. Вяршынін выступаў з публікацыямі за межамі рэспублікі: не аднойчы – у часопісе "Перець", а таксама ў газетах "Ніва", "Брянский рабочий", "Брянский комсомолец", у Ленінградскай газеце "Нева", у "Мордовском сатирическом журнале". Яго творы рэгулярна друкуюцца ў беларускіх часопісах і газетах.

Трэба сказаць, што гумарыстычныя і сатырычныя вершы М. Вяршыніна, яго мініяцюры, каламбуры і эпіграмы карыста-

юцца шырокай вядомасцю, яны дасціпныя, вострыя, па-сапраўднаму смешныя і актуальныя.

З кожным годам расце майстэрства маладога сатырыка-гумарыста, пашыраецца поле дзейнасці, множыцца пералік тэм, закранутых аўтарам.

Варта дадаць, што Мікола Вяршынін з'яўляецца нязменным кіраўніком літаб'яднання "Полымя" пры Мінскім трактарным заводзе. Ён сам дапамагае пачаткоўцам, рыхтуе для газет і часопісаў падборкі іх твораў і такім чынам садзейнічае агульнаму літаратурнаму працэсу.

Вечны неспакой, творчы пошук, штодзённая вучоба ў класікаў сатыры: Крылова, Крапівы, Міхалкова – вось што характэрна для М. Вяршыніна.

Рэкамендуючы прыняць у Саюз пісьменнікаў СССР Вяршыніна Міколу Пятровіча, я ўпэўнены, што раблю добрую справу, даючы ход маладому сатырычнаму таленту, які так патрэбны нашай літаратуры.

*Эдуард Валасевіч*
*4.03.1983 г.*

## РЭКАМЕНДАЦЫЯ

Я, Навуменка Іван Якаўлевіч, член Саюза пісьменнікаў СССР з 1957 года, членскі білет № 12184, рэкамендую ў члены Саюза пісьменнікаў Вяршыніна Мікалая Пятровіча.

Мікола Вяршынін – здольны паэт, сатырык і гумарыст. На старонках газет, сатырычнага часопіса "Вожык", у іншых выданнях яго вершы друкуюцца гадоў дваццаць. І не толькі вершы. Мікола Вяршынін зарэкамендаваў сябе майстрам сатырычнага жанру наогул. Ён выступае з фельетонамі, гумарэскамі, гумарыстычнымі мініяцюрамі, каламбурамі, эпіграмамі.

На працягу апошніх адзінаццаці гадоў Мікола Вяршынін выдаў чатыры зборнікі сваіх твораў: зборнікі "Без віны вінаватыя" (1972 г.), "Не сышліся характарамі" (1977 г.), "Дагуляўся" (1981 г.), "Нашто мне жаніцца" (1981 г.). Названыя зборнікі атрымалі ўвогуле станоўчую ацэнку ў перыядычным друку. Усё гэта гаворыць аб тым, што Мікола Вяршынін не выпадковы

чалавек у цяжкім, адказным жанры сатыры, а, значыць, і ў літаратуры.

Рэкамендую Мікалая Пятровіча Вяршыніна ў члены Саюза пісьменнікаў БССР.

*І.Я. Навуменка,*
*член СП СССР і БССР з 1957 г., чл. білет №12184,*
*акадэмік.*
*14.10.1983 г.*

## Творческий автограф

# ПЕГАС ВОЗНЕС ВЕРШИНИНА НА ВЕРШИНУ

**Бібліяграфічная рэдкасць**
**Першая кніга паэта Міколы ВЯРШЫНІНА**
**"БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ"**

Добраму сябру і журналісту Янку Сухарукаву ад аўтара з пажаданнем вялікіх жыццёвых і творчых удач.

*М.Вяршынін,*
*29 мая 1972 г.*

Потом были другие дарственные надписи моего доброго друга Николая Вершинина на новых своих книгах. Но все первое в жизни, недаром говорят, самое памятное.

До дебюта издательства «Беларусь» да ещё солидным для новичка тиражом – 3500 экземпляров Н. Вершинин печатался в республиканских газетах и журналах. Перечитываю предисловие:

"У першую кніжку паэт уключыў лепшыя свае гумарыстычныя і сатырычныя вершы, байкі, гумарэскі, мініяцюры. У іх трапна і дасціпна высмейваецца надахопы і заганы, якія яшчэ бытуюць сярод канкрэтных людзей".

Кто ж этот автор , который почти три десятилетия тому назад входит в большую литературу? Из биографии, помещённой в той книжке:

“Мікола Вяршынін нарадзіўся 20 мая 1940 года у горадзе Чэрвені Мінскай вобласці. Бацькі яго загінулі ў пачатку вайны. Выхоўваўся ў дзіцячым доме.Скончыў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум і гістарычны факультэт БДУ імя У.І.Леніна.”

Далее перечислятся сухая анкета: служил в пограничных войсках, работал на Минском подшипниковом и тракторном заводах. Добавим: в дальнейшем трудился на других столичных предприятиях.

Он, бывало, частенько приезжал и на ММВЗ по линии внешней кооперации и непременно заглядывал в редакцию «МОТОВЕЛО» с новыми литературными вещами. Помогал в организации работы заводского литобъединения.

Разъездная деятельность /разумеется, наряду с природным талантом/ служила только на пользу самобытного творчества Н.Вершинина: бывая во множестве мест по делам сугубо служебным, он знакомится с разными людьми и ситуациями в трудовых коллективах, словом, подсматривал характерные типажи и интересные темы для сочинения тех самых юмористических и сатирических стихотворений, басен и миниатюр.

В этом жанре, который любит массовый читатель, Николай Вершинин в настоящее время единственный автор, кто под стать своей неравнинной фамилии поднялся на заметную творческую вершину среди коллег по Союзу писателей. Не случайно та давняя книжка «Без віны вінаватыя», ставшая ныне библиографической редкостью, так и начинается с ответа на вопрос-заголовок первого стихотворения “Чаму я люблю гэты жанр?”

На обложке ярко-вишнёвого цвета первой книжки нашего старинного автора изображён Пегас с крыльями вдохновения – мифический образ, означающий поэзию, символ лиры, музы. Эта гостья небесная стала верной творческой спутницей Николая Вершинина. Пожелаем же ему и в будущем всяческих успехов за письменным столом и активного жизненного долголетия.

*З павагай той самы Янка – Іван Сухарукаў.*
***Рэдактор газеты “МОТОВЕЛО”.***
*Публікацыя 90-х гадоў.*

## ПЕРШЫ СЯРОД САТЫРЫКАЎ

Міколу ведаюць усе. Яго байкі, фельетоны, гумарэскі не толькі чытаюць, іх дэкламуюць нават немаўляткі. Таму што лепшы наш паэт – сатырык піша свае дасціпныя радкі вельмі пранікнёна, чыста. Яны ўражваюць, нібы водблеск маланкі, доўга хвалююць.

Мабыць, у літаратурных выданнях з нагоды юбілею вельмі падрабязна адлюструюць творчы шлях Міколы. Ён гэтага заслугоўвае. Мы ж скажам так: Мікола Вяршынін – паэт з народа. Чэрвеньскі хлопец рос без бацькоў, якія загінулі ў пачатку вайны. Аднак сіроцкім яго жыццё не назавеш: у школе, тэхнікуме, універсітэце, на падшыпнікавым, трактарным ды іншых заводах, дзе працаваў, і ўвогуле ў Міколы заўсёды было і застаецца шмат сяброў, добрых людзей. Народ паважае і любіць паэта. Бо паэт не грэбуе яго парадамі, думкамі, звычаямі. Ён і цяпер у жыццёвай і творчай віхуры – працуе вядучым інжынерам аддзела маркетынгу навукова-вытворчага аб'яднання "ПРАГРЭС" у Мінску і адначасова многа піша.

Мы, твае прыхільнікі, Мікола, падымаем сёння кілішкі за тваё здароўе, сяброўскую вернасць, творчы ўзлёт! Хочацца, каб твой літаратурны скарб – 11 кніжак сатыры і гумару – значна папоўніўся.

*Мікола Дым.*
*загадчык аддзела "Народной газеты".*
*20 мая 2000 г.*

## ТЭЛЕГРАМА

СЕРЫЯ В 12 УРУЧЫЦЬ 20. 05. 2000 Г. Г. МІНСК, 100, ВУЛ. КУЙБЫШАВА, Д. 48., КВ. 181 ВЯРШЫНІНУ

ШАНОЎНЫ МІКАЛАЙ ПЯТРОВІЧ, ПРЫМІЦЕ НАШЫ САРДЭЧНЫЯ ВІНШАВАННІ З НАГОДЫ ВАШАГА 60 – ГОДДЗЯ. ДАЗВОЛЬЦЕ АД УСЁЙ ДУШЫ ПАЖАДАЦЬ ВАМ ТВОРЧАГА НАТХНЕННЯ, МАЛАДОГА ЗАПАЛУ, АПТЫМІЗМУ, НОВЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ НА КАРЫСЦЬ РОДНАЙ ЛІТАРАТУРЫ = САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ.

НННН 1132 19. 05 0019

# ЗАСЛУЖАНЫ САТЫРЫК РЭСПУБЛІКІ

У прыватным выдавецтве "ТЭХНАПРЫНТ" немалым накладам выйшла кніжка сатырычнага паэта Міколы ВЯРШЫНІНА.

Кніга выбраных твораў Міколы Вяршыніна – плён яго шматгадовай працы. У зборнік "Дакрытыкаваўся" ўключаны лепшыя напісаныя на працягу дзесяцігоддзяў, а таксама новыя, апошняга часу вершы, сатырычная проза, яшчэ і мемуары.

Байкі, фельетоны, гумарэскі, каламбуры, эпіграмы, сатырычныя паэмы – такі шырокі жанравы ахоп паэта. Тэматычны дыяпазон таксама даволі шырокі: штодзённыя праблемы, вытворчасць, каханне, сям'я, побыт, адпачынак, антыалкагольная тэматыка, роздум над творчасцю і многае іншае.

Асобным раздзелам у кнізе размешчаны вершы, якія аўтар прывяціў старэйшым і малодшым таварышам па пяру, і якія яму прысвяцілі людзі самых розных прафесій – прыхільнікі яго творчасці розных гадоў.

Рознабаковая адукацыя, багаты жыццёвы вопыт дапамагаюць паэту паглыбляцца ў важныя тэмы і паспяхова раскрываць іх. Але асноўная спецыялізацыя Міколы Вяршыніна – сатырычны верш. Яго сатыра савецкіх часоў ёсць прамы доказ бязглуздасці таго ладу жыцця. У той час гэта лічылася крытыкай.

*Марыя Коласава*
*Газета "ЗГОДА". Выпуск №20.*
*19 чэрвеня 2004 г.*

## ЗАГАД АД РЭДАКЦЫІ

Народнаму паэту – гумарысту – сатырыку:

Загад №22/44 – ОГ – 5967

1. Загадваю, улічваючы геніяльнасць:

а/ Прынесці тэрмінова слушныя прапановы і меркаванні.

б/ Новыя сатырычныя творы па вытворчыю тэматыку.

Галоўны рэдактар часопіса "Вожык"

***Уладзімір Саламаха.***
***23.12.2004 г.***

*Рэзалюцыя аўтара:*

Загад рэдактара прымаю да неадкладнага выканання.

***Подпіс*** ***М. Вяршынін***

## "ДАКРЫТЫКАВАЎСЯ" – І ДАЛЕЙ.

### /кнігарня "ВОЖЫКА"/

Узважыўшы ў руцэ зборнік Міколы Вяршыніна "Дакрытыкаваўся", я ажно прыцмокнуў: ого, усе мае сем кніжак на столькі не пацягнуць! І гэта, між іншым, не ўсё з напісанага сатырыкам – гумарыстам, а толькі, як пазначае аўтар на вокладцы, "выбраныя творы" Том у больш чым паўтысячы старонак і насамрэч уключыў у сябе рознажанравыя творы: байкі, фельетоны, гумарэскі, мініяцюры, каламбуры, эпіграмы, сатырычныя паэмы.

Мікола Вяршынін не сядзіць, як "Мыш пад венікам", і не вядзе з чытачом "Размову з-за куста", а без усялякай "Валакіты" кожнаму ўказвае "Сваё месца". Новыя павевы, сённяшняе жыццё – аснова яго творчасці.

Пражыўшы на свеце шэсцьдзесят пяць гадоў, М.Вяршынін – не нейкі там "трыццацігадовы халасцяк", бо ведае і "Што

бывае ў сорак год”, і “Што бывае ў пяцьдзесят”, і “Як жывецца ў шэсцьдзесят”.

М.Вяршынін нічога не прыдумляе – яго сюжэты ўзяты з рэальнага жыцця, дзе суседнічаюць розныя адмоўныя тыпы і добрыя, вясёлыя людзі.

На 516-ай старонцы заканчваецца кніга Міколы Вяршыніна “Дакрытыкаваўся”. Далейшыя дзевяць старонак займае змест. Зрэшты, усе творы прайшлі цераз перыядычны друк. А гэта многа значыць.

Спадзяёмся, і новая кніга аўтара зацікавіць чытачоў. Час ідзе, майстэрства расце. У гэтай кнізе – свежыя думкі, тэмы і вырашэнні праблемаў. Зусім арыгінальныя і непаўторныя. Што характэрна для пісьменніка.

Пачытайце – задумайцеся, і пасмяемся. Над сабой, самымі markdownрознымі людзьмі і недарэчнымі з’явамі, над сучасным жыццём. Знойдзеце і светлыя лірычныя старонкі... І разважайце зноў і зноў.

*Анатоль Зэкаў.*
*Намеснік галоўнага рэдактара часопіса “Вожык”.*
*2004 г.*

## МІКОЛА ВЯРШЫНІН

**(эпіграма)**

На юбілейны п’едэстал
Узняўся з гонарам Вяршынін.
Аднак далёка шчэ да ста,
І клічуць новыя вяршыні.

Мікола асядлаў Парнас,
Ды той малы яму, здаецца...
Мо ён раней за многіх нас
На штурм Алімпа замахнецца?

*Павел Саковіч.*
*З кнігі “Дуплетам па паэтах”.*
*2002 г.*

## ТЭЛЕГРАМА

Мінск 72/327 20/5 1610 ЛІОКС МІНСК
100 вул.КУЙБЫШАВА 48 кв 181

ВЯРШЫНІНУ МІКАЛАЮ ПЯТРОВІЧУ

МІКОЛА ШЧЫРА ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ

Між гор Парнаскіх на вяршыні
За ўсіх вышэй паэт ВЯРШЫНІН

*ВОЖЫКАЎЦЫ*

**09854691 20.05.2005 16.19.**

## МІКОЛА ВЯРШЫНІН – ПАЭТ, ЧАЛАВЕК, СЯБРА

З творчасцю таленавітага, арыгінальнага, сапраўды народнага паэта Міколы Вяршыніна добра знаёмыя чытачы нашай краіны. Ягоныя творы з задавальненнем друкуюць шматлікія газеты, часопісы, яны гучаць па радыё і тэлебачанню, а сам паэт нярэдка выступае перад чытачамі ў самых розных аўдыторыях: на прадпрыемствах, у вышэйшых навучальных установах, школах, бібліятэках дый шмат дзе яшчэ. Адным словам, паэт жыве яскравым, актыўным жыццём, трымае руку на пульсе часу, па-сапраўднаму любіць людзей, а яны, зразумела, адказваюць яму ўзаемнасцю. Шмат кніг выдаў знакаміты творца, і ніводныя з іх не залежваліся ў кнігарнях. Ці гэта не сведчыць пра тое, што людзям падабаюцца творы Міколы Вяршыніна, што яны любяць яго , як сапраўднага паэта?

Вось толькі некалькі радкоў з біяграфіі майго сябра, надзвычай добрага чалавека, сапраўднага творцы, якому Яе Вялікасць Муза спрыяе на жыццёвым шляху.

Мікола Вяршынін нарадзіўся 20 мая 1940 года ў горадзе Чэрвені Мінскай вобласці, а потым яго сям'я пераехала на радзіму маці ў былы Рудзенскі, а зараз – Пухавіцкі раён. На жаль, бацькі Мікалая Пятровіча трагічна загінулі пад нямецкай бамбёжкай у гады Вялікай Айчыннай вайны. Таму будучы паэт спачатку выхоўваўся ў цёткі, пазней – у дзіцячым доме. Рос і ў Мінскім раёне, куды дзетдом затым пераехаў. Пасля – вучыўся ў Мінску. Служыў у пагранічных войсках. За плячыма паэта – Мінскі аўтамеханічны тэхнікум, гістарычны факультэт БДУ, аддзяленне сацыялогіі універсітэту марксізму-ленінізму. Такім чынам, шаноўны Міклай Пятровіч адначасова і інжынер, і гуманітарый. Для творцы гэта заўсёды добрае спалучэнне, бо, на маю думку, свет у такіх людзей шырэйшы і цікавейшы ў параўнанні з тымі, хто мае якую-небудзь адну адукацыю.

Потым Мікола Пятровіч працаваў у Мінску інжынерам Дзяржаўнага падшыпнікавага завода, старшым інжынерам трактарнага завода, вядучым інжынерам Навукова – вытворчага аб'яднання "Прагрэс". Пісаць і друкаваць свае творы пачаў яшчэ ў маладыя гады. Да таго ж піша не проста вершы, а сатырычныя, гумарыстычныя, што далёка не кожны можа, бо сатыра і гумар – даволі рэдкі і вельмі складаны жанр, як кажа вядомы пісьменнік Валянцін Болтач, і многія другія – "Гэта ў літаратуры вышэйшы пілатаж" Вось Мікола Вяршынін і займаецца гэтым самым вышэйшым пілатажам. І, на маю думку, вельмі ўдала! Ён піша байкі, фельетоны, гумарэскі, мініяцюры, каламбуры, эпіграмы, сатырычныя паэмы, прозу, мемуары, лірыку. Часам перакладае з украінскай мовы. Іншым разам піша рэцэнзіі. Усё нават цяжка пералічыць. Бо талент Міколы Пятровіча – сапраўды шматрганны, арыгінальны, непаўторны. Ён такі – адзіны! У сваім жанры!

Шмат каму добра знаёмыя яго кнігі сатырычнай паэзіі: "Без віны вінаватыя", "Не сышліся характарамі", "Дагуляўся", "Нашто мне жаніцца", "У чужым воку", "Свой чалавек", "Мыш пад венікам", "Сваё месца", "Даная і Напалеон", "Нечаканыя сустрэчы", "Дакрытыкаваўся"і інш. А пра безліч калектыўных зборнікаў сатырычнай паэзіі і прозы /!/, у якія ўвайшлі творы вядомага паэта, і гаварыць не трэба. Галоўнае, што Міка-

лай Пятровіч не губляе свайго творчага імпэту, піша і друкуецца пастаяна, да таго ж цікава і нестандартна. Усе кнігі шматразова прэзентаваліся да друку.

Ён – аптыміст па жыцці, сябра для многіх , чулліві і разумны чалавек, таленавіты паэт. І калі я чую ў калідорах рэдакцыі часопіса “Вожык”, у якой я ўжо васемнаццаць гадоў працую, знаёмы голас Міколы Пятровіча: “Палкае прывітанне, сябры!” – то заўсёды радуюся сустрэчы з гэтым добрым чалавекам, сапраўдным літаратурным талентам, маім верным і надзейным сябрам. Новых зорных вяршынь табе. Дружа!

На тое ты і Вяршынін. Прозвішча абавязвае.

***Уладысь Цвяткоў.***
***Пісьменнік.***
***2005 г.***

## ВЕСЯЛІМСЯ. БРАТКІ. ВЕСЯЛІМСЯ!

*Пісьменнікаў па творчасці ведаюць усе. А вось па жыцці, па побыту мала хто ведае. Між тым, пісьменнікі – вельмі цікавыя, арыгінальныя людзі. І ў адносінах да сур'ёзных спраў, і павесяліцца ўмеюць, і трапна, дасціпна пажартаваць. Іншы раз такое адколюць, што захістаешся. Ад смеху, ад рогату, ад роздуму. Хочацца расказаць пра падобнага роду выпадкі, сведкамі якіх быў сам і некаторыя іншыя людзі, у асноўным – таварышы па пяру.*

## МАГУТНАЯ ТРЫЯДА

Аднойчы, ужо даўно, я пад'ехаў на суседні завод, зрабіў свае інжынерныя справы, паабедаў у сталоўцы і пайшоў на выхад. Дайшоў да рогу вуліц, гэта прыкладна ў раёне кінатэатра «Сучаснік», гляджу – на процілеглым баку стаяць трое, як дубы – Міхась Стральцоў, Яўген Крупенька ды Іван Курбека. Стаяць і цікуюць, хто ім сустрэнецца. У Стральцова адно вока ўжо закрывалася ад пастаяннага «недапіцця».

Убачыўшы мяне, таварышы па пяру запатрабавалі:

– Мікола, пастаў пляшку. Паміраем ад смагі.

Я – мац, мац па кішэнях – няма ні рубля. Але тут жа прыгадаў, што ў сталоўцы забыўся ўзяць рэшту.

– Пачакайце, хлопцы, – кажу, – вярнуся на завод, вазьму грошы.

Схадзіў, забраў, купіў вялікую пляшку віна, завёў хлопцаў у бліжэйшую сталоўку, узяў па кавалку хлеба. На гэтым мае грашовыя рэсурсы скончыліся. Наліў па поўнай шклянцы віна. Выпілі. Крупенька адным пальцам грэбліва адкінуў кавалак хлеба і з'едліва прамовіў:

– Вось дык закусь! – Але я знайшоў адказ:

– Нічога, усе абедалі, – і хуценька пайшоў.

А сам падумаў: нічога сабе, напаі іх, ды яшчэ накармі – такую хеўру. Гэта ўжо занадта.

Аднак гэтыя невялікія слабасці не перашкодзілі маім таварышам пісаць добрыя мастацкія творы.

## АНТОН БЯЛЕВІЧ, АНАТОЛЬ АСТРЭЙКА

У ранейшы час іду па Плошчы Перамогі (тады яна называлася Круглай плошчай) і сустракаю старога паэта Антона Бялевіча. Ён быў энергічны, рухавы, часам нават скандальны, але да мяне, маладога паэта-сатырыка, ставіўся прыхільна. Я ж звяртаўся да яго ласкава і з павагай: дзядзька Антось.

– Здароў, Мікола! – кажа ён. – У мяне ёсць два рублі. Дакладзі яшчэ два з капейкамі – возьмем дзве «чакушкі» ў «круглым» гастраноме і пойдзем да Анатоля Астрэйкі, ён жыве тут блізка, на праспекце, у яго – мора закусі.

Насустрач нам ідзе Пятро Прыходзька – дужы, шыракаплечы, шыракатвары.

– Здароў, парася! – кажа Бялевіч. – Ёсць грошы, то пойдзеш з намі, а як няма, дык ідзі сваёй дарогай.

– Няма, – сумна адказвае Прыходзька.

– Ну й ідзі!

Схадзілі ў краму, узялі, што трэба, прыходзім да Астрэйкі, а там ужо сядзіць Рыгор Няхай. Адзначаюць сустрэчу, весела гамоняць. А на стале – «мора закусі» – кілька, капуста і хлеб. Па калідоры снуўдаецца жонка, дэманстрыўна грымiць

посудам. Пры нашым прыходзе Анатоль Пятровіч схадзіў на кухню і прынёс яшчэ капусты – палоску ад выцягнутай уверх рукі да самай падлогі – рэдкі цуд.

Пасядзеўшы, пагаманіўны, Бялевіч прапанаваў:

– Мікола, пачытай свае вершы.

Я прачытаў тое, што лічыў лепшым і найноўшым. Старэйшыя – ці то дзеля ветлівасці, ці зузім сур'ёзна – пахвалілі іх. А пасля Антон Бялевіч пытаецца:

– А скажы, Мікола, як табе падабаюцца мае вершы?

Я трапіў у няёмкае становішча. Як чытач і як сатырык, я не мог сказаць, што мне ўсё падабаецца, бо ў Бялевіча побач з добрымі творамі было нямала і «барабанных», дзяжурных, прахадных вершаў, прытым зацягнутых. Але ж і крытыкаваць вядомага паэта я, малады, не мог. І я выбраў аптымальны варыянт:

– Ведаеце, дзядзька Антось, пішаце вы добра, але пішыце карацей.

А сам сцяўся ўвесь: раптам ён пачне лаяцца, або нават біцца? Характар жа меў выбуховы, і не з такімі, як я, былі стычкі. Аднак усё абышлося.

– Правільна кажаш.

І мы працягнулі нашу сяброўскую і творчую сустрэчу.

## УЛАДЗІМІР ПАЎЛАЎ

З ім я здаўна жыў і цяпер жыву непадалёку. З майго балкона відаць ягоны, а з ягонага – мой. Сустракаліся і дома, і ў выдавецтве, і ў Саюзе пісьменнікаў. Неаднаразова разам адпачывалі ў Доме творчасці.

Я пісаў яму прывітальныя вершы і на пяцьдзесят, і на шэсцьдзесят гадоў, хоць на яго юбілеях ні разу не быў. Напрыклад, на 60 гадоў ён не захацеў ніякіх урачыстасцей і знік у сваёй роднай вёсцы Замошша. Я ж напісаў прывітанне і кінуў у яго паштовую скрынку. Заканчваўся верш так:

*Гронкі вершаў, як зярняты,*
*У людскую сей раллю.*
*А за гэтае вось свята*
*Не нальеш, дык сам налью.*

Праз нейкі час прыходжу да Паўлава дамоў. Ён прыгадаў гэты верш і сказаў жонцы:

– Тамара Мікалаеўна, налі нам з Міколам па сто пяцьдзесят грамаў.

Тая наліла. Але роўна па сто пяцьдзесят і толькі раз. І ўсё ж мой верш, маё старанне не прапалі марна.

У Доме творчасці вечарамі нярэдка сядзелі мы па-сяброўску, гаманілі пра творчасць, жыццё, пра ўсё на свеце, і па ўсіх пытаннях разумелі адзін аднаго, сыходзіліся ў думках. Аднойчы заходжу ў яго пакой – ён вымае кашалёк і пачынае ў ім калупацца. Потым, паказваючы на мяне, кажа:

– Як толькі ён заходзіць, я адразу хапаюся за кашалёк і пачынаю лічыць грошы. А ён так і цікуе, ці шмат у мяне грошай. Это – нехорошо!

І засмяяўся, а я – за ім. Потым доўга рагаталі.

Аднойчы прагульваемся. Я вырашыў пажартаваць і як бы праверыць яго.

– Уладзімір Андрэевіч, – пытаюся я, – вось слова «мох». А калі ляжаць у ім, то як гэта сказаць?

– У моху, у мосе, у мху... э! – і ён махнуў рукой і пабег.

– Андрэевіч, – крыкнуў я ўслед, – іду па ільду, дам па ілбе, кашуля з ільну, змагацца з ільвом, ляжу ў імху...

## УЛАДЗІМІР ДЗЮБА

Аднойчы ў газеце «Знамя юности» была надрукавана нізка лірычных вершаў у перакладзе з беларускай мовы. Зверху быў падпісаны аўтар: «Владимир Клюв». Пасля аказалася, што гэта вершы Уладзіміра Дзюбы, а перакладчык перастараўся, пераклаў не толькі вершы, але і імя, прозвішча паэта. Валодзя быў у роспачы, бо не толькі аўтарства прапала, але і ганарар не мог атрымаць – прозвішча не сыходзілася. Чым гэта скончылася – цяжка сказаць, але жарт атрымаўся няўдалы.

## ЮРАСЬ СВІРКА

Прыходжу да яго ў рэдакцыю «Літаратура і мастацтва». Ён радасна мяне сустракае:

– Вось твае рукапісы, я кладу іх зверху стала, радуйся.

– Дзякуй, – кажу, – а як пайду, перакладзеш іх на ніжнюю полку?

Праз колькі дзён я напісаў на гэтую тэму эпіграму, канцоўка яе такая: Паэт пайшоў. Той кажа: – каб ты скіс! – І рукапіс перакладае ўніз.

Эпіграма была надрукавана ў тым жа «ЛІМе».

Іншым разам, пагаварыўшы са Сіркам і здаўшы яму новыя вершы, выйшлі ў калідор, і тут бачу Міколу Зыля. Ён працаваў і ў абкаме камсамола, і намеснікам дырэктара тэатра імя Янкі Купалы, а пасля – рабочым трактарнага завода. Пісаў апавяданні, часам друкаваўся. Па-сяброўску рэкамендую яго Свірку:

– Юрась Мікалаевіч, вось малады, але здольны празаік Мікола Зыль. Свірка чамусьці набычыўся і ўтаропіўся ў Зыля. Той таксама набычыўся і ўтаропіўся ў Свірку. Стаяць напаўсагнутыя і абое маўчаць. Прама нямая сцэна, як па Гогалю. Потым Свірка кажа:

– Нясіце творы ў «Чырвоную змену». І пайшоў у свой кабінет.

Зыль незадаволенна прамовіў:

– Ну, вось, толькі ты сказаў «малады, але здольны», як ён адразу: ідзі ў «Чырвоную змену»!

Неяк мне расказалі, што Свірка выдаў аднатомнік і на ганарар пабудаваў сабе дачу. Я тут жа скеміў і напісаў верш:

*Свірка выдаў аднатомнік*
*І зрабіўся, як надомнік.*
*Збудаваў сабе ён дачу.*
*Мусіць, цісне там і чачу.*
*А смалістае бярвенне*
*Надае яму натхнення.*
*Як асвоіць гэты домік,*
*Выдасць новы аднатомнік.*

Чытаў Юрасю Мікалаевічу гэты верш. Разам пасмяяліся. Праўда, у друк ён гэты твор не прапанаваў. Нічога, узялі іншыя...

## СЦЯПАН КУХАРАЎ

Выступаем з ім у творчай камандзіроўцы. Позна вечарам заходжу да яго ў гасцінічны нумар. Ён п'е гарбату. Прапануе і мне. Я сыплю цукар у шклянку, не шкадуючы. А ён назірае за мной.

– Чаму так многа сыплеш? – пытаецца.

– Люблю салодка. А цукар купіцца, – невызначальна кажу я.

– Кім купіцца? – падазрона пытае Сцяпан Іванавіч.

– Кім-небудзь, – весела адказваю я.

## АВЕР'ЯН ДЗЕРУЖЫНСКІ

Авер'ян Сафонавіч – яго называлі ў жарт Сафоклавічам – вельмі любіў выступаць і падоўгу. Стане перад публікай, шырока раставіць ногі, патрэ падбародак, тройчы кашляне:

– Кхе, кхе, кхе!

І пачынае. Чытае, чытае, а потым кажа:

– На мае вершы напісана трыста песень. (Мяне гэта вельмі здзіўляла: мусіць, перабольшвае разоў у дзесяць, бо нават у славутага Адама Русака наўрад ці ёсць столькі). Мае песні спяваюць усюды, у тым ліку ў Англіі, Японіі. Асабліва вядомая песня «Ой, мяцеліца». Адну з песень я вам праспяваю.

*Вой ты, мая журавіначка,*

*Вой ты, мая журавіначка,*

*Вой ты, мая жураві...* На гэтым месцы ён заклікае слухачоў:

– А далей спяваем разам!

Публіка маўчыць, затое аўтар аж заліваецца. Скончыўшы песню, Сафонавіч зрываецца з месца, падбягае да аднаго чытача і пытаецца:

– Ну, як, добра? Той маўчыць.

Авер'ян хапае яго за руку, моцна ціспе і трасе:

– Дзякуй, дзякуй!

Пахваліўшы самога сябе, ён урачыста абвяшчае:

– А зараз я буду чытаць вам свой гумар!

Чытае і сам смяецца, аж заходзіцца. А публіка маўчыць.

Ну, што ж, абы самому было смешна і прыемна...

## ІВАН ЧЫГРЫНАЎ

Неяк у Доме творчасці праводзіўся семінар кіраўнікоў літаратурных аб'яднанняў. Лекцыі, абмеркаванні, выступленні. На адну з лекцый быў запрошаны Іван Шамякін. Са сталых пісьменнікаў прысутнічаў таксама Іван Чыгрынаў. Напачатку лекцыі ён папрасіў у аднаго семінарыста цыгарэту, сеў у нішу, каб яго не было відаць, і закурыў. Затым ён заснуў і спаў да канца лекцыі. Але своечасова прачнуўся. Пасля апошніх слоў Шамякіна падышоў, звысоку паляпаў яго па плячы і прамовіў:

– Шаноўны Іван Пятровіч! Калі вы выступаеце, я гатовы слухаць вас бясконца!

Бывае, не важна, што спіш, важна своечасова прачнуцца.

## МІКОЛА ГАМОЛКА

Мікалай Іванавіч усё жыццё меў маленькі дзіцячы тварык. Пасля вайсковай службы доўга насіў форму і боты. Не любіў ніякіх скругленняў: дарогу пераходзіў і паварочваўся не авальна, але пад прамым вуглом.

Аднойчы зайшоў у цэнтральную кнігарню, стаў у канцы доўгага стала і разглядае кніжкі. Прадаўшчыца з другога боку ўбачыла яго і кажа:

– Хлопчык, злезь са стала.

Ідзе Мікалай Іванавіч па Круглай плошчы (цяпер плошча Перамогі), а насустрач Антон Бялевіч – як часцяком бывала, нападпітку. Убачыў Гамолку дый кажа яму:

– Вось ты, Прыходзька – добры паэт, а Гамолка – абышто.

Мікалай Іванавіч пачырванеў (ён і так быў заўжды ружовенькі), шчоўкнуў абцасамі і адказаў па-вайсковаму

– Ніяк не, таварыш Бялевіч!

## СЕРАФІМ АНДРАЮК

Заходжу ў выдавецтва «Мастацкая літаратура». Сустракаю рэдактара Рыгора Яўсеева. Гаманілі аб справах, пра мой ру-

капіс кнігі. Потым абое пайшлі па патрэбе. Каля дзвярэй туалета сустракаем дырэктара выдавецтва Серафіма Андраюка. Той падазрона на нас паглядзеў. Відаць, падумаў: вось аўтар і рэдактар ідуць піць, каб ніхто не бачыў. Знайшлі месца!

Скончыўшы справы, ідзем з Рыгорам на выхад. Да нас далучыўся Іван Міська – навуковец, былы работнік выдавецтва. Вырашылі пайсці ў бар, што на вуліцы Няміга, адзначыць сустрэчу.

Ідзем па праспекце Машэрава. На прыпынку бачым Івана Шамякіна і... Серафіма Андраюка. Ён утаропіўся ў нас вачыма і пільна сочыць. І тут Іван Міська робіць дэмарш. Сказаўшы нам ісці, шыбуе да Шамякіна і Андраюка і гамоніць з імі, каб адцягнуць ад нас увагу. Потым здаганяе нас. Гамонім пра рознае. І пра Ніла Гілевіча, і пра Анатоля Вярцінскага. Гаворым і добрае, і не зусім добрае. Калі б Серафім ішоў за намі, то ўсё чуў бы.

Пераходзім вуліцу Нямігу і на другім баку, на прыпынку, бачым... Серафіма. Ён зноў утаропіўся на нас. Трэцяя сустрэча! Пэўна, зразумеў, што ідзем піць.

І тут свой дэмарш робіць Яўсееў. Працягвае нам руку і кажа:

– Ну, я паехаў дамоў.

І хуценька сеў у аўтобус. Так сказаць, рэабілітаваўся перад начальствам.

А мы з Іванам Міська пакрочылі ў бар. Азірнуўшыся, бачым, што Серафім глядзіць нам услед. Ну, што ж, няхай сабе глядзіць. Мы ж – не работнікі выдавецтва, а аўтары.

Толькі вось доўга не маглі мы даўмецца, як гэта Андраюк не йшоў за намі, але апынуўся ўперадзе нас. Потым да мяне дайшло, што ён сеў у аўтобус № 63, праехаў адзін прыпынак і апынуўся ўперадзе нас.

## ІВАН КУРБЕКА

Іду аднойчы ў Дом друку, а Іван Курбека выходзіць адтуль.

– Здароў, Іване, – кажу. – Ну, як справы?

– Нічога, вітаюцца, – сумна адказаў ён.

Што ж, дзякуй Богу, што хоць вітаюцца...

## ВЯСЁЛЫЯ СУСТРЭЧЫ

Ідзём з таварышам па алейцы каля Дома творчасці. Насустрач – двое: стары пісьменнік і старая яго жонка – ну, як божы дзьмухавец. У мяне нечакана нарадзілася дурная рыфма, і я, сораму не пазнаўшы, адразу зачытаў ім гэтую страфу:

Ветэраны, ветэранкі,
Я гатоў вас бачыць зранку
І ўвечары, і ўдзень,
І ўсюды, і нідзе.

Таварыш штурхнуў мяне ў бок:

– Ты што гаворыш, хуліган? Ты ж хочаш, каб яны памерлі!

– Э, нічога, я жартую так, – бадзёра адказаў я. А старыя не пакрыўдзіліся, а засмяяліся. Назаўтра зранку зноў іду па той жа алейцы і сустракаю тых жа старых. Не стрымаўся і зноў няўдала жартую:

Ветэраны, ветэранкі...

Бабулька не дала мне дагаварыць і сама дагаварыла маю канцоўку:

– І усюды, і нідзе!

І мы разам дружна, утраіх зарагаталі.

Добра, калі людзі бяскрыўдныя... і разумеюць гумар.

## АНАТОЛЬ БЯЛЕВІЧ – СУР'ЁЗНЫ І ЖАРТАЎНІК

Ён любіў назваць сябе генералам. І вось сядзіць аднойчы з сябрамі ў рэстаране, гамоняць на роднай мове. А за суседнім столікам – афіцэры, у асноўным – палкоўнікі. Яны чуюць размову і абразліва выказваюцца на адрас беларускай мовы. Бялевіч улавіў гэта, раззлаваўся, падышоў і раз'юшана гаркнуў:

– Як вы можаце абражаць беларусаў на іх зямлі?

Тыя паспрабавалі агрызнуцца, але Антон Пятровіч як раўкне:

– Устаць, калі з вамі гаворыць генерал! Я – генерал Бялевіч. Смірна!

Афіцэры ўскочылі – рукі па швах.

Бялевіч адышоў і, задаволены, сеў за свой столік.

А той быў у творчай камандзіроўцы, выступаў у Гомелі. Прыехаў у аэрапорт, каб вылецець у Мінск. У руцэ трымаў торбачку з яблыкамі. Сам малы, непрыкметны, апрануты так сабе. Пазнаёміўся з другім мужчынам-спадарожнікам. Разгаварыліся, хто ёсць хто.

– Я – генерал Бялевіч, – безапеляцыйна заявіў Антон Пятровіч.

– Ты што, жартуеш? – не паверыў мужчына.

– Б'емся аб заклад!

– А чым дакажаш?

– А вось зараз сакратар абкама на сваёй машыне падвязе мяне да самога самалёта.

Пабіліся аб заклад. Мужчына ж палічыў Бялевіча за калгасніка.

Бялевіч звоніць у абкам. Неўзабаве падкатвае чорная «Волга» і падкідвае Бялевіча, а заадно і яго спадарожніка на пасадку ў самалёт.

Заклад быў выйграны, але Бялевіч нічога не ўзяў. Такі быў яго жарт.

## АНАТОЛЬ ВЯРЦІНСКІ

*(у яго вымаўленні)*

– Галоўнае наша патанне на сённяшні дзень і надалей – гэта патанне аб беларускай мове. Бо калі вырашыцца гэтае патанне, то і каўбасы будзе больш. Бо эканоміка ў немалой ступені залежыць ад стану культуры. Так што гэта ў нас самае актуальнае патанне.

## КАНДРАТ КРАПІВА

Я двойчы быў у яго на прыёме, калі ён працаваў віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук, а я прасіўу яго рэкамендацыю для ўступлення ў Саюз пісьменнікаў. Ішоў і баяўся, такі ён быў на

выгляд суровы і непрыступны. Аднак пасля ўпэўніўся, што ў яго па сутнасці адкрытая дзіцячая душа. У час майго другога прыходу ён сказаў:

– Мікола, я прачытаў вашы кніжачкі і дам вам рэкамендацыю. Але старайцеся, каб кожная ваша кніжачка была мацнейшай за папярэднюю.

Я так і стараўся.

Расказваюць, што сын Кандрата Кандратавіча быў шкадлівы і хуліганісты. Суседзі ўрэшце-рэшт паскардзіліся на яго класіку.

– А я і сам ведаю, што ён дурны, – спакойна і проста адказаў Крапіва.

Людзі яму былі важнейшымі за бесталковага сына.

## ЭДУАРД ВАЛАСЕВІЧ

Наш мудры байкар быў даволі рослы, разважлівы. Яго можна было слухаць бясконца, і ён ніколі не паўтараўся. Жонка яго, цёця Цыля, была маленькая і хударлявая. Калі ёй што-небудзь не падабалася ў размовах ці паводзінах мужа, яна падскоквала і малаціла яго па грудзях ці спіне сваімі маленькімі кулачкамі:

– Эдзік, што ты робіш, нягоднік!

Ён адмахваўся ад яе, як ад надаедлівай мухі, і адказваў:

– Цыля, мне ідзе восьмы дзесятак, і я ведаю, што раблю.

Званю яму аднойчы і кажу:

– Эдуард Станіслававіч, у мяне выходзіць новая кніжка, але не тоўстая.

– Мікола, – адказвае ён, – у цябе, як у сатырыка-гумарыста, кніжка павінна быць не тоўстая, а моцная.

Я называў яго бацькам. І ён таксама даваў мне рэкамендацыю ў Саюз пісьменнікаў.

Славуты сатырык напісаў і надрукаваў аднойчы вянок лірычных санетаў. Адзін з іх заканчваўся прыкладна так: *Цаню той час, люблю я тую хвілю, Што Бог паслаў мне залатую Цылю.* Розныя пісьменнікі па-рознаму паставіліся да гэтага верша: хто – жартам, хто – усур'ёз.

## АЛЕСЬ ПІСАРЫК

У маладосці ён быў вельмі пладавітым паэтам. І вось прыходзіць да мяне аднойчы і радасна паведамляе:

– Мікалай Пятровіч, я за гэтую ноч напісаў дванаццаць вершаў!

Сам я больш за адзін верш за вечар не пісаў і ведаў, што колькасць не заўсёды пераходзіць у якасць.

– Дзесяць выкінь, – рашуча адказаў я. Праз нейкі час ён зноў прыходзіць і кажа:

– Мікалай Пятровіч, я паслухаў тваю крытыку і за гэту ноч напісаў усяго шэсць вершаў.

– Пяць выкінь, – катэгарычна адказаў я.

## МІХАІЛ ГЕЛЕР

Ен працаваў у дзіцячай рэдакцыі і пісаў вершы на рускай мове для дзяцей.

Уступаў у Саюз пісьменнікаў. Другая стадыя – камісія з 21 чалавека, закрытае галасаванне. Міхась вырашыў зрабіць ход канём: уведаў прозвішчы ўсіх членаў камісіі, падыходзіў да кожнага і прасіў-жаліўся:

– Я ведаю, што ўсе будуць супраць мяне, дык хоць вы прагаласуйце «за».

І кожны прагаласаваў «за», думаючы, што толькі ён адзін. У выніку – сто працэнтаў.

І вось трэцяя стадыя – абмеркаванне на прэзідыуме. Усе глядзяць – нейкі цуд: ніхто ніколі не набраў на камісіі сто працэнтаў галасоў. Пімен Панчанка кажа:

– Малады чалавек, нешта я слаба ведаю вашу творчасць, дык прачытайце які-небудзь свой верш. Міша чытае. Панчанка зноў просіць:

– Нешта я не разабраўся. Ну, яшчэ адзін. Міша зноў чытае. Панчанка патрабуе:

– Ну, і апошні верш!

Міша ўзапрэў, але дэкламуе.

– Таварышы, – кажа народны паэт Пімен Емяльянавіч, – каго мы прымаем? Паэта ж няма!

Вось так. Хітрасць падвяла.

## АЛЕСЬ ПІСАРЫК І КАСТУСЬ ЖУК

Завіталі да мяне маладыя на той час хлопцы-паэты. Час ёсць, настрой – таксама. Можна культурна пасядзець, пагаманіць пра жыццё і творчасць. Купілі гарэлкі. У мяне былі тры пачкі цыгарэт «Арбіта», тры кілаграмы памідораў, цэлая каструля варанай бульбы, і яшчэ тое-сёе з закусі.

Сядзім, гамонім пра ўсё. Папіваем, закусваем. Хлопцы маладыя, апетыт зверскі.

Бачу, мае запасы на вачах знікаюць у беспамерных жыватах маладых. Трэба было б, думаю, частку памідораў, бульбы ды іншай закусі адкласці, бо жонка, Ніна Тарасаўна, як прыйдзе, будзе галодная. Затое хлопцы не саромеліся. Гляджу, і вялізная міска з памідорамі, і каструля з бульбай, і іншая закусь, і цыгарэты, і выпіўка бяследна знікаюць. Праз тры гадзіны ўсё было пуста. Якая потым была размова з жонкай – можна ўявіць.

– Га-га-га! – рагаталі на адыход хлопцы. – Аб'елі, абпілі, абкурылі Міколу!

Ну, што ж, мне не шкада, абы на здароўе пайшло.

Да таго ж мы між гаманой перацісkаліся на руках – мераліся сілай. Я, хоць старэйшы і слабейшы, паклаў руку Пісарыка дзесяць разоў, а Жука – пяць. Праўда, пасля цэлы тыдзень рука балела і ныла.

– Гэта мы былі п'яныя, – апраўдваліся затым сябры. І ўсё ж з Алеся Пісарыка атрымаўся неблагі літаратар, а з Кастуся Жука – добры паэт.

## АНАТОЛЬ СЫС

Гэта быў цікавы паэт і чалавек. Рослы, здаровы, энергічны. Ва ўчынках – непрадказальны.

У Доме літаратара ідзе канцэрт. Анатоль падымаецца на сцэну і становіцца сярод спевакоў. Пастаяўшы, паімкнуўся зняць з піджака аднаго з іх значок. Той нясмела адвёў яго руку. Калі надакучыла стаяць сярод артыстаў, Сыс лёг на падлогу каля іх ног і такім чынам доўга адпачываў.

Іншым разам Анатоль прыходзіць у Дом літаратара ў старых зношаных шортах, як нейкі падлетак. Заходзіць у кабінет намесніка старшыні Саюза пісьменнікаў Анатоля Жалязоўскага і сядае ў яго крэсла (а того не было на месцы). Пасядзеўшы, пагаварыўшы са мной, ён паклаў ногі на стол. Зайшоў Анатоль Пятровіч, страшна абурыўся і выправіў Сыса за дзверы.

У Доме літаратара праходзіць творчая вечарына паэткі Валянціны Аколавай. Я стаю на сцэне і рыхтуюся чытаць прывітальны верш. Побач дзяўчына трымае мікрафон. І раптам яе ўсю затрэсла – пачало біць токам. Мы ледзь адарвалі яе ад мікрафона.

Па зале ў той час соваўся Сыс на падпітку. Казалі, што гэта ён – ці сам надумаўся, ці хто падвучыў – падстроіў гэта. Каб сарваць вечарыну В. Аколавай.

А недзе ў душы ён быў чалавек і добры, і просты, і сяброўскі. З цягам часу ён пасталеў, паразумнеў, супакоіўся.

## СКАРАЧЭННІ

Стаю з сябрамі-літаратарамі. Гаворым пра рознае. Між іншым я патаюся ў іх пра тонкасці мовы:

– А ці можнаце вы скласці кароткі сказ, у якім былі б шэсць скарочаных слоў?

– Як гэта? – пытаюць сябры.

– А так.

Яны маўчаць у задуменні.

– Кажы, Мікола, сам.

– Калі вам чагосьці не хапіла, а хочацца, – кажу я, – то можна скарочана сказаць так:

– Мо нат шчэ трэ, як ё. І до.

– Ну, ты даеш! – прамовілі сябры, пачухаўшы патыліцы.

## І ЯШЧЭ ПРА ІВАНА КУРБЕКУ

Калісьці я праводзіў у Доме літаратара сваю творчую вечарыну. Пасля яе па традыцыі наладзіў банкет. На яго прыдыбаў і Іван Курбека. Без запрашэння, але нос чуе. Ну, няхай будзе і ён: пабалабоніць жа любіць і ўмее.

Ужо ўначы вяртаемся з жонкай дадому. За намі ўвязаўся і Курбека. Па дарозе мовіць:

– Я сёння буду начаваць у вас.

– Што ты, Янка! – рашуча запярэчыў я. – У нас жа аднапакаёўка-шаснаццацімятроўка. Дзе ж цябе пакласці? Прытым ты жывеш зусім побач: я – на вуліцы Куйбышава, а ты – на Якуба Коласа.

– Што вы кажаце, нікуды ад вас не адыду, цяпер людзі прападаюць, – заўпарціўся Курбека.

– Няхай заначуе, – згадзілася жонка.

– Ад яго ж не адчэпішся, ты яго яшчэ не ведаеш, – заўважыў я.

Пакалалі яго на раскладушку, а ўранку былі вымушаны зноў пачаставаць.

Праз нейкі час Курбеку прымалі ў Саюз пісьменнікаў – у шэсцьдзесят гадоў. Пасля прыёму падыходжу да яго і пытаю:

– Ну, Янка, віншую. А добры бэнц будзе? Традыцыя ж, трэба адзначыць як след слаўную падзею ў жыцці.

– Што ты, Мікола! – заенчыў-застагнаў Янка. – У мяне няма грошай.

І ўмомант шаснуў-схаваўся ў бакавы пакой. Можа, з адным-двума больш важнымі чалавекамі ўпотай ад іншых і расціснуў пляшку-другую, але наўрад.

Так, Курбеку не раскруціш. Быццам вечна грошай няма. Затое нашы святы наведаць не праміне.

## І ЗНОЎ УЛАДЗІМІР ПАЎЛАЎ

Пасля ягонага шасцідзесяцігоддзя я пытаюся ў яго:

– Ну, што, Уладзімір Андрэевіч, як жывецца на сёмым дзесятку гадоў?

– Гэтаксама, як жылося і на шостым дзесятку, – бадзёра адказаў ён.

## ХВЕДАР ЖЫЧКА

На працягу чатырох гадоў за пенсіённым узростам ён яшчэ працаваў старшым рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура». У прыватнай размове пра выхад на пенсію ён сказаў:

– Пакуль працую, ды яшчэ ў выдавецтве – усё, што напішу – будзе лічыцца добра. А як кіну работу, усё напісанае будзе дрэнным.

Сапраўды, каму ж хочацца на пенсію, ды з добрай пасады?

## ПАВЕЛ КАВАЛЁЎ

Ен быў у свой час галоўным рэдактарам часопісаў «Вожык» і «Полымя». Стары празаік гадоў пад семдзесят пяць. Некалі сустракаю яго і пытаюся:

– Ну, як справы, як здароўе, Павел Нічыпаравіч?

– Здароўе? Горш, чым было, але лепш, чым будзе, – мудра адказаў ён.

## АЛЕСЬ СТАВЕР

Ен вельмі любіў выступаць. І рабіў гэта даволі цікава. Чытаў і лірыку, і гумар.

І вось аднойчы выступае: чытае, чытае, і раптам... забыўся тэкст. Стараецца ўспомніць, а публіка чакае. Не ўспомніў, але весела кажа:

– Прабачце, забыўся. Але нічога, далей таксама добра. У зале – агульны смех.

## ЯК ШКОДЗІЦЬ ЗАЛІШНЯЁ ЗАХВАЛЕННЕ

У канцы шасцідзесятых – напачатку сямідзесятых гадоў я кіраваў літаратурным аб'яднаннем пры рэдакцыі абласной газеты «Мінская праўда». Загадчыкам аддзела культуры пэўны час быў Уладзімір Антуськоў – даволі малады, гаварун, вастраслоў, да таго ж пісаў вершы, прытым без ніякіх амбіцый і прэтэнзій у гэтым сэнсе. Друкаваў у газеце свае вершаваныя тэкстоўкі.

Вядома, мы нярэдка гаманілі на розныя жыццёвыя і творчыя тэмы. І ён неяк прызнаўся:

– Аднойчы я напісаў байку, паслаў яе ў рэдакцыю часопіса «Вожык». У адказ атрымаў ліст ад галоўнага рэдактара Уладзіміра Корбана.

(Уладзімір Корбан быў чалавекам своеасаблівым: сам высокі, твар каструбаваты, нос – ці то бульбінай, ці то слівай, а гаварыў неразборліва, накшталт:

– Хру, хру,хру... Усё як бы хрукаў).

– Ну, і што, Валодзя, – пытаюся, – было напісана ў тым лісце?

– Адказ быў такі: «Вы – першая ластаўка ў беларускай сатыры».

– І што пасля?

– Пасля я зусім кінуў пісаць байкі.

...Вось так. Лепш бы пакрытыкаваць маладога паэта – карысць была б сатырыку-пачаткоўцу. А так увогуле адбіў ахвоту.

## НЕ НА КОЖНЫ ЮБІЛЕЙ...

Справы даўнія. Заходзіць у выдавецтва, у рэдакцыю паэзіі, мужычок непрыкметнай знешнасці. Зайшоў, шырока раставіў ногі, рукі вісяць, як плёткі, дый кажа:

– Дзень добры!

Хлопцы-рэдактары маўчаць, уткнуўшыся ў паперы.

– Мамонька, паэт, – адрэкамендаваўся прышэлец. – Можа чулі?

– Не, не чулі, – адказалі хлопцы, не падымаючы галоў ад папер.

– У мяне хутка юбілей, – кажа Мамонька. – Дык не пашкодзіла б кніжку выдаць.

– Дзіва што, але ж не на кожны юбілей кніжкі выдаюцца, – быў адказ рэдактараў.

– Ну, добра, дык я пайшоў, – сказаў малады па творчасці, але не малады па гадах паэт.

І пайшоў.

## ДРАЖНІЛКА

Іван Курбека адмыслова падрабляе галасы многіх пісьменнікаў. Ну, проста артыст. Яму б у філармоніі працаваць. Або ў цырку. Канечне, апісаць гэта – вельмі мала. Гэта трэба чуць. Аднак прывядзём некаторыя фрагменты ягоных выступленняў.

Падрабляе Сяргея Грахоўскага. Словы, як высечаныя з каменя.

– Я часта бываю на Гомельшчыне і сустракаюся з сям'ёй лесніка Яўхіма. Найбольш таму, што ў яго ёсць тры дачушкі. Асабліва малодшая, Марыся. Гэткая пульхмяная, гэткая сакавітая. Як убачу яе – адразу ўзбуджаюцца вясёлыя жаданні.

– Іду, – кажа Курбека, – па мосціку цераз Свіслач. Насустрач мне насоўваецца магутным целам Грахоўскі. Я – бокам, бокам, каб ён не скуліў мяне ў раку. А ён і пытаецца:

– Ну, што ты там пра мяне плявузгаеш, Іване? Ды хіба ж я калі-небудзь так казаў?

– Ведаеце, Сяргей Іванавіч, – адказваю, – як казаў Горкі пра Чэхава ці Чэхаў пра Горкага, не важна, што чалавек казаў, важна, што мог сказаць.

– О, то праўда, – сказаў Грахоўскі, – і мірна пайшоў далей.

Падрабляе Міхася Калачынскага. Той доўгі час быў галоўным рэдактарам часопіса «Беларусь». А пры размове вельмі шапялявіў.

– Заходжу я ў рэдакцыю і сустракаю Калачынскага. Ён пытаецца:

– Ну, чаго ты тут сноўдаешся, хлёпча?

– Як чаго? Я здаваў Барадуліну свае нататкі.

– Нятяткі? Якія нятяткі?

– Пра цёцю Уладзю. (Курбека піша вельмі мала, а каб заняць сябе, шматгадова займаецца жыццяпісам жонкі Янкі Купалы).

– Пра цёцю Улядзю? – перапытаў Калачынскі. – Ну, і што?

– Ды вось каторы раз не знайду ні нататкаў, ні Барадуліна. (Рыгор Іванавіч быў вельмі непаседлівы). – Што ж рабіць?

– Напішы зноў гэтыя нятяткі, толькі не здавай Банадуліну. Яго ці ў яго што знайсці – як іголку ў стозе сена. Э... Банадулін, Банадулін! – ён махнуў рукой і адышоў.

Калісьці заходзіць Курбека ў бар Дома літаратара, а там за столікам весела адпачывае славуты паэт Анатоль Вялюгін з кампаніяй. Угледзеўшы Курбеку, Анатоль Сцяпанавіч паклікаў яго, дый кажа:

– Ну, што ты там усіх падрабляеш?

– Стараюся, як магу, – адказвае Курбека.

– А вось мяне ты век не падробіш.

– Чаму ж?

– Таму што я – Вялюгін.

– Дык што ж? Можна прыглядзецца, прыслухацца, заўважыць усё ваша вялюгінскае і спарадыраваць.

– Ну, добра, добра, – мірна сказаў Вялюгін. – Налівай! Гэта была яго вышэйшая ўхвала.

## БРАНІСЛАЎ СПРЫНЧАН

У Доме творчасці Саюза пісьменнікаў на Іслачы, калі хадзілі ў сталоўку, за адным сталом сядзелі Сяргей Грахоўскі, Нічыпар Пашкевіч, Браніслаў Спрынчын і я. Калі Грахоўскі рабіў ці казаў не тое, што трэба, Пашкевіч пад'ялдыкваў яго:

– Кінь ты, Сяргей, свае лагерныя замашкі! (Грахоўскі ў даўнія часы быў рэпрэсіраваны на многа гадоў).

Браніслаў Спрынчын, хоць і жыве апошнія дзесяцігоддзі на таблетках, меў зверсткі апетыт і еў, як не ў сябе. Калі трэба было налiваць суп ці боршч, то замест таго, каб размяшаць у

каструлі і наліваць, што патрапіць – аж уставаў і глядзеў, з якога боку там больш гушчы і мяса. І наліваў сабе з верхам, каб гушча перла з міскі ўверх. Аднойчы я яго за гэта пакрытыкаваў, і ён сцярпеў. Іншым разам, калі Нічыпар Пашкевіч спазніўся на абед і ўзяўся за каструлю, я не вытрымаў і сказаў:

– Еўдакімавіч, не спазняйцеся, бо пасля Спрынчана ад супу застанецца адна вада.

Тут ужо Спрынчан не сцярпеў і справіў мне маленькі скандал.

Дзяды – старэйшыя пісьменнікі у Доме творчасці не трацілі ні рубля. Ніяк не падмацоўвалі сваё харчаванне, хоць кармілі там у апошні час не лепшым чынам: катлеты, макароны. Нават на мяжы лета і восені не давалі агуркоў і памідораў, хоць яны каштавалі вельмі танна. Салаты гатавалі ў асноўным з капусты ці салянкі.

Іду познім вечарам па калідоры і сустракаю Спрынчана. Мяне мучыць смага.

– Браніслаў Пятровіч, – прашу, – мо ў вас ёсць напітак ці мінералка, дык дайце папіць.

– Что ты, что ты, Николай, у меня нет денег.

Аднак, калі мы вярнуліся ў Мінск, Спрынчан на першай жа гандлёвай кропцы купіў ладную гронку бананаў. І грошы знайшліся.

Што ж, прыемнага апетыту вам, Браніслаў Пятровіч!

(Між тым шмат каму незразумелая такая з’ява: прозвішча ў чалавека малдаўскае, на нацыянальнасці – украінец, жыве ў Беларусі, а піша па-руску. Што за «вінегрэт»?).

## НІЧЫПАР ПАШКЕВІЧ І Я

Нічыпар Еўдакімавіч у Доме творчасці займаецца не пісаніной, а зборам грыбоў. Актыўна падмацоўвае сваю гаспадарку, стол. У гэтай справе ён апантаны. Устае на золку – і пайшоў. Грыб яшчэ не выскачыў з зямлі, а ўжо ў кошыку ў Нічыпара... Грыбнік можа за гэтым заняткам забыцца і на снеданак, і на абед. Пашкевіч набірае больш за ўсіх. Рэгулярна робіць

«чаўночныя» рэйсы на Мінск – завозіць багаты ўраджай. Я стараюся не адстаць ад яго, але за ім не паспяваю, трохі адстаю. У яго заўсёды больш. Нехта з таварышаў пажартаваў:

– Калі б яшчэ адзін такі, як Пашкевіч і Вяршынін, у лесе грыбоў не засталося б.

Нягледзячы на розніцу ва ўзросце, у мяне з Пашкевічам склаліся прыяцельскія адносіны. Нярэдка вечарамі я запрашаў яго ў свой пакой і частаваў. А ён, прыехаўшы чарговы раз з Мінску, казаў мне:

– Мікола, зайдзіце.

Заходжу, а ён, як звычайна, выстаўляе паўпляшкі брэндзі «Імперыял», ашчадна наразае вэнджаную каўбасу і робіць бутэрброды. Сядзім, гамонім. Я ўважліва слухаю яго мудрыя словы, а ён – маю вясёлую гаману. Аднойчы ён па традыцыі кажа:

– Мікола, зайдзіце.

Я кажу яму:

– Там у сваім пакоі сумна сядзець Уладзімір Паўлаў. Відаць, у яго нічога няма.

Нічыпар Еўдакімавіч падумаў і сказаў:

– Ну, што ж, паклічце і яго. – Утраіх нам было весялей і цікавей.

## ВЯЧАСЛАЎ СТОМА

Ён – у асноўным журналіст і даследчык. Піша пра звяроў, рыбін, птушак, траўкі і кветкі. Адным словам, фенолаг. Аднак з'яўляецца і членам Саюза пісьменнікаў. Пад артыкуламі падпісваецца і так, і гэтак.

Чалавек вельмі беражлівы. Калі каго запрашае зайсці да сябе – прымушае складвацца, скідвацца, хоць халадзільнік, падлога і сцены завалены, закіданы, абвешаны прадуктамі харчавання і рознымі прахаладжальнымі і моцнымі напоямі.

Вялікая ўпэўненасць у сябе. Дакладней кажучы, самаўпэўненасць. Не церпіць ніякіх пярэчанняў, аж становіцца на дыбкі. Да таго ж нярэдка казаў:

– Я – багацей. Я – мільёншык. І ў той жа час:

– Я прымаю і частую толькі тых, ад каго магу мець вялікую карысць.

Што ж, нямала ў каго найважней – свая выгода. Затым ён пахвальваўся:

– Чаму ў мяне так шмат грошай? Я друкуюся за месяц трыста разоў. (Фантастыка!)

Пры чарговай сустрэчы, калі я прыпомніў гэта, ён папраўіўся:

– Не, гэта я за год друкуюся трыста разоў. (Зноў фантастыка).

Іншым разам ён казаў:

– З вылучэннем на Дзяржаўную прэмію рэспублікі я спазніўся, але на Нобелеўскую я выстаўлю сам сябе.

(Звычайна выстаўляюць арганізацыі). Пры наступнай сустрэчы ён казаў:

– Не, на Нобелеўскую не пайду, але звання Народнага ці ордэн – гэта пастараюся дамагчыся.

Што ж, сціпласць – рэч рэдкая.

Але поспехаў табе, Вячаслаў, у тваіх высокіх памкненнях!

## ІВАН КУДРАЎЦАЎ

Ён не пісаў аб'ёмных высокамастацкіх твораў, а займаўся літаратурнай крытыкай. Што ж, таксама жанр. Праўда, прызнаўся мне, што на старасці гадоў напісаў раман у трох тамах. Я бачыў у выдавецтве тры папкі машынапісу яго рамана. Але ці дачакаецца аўтар на восьмым дзесятку гадоў жыцця выхаду ў свет свайго шматпакутнага твора – гэта праблематычна.

У Доме творчасці ён адзін быў заядлым карцёжнікам і ўцягнуў мяне ў гэтую гульню. Яму больш не было чым займацца, бо нічога не пісаў. А я – ну, не буду ж цэлы дзень чытаць і пісаць, а ніякіх культмасавых мерапрыемстваў у нашым Доме не праводзіцца. Ён мяне абгульваў удвая больш, чым я яго.

Іду па калідоры Дома творчасці, а насустрач мне Сяргей Грахоўскі.

– Чым займаўся сёння, Мікола? – пытае ён.

– Трохі чытаў, крыху пісаў, – адказваю. – А пасля гуляў у карты з Кудраўцавым.

– Што ж, гуляць у карты – лепш, чым пісаць бяздарныя раманы.

Расказаў пра гэтую размову таварышам. Адзін з іх сказаў:

– А чаму Грахоўскі думае, што раман Івана Фёдаравіча Кудраўцава будзе горшым, чым вершы Грахоўскага?

## ВАЛЯНЦІН БАРЫСЕВІЧ

Ёсць у мяне сябар, вучань, малады паэт і празаік Валянцін Барысевіч. Цудоўнай душы чалавек! Сябрую з ім ужо не адзін дзесятак гадоў.

І вось аднойчы ён чытае мне свой новы верш. Я заўважыў два радкі:

– Прачнуўся – адразу ўключаю я маг,

І хлеба скарынку кусаю...

Пытаюся ў яго:

– А чаму, устаўшы, ты ўключаеш магнітафон замест таго, каб спяшацца на працу? І чаму толькі скарынку хлеба кусаеш? А дзе ж сала, мяса, каўбаса? Ты ж трымаеш цесную сувязь з вёскай – бацькі там.

– Ну, відаць, гэта быў выхадны дзень, – адказаў сябар,

– і на працу не трэба было ісці. А напярэдадні да мяне завалілі таварышы, як саранча, і вынішчылі ўсе мае харчовыя запасы. Вось я і кукаваў, чакаючы, калі адчыніцца гастраном. Жыву ж у інтэрнаце.

– У такім выпадку, – кажу я, – падскоквай да мяне, накармлю ад пуза.

## МІХАСЬ ПАРАХНЕВІЧ

Ён працаваў намеснікам рэдактара газеты «Вячэрні Мінск», а яшчэ раней быў інструктарам ЦК КПБ, чым вельмі ганарыўся і пра што часта ўспамінаў. Пажылы мудры чалавек. Яго кабінет быў цэнтрам прыцягнення і заўжды поўны людзей. Міхась Прохаравіч дапамагаў людзям словам і справай. Так цікава распавядаў пра ўсё, што слухаць яго і гаманіць з ім можна было бясконца. Шкада, што я з ім пазнаёміўся даволі позна. Да мяне Парахневіч ставіўся па-бацькоўску і нярэдка казаў:

– А вой, мой слаўны дзетдомавец, маё дарагое дзіця! Напішы аповесць пра сваё няшчаснае дзяцінства.

Я ж аповесць не пісаў, а пісаў сатыру і гумар.

Міхась Прохаравіч не баяўся ў рабочы час прыняць чарку.

Так сказаць, для ўстанаўленя кантактаў. І вось аднойчы нас сабралася многа ў яго кабінеце, і ўсе прынеслі разнастайныя напоі рознай моцнасці, а на стале ляжала гара зялёнага гароху.

Выкладчык універсітэта Валеры Грыцэвіч закусвае гарохам і ўсяляк пахвальвае:

– Вось дык закусь! Міравая закусь!

Парахневіч паглядзеў на стол і сумна прамовіў:

– Мора выпіўкі, а на закусь – адзін гарох. Разыходзьцеся па дамах!

Але мы не разыходзімся, не хочацца. Вельмі ж цікавая і вясёлая кампанія. Валеры Грыцэвіч убачыў у кутку зняты са сцяны партрэт Леніна і кажа:

– Міхась Прохаравіч, аддай мне гэты партрэт, я вынесу яго і выкіну на сметнік.

Парахневіч маўчыць. Грыцэвіч трындзіць адно і тое шмат разоў. Нарэшце, Міхасю Прохаравічу гэта надакучыла, і ён са злосцю агрызнуўся:

– Чаго ты да мяне прычапіўся? Ідзі да Дома Урада, там вісіць шасцімятровы партрэт. Здымі яго і валачы, куды хочаш.

## ЛЁС ПІСЬМЕННІКА

Стаім учатырох: я і яшчэ тры пісьменнікі. Размова віецца вакол мяне, а я стаю моўчкі.

– Скажы, Мікола, – пытаецца адзін, – чаму цябе позна прынялі ў Саюз пісьменнікаў?

Я не паспеў раскінуць мазгамі, як за мяне адказаў другі:

– Бо пісаў вельмі востра. – А трэці дадаў:

– А калі б пісаў яшчэ вастрэй, то і зусім не прынялі б.

Такі вось лёс сатырыка. Усіх нашых сатырыкаў.

## ЯШЧЭ РАЗ ПРА ЎЛАДЗІМІРА ПАЎЛАВА

Усё-такі я пабываў аднойчы ў яго на свяце. У Доме літаратара праводзілася творчая вечарына з нагоды выхаду яго но-

вай кніжкі «Сляза на вейцы». Яна была тонкая, аднак у цвёрдай вокладцы (зразумела, аўтар жа сам быў выдаўцом). Урачыстая частка прайшла на вышыні. Затым паэт раздаваў аўтографы. Падышоў і я (кніжку ж купіў) і кажу:

– Уладзімір Андрэевіч, цябе не абцяжарыць даць мне аўтограф?

– Не, – весела адказаў ён. Падпісаў, а пасля пытаецца:

– А цябе, Мікола, не абцяжарыць пабыць на неафіцыйнай частцы?

– Дзіва што! – бадзёра адказаў я.

Неафіцыйная частка таксама прайшла на належным узроўні.

Раз'язджаліся разам, у адзін бок – я, Паўлаў і яшчэ адзін паэт – Сяргей Законнікаў. На вуліцы Сурганава пачалі развітвацца, каб ісці па дамах. Паўлаў спяшаўся, а я – не. І кажу Сяргею:

– Ну, Валодзя няхай ідзе на спачын, а мы з табой яшчэ пагамонім.

Валодзя неяк зніякавеў і падаўся ў свой бок, а Сяргей накінуўся на мяне:

– Што ты сказаў – ідзі на спачын? Ты што хочаш, каб ён памёр?

– Ат, я не ведаў такіх тонкасцей мовы, – адказаў я.

І працягваю далей:

– Уладзімір Андрэевіч, я – без роду, без племені, былы дзетдомавец, ні блізкай радні, ні моцнай сям'і. Так што калі памру, дык ты паклапаціся, каб мяне пахаваў Саюз пісьменнікаў.

– Што ты кажаш, Мікола, – здзіўлена запярэчыў ён, – як я магу пахаваць цябе, калі я на пяць гадоў старэйшы за цябе? Гэта ты павінен мяне хаваць.

– Не, ты мяне. Я не хачу, каб ты памёр раней за мяне, – настойваў я.

– Не, ты мяне! – не згаджаўся ён. – Я таксама не хачу перажыць цябе.

Тады я знайшоў найлепшае, на маю думку, выйсце:

– У такім выпадку давай памрэм разам, у адзін дзень, і ніхто з нас нікога не будзе хаваць. Няхай пра нас паклапацяцца іншыя!

Ад сумнай размовы мы перайшлі да смешнага. А найлепей – жыць і жыць. І нам, і ўсім.

# МІКОЛА ФЕДЗЮКОВІЧ

З Міколам мне тройчы давялося быць у творчых камандзіроўках. Выступалі на прадпрыемствах, ва ўстановах, у гаспадарках. Нас шмат што яднала: аднолькавыя імёны, рост і вага, нават аднолькавы шэры колер касцюмаў. Прыйшлі выступаць у прафтэхвучылішча. Зала поўная юнакоў і дзяўчат. Мы за сталом прэзідыума перакінуліся некалькімі словамі пра нешта вясёлае – нягучна, а яны пачулі і раптам чамусьці паехалі са смеху. Рагаталі і яны, і мы – хвілін мо дзесяць, і ніхто не ведаў, чаму. Відаць, у зале насіліся бацылы смеху. Потым мы дадалі гумару яшчэ і ў вершах, і ўсе парвалі жываты.

Выступаем перад дарослымі. Мікола нечакана пачынае:

– Верабей чырык-чырык,

Заляцеў у хатку.

Я штурхаю яго пад бок:

– Ты што, тут жа не дзеці.

А ён: – Нічога, усе мы былі дзецьмі, весялей будзе.

І сапраўды, усталяваўся вясёлы настрой.

У іншым месцы чытае верш:

Як мы рэзалі, ці не рэзалі,

*Як калолі мы вепрука.*

Я з падколам пытаюся:

– Дык што ўсё ж – рэзалі, ці не рэзалі? Ці калолі? Парсюка ж не рэжуць, а колюць. А вяпрук – дзікі парсюк, яго ўвогуле страляюць.

– Ат, гэта не важна, – бесклопатна адказаў Мікола.

Ездзім на выступленні, ходзім па Пінску, гляджу – у майго Міколы хада, як у слана. Чаму, пытаюся. А ён кажа, што жонка купіла і падаравала яму чаравікі, а ў іх (я сам бачу) падэшва таўшчэзная, абцасы ж утрая таўсцей. Але такая новая модная мадэль. А вось мне чаравікі спадабаліся.

– Прадай, – кажу, – мне. За паўцаны. А сабе купіш лёгенькія. – Ён з гатоўнасцю згадзіўся. На тым і парашылі. Я аблегчыў яму жыццё, дакладней, ногі. Мікола купіў танныя красоўкі і шыкаваў у іх, як малады.

Пасля ён звоніць жонцы. Пагаварылі пра ўсё. Яна, між іншым, паведаміла, што трагічна загінула дачка паэта Анатоля Вялюгіна – Іра. Потым Мікола расказвае ёй, што прадаў мне чаравікі. У трубцы чуецца лямант.

– Нс крычы, бо і ты памрэш, – з гумарам адказаў Мікола. Праўда, гэтыя чаравікі не пайшлі на карысць мне, бо пасля вяртання дамоў мне цяжка было іх насіць – ужо я хадзіў як слон. Мог абуць хіба што на паўгадзінную прагулку. Ступні ног не гнуліся, можна было зарабіць плоскаступнёвасць. Урэшце я іх камусьці падараваў. Так сказаць, збыў з рук, дакладней – з ног.

У час выступленняў я пастаянна пахвальваў Міколу:

– Ён актыўна ўмешваецца ў жыццё, калі піша хоць пра новабудоўлі, хоць пра гранітаздабытчыкаў у Мікашэвічах. Ён – слаўны камсамольскі паэт.

Мікола ўрэшце не вытрымаў і сказаў мне:

– Ты кінь расхвальваць мяне. Камсамольскі паэт – дрэнны паэт. Ты яшчэ назаві мяне партыйным паэтам! Я – проста паэт.

## МІКОЛА ТАТУР І МІКОЛА ГАМОЛКА

Мне даводзілася выступаць з імі абодвума. І я ведаў, што ім не здзівіць публіку нічым звышарыгінальным, бо першы нешта трохі перакладаў, другі імкнуўся напісаць штосьці сваё, наколькі яму ўдавалася. І я вырашыў падкузьміць Татура:

– Вы, Мікалай Ігнатавіч, неаднойчы выступалі з Гамолкам. Дык як вы ставіцеся да яго выступленняў? Той грэбліва паглядзеў і адказаў:

– Тарабаршчына!

«Так, магчыма, і тарабаршчына, – падумаў я, – але ж свая. А ў цябе ж – і таго няма».

## НАСТАЎНІКІ – ПАЭТЫ

Зайшлі да мяне два паэты, пагаманілі і, між іншым, расказалі даўнюю гісторыю.

Трое студэнтаў філфака БДУ, яны ж і вершы пісалі зрасходавалі свае стыпендыі і засталіся, як кажуць, на бабах. Ну, калі б быў боб, то жыць яшчэ можна было б, але і таго няма. А есці ж хацелася, і не толькі – вядома ж, маладыя. Дзе ж дастаць грошы? Вырашылі схадзіці дамоў да выкладчыка, да таго ж вядомага паэта. Пазванілі ў дзверы, а самі з асцярожнасці сталі адзін за адным на выступках лесвіцы.

Ён выйшаў і з вышыні свайго немалога росту спытаў:

– Што трэба?

Хлопцы занылі-застагналі:

– Ды вось стыпендыі скончыліся. Дык пазычце ці дайце нам трохі грошай.

Выкладчык разгневаўся і рыкнуў:

– Ідзіце, не наглейце!

Ды як «пагладзіў» па ілбе першага сваёй магутнай лапай, аж той паваліўся на другога, другі – на трэцяга, і ўсе трое пакаціліся па прыступках лесвіцы.

А голад не цётка. Пайшлі да другога выкладчыка, балазе, той таксама быў паэт, да таго ж шэфстваваў над маладымі літаратарамі. І заўсёды быў ласкавы, з усмешкай.

Пазванілі. Адчыніў. Хлопцы зноў просяцца:

– Няма чаго есці. Пазычце ці дайце нам грошай. – Выкладчык пляснуў у далоні і заскугатаў:

– Вой, хлопчыкі, мае даражэнькія! Ды ў мяне ж няма грошыкаў, усе яны на кніжачцы. Я ж думаю купіць машыначку. Лепш я вам кавалачак сальца дам.

Студэнты выйшлі з дому ды як ляснуць гэтым салам аб сцяну! Ім жа найперш хацелася выпіць, а пасля ўжо – закусіць.

## ВІКТАР ДАЙЛІДА

Таварышы часам кпілі з яго:

– Скажы, Віктар, чаму ў цябе такое дзіўнае прозвішча – Дайліда? Пэўна, тваю маці клікалі Лідай, і яна была гуляшчая? А ўсе мужыкі пра гэта ведалі і часта прасілі:

– Дай, Ліда!

Віктар сарамліва аднекваўся:

– Што вы, што вы! Гэта мае продкі займаліся дойлідствам.

## АЛЕСЬ РЫБАК

Калі адзін час жыў і працаваў у Маскве, то з гонарам заяўляў:

– Пахаваюць у Маскве! Пахаваюць у Маскве!

Калі ж быў вымушаны вярнуцца ў Мінск, змяніў гаворку:

– Настальгія заела! Настальгія заела!

## ПЯТРО СТЭФАНОВІЧ

Неяк перад адным са з'ездаў быў масавы прыём у члены Саюза пісьменнікаў. Сярод прэтэндэнтаў быў і Пятро Стэфановіч, які крыху перакладаў, зрэдку пісаў які-небудзь скэтч. Трэцяя, самая высокая і галоўная камісія – прэзідыум (цяпер гэта – Рада) складаўся з паўсотні чалавек, у асноўным дзядоў.

Надышла чарга Стэфановіча. У канцы абмеркавання яны спыталі яго:

– Над чым зараз працуеш, Пятро, што пішаш?

– Ні над чым не працую, – адказаў той, – фазэнду будую.

Дзяды засмяяліся і сказалі:

– Трэба прымаць.

# ВАСІЛЬ ВІТКА

Ён быў сур'ёзны, строгі, нават суровы. Пісаў вершы для дарослых і дзяцей. Доўгі час рэдагаваў часопіс «Вясёлка». Даводзілася бачыцца з ім, трохі перамаўляцца, але да вялікага сяброўсва не даходзіла з-за даволі значнай розніцы ва ўзросце і характарах.

Я не быў удзельнікам ці сведкам тых выпадкаў, пра якія пойдзе гаворка, але прывяду з прыватных размоў з некаторымі старэйшымі пісьменнікамі. Як кажуць, за што купіў, за тое й прадаю.

Распавядаў адзін з таварышаў па пяру.

– Правінцыйная журналістка, яна ж – трохі і літаратарка, перабралася жыць у сталіцу. Уладкавалася на работу ў рэдакцыю вядомага магутнага выдання. Добра зарэкамендавала сябе ў працы.

Праз нейкі час яе сустракаюць уплывовыя знаёмыя. І кажуць – раяць – напішы кніжку пра Васіля Вітку. Падтрымаем. Надрукуем. Прымем у Саюз пісьменнікаў. Інакш памрэш у невядомасці.

Напружылася. Напісала.

Падтрымалі. Надрукавалі. Прынялі ў Саюз. Усе задаволены.

У творчых людзей, у прыватнасці, у пісьменнікаў, бывае саперніцтва. У лірыкаў – з лірыкамі, у сатырыкаў – з сатырыкамі, у лірыкаў-сатырыкаў – з лірыкамі-сатырыкамі, у драматургаў – з драматургамі, у дзіцячых пісьменнікаў – з дзіцячымі.

Расказваў старэйшы пісьменнік – здаецца Язэп Семяжон, і літаратар, і славуты перакладчык. На старасці гадоў адрасціў сівыя вусы і бараду – ну, як акадэмік, ну, як Эрнест Хэмінгуэй.

– Прахадзіў прыём у члены Саюза пісьменнікаў. Сярод іншых кандыдатаў была і Ніна Галіноўская, якая пісала і цяпер піша ў асноўным для дзяцей. Яе, як і былога мужа Яўгена Крупеньку, доўга мучылі з гэтымі прыёмамі. І ўсё тармазілі. А тут – Васіль Вітка выступае, расхвальвае, аж са скуры вылузваецца:

– Вох, вох, вох, якая яна выдатная жанчына, які цудоўны чалавек, якая адмысловая паэтка! Усе на свеце дзеткі ў захап-

ленні ад яе вершаняткаў! Абавязкова трэба прымаць гэтую дзіцячую паэтку.

Ідзе прыём. Галасуем. Стаім побач. У нас у руках – бюлетэні. Я стаю побач, збоку. Скасавурыўся, савурыўся і пазіраю. Вітка бярэ ручку – і... рашуча выкрэслівае са спісу Галіноўскую.

Вось так. А як пахвальваў! І нашто? Пыл у вочы...

Еўдакія Лось, наша выдатная ў мінулым жанчына і паэтка, і для дзяцей пісала – наколькі памятаю, пасля Віткі нейкі час сама ўзначальвала «Вясёлку» – скардзілася, што ў час свайго рэдактарства Вітка не вельмі ветла і добразычліва прымаў яе. І адказваў ён прыкладна так:

*Прывітанне табе, мая любачка.*

*Друкавацца ў нас цяжка, галубачка.*

А яна ўжо была тады шырока вядомай літаратаркай.

Вось такія былі «жартачкі» нашага шаноўнага Мэтра. Не самыя лепшыя жартачкі. Ну што ж...

Высокім – не вельмі, а хоць бы трошкі – больш дазволена. Ва ўсялякім разе – так яны лічаць.

Самі.

## ВІКТАР ШНІП

Паэт Віктар Шніп – былы галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва». Там жа працавала яго жонка Людміла Рублеўская, паэтка. Разгаварыўся з ім аднойчы па-сяброўску:

– Ці не напісаць мне вялізны крытычны артыкул пра дзяржаўнае выдавецтва? Маю багатую фактуру. Друкаваць будзеце ці баіцеся?

– Ат, не варта звязвацца, ці будзе толк? – адказаў ён.

– Ды ўжо гадоў дзевяць там ляжыць мая не тоўстая кніжка – двойчы гублялася, двойчы была ў плане, але не задуць кажуць – сам шукай заказы і заказчыкаў, няхай пераводзяць нам грошы. (На сённяшні дзень кніжка там ужо 13- ты год.)

– А ў мяне, – адказаў ён, – кніжка здадзена ў тую ж «Мастацкую літаратуру» яшчэ ў 1991 годдзе, і таксама не выходзіць. Там кажуць:

– Затое нядаўна выйшла кніжка тваёй жонкі.

– Дык што ж, – сумна працягваў ён, – дзеля выхаду кніжкі мне цяпер трэба разводзіцца з жонкай? – Ён безнадзейна махнуў рукой і адышоў. І я таксама адышоў. А потым падумаў: трэба было даць прыяцелю і калегу слушную параду:

– Віця, а ты вазьмі ды часова развядзіся, а як выдадуць кніжку – тады сыдзецеся зноў.

І ўсё стане на свае месцы.

А захочаш некалі выдаць яшчэ кніжку – зноў развядзешся – сыдзешся. І так увесь час.

Вось такі гумар. Сумнаваты гумар. Але ж – такое наша нялёгкае творчае жыццё.

## ЯЎГЕН КРУПЕНЬКА

Аднойчы ў рэспубліканскай маладзёжнай газеце «Чырвоная змена» была надрукавана вострая пародыя Валерыя Шыханцова на няўдалыя вершы Яўгена Крупенькі. Ну, чаму ж тут радавацца? Адна справа – цёплая эпіграма, зусім іншае – рэзкая пародыя. Аднак Яўген схапіў газету і насіўся па ўсяму Дому друку, выхваляўся:

– Во, як мяне прапясочылі! Значыцца, недарэмна я працую, недарэмна пішу. Значыцца, мяне заўважылі!

Знайшоў, чым ганарыцца... Не той гонар.

## АЛЕСЬ СТАВЕР

Ён неяк паехаў з групай пісьменнікаў у адзін з раёнаў. Пасля аднаго выступлення іх акружылі мясцовыя паэты. Алесь падышоў да аднаго з іх, ды як лясне па плечуку:

– Ну, чаго рот разявіў? Не бачыш – класікі прыехалі? Вядзі, частуй!

А таму што рабіць? Ён і яго таварышы вымушаны былі сталічных гасцей частаваць. А як жа быць – усё ж класікі пры-ехалі...

Радасці і гонару шмат было правінцыялам. А расходы – што ж, Бог з імі. Не кожны ж раз, не кожны дзень.

## МІХАСЬ СКРЫПКА

Старэйшы сатырык сустрэў знаёмых і прывітаў іх па-сяброўску, у перакладзе з Гогаля.

– Га, знаёмыя ўсё твары! Адна кабета з гэтай кампаніі страшна абурылася:

– Почему вы нас так оскорбляете? Какие мы вам твари? Мы ведь не звери!

Міхась Аляксандравіч грэбліва адказаў:

– Цемра ты непралазная! Трэба не абурацца, а вывучаць мову. Мову сваёй краіны.

## ЯКІЯ РОЗНЫЯ І ТВОРЦЫ

Выступае недзе група пісьменнікаў: Эдуард Валасевіч, Рыгор Шкраба, яшчэ нехта – усе кульгавыя, на кульбах. А слухачы перамаўляюцца:

– А што, усе беларускія пісьменнікі – кульгавыя?

Іншыя разам выступаюць, уся група – лысыя. Слухачы пытаюцца:

– А што, усе беларускія пісьменнікі – лысыя?

Трэцім разам група падабралася – усе яўрэі. І распавядаюць пра свае ваенныя подзвігі. Публіка цікавіцца:

– А што, усе беларускія пісьменнікі – яўрэі, і ўсе ваявалі?

Потым гэтыя як бы жартачкі ўсім надакучылі, і ў бюро прапаганды Саюза пісьменнікаў пачалі камплектаваць творчыя брыгады па новаму прынцыпу: аднаго – кульгавага, аднаго – лысага, аднаго – яўрэя.

Усё ж хоць бы нейкая разнастайнасць.

## Я – І МАЕ ВУЧНІ

Шмат гадоў я быў старшынёй літаб'яднання розных газет, пасля – літкансультантам. І вось аднойчы арганізаваў выступленне ў заводскім дзявочым інтэрнаце. Прывёў з сабой чац-

вярых маладых паэтаў – не па ўзросту, а па творчасці. І ўсе яны аказаліся... лысымі. Мы селі на сцэне, я – пасярэдзіне паміж імі.

Дзяўчаты пасміхваюцца і перагаворваюцца:

– Ну й дзіва. Маладыя паэты, а ўсе – лысыя, толькі кіраўнік іх з валасамі.

Пасля выступлення мае вучні-сябры ледзь не білі мяне:

– Бач, які разумны! Мы ўсе свецімся галовамі, як голымі каленямі, а ён – паміж намі, і трасе чупрынай. Проста здзек перад дзяўчатамі!

Што ж, прабачце, гэта было не наўмысна. Проста так атрымалася.

## СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ І СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ

Абое ў вельмі сталых гадах яны доўгі час варагавалі. Кожны з іх лічыў, што піша лепш за другога. Было нездаровае саперніцтва. Нярэдка іх пасылалі выступаць разам, а яны не хацелі сустракацца, сутыкацца.

Звычайна Шушкевіч прыходзіў і выступаў першы, а Грахоўскі падстройваўся пад яго адыход. Станіслаў Пятровіч прыдумаў хітры розыграш Сяргея Іванавіча. Ён напамяць вывучыў вершы, з якімі выступаў яго сапернік. Выходзіць на сцэну і пачынае:

– Прывітанне, дарагія чытачы! Я – паэт Сяргей Грахоўскі. Зараз прачытаю вам свае любімыя вершы. І пайшоў-паехаў. Прыкладна так: Радзіма. Народ. Маці. Каханне. Сям'я. Прырода... І гэтак далей.

Выступленне падыходзіць да канца. Магутнаю хадою крочыць Грахоўскі. Шушкевіч хуценька сыходзіць са сцэны і бясследна знікае.

Сяргей Іванавіч абвяшчае:

– Прывітанне, дарагія чытачы! Я – паэт Сяргей Грахоўскі (усе здзіўлена пераглядваюцца). Зараз я прачытаю свае любімыя вершы.

І пайшоў – паехаў. Тое ж, што перад гэтым чытаў Шушкевіч, але не сваё. Радзіма. Народ. Маці. Каханне. Сям'я. Прырода... І гэтак далей.

Слухачы спачатку пасміхваюцца, потым смяюцца, затым рагочуць. І нічога не разумеюць: што гэта за розыгрыш, што за канцэрт? Не ў цырк жа прыйшлі. Нічога не разумее і Грахоўскі: адкуль смех, чаму рогат? Не гумар жа чытае.

З цягам часу ён расшалопаў, у чым справа, і паскардзіўся у Бюро прапаганды. Больш разам выступаць іх не пасылалі. Удваіх ім было цесна.

## УЛАДЗІМІР ДЗЮБА

Калісьці ён выдаў першую кніжачку лірычных вершаў. Зборнічак быў так сабе, пра гэта казаў і сам рэдактар Янка Сіпакоў. Аднак я вырашыў маральна падтрымаць прыяцеля і напісаў цёплую рэцэнзію. Здаў у рэдакцыю газеты «Літаратура і мастацтва», чакаю публікацыі.

Тым часам ў рэдакцыю завітаў Валодзя. Соваўся па аддзелах і вынюхаў маю рэцэнзію, яна ляжала на адным стале зверху. Прачытаў, паглядзеў і рашуча запатрабаваў:

– Няхай напіша хто-небудзь больш важны і ўплывовы!

І напісалі...два зусім невядомыя студэнты. Разгромную. Хацеў больш славы, атрымалася – наадварот.

## АБГАВАРЫЛІ

У ранейшы нейкі час па накіраванню Саюза пісьменнікаў нас трох адправілі на выступленне ў Інстытут культуры. У творчай брыгадзе былі празаік Алесь Крыга, сатырык Уладзімір Праўдасуд і я – гумарыст Мікола Вяршынін.

Выступілі. Нас прывіталі. Рукі паціснулі на развітанне. Усе былі задаволены. Праўда, публіка была напалову старэйшая і найстарэйшая – чамусьці гадоў ад 50 і больш таго.

Пасля нашага выступу папаўзла плётка (а нам даклалі пра гэта сябры).

Алесь Крыга выступаў з нецікавай прозай, і чытаў нецікава.

Уладзімір Правасуд быў апрануты непрыгожа і часта соп (але ж ён не артыст. Важна тое, не як выступае, а што чытае сам пісьменнік).

Ну, а мяне абгаварылі за тое, што я чытаў залішне маладзёжныя для іх старэйшай аўдыторыі: «Аб модзе» – пра кароткія спаднічкі, «І зноў аб модзе» – пра шыньёны, «Благое падабенства» – пра доўгія валасы ў хлопцаў, і вечная мая гумарэска «Як я аднойчы быў жанатым».

Ну, мы ж не думалі, што дзяды будуць такімі архаічнымі. І вырашылі – век да іх не пойдзем. Тым больш, можа, іх ўжо нават і няма – час іх мінуў.

## “ПАДАРАВАЎ”

Адзначалі дзень нараджэння Рыгора Яўсеева. Нас сабралася трое сатырыкаў: ён, я і яшчэ адзін. Сядзім, віншуем, падымаем кілішкі.

Я падараваў імянініку пяць салідных кніг, у тым ліку “Даведнік журналіста”, так патрэбны яму (Рыгор у той час працаваў у рэдакцыі. І вось устае старэйшы:

– А вось табе мой падарунак!

Вымае з кішэні і рашуча кладзе на стол… пачака самых простых і танных цыгарэт “Астра”. Дык вось даў! Хоць бы пару пачак цыгарэт з фільтрам “Гродна” ці “Арбіта”. Было б больш культурна і інтэлігентна.

А, можа, грошай не было? Дык лепш было б зусім нічога не дарыць… А мо гумар такі.

Рыгор, чалавек просты і добры, гэтага як бы не заўважыў. Вясёлая гамана працягвалася.

## ЗМІЦЕР ПАДБЯРЭЗСКІ

Сустракаю на рагу майго дома Зміцера Падбярэзскага.

– Мікола, – кажа ён, – у мяне ёсць слушная прапанова: давай створым Цнянска-Куйбышаўскую філію (па назвах нашых ушчыльную размешчаных вуліц) Саюза пісьменнікаў. Ты, я, і Мікола Гіль.

– Бяры шырэй – адказваю , – трэба філія хоць бы ўсяго Савецкага раёна сталіцы: яшчэ Уладзімір Паўлаў, Алесь Камароўскі, Васіль Макарэвіч, Навум Гальпяровіч, Георгій Марчук...

– Ат, не трэба занадта разрастацца ды заглыбляцца і разбіваць штаты. А так у кожнага з нас будзе па пасадзе: адзін – старшыня, другі – намеснік, трэці – дырэктар літфонда. Кожнаму – па партфелю і акладу!

Расказаў пра гэту гаворку калегам па пяру – разам пасмяяліся...

## Я – І МАЕ ГАНАРАРЫ

Гэта ўсё было раней.

Заходжу ў салідную рэдакцыю. Сябар, загадчык аддзела, калупаецца ў паперах. Угледзеў мяне і ўзрадаваўся.

– Га, Мікола, прывітанне! Вось рыхтую выпуск сатыры і гумару, думаю, ці ставіць твой верш?

– Стаў! – усклікнуў я. – Яшчэ думаеш…

– Бяжы па пляшку!

Я і пабег што ж зробіш. Балазе – крама побач.

Узяў бутэльку за 5 тысяч, трохі закусі, прыйшоў. Падскоквае хлопчык з сакратарыяту. Хай, думаю, пасядзіць і ён – пэўна ж , ганарар размячае – накіне больш.

Праз нейкі час прыходжу па ганарар. Во, думаю, накідаюць. Друкавалі ж і пашыраную заметку, і ладны вершаваны фельетон. Атрымліваю... 3800 рублёў. Вось дык далі! Не прыбытак, а ўбытак.

Уздзенская раёнка надрукавала маю падборку вершаў, змясціла партрэт і біяграфію. І ціха-ціха. Званю рэдактару:

– А што, ганарар даваць не ў модзе?

– Прабач, Мікола, грошай няма.

Рэспубліканская газета «Дачнік», што выходзіць ў Гомелі, апублікавала маю немалую сатырычную паэму «Дача, дача – вось няўдача». Я верш паслаў, але публікацыі не бачыў. Сябры паказалі. Пачаў патрабаваць ганарар – месяцы чатыры ці нават восем дамагаўся, ледзь «выбіў» невялікія грошы.

Паказваю сябрам цэлую старонку публікацый ў заводскай газеце. Яны пытаюцца:

– Пэўна, ганарарам завалілі?

– Заводскія шматтыражкі не плацяць. Наадварот: я сам ім пляшку паставіў.

– Як? Чаму і за што?

– За дружбу. Калі ж у раённай, а то і ў буйнейшай газеце даюць ганарар 1000-1400 рублёў – не хочацца атрымліваць. Гэта ж – на бохан хлеба.

У апошні час я нярэдка выступаў па радыё ў ранішніх перадачах «Будзьма разам» – на розныя жыццёвыя тэмы. Мяне нават назвалі народным экспертам. Даваў парады, дапамагаў разабрацца ў многіх складаных сітуацыях. Падключаўся да перадач па тэлефоне прама з кватэры, за кубкам кавы.

Сябры, знаёмыя, калегі ці сур'ёзна, ці з усмешкай пыталіся:

– Ты, мусіць, ад радыё ганарары шуфлём грабеш?

– Што вы, – адказваю, – грошы невялікія плацяць, толькі калі выступаеш у студыі. А з дому, па тэлефоне – нуль.

– Які ж сэнс у тваіх выступленнях?

– Як чалавек пажылы і вопытны, рознаадукаваны і паэт-сатырык, вучу людзей жыць.

– І ўсё ж – хоць якія ганарары?

– Адны ўбыткі. Я толькі сам плачу за тэлефонныя размовы.

Жонка кажа:

– Калі ты разоў дзесяць за месяц выступіш у гэтых перадачах, то заплаціш за тэлефон больш, чым я званячы па справах. Навошта табе гэта?

– Дык хоць бы якія сувеніры ці прызы або прэміі выдзелілі, – не супакойваліваліся сябры.

– Адкуль яны возьмуць? – адказваю я.

Адзін адказаў:

– Нічога, цярпі, слава важней!

– У мяне гэтай славы і так вышэй вушэй, толькі няма грашэй. Я б сам аддаў нейкаму багацею мяшэчак славы, калі б ён мне даў паўмяшэчка грошай.

Прыведеныя выпадкі раней былі рэдкасцю, а цяпер сталі рэгулярнымі. Неплацяжы або зацяжкі плацяжэй не толькі ў вытворчасці, эканоміцы, але і ў творчай сферы. Рэдакцыям кажуць: – Зарабляйце самі грошы. Ці брашуры, ці кніжкі выпускайце за кошт аўтараў, ці фундатараў.

І ўсё ж жыццё працягваецца – і ў вытворчасці, і ў эканоміцы, і ў творчасці. Прытым, як кажуць, сытым горш працуецца, чым нясытым. Аднак жа ўсім хочацца быць сыцейшымі.

Не важна, у якія сітуацыі трапляюць пісьменнікі, як і ўсе людзі. Важна, як яны з іх вы-ходзяць.

І каб чытаць іх творы было цікава.

*А чытачам, а чытачам —*
*Што прачытаць*
*найлепей нам?*
*За кнігі розныя бярыся,*
*Што цікавей —*
*сам разбярыся.*

## ХВЕДАР ЧЭРНЯ

Ён рэдагаваў маю чарговую кніжку, працаваў над рукапісам дома. Я заходзіў да яго, каб прыспешваць работу. А як ні зайду, аловак ляжыць заўсёды на адной і той жа старонцы, а Хведар звычайна ўжо знаходзіцца ў бязважкім стане. І настойвае, каб я скокнуў у краму. Я і так з ветлівасці прыношу з сабой, але яму ўсё мала. Ён патрабуе, а жонка яго Надзея – дзіка супраць. А я аказваюся ў дурным становішчы, між двух агнёў: дагаджу аднаму – пакрыўджу другога. Дагадзіць жа абодвум адразу – немагчыма. Не схаджу – ён псіхане, забзыкуе; схаджу, прынясу – яна выгане з хаты...

Нарэшце, мне надакучыла ўся гэтая бадзяга, і я запатрабаваў другога рэдактара. Дапрацоўваць даручылі Рыгору Яўсееву. Той таксама любіў па-сяброўску пасядзець (а хто ж не любіць?), але працаваў настойліва і ўпарта. Выдатны быў рэдактар.

# І ЗНОЎ ПРА МІХАСЯ СКРЫПКУ

Ён павучаў мяне жыць.

– Мікола, гуляй, пакуль гуляецца. Пакуль сіла ёсць. Не спяшайся жаніцца.

І сам так паводзіў сябе, не праходзіў міма ніводнай маладзенькай дзяўчыны. Асабліва пасля выступленняў.

А ў выніку пажаніўся са сваёй былой вучаніцай – яна была на дваццаць гадоў маладзейшая за яго. Ён быў вымушаны пайсці на гэта, бо гуляў – дагуляўся, і адступаць ужо не было куды, а яна была дзеўкай энергічнай і ўчэпістай, і змагла зацугляць яго, гэткага жарэбчыка.

Прыяцелі пад'ялдыквалі яго:

– Ну, што, Міхась, пажаніўся з дачкой па ўзросту? Што ж ты будзеш з ёй рабіць?

– А, вой, вой, вой! – завойкаў той. – Чым каб было менш, дык хай застанецца больш!

Ну, Міхась Аляксандравіч, наш ты Дон Жуан, ты наш Казанова, яшчэ хто?

А яна кіравала, жоначка яго, сямейнымі лейцамі. Наколькі магла.

Відаць, нямала яго былых сяброўак стогнуць па ім, як бялугі, і спяваюць яму пасмяротныя гімны.

Усё ж быў – мужчына. Паэт. Сатырык і гумарыст. А такога дзе знойдзеш?

Невысокім ростам, не прыгажун, але з вясёлаю і добраю душой. І жыў, грашыў – але ж хто з нас – не такі? Толькі дзівакі і бедакі...

# ВОСЬ ДЫК ЖАРТАЧКІ

Адзін паэт раённага маштабу выціснуў у выдавецтве кніжачку і плаваў у марах аб далейшых творчых поспехах. Праз нейкі час яго знаёмыя з Мінску ці то пазванілі, ці прыслалі тэлеграму з віншаваннем аб прыёме таго ў Саюз пісьменнікаў. І, маўляў, можаш шырока адзначаць гэтую выдатную жыццёвую падзею, радуйся бясконца!

Той хутка зарыентаваўся, заказаў залу ў раённым рэстаране, прыціснуў цяля, закалоў парсюка, здаў мяса ў рэстаран, каб абышлося больш танна, заказаў гарэлку і выціснуў сваёй на мядку, склікаў сваякоў, сяброў і начальства, і закаціў банкет з прыемнае прычыны, загулялі-загулі.

Але... хоць слаўнае было вяселле, ды горкім сталася пахмелле. Ішоў час, а з Мінску – ні гуку. Пэўна ж, калі б прымалі ў Саюз пісьменнікаў, то запрасілі б прыехаць у сталіцу. А так – гэта былі жартачкі яго знаёмых.

Дурныя «жартачкі», як кажуць, давярай, ды правярай.

Не так шкада, што прапала цяля. Не так шкада, што прапаў парсюк, шкада свайго гонару.

А гумар бывае і чорны. Трэба ж разумець, дзе мёд, а дзе – дзёгаць.

## МІХАСЬ ВЫШЫНСКІ

Ён і Пятро Ліпай нейкі час жылі ў двухпакаёвай кватэры на пасёлку падшыпнікавага завода. У кожнага было па пакою. Пятро быў акуратыст, а Міхась – далёкі ад ахайнасці. Як яны ўжываліся на агульнай кухні – не ведаю. Адзін засмечваў, другі – чысціў.

Запрасілі выступіць мяне, Міхася і Анатоля Майсеева ў мужчынскім інтэрнаце трактарнага завода. Збор быў на кватэры ў Анатоля. Прыходжу.

А там ужо Міхась, і на добрым падпітку. Пытаюся ў Анатоля: – У чым справа? – Той адказвае: – Ды ён прыйшоў ужо паддаты. А я яшчэ наліў.

– На які чорт? – Дык ён жа член Саюза, а я – не. Паважаць трэба. – Дапаважаешся, сарве выступленне! – разззлаваўся я.

Пайшлі выступаць. Першы – Анатоль з вершамі. Потым абвяшчаю: – А зараз выступіць майстар пяра Міхась Вышынскі, і пачытае свае апавяданні.

У Міхася язык ледзь варочаецца. Пыкаў, мыкаў – нібельмэс! Дзяўчына, выхавацелька інтэрната, ад сораму схавала пачырванелы твар у рукі. Ратаваць становішча давялося мне.

Пачынаю сатыру і гумар, выклікаў смех і воплескі, згладзіў абстаноўку.

Праз нейкі час недзе сустракаю маладога рабочага з МТЗ, і ён пытаецца: – Ну, як там майстар пяра?

А сам жартаўліва ўсміхаецца.

– Нічога, – адказваю, – весяліцца.

Аказваецца, ён быў на тым выступленні і запамятаў Міхася.

Паехаў я з жонкай наведаць дваюроднага брата ў санаторый. Пайшлі на двор, у кусты і дрэвы, селі на лаўку. Я выняў пачастункі – ежу, бутэльку гарэлкі, запіўку. Брат піць катэгарычна адмовіўся, сказаў, што нельга, бо прымае моцныя лекі. Жонка амаль не п'е. Дык што ж, мне аднаму выпіць цэлую пляшку?

І тут бачу: з-за кустоў вылазіць Міхась Вышынск!. Узрадаваўся і кажа, што адпачывае і лечыцца. А выгляд пакамечаны.

– Раздзеліш з намі абед? – пытаюся з надзеяй.

– Ого-го, не сумнявайся! – чую радасны адказ.

Выпілі, закусілі, пагаманілі пра жыццё, здароўе, пра творчасць. Міхась як бы зняў з нас трох нагрузку і сам акрыяў. Вось радасці было! На здароўечка! Каб толькі так і было.

Усім нам стала весялей.

## УЛАДЗІМІР ПАЎЛАЎ

Званю аднойчы і пытаюся:

– Прывітанне, шаноўны сусед, дарагі сябар, паважаны рэдактар (пад яго рэдакцыяй выйшаў мой том выбраных твораў пад назвай «Дакрытыкаваўся»)! Ты – стары, вопытны рэдактар, выдатны мовазнаўца, дык растлумач мне сэнс некаторых слоў: – Ты здзічэў, зблажэў, сапсеў (асабліва апошняе слова).

– Слухай, Мікола, уважліва, – адказвае Уладзімір Андрэевіч. – Здзічэў – калі чалавек зрабіўся такім злым, агрэсіўным, як воўк, як сабака. Зблажэў – калі нехта вельмі пагана выглядае. А сапсеў – гэта не ад слоў «сабака» ці «пёс». Гэта калі адной нагой стаіць у труне, а другой – яшчэ на зямлі.

– Дзякуй, кажу, – ты развеяў маю цемру, цяпер буду ведаць, як да каго звяртацца пры сустрэчы. Праўда, найлепш увогуле не ўжываць гэтых слоў. Але ж усялякае здараецца – ці жартам, ці ўсур'ёз. Як кажуць, разумны – зразумее. А з дурным – увогуле нашто размаўляць.

## УЛАДЗІМІР ШАХАВЕЦ

У свой час выдавецтва «Мастацкая літаратура» знаходзілася на вуліцы Савецкай у невялікім доме. Намеснікам галоўнага рэдактара працаваў стары празаік Уладзімір Шахавец. Яго маленькі кабінецік з зарашэчаным акном размяшчаўся на першым паверсе – як катушок. Але мы, і аўтары, і супрацоўнікі, нярэдка збіраліся там, каб на схіле дня пасля нялёгкіх творчых спраў пасядзець і развеяць душу. Уладзімір Міхайлавіч быў добры, мудры чалавек, ставіўся да нас па-бацькоўску, іншы раз прымаў нас і дома на Круглай плошчы, і мы ласкава называлі яго «папа Шах».

Аднойчы ідзе па выдавецтву добра паддаты Яўген Крупенька, а насустрач яму – салідны мужчына, і пытаецца:

– Дзе ж ты, Жэня, так насцябаўся?

– Як дзе? – адказвае той. – У папы!

– У якога папы?

Жэня ад здзіўлення і абурэння аж узвіўся:

– Што, вы не ведаеце папу? – І давай усё расказваць пра Шахаўца – як мы збіраемся, як сядзім, і гэтак далей, з усімі падрабязнасцямі. Язык жа быў, як мянташка.

Той чалавек аказаўся начальнікам аддзела кадраў выдавецтва. І назаўтра ўваліў Шахаўцу, як каню. А той пасля адпаведна ўваліў Крупеньку. За дурную «рэкламу». Не ляпай абышто.

## ПЯТРО СТЭФАНОВІЧ

Ён працаваў у Доме літаратара на пасадзе інжынера. Папутна зрэдку мінімальна займаўся творчасцю – як бы неўпрыкмет.

І вось нечакана здарылася так, што ў падвале Дома творчасці пагарэла мэбля. Адказным па пасадзе і абавязках быў Стэфановіч. Яго маглі судзіць і пасадзіць. Шамякін быў першым сакратаром Саюза пісьменнікаў, а пасля кіраваў Беларускай энцыклапедыяй. Пятро Францавіч завітаў да яго і расплакаўся. Іван Пятровіч, добрая душа, пайшоў у рэдакцыю часопіса «Вожык», пусціў слязу і папрасіў:

– Хлопцы, ратуйце Стэфановіча – прападзе чалавек! Вазьміце яго да сябе на работу, прыкрыйце (а «Вожык» быў органам ЦК КПБ).

Узялі. І там ён – без выдатных журналісцкіх, сатырычных і пісьменніцкіх здольнасцей працаваў у літаратурным аддзеле аж чатыры гады – два да пенсіі, і два – пасля. Але працаваў так, што толькі заблытваў справы. Калі здасі яму рукапісы твораў, то пасля было цяжка адшукаць.

Апроч таго, ён быў адчайным сімулянтам, рэгулярна браў бюлетэнь, прытым на цэлы месяц. А сам тым часам то рамантаваў кватэру, то мяняў. То дачу будаваў.

Галоўны рэдактар Аляксандр Данілавіч Раманаў нарэшце разабраўся і сурова папярэдзіў:

– Пятро! Кінь свае хітрыкі. Калі яшчэ раз возьмеш бюлетэнь, прытым на месяц – выганю к чортавай матары.

Той зразумеў, спужаўся і перастаў. Усяму канец бывае.

Пра гэта мне з усмешкай распавядаў сам Стэфановіч.

## ПАЖАРТАВАЎ

З трактарнага завода нас штогод увосень адпраўлялі ў адсталы тады Лагойскі раён на ўборку бульбы. Пасылалі ў асноўным старых, нягеглых, з дрэнным зрокам – абы з рук збыць на месяц.

Едзем, выбіраем, гэтая бульба аж у вачах рабаціць. Ведама – не мужчынская работа. Не хочацца. Але ж мусіш.

Быў сярод нас вельмі пажылы адстаўнік, называлі яго па-руску – Афанасий. Нам, маладзейшым, было лягчэй, а яму – ну, што сказаць? Я глядзеў, глядзеў на яго, і скляпаў такую мініяцюру (па – руску):

Идёт по полю Афанасий

*В кирзовых старых сапогах.*

*Там семь на восемь, восемь на семь* (чытай – уздоўж і ўшыркі – 56-ты памер ботаў),

*И чуть стоит он на ногах.* (А ён увогуле не выпіваў. Проста быў слабы. Дахадзяга. Трымалі ж у нас у той час і да сямідзесяці гадоў).

Як вярнуліся – пачытаў усяму аддзелу. Усе смяяліся. А ён, дабрадушны, і не злаваў, а смяяўся разам з намі.

Усе б так разумелі гумар!

## МІХАСЬ ЧАВУСКІ

Ён працяглы час працаваў галоўным рэдактарам сатырычнага часопіса "Вожык". Адно яго вока невідушчае, што не перашкаджала яму бачыць жыццё з усімі яго недахопамі.

Заходзіць неяк да яго сябар, прыносіць гумарэску і кажа:

– Міхась, прачытай мой твор, кінь адным вокам.

Той здзіўлена пытаецца:

– А дзе ты ў мяне другое вока бачыш?

Атрымаўся як бы няўдалы жарт. Але бяскрыўдны.

## ЭДУАРД ВАЛАСЕВІЧ

Ён быў інвалідам – замест адной нагі быў пратэз. Не дзіва – удзельнік вайны, менавіта – славутай абароны Магілёва.

Збяруцца некалькі яго сяброў – пісьменнікаў, яго равеснікі. Адзін кажа:

– Эдуард, вось мы сабралі грошай, падскоч у краму на адной назе, вазьмі што трэба для стала.

Станіслававіч недаўменна адказвае:

– А дзе ты бачыш ў мяне другую нагу?

Як быццам чорны гумар. Але сябрам за ўсё даруецца.

## РЫГОР ЯЎСЕЕЎ

Мой калега па пяру часта дзяліўся са мной сваімі думкамі і ўражаннямі. Ён быў як прыроджаны да фізічнай працы: рукі, як крукі, магутная сіла. Летам і ўвосень яго звычайна адпраўлялі на сельгасработы ў калгас.

Аднойчы распавядаў мне:

– Я сяджу на беразе ручая. Пакурваю, чытаю, папіваю вінцо. Адным словам, адпачываю. Раптам з трыснягу выбягаюць мышкі. Заўважылі мяне, прыселі і цікуюць за мной. А я назіраю за імі, не рухаюся. Паглядзелі і пабеглі назад у траву. Праз нейкі час зноў выбеглі, пасядзелі, паглядзелі і зніклі. Так і забаўляліся мы. Яны былі мышкі, а я не – кошка. Таму яны і не баяліся мяне.

Іншым разам заходжу да Рыгора дамоў – жылі па-суседску. Ён пачаў мне скардзіцца:

– Ногі даўно баляць, цяжка хадзіць.

– Дык паліклініка ж побач, метраў за трыста, - адказваю. – Схадзі на прыём да ўрача , няхай прапіша лячэнне. Ці лянуешся схадзіць? Не таксі ж браць.

– Э, Мікола, – кажа ён. – Не бяры да галавы, не думай пра хваробы. Калі ёсць грошы, купі бутэльку гарэлкі, выпі грамаў дзвесце і думай, што ты здаровы. А пасля і весялосць прыйдзе… Калі дома я наліваў нам па кілішку, ён…казаў: – Ты не выдурвайся, сам як хочаш , а мне – шклянку!

Вось такі ён быў жыццярадасны і аптымістычны. І не дзіва – сатырык жа і гумарыст быў. І сумаваць ніколі не любіў.

## ГЕОРГІЙ МАРЧУК

Стаім утраіх на двары суседняга дома. Гуртуемся. І раптам я чую голас:

– Мікола, лаві!

Гляджу ўверх – з акна выглядае Георгій Марчук, вядомы драматург, былы дырэктар выдавецтва “Мастацкая літаратура”.

З акна вылятае цалафанавы пакецік . Падымаю. У ім - тры салёныя гуркі і адна тысяча рублёў. Ну даў, вось дык даў Георгій Васільевіч! Аднак ягоны “падарунак” прыйшоў нам дарэчы.

# МІКОЛА АЎРАМЧЫК

Я заходзіў да яго ў даўнія часы з вершамі, калі ён працаваў загадчыкам аддзела паэзіі часопіса “Маладосць”. Ён друкаваў мае творы.

Даўно бачыліся. Дамовіліся аб сустрэчы. У бліжэйшым для абодвух скверы. Так сказаць, на ўлонні прыроды.

Хаджу, шукаю, чакаю – няма. На дальняй алейцы угледзеў нейкага старога даўгога мужчыну ў плашчы і капялюшы. Не пазнаў, але падумаў – можа, ён? Больш нікога не бачна.

– Мікола Якаўлевіч! – гукаю на ўсялякі выпадак.

– Мікола! – адгукнуўся ён і пайшоў мне насустрач. – А я ўжо сам тут даўно бадзяюся і шукаю цябе. Думаў – ці ты згубіўся сярод дрэў, ці я.

Радасна прывіталіся, прыселі на лаўку, разгаварыліся. Я падараваў яму свой салідны том выбраных твораў, ён расчуліўся і шчыра падзякаваў, усё ж я ў некаторым сэнсе яго вучань, як і многія іншыя і старэйшыя за мяне. Сядзім, адзначаем паціху сярод зеляніны, не баючыся ахоўнікаў парадку, прыгадваем часы былыя аж ад канца шасцідзесятых гадоў і да апошняга часу. Што – сур'ёзна, а нешта – з жартам і смехам.

Я не ведаў Мікалая Якаўлевіча маладым. Калі я прыходзіў да яго ў рэдакцыю хлопцам гадоў пад трыццаць ( а бывала, і значна раней), яму было ўжо пяцьдзесят. Быў сіваваты, лысаваты, стараваты – і праз дзесяцігоддзі не вельмі змяніўся на выгляд. Бывае ж так: нехта хутка мяняе сваю знешнасць з гадамі, а іншы як бы ўрос у сябе, і вельмі доўга не мяняецца. Размаўляў заўсёды спакойна, з лёгкай усмешкай. Але я мала ведаў яго асабіста. Старэйшыя ж расказваюць, што ў сяброўскай вясёлай кампаніі ён такі хахмач – жываты ўсе парвуць са смеху. Не горш за таго ўсім вядомага Юрыя Нікуліна.

Часам мне здаецца, што ён і нарадзіўся старым і мудрым. Бывае ж так. А можа, і не…

І ўсё ж здароўя і творчых поспехаў Вам, шаноўны Мікалай Якаўлевіч, у вашы 85 гадоў і надалей. Не сумуйце, і часцей жартуйце.

*2005 год*

## НІЛ ГІЛЕВІЧ

Сустракаемся на ўваходзе ў рэспубліканскі Дом літаратара. Ён ці не на паўметра даўжэйшы за мяне ростам, гадоў на дзесяць старэйшы, дый творчых здабыткаў мае значна больш. Але ж і я не хлапчук у жыцці і ў літаратуры.

Як маладзейшы, вітаюся першым: – Дзень добры, Ніл сымонавіч.

А той ці задзірае галаву ўверх, ці апускае і глядзіць уніз, быццам не заўважае – каб не адказваць на прывітанне, і праходзіць моўчкі. Відаць, у кожным сатырыку-гумарысту падазрае саперніка, бо лічыць сябе першым.

Быў на кіруючых пасадах у высокіх сферах. Аднак высокай культуры так і не дасягнуў. Хоць бы элементарнай ветлівасці.

## Я І МАЕ ЧЫТАЧЫ

Адзінаццаць гадоў працаваў старшым інжынерам на трактарным заводзе. Пасля звыш двух дзесяцігоддзяў быў звязаны з заводам па рабоце. 22 гады кіраваў літаратурным аб'яднаннем пры рэдакцыі завадской газеты "Трактор", рэгулярна публікаваўся. Ведаў увесь завод, увесь завод ведаў мяне.

Іду, бывала, на работу ці з работы, сустракаю сяброў ці прыяцеляў, ці знаёмых. І яны пачынаюць дапытвацца:

– Ну, расказвай, што напісаў за апошні час, дзе друкаваўся, калі?

А настрою, здаралася, зусім няма, не хочацца і гаварыць, паслаў бы каго-небудзь з іх далёка. Але ... не маю права, бо я – іх аўтар, іх паэт, а яны, мае чытачы, маюць права ў мяне пытацца патрабаваць. Мушу доўга і падрабязна пра ўсё ім расказваць. Пра вершы, газеты, часопісы, дзе друкаваўся.

Адзін сябар прызнаўся шчыра мне аднойчы:

– Мікола, я чытаю газету "Трактор" у двух выпадках – калі там ёсць тэлеправграма і вершы Вяршыніна. Пішы больш і ўсё лепш і друкуйся часцей.

Зайшоў у рэдакцыю, расказаў пра гэтую размову рэдактару Зіновію Шарамеццеву. Той, заўсёды сур'ёзны і нават суровы , павёў вусамі, усміхнуўся і прамовіў:

– Ну, что ж, если так – придётся тебя чаще печатать.

Вось так. Слова чытача – закон. Для аўтара і рэдактара. У любой газеце і часопісе.

## ЯК ТВОРЧАСЦЬ МНЕ ДАПАМАГЛА

Калісьці на месцы цяперашняга універмага "Рыга", што амаль у цэнтры Мінска, стаяў драўляны кінатэатр "Вымпел". Падобных кінатэатраў у горадзе было некалькі. І вось аднойчы мяне накіравалі ад Саюза пісьменнікаў правесці там літаратурнае выступленне. Вечар сатыры і гумару.

З гатоўнасцю прыйшоў і думаю: зараз сустрэнуся з кінагледачамі – чытачамі. Заходжу ў залу – а там сядзяць... адны першакласнікі. Вось далі! Не хапала яшчэ, каб прывялі з дзіцячага садка. А я ж для дзяцей нічога не пішу. А выступаць трэба. Дык што ж ім чытаць? Думаў, думаў і – прыдумаў. Вырашыў чытаць байкі, а мараль не чытаў, бо гэта было б для іх залішне складана. У выніку атрымалася выдатна: дзеткі ўспрымалі гэта, як вершы пра звяркоў.

Плён майго выступлення быў добры для мяне. У гэтым кінатэатры ішлі цікавыя фільмы, прытам білеты былі недарагія. Але ад мяне білеты браць адмаўляліся. Аднойчы пайшлі з жонкай на двухсерыйны індыйскі фільм. Білеты – па 35 капеек за серыю. У суме – рубель і сорак капеек. Прад'яўляю білеты, а кантралёрка патрабуе:

– Ідзіце ў касу і здайце назад свае білеты. Вы ж у нас выступалі! – Пайшоў, здаў, купіў цукеркі.

Але "нядоўга музыка іграла" – праз нейкі час наш мілы драўляны кінатэатрык згарэў, як пагарэлі і некаторыя іншыя. А шкада. Мінулася мая маленькая ільгота.

Доўгі час працаваў інжынерам па забяспячэнню. Прыходжу неяк на мой ранейшы трактарны завод, каб аформіць выпіску метала для нашай арганізацыі. Заходжу да начальніка бюро, майго прыяцеля, каб узяць першую візу. А ён патрабуе (з усмешкай):

– Мікола, пакуль не прачытаеш дзве байкі – пісьмо не падпішу!

Мне тут не да баек, часу няма, але адчуваю: калі не падвесялю яго, ён сапраўды не падпіша. Як кажуць, не хочацца, але мусіш. Напружыўся, пачытаў, атрымаў і пайшоў далей аформіць.

Прыязджаю іншым разам на металабазу, каб загрузіць вялізны грузавік металам. Машын адусюль – вялікая чарга. У першай змене загрузіцца не паспеў. Упрасіў шафёра застацца на другую змену, паабяцаў адгул. Толькі чарга дайшла да мяне – і тут пачаўся дождж з пераходам на лівень. Грузчыкі пайшлі ў канторку кладаўшчыкоў, і я за імі. Скінулі рукавіцы, кінулі ў куток тросы. Сядзім усе моўчкі, сумуем пад шум дажджу.

І раптам мяне як прарвала. Я пачаў... чытаць гумарэскі. Яны слухаюць, усміхаюцца. Пасля – смяюцца, пляскаюць у ладкі. Затым зусім нечакана для мяне ўстаюць, надзяваюць рукавіцы, бяруць тросы і кіруюцца на выхад. А мне кажуць:

– Калі б не пачытаў свае гумарэскі – не выйшлі б, пакуль дождж не скончыўся б, хоць да самае начы. Хадзем грузіцца!

Вось так. Так што не трэба лічыць творчасць нечым абстрактным і няважкім. Яна можа не раз канкрэтна і сур'ёзна дапамагчы ў розных складаных жыццёвых сітуацыях. Няхай часцей будзе натхненне – і ў творчасці, і ў працы, і ў паўсядзённым жыцці!

## ПРЫЕМНА, КАЛІ ХВАЛЯЦЬ!

Заходжу ў рэдакцыю газеты "Белорусская ніва" да даўняга сябра Мікалая Курганскага, які вёў пастаянную рубрыку "Почта деда Михеда" – рыхтаваў выпускі сатыры і гумару. З разбегу кажу – патрабую:

– Коля, прынёс табе новую кніжку, давай прэзентацыю!

А той з усмешкай гаворыць сваім супрацоўнікам:

– У Вяршыніна кніжкі выходзяць часцей, чым у нас "Почта деда Михея". Не паспяваем прэзентаваць! Але трэба даваць. Чакай.

Што ж, як кажуць, добрае слова і кошцы прыемнае.

## ЦІ СУДЗІЦЬ, ЦІ АПРАЎДАЦЬ?

Такія цікавыя бываюць прозвішчы пісьменнікаў: Зэкаў, Трыбуналаў, Губернатараў, Законнікаў, Правасуд. Ну, прама крымінальны вышук і суд.

...Няхай бы яшчэ быў Адвакатаў. Можа, будзе?

## ІВАН БУРСАЎ, ІВАН МАРКЕВІЧ І МЫ

Іван Бурсаў калісь працаваў рабочым, счэпшчыкам вагонаў у чыгуначным цаху Мінскага трактарнага завода. Пісаў лірычныя вершы на рускай мове, актыўна друкаваўся. Пасля пераехаў жыць у Маскву. Стаў шырокавядомым паэтам, супрацоўнічаў з часопісам "Молодая гвардия". Займаўся і перакладамі, у асноўным – з беларускай мовы. Нярэдка прыязджаў у родны Мінск, заходзіў на родны завод, у рэдакцыю заводскай газеты "Трактор", тыраж якой у тыя часы быў магутны – 22000 экземпляраў, а на заводзе тады працавалі 32000 чалавек.

Іван Маркевіч быў даволі вядомым паэтам-лірыкам і журналістам. Працаваў у рэдакцыі рэспубліканскай газеты "Літаратура і мастацтва". Затым перайшоў на работу ў газету "Трактор".

У свой чарговы прыезд Івана Бурсава чакалі ў рэдакцыі нашай масавай шматтыражкі. Я як аўтар і кіраўнік літаб'яднання прыйшоў у рэдакцыю. Іван Маркевіч і я зайшлі ў кабінет рэдактара Зіновія Шарамеццева. Іван і кажа:

– Зіновій Аляксандравіч, у нас шаноўны маскоўскі госць. Дык трэба яго хоць трохі прывітаць. Я купіў бутэльку шампанскага, давайце разам вып'м па шклянцы-другой і па-сяброўску пагамонім.

Рэдактар аж усшалеў:

– Вы что, в редакции устроить пьянку, да ещё в рабочее время? Чтобы я больше слышать этого не мог! Накажу!

Заўважу, гэта было ў той час, калі на ўсіх узроўнях панавалі выпіўкі, банкеты, юбілеі ў офісах. Гэта ўсяляк заахвочвалася.

Бедны Іван на свае апошнія рублікі купіў шампанскага, а начальнік справіў яму вэрхал. Я незадаволена і абурана пайшоў, а Іван ад страху ледзь пад стол не палез.

Між тым раней Зіновій Аляксандравіч сам быў немалым аматараў выездаў на прыроду на шашлыкі і прыняцця добрай чаркі. Пасля ж перастроіўся, ці, як тады казалі, перабудаваўся. Зрабіўся як бы святым. Усе мы рабіліся святымі, калі грашыць ужо не можам. Калі нічога ўжо не можам. Дык трэба ж было нарадзіцца святым!

## БІЦЬ НЕЛЬГА!

У нашым магутным 12 –павярховым мужчынскім інтэрнаце трактарнага завода, што амаль з выхадам на Партызанскі праспект, ладзіўся вечар адпачынку, а дакладней – найцікавейшае спаборніцтва дзвюх камандаў Клубаў вясёлых і знаходлівых, што тады было надзвычай у модзе. Запрасілі гасцей з іншых мужчынскіх і жаночых інтэрнатаў. Я быў капітанам адной з камандаў "Халасцякі". Мне было тады гадоў за трыццаць, я завёў модную для даволі маладога прычоску – вусы, бакенбарды і бараду. Усё даволі светлае, мяккае, прыгожае. Шыкаваў, так сказаць.

Наша каманда перамагла, але суддзі звялі вынік на нічыю з-за таго, што публіка надта за нас перажывала, і з нас знялі адно ачко.

Пасля гульні – танцы. Ах, моладзь! Зачараванне і любоў. Заляцанні, каханне, сустрэчы...

Аднаму з нашых гасцей я нешта не спадабаўся. Ён, можа, быў нападпітку, сказаў сваім сябрам-таварышам:

– Я зараз падыду ды як стукну таму барадатаму па барадзе!

– Ты што, ахранеў? – здзівіліся, абурыліся яго сябры. – Гэта ж паэт.

– А што, паэтаў нельга біць? – здзівіўся той.

– Нельга! – рашуча адказалі сябрукі.

Так мне і абышлося. Без мардабою. Аўтарытэт уратаваў.

## БРАНІСЛАЎ СПРЫНЧАН

Я быў з ім у прыяцельскіх адносінах. Здаралася, разам хадзілі на вечары адпачынку ў адзін вядомы клуб у парк Чалюскінцаў, хоць ён на 12 гадоў старэйшы за мяне, дый здароўечка меў адпаведна значна горшае. Але стараўся трымацца бадзёра, хоць і не падбрыкваў, як козлік, бо характарам быў спакойны і разважлівы. А на жанчынак пазіраў уважліва і неабыякава.

Працаваў загадчыкам аддзела паэзіі папулярнага часопіса "Нёман". У мяне вершаў і перакладных хапала. І вось аднойчы ёе мне кажа (а ўтой час, як і пасля, туды прабіцца было нялёгка):

– Ничего, Микола, и тебя додим!

Аднак з гэтага «додим» нічога не атрымалася. Было – прынёс яму пару вясёлых вершаў у перакладзе на рускую Івана Бурсава. У выніку яны не толькі не былі надрукаваныя, але зусім прапалі. А запасных экземпляраў у мяне не было. На вялікі жаль.

Але я не сумаваў. З мяне хапала публікацый і ў беларускамоўных, і ў рускамоўных выданнях.

Толькі запамятаў цівавы выраз Спрынчана "И тебя додим!"

## АДУКАВАЛІСЯ

Сельская дзяўчына прабілася жыць у горад. Спрабавала пісаць вершыкі, хацела вучыцца за настаўніцу. Аднак марымарамі, жыццё-жыццём, здольнасці-здольнасцямі. Не ўсё і не заўжды стасуюцца.

Праз колькі месяцаў прыехала ў родную вёску і строіць з сябе гарадскую. І распавядае сяброўкам-суседкам:

– Девчата, мы собрались как-то компанией весёлой, травили анекдоты, нам стало смешно, и мы долго реготали.

Вось так. "Реготали". Такім чынам, ад роднай мовы адбілася, і мову суседняга народа не вывучыла. І горад не дапамог.

Рускую мову ты заўсёды вывучыш, а мову роднага гнязда, сваёй вёскі ніколі не забывайся.

## УЛАДЗІМІР КОРАНЬ

Ён – былы вядомы лётчык, працуе і цяпер на даволі адказнай пасадзе. Так сказаць, у адстаўку ад актыўнага жыцця не ідзе. Мой сусед. Усебакова развіты чалавек, разумнік. Выдатны суразмоўца. Размаўляе па-беларуску, а не інакш.

Бывае, сутракаемся на двары ці на вуліцы. Гатовы гаманіць бясконца на ўсе тэмы жыцця.

Зрэдку заходзіць да мяне. Чытаю яму свае новыя творы, паказваю апошнія публікацыі. Ён чытае, слухае, смяецца, цісне мне руку. З ім не засумуеш, а задумаешся.

Аднойчы пры расстанні кажа мне:

– Мікола, з табою паўгадзіны пагаварыць – што з Богам сутрэцца – і не раз мне так гаварыў, і пры сябрах.

Ну, наконт Бога памаўчым – гэта занадта высока для нас. Але сутрэцца і пагутарыць двум інтэлігентным людзям заўжды цікава і прыемна. Прытым прамая сувязь: пісьменнік – чытач, які можа зразумець і ацаніць. А часам і падказаць слушныя думкі, прапановы і меркаванні.

## ПАЭТ І МАСТАК

У нашых дварах жыве нямала вядомых людзей: пісьменнікі, кампазітары, мастакі. Мастак Валеры Талейка піша нядрэнна карціны. Я пазнаёміўся з ім і пасябраваў. Аднойчы зрабіў яму прапанову:

– Валерка, давай зробім з табой творчы бартэр: я падарую табе сваю кнігу, а ты мне – карціну. Згодзен? – Так і зрабілі.

"Здзелку" адзначылі ў яго дома. Прыемна правялі час, дзяліліся планамі. На развітанне папярэдзіў яго:

– Не ўздумай усю маю кнігу прачытаць адразу. Чытай па два вершы на дзень, каб унікнуць і асансаваць: якая глыбіня думак, якая шырыня пачуццяў! Чытаць хопіць на год, а пасля будзеш мець як настольную кнігу, як Біблію перачытваць бясконца.

На тым і разышліся.

Праз пару дзён спяшаюся ўранку на прыпынак за маім домам, трымаючы падпахай сваю інжынерскую папку, каб ехаць на працу. Паміж маім домам і гастраномам сустакаю сябра Валерку.

– Га, Міколка! – ён радасна раскінуў рукі насустрач мне. – У мяне была тройка,а я ў жонкі выцыганіў пяцёрку – дык давай пойдзем, прап'ём!

– Ты што, Валерка, - рашуча запярэчыў я, - здурнеў ці жартуеш? Зранку нават коні не п'юць. Я ж еду на работу, мне трэба па справах на розныя заводы, а пасля дакладваць майму дырэктару. Так што пачакай да канца дня, і зрасходуем пяцёрку.

Хіба вы думаеце, што ён дачакаўся мяне? Вядома ж, не! Ну, мастак, ён і прыняць чарку – мастак. Але на здароўе табе і прыемнага апетыту! Хоць і без мяне – не стала сілы дачакацца. Адыходзячы ж тады, на развітанне я спытаў у Валерыя.

– А з якой нагоды мы б з табой выпілі б зрання і ўвогуле?

– Коля, увесь той вечар і ўсю ноч чытаў тваю кнігу.

– Я ж табе казаў: чытай па два вершы на дзень.

– Ніяк не мог адарвацца.

– А пасля што?

– Пасля я ўсю раніцу расказваў жонцы пра тваю кнігу

– А яна што?

– Веру, чула і чытала ў газетах і часопісах. А кнігу сама абавязкова прачытаю.

Прыгадваю студэнцкія гады – «в пору юности туманной», калі яшчэ быў студэнтам Мінскага аўтамеханічнага тэхнікума, да мяне трапіў у рукі раман Вальтэра Скота "Айвенга". А маладосць з мяне так і перла, а там столькі рамантыкі, што я за вечар і за ноч асіліў гэты нямалы том прозы.

Хто і які б ні быў аўтар, а як напіша цікава і захапляюча – дык і адбою ад чытычоў не будзе.

Лірыка – пачуцці, думкі, слёзы.

Сатыра – мудры роздум над праблемамі жыцця.

Гумар – усмешкі, смех рогат. Лекі без таблетак і уколаў. Без бальніц і санаторыяў.

# АД КАМАРОЎКІ ДА ЧЫЖОЎКІ

Мой шаноўны зямляк Генадзь Якаўлевіч Кляўко быў паэт-лірык і сатырык, дарос да намесніка галоўнага рэдактара часопіса "Полымя". Салідны, памяркоўны, прыемны. Быў грамадскім рэдактарам маёй першай кніжкі.

Падчас выдання адной з маіх кніжак я запытаўся:

– Генадзь Якаўлевіч, а як яе назваць?

– Назаві "Мыш пад венікам".

– Як жа я магу так яе назваць? – адгукнуўся я. – Гэта трэба, каб уся кніжка была пра мышэй, альбо хоць адна байка.

– Дык напішы такую байку, – адказаў зямляк.

Параіць лягчэй, чым зрабіць. У мяне ж – толькі назва. І ніякага сюжэта, і ніякіх ходаў. Трэба думаць! Як і што , дзеля чаго? Тлумна неяк.

Стаю каля свайго дома на прыпынку аўтобуса №59, каб паехаць у раён Чыжоўкі на сустрэчу ці то з сябрам, ці з сваякамі. Доўга чакаю, а мазгі ўжо шурупяць. Як кажуць у нас, вытворцаў–інжынераў, шарыкі за ролікі чапляюцца, альбо шасцерні зубчыкамі адна за другую. А пэўныя мазгавыя цэнтры працуюць незалежна ад волі чалавека, асабліва творчага, нават у дарозе, нават у сне. Вялікія людзі рабілі адкрыцці важныя ў сне, і законы адкрывалі, і вершы складалі. Навукай і жыццём даказана.

Такім чынам, я еду ад Камароўкі да Чыжоўкі. А сам не вельмі адпачываю, а больш думаю. Не так шуруплю, як яно само шурупіцца. І як ні дзіва (гэта для маладога паэта не дзіва) – выстрэльваюць самі словы, радкі, рыфмы, строфы. І сюжэт жа цікавы з'яўляецца і мудры, і просты, і жыццёвы. І пачатак, і сярэдзіна, і мараль.

Недаехаў я адзін прыпынак да Чыжоўкі – толькі да возера даехаў – і ўжо нарадзілася байка "Мыш пад венікам". Удалася. Друкаваў не раз, яе імем я назваў кнігу. І дзякую шчыра Генадзю Кляўко за ідэю і падказку.

## АНДРЭЙ МДЗІВАНІ

Сутракаю нашага славутага кампазітара, майго суседа, і пачынаю жартаваць, пад'ялыкваць, разыгравяць яго.

– Андруха (па-вясковаму), што ты цяпер пішаш – фугу, санату або сюіту? Быццам многа разумею ў музыцы).

Ён дакумекаў мой гумар і адказвае з усмешкай:

– Не, Мікола, пішу сагу.

– Ну, Андруха, – парырую я, – Сага – гэта больш па маёй лініі, гэта – літаратура. (Народны эпас паўночных, скандынаўскіх краін).

А ты лепш пішы новую оперу ці балет. Тут тваё прызванне і прызнанне.

– Слухаюся, Мікола! – па-армейску з гатоўнасцю адказаў ён. – А ты складай новыя байкі, фельетоны, гумарэскі.

Коратка пагаманілі, пасмяяліся і на гэтым разышліся. Кожны застаўся пры сваім. Як кажуць, хто на што вучыўся... Дакладней, у кожнага творцы – свая "божая іскра". А творчыя сустрэчы – неабходны атрыбут нашага жыцця.

## ЯК З НЕБА ЎПАЛА

Бывае, верш пішуцца лёгка і хутка. Іншы раз - цяжка, працуеш над ім не адзін вечар. Упрэшся ў нейкае слова, радок ці страфу – і ні з месца.

З гадамі вопыт расце, здараюцца і нечаканыя ўдачы. Ідзеш ці едзеш – і тут выскокваюць самі з галавы словы, радкі, стофы, якія з цяжкасцю шукаў. Мозг, а менавіта некаторыя яго ўчасткі, падсвядома працуюць. Толькі запісвай. Ну, гэта – над чым напружана думаў.

Не мог зразумець абсалютна дзіўных з'яў – фенаменальных.

Іду з прыпынка дахаты. Дом – насупраць. Толькі дайшоў да рогу дома – "выстрэльвае" страфа, прычым я пра гэта не думаў – лірычнага верша пра каханне (а лірыку пішу зрэдку).

Здзівіўся, іду далей. Прайшоў паўдома – "выстрэльвае" другая страфа. Спяшаюся ў кватэру, каб не забыцца запісаць. Толькі зайшоў у па'езд – трэцяя страфа! Дома хуценька занатаваў, а сам думаю: калі Бог даў мне такі падарунак – трэба завяршаць справу. І мяне як панесла! За чвэрць гадзіны дапісаў яшчэ пяць строф. Атрымаўся мяккі, светлы верш. "Дзяўчаты беларускія". Кампазітар Уладзімір Буднік напісаў на гэтыя словы рамантычную песню. Выконваў яе на маёй творчай вечарыне ў Доме літаратара. Усім спадабалася.

А то сяджу дома, адпачываю душой і целам. Папіваю спакойна чаёк, а можа, і нешта больш грунтоўнае. І раптам на мяне звальваецца страфа – чамусьці на рускай мове і на літаратурную тэматыку. Неўзабаве – другая! Я запісаў і падумаў: неблагая лірычная мініяцюра выйшла. А ўжо потым раздумаў: гэты – вельмі мала для мяне. І дапісаў яшчэ чатыры страфы і перавёў на значную грамадзянскую тэматыку. І арганічна спалучыў рускія і беларускія радкі. Атрымалася вельмі арыгінальна. Верш стаў заключным у томе выбраных твораў.

А што "з неба ўпала" – не кожнаму падае. Але дай Бог такіх удач і маім калегам. Хоць праз гады, хоць праз дзесяцігоддзі.

## ПАЖАДАННІ, ПРЫВІТАННІ

Пры сустрэы прыяцель пытаецца ў мяне:

– Ну, як жыў - здароў?

– Як статак кароў, – сходу зрыфмаваў я.

– Не разумею, – вылупіў ён ад здзіўлення вочы.

– Вельмі проста: адна карова можа прапасці, а статак будзе вечна.

– Ну, ты даеш! На вечнасць размахнуўся?

– Жадаць не шкодна! – бадзёра адказаў я.

З іншым жартую: – Здароў, каб ты зароў! – Ён не крыўдзіцца і не б'ецца бо разумее гумар.

Пытаюся ў аднаго майго сябра: -Як ты маешся? - Маюсь! – зразумеў і адказаў ён па-руску.

У другога пытаюся зусім сур'ёзна: - Як ты кідаешся?

– Галавой аб плот! – з гумарам адказаў той.

Яшчэ адзін на тое ж пытанне даў свой адказ:

– Кідаюся, як гарох пры дарозе: хто ні йдзе, той ушчыкне. А хто не лянуецца, той і нагой пад зад паддасць.

Раблю знаёмай, як мне здаецца, камплімент:

– А ты ўсё маладзееш і харашэеш!

– А нашто мне маладзець і харашэць? - адпарыравала тая. – Я і так маладая і харошая.

Перастараўся.

Малады паэт пытаецца ў старога:

– Як ваша найкаштоўнейшае здароўечка?

– Нічога, ускрыццё пакажа, - хітравата ўсміхнуўся старэйшы.

– Тады позна будзе, - сумна падумаў малады.

У нас, інжынераў, былі заведзены журналы запісаў тэлефонных званкоў па горадзе і міжгародніх – для памяці, уліку і праверак. Заходжу да прыяцеля ў суседні аддзел. У яго на стале ляжыць журнал, а на вокладцы напісана: "Кніга размоў, гамонак, балбатні."

– Ты што напісаў? – здзівіўся я. – Гэта ж несур'ёзна. Твой начальнік як убачыць, то дасць табе дыхту.

– Ад цябе набраўся, гэтых слоў нахапаўся. Так што мой начальнік за цябе мяне не пакарае, ты ж у нас папулярны. Жадаю табе творчых поспехаў. Будзем разам прапагандаваць нашу мову.

Калі сустракаю сяброў, суседзяў ці таварышаў па пяру, то здалёк выгукваю свае любімыя словы:

– Палкае прывітанне!

Бывае, толькі адчыняю дзверы ў якую – небудзь рэдакцыю, а сябры-калегі, даўнія і верныя таварышы самі крычаць мне насустрач:

– Мікола, палкае прывітанне! Паказвай свае новыя творы.

А хто не разумее – пачынае папраўляць:

– Не палкае, а пылкае.

– Не вучы вучонага! – адбіваюся я. – "Пылкое" - гэта чыста рускае слова. А "палкае" – скарочаная форма ад нашага

роднага слова "палымянае". Трэба вывучыць родную мову і ўмець карыстацца ёю, а не размаўляць на "трасянцы". Павышайце сваю культуру. Штодзённа.

На выхадзе з нашага пад'езда сустракаю сваю пажылую суседку і кажу ёй па-іхняму, па-украінску:

– Здаравэнькі булы, сусідачка. Пішлы разам у крамныцю. Яна з вясёлай усмешкай адказвае па-нашаму:

– Прывітанне, Мыкола. Прабач – Мікола. – І бярэ мяне пад руку.

Вось так прыемна і паразумеліся. Лепш, чым з некаторымі нашымі.

Высокая культура чалавека прадумоўлівае абавязковае веданне роднай мовы або мовы таго народа, на тэрыторыі якога ты жывеш. Хоць часова.

А ў родны край, дзе б ты ні быў, абавязкова вернешся. Настальгія.

## КОШТ УДЗЯЧНАСЦІ

Набліжаўся 80-гадовы юбілей нашага старэйшага пісьменніка, сатырыка-гумарыста Міхася Скрыпкі. Пры выпадковай сустрэчы я завёў яго ў рэдакцыю газеты "Аўтазаводзец" (а сам працаваў у той час літкансультантам). Яны прыемна пазнаёміліся і дамовіліся пра юбілейны выпуск у газеце. Я падрыхтаваўся, і далі цэлую старонку з біяграфіяй і партрэтам.

Апроч таго, я арганізаваў, і далі калонку ў раздзеле "Каляндар памятных дат" у часопісе "Полымя". Я пастараўся – куды больш. Ну, думаю сам сабе, запросіць жа на юбілейную вечарыну. Адносіны ж у нас былі вельмі добрыя. Павінен жа аддзячыць за мае паслугі. Тым больш, што перад гэтым ён выдаў тоўстую кнігу і атрымаў вялікі ганарар. Так што і прычына, і ўсе магчымасці адсвяткаваць былі.

Час бяжыць, падходзіць і праходзіць юбілей, а ён мне – ні гугу. Сустрэліся выпадкова зноў. Я здзіўлена пытаюся:

– Міхась Аляксандравіч, што ж вы не паклікалі мяне на юбілей?

– Вой-вой-вой, Міколка! – заеньчыў, застагнаў ён, – я і не адзначаў ніяк. Бо аднаго запрасі, другога – не. Дык той пакрыўджана скажа:

– А чаму ж мяне не паклікаў, сабака?

– А хто ж запрашае ўвесь свет? – адпарыраваў я. – Запрашае кожны тых , каго лічыць патрэбным і неабходным.

Пытанне засталося без адказу. Як бы павісла ў паветры.

Ну, дзед, падумаў я, тут, відаць, спрацавала не сціпласць, а сквапнасць. Пэўна, увесь ганарар аддаў маладой жонцы, а цяпер сам выпрошвае рублікі.

Так і застаўся я з сухім ротам, глытаючы сліну.

Вытупаючы на адной сустрэчы з чытачамі, Міхась Скрыпка сказаў:

– Калі пражыву да васьмідзесяці, то буду жыць яшчэ доўга.

І пражыў пасля юбілею яшчэ тры гады.

А ўвогуле гэта быў вясёлы, просты, прыемны чалавек. Выступаў па – народнаму.

## АНАТОЛЬ ВЯЛЮГІН І КАМПАНІЯ

Анатоль Сцяпанавіч – былы ўдзельнік вайны, класік нашай паэзіі. У свой час нашумела яго паэма “Вецер з Волгі”. Працаваў загадчыкам аддзела паэзіі часопіса “Полымя”. Мудры чалавек быў, настаўнік многіх паэтаў.

У канцы дня выходзіў з рэдакцыі, паважна крочыў уперад з кульбай, а за ім – пастаяннае суправаджэнне, ягоная “світа”, магутная тройка – Генадзь Пашкоў, Георгій Шыловіч і Валянцін Мысліве ц. Ішлі, каб разам культурна адпачыць.

У вялізны выдавецкі дом зрабілі мармуровы падыход. Быў ці то снег, ці то дождж, Вялюгін як ішоў, так і бразнуўся. І зламаў нагу.

Я разам з маладым паэтам Эдуардам Граковічам двойчы наведваў яго ў бальніцы. Апошнім разам сустрэлі там і магутную трыяду. Папіваюць (пры пераломе гэта не страшна) і закусваюць... смажанай мойвай. А Мысліве ц важна ходзіць па палаце і прыцмоквае: – Вой, як смачна! Вой, як смачна! – А мне зрабілася і смешна, і тужліва за калегаў. Таварышы па па-

лаце, простыя і розныя людзі, недзе падумалі: вось дык пісьменнікі! Прыйшлі да класіка ўтраіх усяго з адной пляшачкай, і закусваюць...мойвай. Галыцьба, ці што?

Між тым тая мойва была сапраўдны смачная і самая танная – 90 капеек за кілаграм – міравая закусь для выпівакаў.

Мы з Эдзікам Граковічам удваіх прыйшлі з добрай пляшкай і смачнай закуссю. І тут Мыслівец камандуе: - Разлівай на ўсіх!

Мы ж прыйшлі частаваць не вас, падумаў я, а Вялюгіна. Дый разліваць адну пляшку на шасцярых не ўмею. Але ж мусіў. Бо Ленін казаў: трэба дзяліцца. Хоць Сталін казаў: трэба мець сваё.

Вялюгін прымусіў нас паставіць свае аўтографы на гіпсавай павязцы на яго назе. Цяпер бы той гіпс у музей можна б было здаць!... Пагаманілі, разышліся.

Няма ўжо даўно Анатоля Сцяпанавіча. Слаўны быў наш мудрэц – і паэт і чалавек1

## ВАЛЯНЦІН ЛУКША

На канцы шасцідзесятых гадоў ён працаваў у аддзеле культуры ў рэдакцыіі газеты "Чырвоная змена", а я прыходзіў як аўтар, прыносіў вершы і заметкі. Я быў малады паэт, і ён быў малады паэт. Склаліся прыяцельскія адносіны. Пры сустрэчах я весела вітаў яго:

– Прывітанне, Валік!

Ён гэтак жа бадзёра адказваў:

– Здароў, Мікола!

Так працягвалася, калі ён кіраваў замежнай рэдакцыяй Рэспубліканскага радыё. А вось калі ён стаў галоўным рэдактарам літаратурна- драматычных перадач, то адносіны рэзка змяніліся, сталі дзяжурна – афіцыйнымі. Сустрэўшыся, я казаў яму:

– Вітаю вас , Валянцін Антонавіч.

– І я вас, - коратка адказваў ён.

І нічога сяброўскага. Ён жа ў нас – адзін, а такіх, як я – многа.

А потым ён ужо – дырэктар выдавецтва "Юнацтва". Зрабіўся яшчэ больш важным і менш даступным.

Так высокая ўлада псуе чалавека.

Але не кожнага. Вядомы крытык Верлен Бечык раптоўна вырас да намесніка галоўнага рэдактара выдавецтва "Мастацкая літаратура". А я здаваў туды рукапісы сваіх новых кніжак. Мы былі ў простых, таварыскіх адносінах. А пасля яго павышэння я пачаў звяртацца да яго на "вы". Ён здзіўлена спытаў:

– А чаму ты, Мікола, пачаў мне "выкаць"?

– Дык вы ж ужо – высокі начальнік, – адказваю.

– Кінь ты глупства! Мы як былі прыяцелямі, так і засталіся.

Вось так бы ўсе! А я гэтак лічу, што культура адносін ніколі не пашкодзіць. І не варта залішне спрашчаць адносіны – асабліва тады, калі нехта гэтага не хоча. А хто хоча – сам прапануе спрасціць.

Падыходзіць 50-гадовы юбілей Валянціна Лукшы. Я ўзяўся падрыхтаваць і апублікаваць матэрыял пра яго жыццё і творчасць у рубрыцы "Каляндар памятных дат" у часопісе "Полымя". А ў Лукшы ў той час былі напружаныя адносіны з рэдакцыяй, што магло стаць тормазам для публікацыі. Нічога, думаю, праб'ю. Мяне там паважаюць, і мне давяраюць.

Званю Лукшу, каб сустрэцца, сабраць неабходныя звесткі. Сабрацца ўдваіх ці ў яго дома, ці ў кафэ, ці яшчэ дзе неафіцыйна. Ён будзе расказваць, а я – запісваць. Заадно трохі адзначым.

Ён на асабісты кантакат выходзіць не пажадаў. Зносіны мелі цераз пошту і тэлефон. Так-сяк нашкроб матэрыялаў. І напісаў. Надрукавалі.

– Дзякуй! – ён мне так і не сказаў. Хоць бы па тым жа тэлефоне. Ці вельмі заняты быў, ці раптам вельмі забыўлівым.

Ну, што ж, будзь здароў, Валік!

Прабачце – Валянцін Антонавіч!

## СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ

Калі быў маладым паэтам – усюды крычаў: "Дарогу маладым! Дарогу – маладым! Калі ж састарэў – усюды патрабаваў:

– Не засціскайце старых! Не заціскайце старых! Не заціскайце старых!

А што ж ён рабіў у сярэднія гады? Выдаваўся і выдаваўся тоўстымі тамамі. Удосталь выдаваўся. Не саступаў дарогі маладым. Свая кашуля – бліжэй да цела. Малайчына быў, баявы! Свае творы і сябе любіў. А хто ж сябе не любіць?

## АЛЕГ ФОМЧАНКА

Пісаў прозу. Доўгі час працаваў загадчыкам аддзела культуры газеты "Вячэрні Мінск". Потым захацеў павысіцца па службе. Яму ўдалося ўладкавацца намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Вожык". Хоць ні магутнага ведання беларускай мовы, ні выдатных сатырычна–гумарыстычных здольнасцей у яго не было. Але працаваў, наколькі хапіла сіл.

Аднойчы напісаў нейкі там скэтч, ці мастацкі фельетон, падаў на подпіс рэдактару Аляксандру Данілавічу Раманаву. Таму не спадабалася, і ён забракаваў. Алег Сямёнавіч разбушаваўся, і напісаў скаргу на начальніка "наверх" – у ЦК КПБ, бо "Вожык" быў у іх падпарадкаванні. І, як часта бывала, замест разбірацельства адтуль скаргу адправілі рэдактару, бо рэдактар быў стаўленнікам ЦК. Як кажуць, казла аддалі на з'ядзенне ваўку, каб не стукаўся ілбом у зачыненыя для яго вароты.

У выніку рэдактар выдаў загад аб звальненні Фомчанкі з пасады "за службовую неадпаведнасць" з адпаведным запісам у службовую кніжку. Таму давялося ісці ў вялікі выдавецкі дом на невысокую пасаду.

Вось так. Сядзеў бы ціха Алег Сямёнавіч у "Вячорцы", пісаў бы на лаяльныя тэмы літаратуры і мастацтва, і вёў спакойнае жыццё. І дасядзеў бы ў сваім кабінеце да пенсіі. Не меў бы лішніх непрыемнасцей і клопатаў. Амбіцыёзнасць падвяла.

## АЛЯКСАНДР РАМАНАЎ

Распавядалі работнікі рэдакцыі.

Калісьці ён напісаў раман на рускай мове "В буран" (я ў свой час яго чытаў). Многія незадаволена пыталіся: – А чаму

гэта наш магілёўскі хлопец напісаў па-руску? – Ад таго ў яго былі цяжкасці з уступленнем у Саюз пісьменнікаў. Працягваў пісаць прозу, але не вельмі актыўна. Некалькі гадоў кіраваў "Вожыкам".

Быў вельмі сур'ёзны і строгі. І вось зусім нечакана для многіх на яго як бы нешта найшло... Расказваюць, што аднойчы ўвечары на добрым падпітку яму ўздумалася паездзіць па начным горадзе, палюбавацца, так сказаць, адпачыць душой. Камандаваў шафёру ездзіць то ў адзін бок, то ў другі. Той прапаноўваў завесці яго дамоў. Раманаў не слухаўся, а потым стаў чапляцца да вадзіцеля:

– Ты крадзеш мой бензін, нягоднік! Бензін са службовай машыны. Аддавай ці бензін, ці грошы за яго. Я пасаджу цябе!

Угаворы супакоіцца не дапамагалі, пагрозы і лаянка працягваліся. Урэшце шафёру гэта надакучыла, і ён падкінуў начальніка ў міліцыю. Тыя хацелі адпусціць рэдактара, але ён бушаваў і патрабаваў: – Складзіце пратакол на злодзея!

Міліцыянеры – не нянькі. Задаволілі патрабаванне і склалі пратакол. Не на шафёра, а на Раманава. Дайшло да ЦК, і ён зляцеў з пасады. Пагаворвалі, што ў яго здарыўся "зрух па фазе". Відаць, нервы расхадзіліся – хоць на руку намотвай.

Што ж, як кажуць – "умейте властвовать собой". Асабліва калі знаходзіцеся на высокай і адказнай пасадзе.

## МУЗЫКА ДУШЫ.

### (у свеце цудаў)

Ляжу на канапе. Збіраюся спаць. Дзень быў нялёгкі: справы і творчыя, і гаспадарчыя. Нахадзіўся, наклапаціўся. Засынаю, сплю.

І раптам з мяне выходзіць музыка. Толькі адна музычная фраза:

– Ля-ля-ля, ляляля, ляляля, л-яяя! – і гучыць спакойна і гэтак пяшчотна. Як быццам маленькі аркестрык грае (без ударных). Здзівіўся. А далей толькі ўздыхнуў, а як выдыхаю паветра – і зноў тое ж замілаванне:

– Ля-ля-ля-ля-ля – ля, ляляляля! – Мо мне здаецца? Гучыць і гучыць. Як па заказу.

Колькі ж будзе працягвацца мая радасць? Разоў сем працягвалася. Нарэшце пасля змоўкла. А я выдатна адпачыў, сеў пісаць. І сон прапаў. Расказаў пра гэта жонцы. Яна нічога не зразумела. І я не зразумеў.

Мо, гэта – цудоўнае знаменне – знак зверху – ад майго цяжкага жыцця? Ці ад Бога, ці майго заступніка святога Міколы? Часцей бы так было! Лепшага не меў натхнення. Ніколі. А хай было б часцей.

## “НАПАЛОХАЎ”

Быў у мяне прыяцель Уладзімір Вярхоўскі – загадчык піўбара (у мінулым - ваенны). Сам папісваў вершы – на рускай і беларускай, лірычныя і гумарыстычныя. Я дапамагаў яму друкавацца, падпраўляў яго творы. Два вершы ён прысвяціў мне, я змясціў іх у маёй кнізе выбраных твораў.

Я напісаў два вершы пра лысых – вясёлую гумарэску і фельетон пра іх паходжанні. Паказаў іх Валодзю. Той здзівіўся і нават абурыўся:

– Што табе пішаш, Мікола? Лысыя могуць сабрацца магутным гуртом і падаць на цябе ў суд.

– За што? – я не зразумеў.

– Ты здзекуешся над фізічнымі недахопамі людзей.

– Але ж гэта не калецтва, а лысым можа быць кожны мужчына. І я сам.

– Ты яшчэ раскрытыкуй тых , хто без рукі ці нагі!

– Не, гэтых я чапаць не буду. Лепш крытыкну тых, хто без галавы.

Цікава, чаму ён так разышоўся? Відаць, таму, што сам быў напалову лысы. А каму ж падабаецца крытыка, хоць бы і лёгкая?

# НЯЎДАЛЫ І ЎДАЛЫ ПАДЫХОД

Заходжу да рэдактара вячэрняй газеты. З парога бадзёра гукаю:

– Добры дзень, дарагі сябар Сяргей Дзмітрыевіч – калі можна да вас так звярнуцца.

Ён з лёгкай усмешкай запытальна пазірае на мяне. Я працягваю свой энергічны наскок:

– Прывітанне, бацька родны! Заўсёды рады бачыць вас.

Ён здзіўлена адказвае:

– Да што ж ты гаворыш, Мікола? Які я табе бацька? Я ж намнога маладзейшы за цябе. Ужо чытаў у многіх газетах, што табе – 65. Віншую!

– Ну , гэта я кажу чыста ўмоўна, так сказаць сімвалічна. Рэдактар жа – бацька і для ўсіх сваіх журналістаў, і для аўтараў.

Бачу, твар яго цяплее, а ўсмешка шырэе.

– Дык чаго ж ты хочаш?

– А ў мяне, можна сказаць, юбілей, дый, магчыма апошні. Многія выданні даюць мне выпускі. Дык і вы ў сваёй роднай мне газеце падтрымайце мяне маральна. Прыстойнай публікацыяй.

– Што ж, маральна падтрымаем. Пакінь свае вершы, партрэт і ўрэзку.

На тым я радасна і развітаўся.

Выйшаў з кабінета і расказаў пра гэтую сустрэчу журналістам. Яны паўсміхаліся і злёгку папракнулі мяне:

– Ну, ты і даў! Рэдактару ўсяго 54 гады, а табе – 65. А ты – "бацька родны"!

– Нічога, рэдактар зразумеў мой гумар, – не разгубіўся я.

# МАЙСТАР ВЕРШАЎ ЗАКАЗНЫХ

Заказны верш – гэта такая брыдота, што ніводзін паважаючы сябе паэт ніколі за іх не возьмецца. Альбо – вельмі рэдка. Мне ж давялося пісаць не дзесяткі, а сотні заказных вершаў. І на дні нараджэння, і на юбілеі, і на вяселлі. І сябрам, і саякам, і заводам, і фірмам, і газетам, і часопісам. Калі пішу мастацкі

верш,я яго і надрукую – можа, не раз, і ў кнігу ўключу, і ганарары атрымаю. А заказны – напісаў і аддаў, разавую аплату па дамоўленасці атрымаў (а бывала, і не плацілі) – і канцы ў ваду. А трэба ж улічваць і ўвязаць і біяграфіі, і імёны., і спецыфіку работы (чалавека і яго сям'і, радні), і спецыфіку вытворчасці (калі завод, будоўля, фірма), і гісторыю ўсяго гэтага Як кажуць, заморышся пыл глытаць. А патрабуюць, каб гучала прыгожа, па-мастацку. Не тое, што халтурка – "с днём рожденья поздравляем, счастья, радости желаем".

Сяджу аднойчы з сябрамі дома за вясёлым сталом. Гадзіна дня. У дзве паедзем адпачываць далей. Чуецца тэлефонны званок. Звоняць сябры з абутковай фабрыкі.

– Мікалай Пятровіч, тэрмінова напішыце юбілейны віншавальны верш. Мы збіраемся ў пяць гадзін дня.

– Я – не пажарная каманда, – адказваю. – Мы з сябрамі гуляем, у дзве гадзіны ад'язджаем. Да таго ж вы не разлічыліся за мінулы заказ.

– Разлічымся разам, а за тэрміновасць – надбаўка.

– Не гарантую. (Але дадзеныя запісаў).

Сядзім, падымаем кілішкі. У палове другой сябры паднатырквают мяне.

– Мікола, трымай марку. Напішы, пакажы клас і хуткасць. І грошай трошкі падзаробіш.

Званю на фірму: – Пад'язджайце ў дзве гадзіны.

Прыехалі, забралі, падзякавалі, разлічыліся...

Сядзім у аддзеле забеспячэння трактарнага завода. Работніца просіць: – У майго бацькі дзень нараджэння, напішыце верш. Я разлічуся. – І расказвае пра бацьку.

Я не даваў згоды, раздумваю, калупаюся ў сваіх паперах, каб аформіць. Праз колькі хвілін падаю ёй верш. Гатовенькі.

Яна потым охала і ахала:

– Вой-ёй-ёй! І не бачыла, каб пісаў, і ў момант намаляваў карцінку жыцця майго бацькі. Цуд! Яму ўсе заказвайце.

Не заплаціла. Сама вельмі цягнулася да чаркі. Я сказаў ёй:

– Гэта ты не мне шкадавала, а свайму бацьку.

У далейшым трэба браць папярэднюю плату.

Ну, нічога. Мне важней мая марка. Чым грошы.

Яшчэ адзін прыклад. Сустракаю прыяцеля, суседа Віктара, жыве цераз дарогу. Ён і пытаецца: – Мікола, чаму ты не напісаў мне верш да 50-годдзя? Я ж табе казаў.

– А чаму ты мне не напомніў хоць за паўмесяца або за тыдзень?

– Дык напішы цяпер, хоць заднім чыслом.

– Пасля трэцяй чаркі за тваім сталом.

– Добра, пойдзем да мяне.

Пасля трэцяй чаркі чытаю яму верш на восем строф (жыццё ж яго я ведаў). Ён вымае грошы і кажа: – Я пайшоў па другую пляшку.

Справа ж не ў чарцы, не ў выпіўцы, а ў творчасці і сяброўстве.

А на заказныя вершы ў мяне рука даўно набітая. Хоць гэта – не сістэма. А бывае ж – людзям патрэбна. І іх трэба выручаць. Вось і звяртаюцца па дапамогу.

## СПАКОЙНЫ ЛІФТ

### (высокі, творчы)

Дом друку. Ліфт. Заходзяць людзі – чалавек пяць-шэсць. Магчыма – перагрузка. Але нічога – вывезе. А калі не – дык нехта вылезе. А мы ж усе – не тоўстыя. Пісьменнікі, журналісты, аўтары. Яны ж усе – не самыя поўныя ў целе. Гараць, перагараюць у рабоце.

Ліфт такі – перш, чым пайсці, паехаць – пастаіць, падумае. І толькі тады зрушыцца з месца.

І тут мяне раптам паперла на гумар:

– Гэты ліфт – такі спакойны і мудры, як рэдакцыя газеты "Звязда".

Усе заўсміхаліся. І загаманілі пра газету.

Пайшоў да галоўнага рэдактара "Звязды" Уладзіміра Браніслававіча і расказаў яму пра гэтую выпадковую размову. Ён, як заўжды, прыемна заўсміхаўся – звычайна рады сустрэчы, паважае мяне як сатырыка-гумарыста. Дый кажа:

– Ну, Мікола. Жартаўнік! Да цябе даўно прывык. (Я зарыфмаваў гэтую нашу гутарку).

*– Вы, – адказваю, – штукуйце,*
*Лепей трохі надрукуйце,*
*Ён пытае: – Гумар ёсць?*
*І сатыра, радасць, злосць?*

*Фельетоны, гумарэскі –*
*Каб усё ляцела з трэскам!*
*На старонцы нешта дам,*
*Колькі можна, ўбачыш сам.*

*Хоць табе – 65,*
*Дык не трэба "ў шапку спаць",*
*А як пошук ёсць заўжды –*
*Будзеш аўтарам "Звязды".*

Пажадаў таго рэдактар, а ў яго ёсць свой характар. Для выдатнейшай газеты дасягну я творчых мэтаў. Хоць газеты ўсе люблю, і для іх я ўсё раблю. Бо і кожная з газет нам адкрые новы свет.

– Я не часта ў вас бываю – вы ж такая важная і сур'ёзная ўрадавая газета. Заходжу толькі з прычыны юбілею ці выхаду новай кнігі. Але ж я не вінаваты, што ў мяне і юбілеі часта бываюць, і кнігі нярэдка выходзяць. – Так я сказаў на адыход.

*Што напісана – не дзіва.*
*Гэта – проста жартаўліва,*
*Чытачы ўсё зразумеюць,*
*Думаць жа – яны ўсё ўмеюць.*

## МОЙ ГОРАД, МОЙ ДОМ, МАЯ ВУЛІЦА

Здаўна сябры, прыяцелі казалі мне:

– Чыталі, слухалі твае творы. Хочам наведацца да цябе ў госці. А дзе ты жывеш?

– У самым цэнтры Масквы! – бадзёра адказваў я.

– Як? – не разумелі яны. – Што за жартачкі? Ты ж наш па крыві.

– У Мінску, канешне, – тлумачу. – Амаль у цэнтры. Два прапынкі ці хвілін сем хадзьбы за Камароўскім рынкам. Вуліца Куйбышава.

– Які дом?

– Знойдзеце самі. На доме напісана “Калі ласка” (салон пракату). І прыпынак так называецца. А раз на доме напісана “Калі ласка” – я проста не маю права не прыняць гасцей.

– Які пад’езд і паверх? – удакладняюць яны.

– Зайдзіце ў мой двор і спытайце ў кожнага сабакі, дзе жыве паэт-сатырык Мікола Вяршынін, і кожны прабягаючы міма сабака пакажа вам хвастом ці лапай на мой пад’езд і паверх.

– Не, ну гэта несур’ёзна. – Які нумар кватэры? Бо ж мы не ўмеем гутарыць з сабакамі.

– Вучыцца трэба, – пад’ялдыкваю я іх. – А я вось умею. І да мяне сабакі ахвотна ідуць. І не кусаюць. А як, вядома, дзеці і сабакі ідуць толькі да добрых людзей. Так што будзьце і вы добрымі – і да вас будуць ісці.

– Хопіць тваіх жартачкаў! – не вытрымалі яны. – Называй нумар!

– Запамінайце лічбы, – у мяне ўмоўны мой код. Я жыву адзін (на той ранейшы час), на восьмым паверсе, у аднапакаёвай кватэры. Зразумелі?

– Ура – 181! – радасна загулі яны. – Чакай гасцей.

## АДГАВОРКІ І ДАГАВОРКІ

Прыходзіць у рэдакцыю малады паэт. Прыносіць вершы. Неблагія. А іх чамусьці друкаваць не хочуць. Мо старэйшых аўтараў хапае, больш важных. І яму адказваюць:

– Працуй над мовай.

Дзяжурная адгаворка. Працаваць жа над мовай трэба ўсім, і ўсё жыццё.

Я ж калі заходжу ў рэдакцыю, іншы раз выступаю так:

– *Я пішу ўжо год не першы,*

*Ёсць і проза, ёсць і вершы,*
*Іх не варта бракаваць,*
*А найлепей – друкаваць*, – адгадвае мае думкі і словы і дагаворвае за мяне рэдактар. І расплываецца ў шырокай усмешцы. Адным словам – паразумеліся.

## АЛЕСЬ ПІСАРЫК

На адным чарговым з'ездзе Саюза пісьменнікаў у час перавыбараў ён сам прапанаваў сваю кандыдатуру на пасаду Старшыні. Хоць не быў ні магутным пісьменнікам )увогуле неблагі паэт, але такіх многа), ні выдатным грамадскім дзеячом. Але хацелася ўзняцца і пакіраваць творцамі.

Сказаў, што яго выстаўляе ягоная фірма ў колькасці 47 чалавек. Вядучы на той момант паседжанне Уладзімір Паўлаў угледзеў у гэтым нешта падазронае і сказаў:

– Відаць, усе гэтыя сорак сем чалаваек прысутнічаюць тут – няхай устануць і падтрымаюць. Хоць бы адзін чалавек.

Ніводзін не ўстаў. Як кажуць, пытанне адпала.

Я хацеў маральна падтрымаць Пісарыка (усё ж – мой былы вучань па літаб'яднанні) і ўнёс сваю слушную прапанову:

– Давайце прапануем яго ў Рэвізійную камісію. Няхай не балабоча па-пустому, а займаецца канкрэтнай справай – лічыць і правярае грошы.

Але пры галасаванні ён і туды не прайшоў.

Пры адной сустрэчы пасля таго я напрамую запытаў ў яго:

– На што ты спадзяваўся, калі ішоў на Старшыню?

– Гэта я пажартаваў, – сарамліва адказаў ён.

Нішто сабе жартачкі! Знайшоў час і месца. Вось так, Алесь. Трэба ўзважваць свае жаданні і магчымасці. Каб шапка была па Сеньку. Жадаем поспехаў.

## АНАТОЛЬ ВЯРЦІНСКІ

Чытаю неяк адзін яго верш. І кожная страфа канчаецца словам “час”. У другім вершы ў адным радку – тройчы слова “час”. Ці не залішне часта? Сказанае ў адным вершы слова не павінна паўтарацца ні разу. Такі строгі закон паэзіі. У іншым вершы слова “час” паўтараецца тройчы ў адным радку!

Яшчэ адзін яго верш чытаю. Ён паехаў у камандзіроўку (відаць, творчую), а ў гасцініцы не было вольных месцаў. Дык ён пайшоў на бераг ракі (пэўна, быў у Рэчыцы), і ўсю ноч да рання прастаяў там. І ў выніку – нарадзіўся верш.

Узнікаюць пытанні. А нашто было ісці на раку? Ці не лепш было б сесці ў крэсла ў вестыбюлі гасцініцы і падрамаць да ранку. А там, глядзіш, пад ноч і месца магло выслабаніцца. А каму патрэбны вершы пра вершы? Хіба што самому аўтару. Чытачам яны нічога не даюць. Лепш напісаў бы нешта больш значнае.

Аднак ён даволі здольны і вядомы паэт, у яго хапае і добрых вершаў. З глыбокім роздумам, з прэтэнзіяй на філісафічнасць. І дай Бог яму новых творчых удач і здзяйсненняў.

## ЯК ПРЫЕМНА БЫЦЬ ЗНАКАМІТЫМ

На рагу майго дома сустракаю суседа – Алег, малады, магутны, недзе і дзялок, з дзяўчынай, прыгажуняй юнай. І кажа, патрабуе, просіць:

– Мікалай Пятровіч, пачытайце нам свае вясёлыя вершы!

– Я не чытаю вершы на вуліцы, – з гонарам адказваю я. – Толькі ў хаце, за багатым сталом.

– А я вам заплачу пяць тысяч, – таксама з гонарам адказвае ён (адчуваю, хоча зацікавіць дзяўчыну).

– Не трэба мне твае грошы, – сціпла кажу я . – Аднак трохі падвеселяю.

І сходу прачытаў некалькі сваіх сатырычных мініяцюр. Яны пасмяяліся, парагаталі. Пасля гляджу – ён дастае з кішэні свой гаманец і калупаецца ў ім, лічыць рублікі.

– Не шукай, – кажу, – я пажартаваў.

– Нічога, – адказвае ён, – у мяне грошай больш, чым у вас.

– Пяцёрку не знайшоў, а выдаў дзесятку. Такім чынам, я пабагацеў, а ён шыкануў перад дзяўчынай з вядомым паэтам-гумарыстам.

## ЯК РЭДАКЦЫІ ДАГАДЗІЦЬ

Напісаў калісьці верш "Пра машыну". Апісаў з гумарам многія цяжкасці, звязаныя з аўтамабілем: і гараж трэба займець, і бензін трэба купляць, і запчасткі, і рамонт праводзіць. Клопатаў больш, чым зручнасцей. Заканчваўся верш такімі радкамі:

*Я машыну не трымаю,*
*І таму я вельмі рад,*
*Часу вольнага шмат маю,*
*І сяброў заўсёды шмат.*

У рэдакцыі сказалі: – Друкаваць не будзем. Што значыць – і сяброў заўсёды шмат? Значыць, п'еш пастаянна?

– Нічога. Папраўлю! – бадзёра адказаў я.

Прыношу новы варыянт:

*Часу вольнага шмат маю*
*Для сяброў і для дзяўчат.*

– Яшчэ горш! – абурыліся ў рэдакцыі – не толькі п'еш, але яшчэ і гуляеш.

– Памяняю! – запэўніў я.

Наступны варыянт гучаў так:

*Часу вольнага шмат маю,*
*І не трэба нават блат.*

– Не пойдзе! – запярэчылі ў рэдакцыі. – Хіба ў нас усюды блат?

Пайшоў у другую рэдакцыю, злучыў усе варыянты разам. Але на ўсялякі выпадак два радкі выкрасліў. А машыністка аддрукавала ўсе радкі падрад. Атрымалася так:

*Я машыну не трымаю,*
*І таму я вельмі рад.*
*Часу вольнага шмат маю*
*Для сяброў і для дзяўчат.*
*І не трэба нават блат.*

Так і пайшоў у друк. І чытачам было цікава, і аўтару прыемна.

## ПРАМОВА ПРА МОВУ

І па радыё, і ў артыстаў, і ў пісьменнікаў, журналістаў часам можна чуць: – Вялікі дзякуй! – Гэта непрыемна рэжа слых.

Слова "дзякуй" не мае свайго роду. Гэта – не назоўнік, не прыметнік. Не дзеяслоў. У такім разе лепш за ўсё ўжываць азначэнне сярэдняга роду: вялікае дзякуй. А найлепш ужыць іншы выраз – "шчыра дзякую". І ніякіх пытанняў. І не "дасланць ліст", а – "выслаць пісьмо". Даслаць – гэта калі не ўсё выслаў, а ліст – ён трапечацца на дрэве.

Стала модна ўжываць малазразумелыя наватворы накшталт "насамрэч", "напрыканцы". Апошняе – сімбеоз трох слоў: на, пры, канцы. Натуральней было б гаварыць па-ранейшаму: пад канец сустрэчы, у канцы размовы.

Стала сарамліва ўжываць словы "член", "орган" – маючы на ўвазе чыста фізіялагічны, біялагічны сэнс гэтых слоў. Цяпер гавораць: сябар Саюза пісьменнікаў (а не член). Але ж сябры Саюза пісьменнікаў – чытачы. Так можна дагаварыцца да "сябар парламента", "сябар ўрада", "сябар грамадства", "сябар таварыства" – і ўсе стануць сябрамі, нягледзячы на розныя палітычныя і эканамічныя платформы. Цікава. А чым наватворцы прапануюць замяніць слова "орган"? (Органы ўлады,

органы кіравання, органы следства або пракуратуры). Можа, тым жа словам “сябар” ці яшчэ мудрэй? Хопіць мудрагеліць да бязглуздзіцы. А яшчэ – не “камп’ютэр”, а кампутар, не “долар”, а даляр. А родны і давальны склоны ўвогуле пераблытваюцца.

Давайце ж змагацца за чысціню роднай мовы, спадары пісьменнікі, журналісты, артысты, настаўнікі і ўсе члены (а не сябры) грамадства, і органы (а не якое іншае слова) улады.

Гэта маральны абавязак нас усіх. Бо калі знікае мова – знікае, раствараецца сярод іншых і народ. Не дапусціць гэтага – наш агульны клопат.

---

Карацей кажучы, з пісьменнікамі здараюцца розныя кур’ёзы, як і з усімі людзьмі, і жартуюць яны па-рознаму – то больш, то менш удала – як усе.

Запісана з падслуханага, падгледжанага, пабачанага, пачутага, распавяданага іншымі пісьменнікамі і не пісьменнікамі ў розныя гады і розных месцах.

# АД СУСЕДЗЯЎ-БРАТОЎ

(пераклады з украінскай мовы)

# ЗДАРАВЭНЬКІ БУЛЫ!



## <u>ЛЮДМІЛА ЗАЗУЛЯ</u>

# “СЛАЎНЫ” ПАЛЁТ

Ходзіць певень на таку
І крычыць: – Ку-ка-ра-ку!
На зямлі мне годзе жыць,
З хмаркамі хачу дружыць.

Тут прыбеглі Кураняты,
Гусяняты, Качаняты,
І смяюцца, і рагочуць –
Певень слухаць іх не хоча.

Як задраў чырвоны грэбень:
– Мне хутчэй у неба трэба!
Як раскінуў малы крылы:
– Вось мая якая сіла!

Вецер тут як раздурэў,
Кінуў пеўня аж за хлеў.

---

Хтосьці хваліцца усюды:
– Даставаць я зоркі буду,
Сонца зачаплю крылом!
А сядае... за хлявом.



*ВАЛЯНЦІН ЛАГАДА*

## НАВАГОДНІ КУР'ЁЗ

### (гумарэска)

Вось сенсацыя! Кур'ёз!
Люд увесь смяецца:
Апынуўся Дзед Мароз
Ў непрыстойным месцы.

А што здарылася з ім?
Уявіце самі:
Быў за прыклад ён усім –
Горшы стаў між намі.

Па кватэрах ён хадзіў,
Падаруначкі насіў,
Дый... начаставаўся.
Новы не знайшоў масіў,
Заспяваў, загаласіў,
Ўпаў, разрагатаўся.

Не падняўся, як на грэх,
Хоць напружваў сілы.
Тут дружыннікі пад смех
Дзеда падхапілі.

– Ты глядзі, як ён аброс!
Дзед, а вось гарэзнік.
Ды які чырвоны нос!
Э-э, у выцвярэзнік!

Той, на дзіва, паставаў –
План "гарыць", пагроза!
Дзеда радасна прыняў –
Нашага, Мароза.

Той без спрэчак лёг, прыціх,
Як дзіця ў калыску.
А прачнуўся, дык у іх
Выявіў... прыпіску.

Прыпісалі ў свой журнал
Нулік да адзінкі.
(Паказуха правіць баль –
Звыклыя ўжо ўчынкі).

Дзед Мароз забушаваў:
– Я, вядома, заспяваў –
Галава пад ціскам.
Ну, а хто ж вам, хлопцы, даў
Права на прыпіскі?

Начаваў тут я адзін,
Запісалі ж – дзесяць.
(Схітраваў не без прычын):
Я, між тым, высокі чын,
Вы не баіцеся?

І яго тады хутчэй
Адпусцілі з Богам.
Запіс справілі яшчэ:
"Не было нікога".



# ЗАЛЯЦАЎСЯ ГРЫЦЬ МАКУХА



## *ІВАН НЕМІРОВІЧ*

# “АДСТАЛЫ”

Казаў на лузе Конь Аслу,
Што ён усім і скрозь патрэбны,
Што людзі аддаюць яму хвалу,
Лёс ім служыць – далёка не ганебны.

– Мы людзям шмат у чым дапамаглі,
Здароўя не шкадуючы і сілы.
Скакалі ў бой, плуг або воз цяглі,
Хоць нас, здаралася, і пугай білі.

Мы ганарымся й тым, што не без нас
І гарады, і сёлы выраслі...
Асёл зароў і адказаў ураз:
– Эх, Конь, які ж ты, бачу я, адсталы!

Ме-ха-ні-за-цыя! Яна не навіна.
Відаць, пра Коней хутка ўсе забудуць,
Няхай хоць і не ваша ў тым віна.
А вось Аслы
заўжды былі –
і будуць.



—Я нарадзіла чалавека і Асла.
Чакала дабрыні я, а не зла.

# НЯЎДАЛЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ

Прыходзяць на работу Даніла і Тарас,
У цэху працавалі адным яны якраз,
А быў жа панядзелак – як кажуць, дзень цяжкі.
– І дзе ж бы пахмяліцца? – мяркуюць сябрукі.
Ды раптам нечакана ў кутку, каля акна,
Даніла бачыць пляшку, там штось накшталт віна.
– А хто ж яе забыўся? Магчыма, майстар наш.
Ён тут круціўся, потым пасунуўся ў гараж.
Раскаркаваў Даніла, нюхнуў: знаёмым тхне.
І радасна гукае: – Віно, здаецца мне!
Давай глытнём патроху, – спакуса ў дружбака.
Але схапіла пляшку Тарасава рука.
– Стрывай, не пі, Даніла. А як атрута тут?
Тады памерці можна, не мінаваць пакут.
Тарас зірнуў на пляшку, а потым – на варштат...
А за вакном раптоўна загаўкаў пёс Пірат.
Тарас сказаў: – Я зараз эксперымент зраблю:
Вазьму кавалак хлеба, наверх віна налью.
Сабаку пачастую.
І кінуў: – На, вазьмі!
А сябруку: – Не здохне – пахмелімся і мы.
Шумяць станкі, варшаты. Працуе цэх, завод.
Даніла жмурыць вочы, Тарас разявіў рот.
Спакойным быць з іх кожны ў той момант быць не мог.
Мінае паўгадзіны – жыве Пірат, не здох.
Наадварот, гуляе, вясёленькі: – Гаў, гаў!
– Эксперымент удаўся! – Тарас канстатаваў.
І выжлукцілі пляшку да донца акурат,
А закусіць няма чым, бо хлеб жа з'еў Пірат.
Пасля глядзяць: на донцы, нібыта сарнякі,
Ляжаць якіясь штучкі, сцяблінкі ці сучкі.
Адну дастаў Даніла. А разабрацца як?
Куснуў – хрумсціць, як крашчык. І невядомы смак.
Астачу вытрас з пляшкі: – Тарасе, еш і сам.
Як лепшага не маем, і гэта пойдзе нам.
Абое нечакана збялелі – проста жах,

Аж жудасна ім стала, і роспач у вачах.
– Пірат падохнуў, – кажа Даніла, як у сне.
Ляжыць, адкінуў лапы, хвастом не варухне.
Мы выпілі атруту. А што ты, баламут,
"Эксперымент удаўся", – малоў, аж кляўся тут?
Бывайце, жонка, дзеці, мае ўжо справы швах.
Пячэ і цісне, чую, у страўніку, кішках.
Як той сабака, згіну за некалькі секунд.
А тут Тарас гукае: – Дык ёсць жа ў нас медпункт!
Прыбеглі. Іх паклалі. Калолі, быў і душ.
Круцілі, гнулі, мялі. Атруту гналі з душ.
Ледзь выпаўзлі з медпункта, нарэшце, сябрукі.
– Хай згіне ўся гарэлка, віно і каньякі!
Ідуць-брыдуць. Насустрач ім чуецца: – Гаў-гаў!
Бяжыць Пірат вясёлы, загаўкаў, не стрываў.
Іскрацца вочы хмелем, бушуе ў жылах кроў.
Ён быў сп'янеў. Праспаўся. І зноўку жыў-здароў.
А тут шчэ майстар прэцца, сам злы, як сатана:
– Вы выпілі настойку – у цэху, ля акна?
Прагульшчыкі, ханыгі, з вас кожны – паразіт!
Чым расціраць, скажыце, мне свой радыкуліт?
Настойка, як пякучка, была, аж проста страх!
Яе я на мышыных заўжды рабіў хвастах...
І зноў п'янтосам стала пагана вельмі ўраз:
Направа ўпаў Даніла, налева ўпаў Тарас.






# СМЕРЦЬ КАТА

## (гумарэска)

Жыў без гора і нягод
Сімпатычны шэры кот.
Неяк вылез ён на мур
І ласкава муркнуў: – Мур!
Потым выперся на дах
І хвастом пухнатым – мах!
Раптам чуе: – Гэй, стары!
Танцаваць мяне бяры –
Зразумела, што не жок,
Ад яго схапіў бы шок.
І не польку – прымітыў,
Лепш каціны наш матыў.
– Згода? – Згода! – Мяў-мяў-мяў!
Кошку тут жа кот абняў,
Хвост – трубой, сам – як артыст,
Зараз кінуўся у твіст.
А між тым паміж двароў
Кампазітар модны йшоў.
Нечакана чуе там
Той гармідар, шум і гам,

Ён паслухаў – быў хіцёр –
“Састругаў” мадэрны твор.
Клаў на ноты пяць хвілін,
І зварганіў. Чортаў сын!
Тую песню кот пачуў –
Кажа: – Жыць я не хачу,
Лапкай слёзы ён уцёр
Сумна мяўкнуў і... памёр.
Як жа людзям нервы мець –
Модны жах такі цярпець?

## З ХВОРАЙ ГАЛАВЫ НА ЗДАРОВУЮ

### (займеннікавыя метамарфозы)

На якім вялікім сходзе,
На трыбуне, пры народзе
Гаркне: – Зробім удвая,
Абяцаю я!

А дайшло да выканання –
Кліча Грыцю і Івана
І давай на іх гусці:
– Дык працуй і ты, і ты!

А калі зашыўся з планам,
Калектыў назваў паганым,
Б’е ваўсю з трыбуны ў звон:
– Ён віноўны, ён!

## ШТО – КАМУ

Седзячы ля берага крутога,
Хведар вудзіў рыбу цэлы дзень.
І дарэмна. Не злавіў нічога,
Безнадзейна на ваду глядзеў.

Раптам, поўны гора і адчаю,
Крык пачуўся. Хто там – не відно.
Нейкі тып як быццам бы нырае,
Сам жа йдзе сякераю на дно.

Доўга Хведар галаву не чухаў,
У адзенні з кручы ў рэчку – скок!
Ухапіў няшчаснага за чуб ён,
І на бераг хутка прывалок.

Той ажыў. На твары шчасце бачна.
Хоць бягць мурашкі па спіне.
– Буду век увесь табе я ўдзячны,
Ты ж ад смерці ўратаваў мяне.

Каб вядома стала ўсім пра гэта,
Адрас і імя скажы хутчэй.
Вынесу падзяку праз газету,
І табе аддзячу я яшчэ.

Толькі Хведар быў не вельмі рады:
– Не хвалі мяне, браток, дарма.
Ты ж на дне быў. Дык скажы мне праўду:
Ёсць у рэчцы рыба ці няма?



## ПАГАВАРЫЛІ

### (жарт)

Курылі хлопцы і гулялі ў карты,
І раптам сіплы бас Мартына:
– Канчай, братва, смаліць. Не варта
Губіць здароўе нікацінам.

Ужо даўно няма сакрэту:
Курыць жа шкодна, непрыгожа
І ведайце, што цыгарэта
Каня забіць, напрыклад, можа.

– Мартыне, не мялі дурнога, –
Сказаў хтось, ляснуўшы валетам. –
Дзе бачыў ты каня такога,
Які курыў бы цыгарэты?

## МІКІТАВА ПОМСТА

### (гумарэска)

Трымайся, іншаземец ты пракляты,
Маёй кабеты вечная любоў.
Пачну з цябе духі ўжо выбіваць я.
Нядаўна біў і адлупцую зноў!

Я – чалавек зямны, не ўзяўся з неба,
Навошта мне такая мітусня?
Дзеля чаго мне штосуботы трэба
І бруд, і пыл з цябе ўсё выганяць?

Я ведаю даўно: ты – наймілейшы,
І радасці прыносіш жонцы шмат.
На перакладзіну цябе падвешу,
Вазьму дручок – і атрымоўвай, гад!

Вось так! Вось так! Цяпер здыму з вяршыні
І на зямлю шыбну, каб затаптаць,
І на другі бок хутка перакіну,
І венікам пачну яшчэ хвастаць.

За ўсё адпомшчу я: за ўсе турботы,
Што многа з-за цябе нядобрых спраў!
...Так лютаваў Мікіта штосуботы,
Калі дыван персідскі выбіваў.




## ЯК ЗАБІВАЛІ ПАРСЮКА

Неяк восеннюю пад вечар (у суботу ўсё было)
Да бацькоў браты-студэнты завіталі на сяло.
Маці пляснула ў далоні: – Вось дык лёгкая рука!
Бацька мовіў, кашлянуўшы: – Сёння колем парсюка.
Навастрыў я нож, як трэба. І саломкі ёсць запас.
Хутка добрая каўбаска, многа сала будзе ў нас.
Сын старэйшы аж скрывіўся: – Я ад гэтага адвык.
Проста сала – архаічна. Вось бы нам нямецкі шпік!
А малодшы: – Будзе шпік вам. Час пра сала забываць.
Тут патрэбна парсюка нам не калоць, а забіваць.

І тады па ўсяму салу кроў у жылкі зацячэ.
Так што, тата, не журыся. Тут кувадла ёсць яшчэ?
– Ёсць, – адказвае татуля.
– Вось і добра. Зробім шпік.
Парсюка па лбе я стукну, а пасля нажом брат – штырк!
Пасля доўгае нарады задаволены былі.
Да хлява прашнуравалі два студэнты, як арлы.
Нёс старэйшы нож. Малодшы ўзяў кувадлу пад руку.
Тут усё і зразумела – смерць прыходзіць парсюку.
А парсюк той, парсючышча, страшна глянуць і здаля:
Метры два ён даўжынёю, а вось ростам быў з цяля.
Зніклі хлопцы за дзвярыма... не былі й хвіліны там,
Як хлявец той захістаўся і пачаўся шум і гам.
Паўсяла бяжыць на двор іх: – Што за гвалт, і што за крык?
А стары: – Мае студэнты робяць там нямецкі шпік.
Раптам зірк – сынок малодшы ледзь-ледзь сунецца з хлява,
А за ім паўзе старэйшы, і пабіта галава.
Бацька глянуў і жахнуўся, ахапіў за хлопцаў страх:
Без нажа і без кавадлы, гной вісіць на іх вушах.
– Парсюка вы там забілі? Будзе ў нас нямецкі шпік?
Сын малодшы абтрусіўся, паглядае, як індык:
– Не, забіць мы не забілі. Адкладзем, бо позні час.
Але так адлупцавалі, што запамятае нас!




# ЗАЛЯЦАЎСЯ ГРЫЦЬ МАКУХА

## (фельетон)

Як паехаў Грыць Макуха на курорт,
То сустрэў там дзіва-кралю – першы сорт.
Нібы токам праняло Макуху ўраз:
Пакахаў Марыну ў профіль і анфас.
Толькі што ёй хілы Грыцявы той, калі
Навакол уюцца сокалы-арлы.
Ды дамогся ўсё ж нарэшце ён свайго,
І Марына ашчаслівіла яго.
Проста так, і не падняўшы галавы,
Пазяхнула, запытала: – Скуль жа вы?
Аж заззяў Макуха раптам, небарак:
– Сам я з Кіева, – спявае, – халасцяк.
Шчэ нядаўна і ў мяне была сям'я,
А вось зараз – толькі матухна і я.
Тры пакоі ў нас, выгоды ёсць усе.
І растаяла Марына пакрысе.
– Падыходзіце ва ўсім вы мне якраз,
Што ж адразу не заўважыла я вас!
Хоць кірпаты вы і рост зусім малы,
Ды не важна, абы разам мы былі.
Спалыхнула ўсё нябачаным агнём.
– Дык увечары на танцы мы ідзём?
Грыць падаў тут свой слабенькі тэнарок:
– Ну, вядома, я танцую шэйк і рок.
Тонка лінію Марына павяла
І праз нейкі час у Кіеве жыла.
А мінула тыдні два ці, можа, тры –
Кажа жоначка: – Паслухай ты, стары!
Мо ў цябе на сэрцы моцна зашкрабе,
Ды чамусьці разлюбіла я цябе.
Словам, так: хутчэй разлучымся давай,
Ды раздзелім мы жылплошчу – і гуд бай!
Грыць – у крык, матуля услед за ім – у плач,

А Марына крывіць губы, кажа: – Бач,
Не кудахтайце, прапісана тут я,
У кватэры, значыць, частка ёсць мая.
Дык згаджайцеся, бо вам жа на бяду
Я такога Геркулеса прывяду
(Жыць са мною хоча ён, між іншым, тут),
Што вам будзе хутка амба і капут.
Быў і суд пасля таго праз колькі дзён
І жылплошчу раздзяліў, бо ёсць закон,
А пасля ўжо ўсё – крычы ці не крычы.
Нам хацелася Макух засцерагчы –
Тых, хто часам пад шумлівы шэйк і рок
Паддаюцца верціхвосткам на кручок.
Хоць, прызнацца, асуджаем і Грыцькоў,
Што бываюць часта ў ролі прымакоў.



# ЯК ЖАНОК МЫ СУСТРАКАЛІ

Пад раніцу з Міколам, не узяўшы і глыток,
На станцыю пайшлі мы сустрэць сваіх жанок.
Чакаем. Кветкі ў сябра, дый у мяне – букет.
Без жонкі гора ій ліха, пагана – не сакрэт.
– Напэўна, на курорце паправяцца яны, –
Пачаў Мікола. – Я лічу даўно растання дні.
Хаджу я без настрою, і апетыт мой знік.
Ды раптам аб'явілі: – Спазняецца цягнік.
Сябрук мой прапануе: – Каб час нам скаратаць,
Давай мы пашукаем што-небудзь пачытаць.
Ды не знайшлі мы кніжак, часопісаў, газет.
Але з вакзалам побач патрапіўся буфет.
У ім і шум, і гоман, застаўлены сталы.
Чатыры куфлі піва мы з сябрам упяклі.
Затым кіёск знаходзім – і зноў не тое там:
Віно ракою льецца, прысесці трэба нам.
Хадзілі па кіёсках, час бавілі дарма.
Ёсць грабяні, шкарпэткі, а кніг, газет – няма.
Не вытрымаў, гукае з натугаю сябрук:
– Дык дзе ж ты, Кнігагандаль, дзе дзеўся "Саюздрук"?
Зайшлі ў кіёск нарэшце пад назваю "Экспрэс",
З апошняю надзеяй туды з нас кожны ўлез.
Газет няма – гарэлка. Кульнём без лішніх слоў! –
І тут жа аб'явілі, што наш цягнік прыйшоў.
О жоначкі, красуні, о наша мара – сон!
Букеты мы схапілі, галопам – на перон.
А жонкі папаўнелі – рэжым і харч відаць.
Курорт карысны ім быў – адразу не пазнаць.
Стаім, глядзім, і слёзы глытаем – ён і я.
Мікола кажа: – Злева – мая, далей – твая.
Даў кветкі я, цалую, і рады сам без меж,
А жонка верашчыць штосьці, а што – не разбярэш.
Дык гэта што! Міколу як вызваліць з бяды?
Яго кабета кліча міліцыю сюды.
А потым зразумелі, чаму той шум і гам:
Мы цалаваць палезлі чужых, пабочных дам.

Пасля яшчэ горш: нашы законныя жанкі
Букетамі сцябалі, штурхалі пад бакі.
І зараз мы сумуем, бяда ад тых прыгод:
Жанкі нас пакідаюць, бяруць ужо развод.
Сямейнай пуцявіне, жыццю ўсяму – каюк.
Віноўны Кнігагандаль , з ім разам – “Саюздрук”.
Купілі б пачытаць што – і не пайшлі б убок,
Не выпілі б ні кроплі, не зблыталі б жанок.



# ЗАЧАРАВАНАЯ ШАСЦЁРКА



*ІГАР СІЧАВІК*

## ХВІЛІНКА

Сяджу ў кафэ,
Глытаю доўга слінку.
– Афіцыянт!
– Іду. Адну хвілінку!

Нарэшце йдзе.
І заказаў я шынку.
– Я пагляджу.
Чакайце шчэ хвілінку.

– Ужо няма
І ні шматочку, сынку.
– Падайце суп.
– Нясу. Адну хвілінку!

– Паелі суп.
Няма і саланінкі.
– А кнігу скаргаў?
Ёсць. Адну хвілінку!

Не дачакаўся.
Выпырхнуў пушынкай
З экспрэс-кафэ
Пад назваю "Хвілінка".

## РЭДКІ ГОЛАС

### (гумарэска)

У Галі голас, як у салаўя,
У захапленні ад яго сям'я.

Настаўнікі казалі ўсе падчас:
– З'явіўся талент у сяле і ў нас!

Вось скончыла яна ўжо дзесяць класаў –
Вучыцца на спявачку падалася.

Гады ідуць. І пяты праміпае,
Пра долю Галіну ніхто ў сяле не знае.

Бацькі між тым бясконца сумавалі:
– Калі ж пачуць мы зможам голас Галі?

Нарэшце, вестачка прыйшла ў сяло
(Пабыў у горадзе шафёр Паўло):

Па голасе пазнаў-такі Галінку –
На Бесарабскім рынку.



## ШЧАСЦЕ

### (гумарэска)

У маёй кватэры –
Ну, браткі, бяда! –
Працякаюць трубы,
І бяжыць вада,

Я званю ў кантору,
Слесара лаўлю.
Той спакойна кажа:
– Заўтра ўсё зраблю.

Я адчуў, што хутка
Нацячэ вады!
І пра свой ратунак
Прыгадаў тады:

– Я, – кажу, – не супраць,
Хай той дом плыве,
Ды Ігнат Пятровіч
Пада мной жыве.

Тут па тэлефоне
Хтось гукнуў: – Трывога!
І праз паўгадзіны
Ад майго парога

Слесар плыў да ванны,
Я ў начоўках – следам.
"Шчасце жыць, – я думаў, -
Над такім суседам!"

## АБОЕ РАБОЕ

### (гумарэска)

Вось дастаў Мікіта адрас
Дзеўчыны з Урала.
Сфатаграфаваўся з "Волгай",
Піша ліст ёй: "Ала!
Мы з табою незнаёмы –
Высылаю фота.
Выбачай, што атрымаўся
Я з адкрытым ротам,

Шлі і мне ты фотакартку,
Каб пры поўным росце.
Калі будзеш даспадобы,
Дык чакай у госці...”
Вось сустрэліся праз месяц.
Ала запытала:
– Дзе ж твая, Мікіта, “Волга”?
– Што за “Волга”, Ала?
– Ты ж з ёй быў на фотаздымку.
– Ты пра што, галуба?
Сябрука машына гэта,
Ён – загадчык клуба.
Ала ў слёзы: – Ну й нягоднік,
Падманіў дзяўчыну!
Я ж так марыла на “Волзе”
Аб’язджаць краіну.
Ён жа стогне: – Не рабі
З мяне ты ідыёта,
Ты ж сама мне вось прыслала
Кіназоркі фота!



# ЗАЧАРАВАНАЯ ШАСЦЁРКА

Купіў я картку "Спортлато" –
Патрэбны грошы на аўто.
Прысеў за стол у думе цяжкай,
Раскаркаваў "баржомі" пляшку.
І раптам з пляшкі вылятае
Стары Хатабыч і пытае:
– Ёсць у цябе жаданні, сынку?
Я ўсе іх здзейсню праз хвілінку...
Гляджу, вачам сваім не веру.
– Жартуй, жартуй, ды ведай меру!
– Хутчэй, чакаю я наказу!
І тут прыпомніў я адразу:
– Раз так, тады параду дай мне,
Шэсць відаў спорту адгадай мне!
– Усё так проста гэта, сынку,
Вось зараз вырву валасінку!
Хакей, футбол, турызм, стральба,
Валет, кароль, ачко, гульба...
Штось не выходзіць, вось дык дзіва!
І зноў скубе валоссе сівае.
Калі ж не стала барады,
Ён прастагнаў: – Падай вады!
Няма ўжо сілы. Я – ніхто.
І хто прыдумаў "Спортлато"?
Калі б лягчэй што загадаць,
То я адразу мог бы даць:
Напрыклад, дачу ці машыну,
А адгадаць – куды мне, сыну...
Тут уздыхнуў Хатабыч цяжка,
І ўміг схаваўся зноў у пляшку.

# КАБ СПЯВАЛА ДУША

(лірыка – сатырыка)



# НАТХНЕННЕ

Я йшоў аднойчы ў задуменні
Ад дому лугам за раку
І нечакана стрэў натхненне,
І не застаўся я ўбаку.

І прасвятлела ўсё імгненна,
З тае цудоўнае пары.
Я залічыў тады натхненне
Ў свае найлепшыя сябры.

Паэзіяй стаў захапляцца,
І меў я радасць не адну.
(Раней складала вершы маці,
Але загінула ў вайну).

Пра ласку я тады забыўся:
Быў сын вайны, нялёгка рос.
У спадчыну мне засталіся
Верш маці і сіроцкі лёс.

Але я зараз маю крылы,
Жыццё ўсё поўнае святла.
Радзіма шчасце мне адкрыла,
А маці здольнасці дала.

І я плачу сумленнай працай,
І я ўсяго сябе аддам.
Радзіма ў нас – другая маці,
Дае Натхненне й Шчасце нам.

## БЕЛАРУСЬ

Склалі людзі казкі і паданні,
Як у барацьбе і ў змаганні
Пачынаўся беларусаў род.
Праз вякі прайшоў і праз нягоды,
Не скараўся ворагам заўсёды
Добры, шчыры, баявы народ.

Беларусь лапцюжнай называлі,
Пад чужым прыгнётам мы стагналі,
Не было святла раней і ўдзень.
Толькі не канчаліся паўстанні,
Верыў люд, што светлы дзень настане,
Знікне назаўжды жахлівы цень.

Дачакаліся – ўзышла заранка,
І паноў скідалі, і падпанкаў.
Цяжка. Але ўперад мы ідзём.
І людзьмі сапраўднымі ўжо сталі
Трактары, станкі і смазвалы
Мы сабе і за мяжу даём.

А хіба няма чым ганарыцца?
Ёсць і мінеральныя крыніцы,
Буры вугаль, торф і соль, граніт.
Ёсць і нафта, і руду дасталі,
Лён цудоўны. Бульба. Мяса. Сала.
Мы ў навуцы паказалі спрыт.

Зорныя над Беларуссю ночы,
Светлыя ў беларусаў вочы
Ад празрыстасці нябёс, азёр.
Дасягаем мы за мэтай мэту,
Слухаем сімфонію Сусвету,
Беларусы ўжо ляцяць да зор.

Можа лёс закінуць і далёка
Ад Радзімы нашай сінявокай,
Толькі ў сэрцах Беларусь навек.
Не забыць ніколі кут любімы,
Думкі нашы ўсюды пра Радзіму –
Край лясоў, будоўляў, ціхіх рэк.

## БАЛАДА ПРА МІНСК

Стаіць сталіца Беларусі
На свеце ўжо дзесяты век.
Ніколі Мінск не быў у скрусе,
Хоць і цярпеў чужынцаў здзек.

І хто зняволіць нас не марыў!
Але змагаўся Мінск штодня.
Захопнікаў ляцелі хмары,
Ды іх народ мой разганяў.



Ішлі гады, міналі весны,
І рос мой горад, і квітнеў.
Перамагаў і час ён грозны,
І славы добрай многа меў.

Любімы Мінск наш жыў без гора,
І будаваў свій новы лад.
Але прыйшла вайна ў наш горад,
Клыкі вастрыў фашысцкі гад.

І неба, і зямля стагнала,
Наўкол віхуры чорны дым,
Калі фашысцкая навала
Плыла над горадам маім.

Ды не скарыўся горад родны,
Хоць і пакутаваў ад ран.
На барацьбу ўзняў гнеў народны
Падпольшчыкаў і партызан.

Была фашысту ўсюды згуба,
Руіны цэлілі ва ўпор…
Быў знішчан кат фашысцкі Кубэ,
І помсты запылаў касцёр.

Хацеў фашызм, каб Мінск быў мёртвы,
Ды мірны дзень махнуў крылом.
Усё было навокал сцёрта,
Загінуў беларус чацвёрты,
Застаўся толькі пяты дом.

Але натхніла Перамога,
На рыштаванні мы ўзышлі.
Хоць страцілі страшэнна многа,
Намнога больш зрабіць змаглі.

Раслі дамы, раслі заводы,
Мы аднаўлялі шчасце зноў.
Адбудавалі пра нягоды
Наш Мінск на тысячы гадоў.

Усё цудоўнае, святое,
Сталіца, звязана з табой.
Даўно ўжо Зоркай Залатою
Узнагароджан горад мой.

Радзіма подзвіг не забудзе,
Што Мінск здзяйсняе дзень у дзень.
Расці, мой Мінск, на радасць людзям,
Шчаслівы лёс цябе вядзе!

## МАЁ ЖЫЦЦЁ

Адны жывуць, спяваюць песні –
Удача іншых абміне.
А я вось нарадзіўся ўвесну,
Нялёгкі лёс сустрэў мяне.

І хіба хто калі прыкмеціў,
І ці пачуў хто сэрца ўздых,
Што я зусім адзін на свеце,
Але жыву, і не прыціх.

І ўсё ж знайшоў я пуцявіну,
Адну-адзіную сваю,
Другі б даўно упаў і згінуў,
А я – стаю, а я – стаю.

Быў шлях цяжкі і невядомы,
Я зведаў радасць і бяду.
Сустрэчны вецер гне і ломіць,
А я – іду, а я – іду.

Інакш я жыць і не пачаў бы,
Усё кажу, як сам лічу.
Хто-небудзь іншы і змаўчаў бы,
А я – крычу, а я – крычу.

Дзе поспех ёсць, а дзе прамашка,
За праўду дорага плачу.
Тут і хадзіць бывае цяжка,
А я – лячу, а я – лячу.

Шукаць паэзію і ў прозе
Усё жыццё імкнуся я.
Хай стома век мяне не возьме,
Не згасне зорачка мая!

## МОЙ КРАЙ

Ледзь пасвятлее ў Светлагорску,
І прачынаецца мой край.
Едзь у райцэнтр, у горад, вёску,
Любое месца – гэта рай.

Шмат маладых у Маладзечне,
Вакол Барысава – бары.
І слаўна ў Слаўгарадзе вечным,
І людзі мірныя ў Міры.

У Лідзе Лідаў звабных многа –
Красунь, што кожны ўзяць бы рад.
І робяць новыя дарогі
Ў Старых Дарогах акурат.

Не глуха ў Глуску, а цікава,
Углыб Глыбокае глядзіць.
Дамы паставілі Паставы,
І добра ў Добрушы пабыць.

А горы солі ў Салігорску –
Хоць на ўвесь свет яе бяры,
І шмат азёр ля Белазёрска
Блакітам ззяюць на зары.

У Століне сталы засланы.
Пад Тураў – тураў статкі йдуць,
Напружышся – і вось Пружаны,
Ружаны ружамі цвітуць.

У Слуцку Случ цячэ прывольна,
Ў Вілейцы Вілія бяжыць.
Зачараваць і Нёман здольны,
Цудоўна ў Жыткавічах жыць.

У госці кліча Клічаў часта.
У Любань люба завітаць.
Масцяць Масты дарогу ў шчасце,
У Шклове вокны сонцам шкляць.

О, Беларусь, мая Радзіма,
Край родны, велічны, святы!
Мной кожны твой куток любімы.
Найдаражэй – жыццё і ты!



*Група выпускнікоў Універсітэта марксізму-ленінізму (факультэт партыйна-гаспадарчага актыву, аддзяленне сацыялогіі). 1972 год.*

## ЖЫЦЦЁ І МАРЫ

Дзе лепшага ўсяго вытокі,
Што сэрца бурна ўскалыхне?
Да светлых мар, ідэй высокіх
Цягнула ўсё жыццё мяне.

І музыку, і песні, вершы
Хацеў прафесіяй зрабіць.
Аднак рабочым месцам першым
Завод стаў – як яго забыць?

І выйшла так па той прычыне,
Што я – заводскі інжынер,
Хоць мары светлыя не кінуў,
І маю кніжак шмат цяпер.

А летуценнік я прыродны,
Але праз доўгія гады
Завод зрабіўся мне, як родны,
І гэта, пэўна, назаўжды.

Усё свой сэнс па-свойму мае,
І не ідзе ўсё ў забыццё.
Паэзія – мяне натхняе,
Завод – паказвае жыццё.

Я вершаў напісаў нямала,
Заўжды ў душы – пачуццяў вал.
Люблю – паэзію метала,
Люблю ў паэзіі – метал.

# ПЕСНЯ ПРА МІНСК

Родны Мінск, ты стаіш на працягу вякоў,
Праз нягоды ўсе падымаешся,
Разбуралі цябе, ды ўздымаўся ўсё ж зноў.
Ты і ў снах, і наяве мне бачышся.

Прыпеў:
Свеціць вокнамі яркімі горад наш скрозь,
Песні радасці ўсе пачуваюцца.
Кожны ў нас – дарагі, кожны будзе тут – госць,
Чуйна ў сэрцы пачуцці ўліваюцца.

І шчаслівыя дні, і нярэдка ў журбе
Быў для нас жыватворнай крыніцаю.
І свае, і чужыя – ўсе лічаць цябе
Самай новай ў Еўропе сталіцаю.

Прыпеў.
На Радзіму маю светлы ранак ідзе,
І жывём мы штодзённа надзеямі.
Ганарымся багаццем выдатных людзей –
Працавітымі, добрымі, смелымі.

Прыпеў.
Кожны дом, і праспект, і завулак, і пляц
Захапляюць, як быццам відовішчы,
А нярэдка яшчэ і палацы стаяць –
То культуры надзейныя сховішчы.

Прыпеў.
Не паеду ніколі я ў горад другі,
Бо ўлюбёны ж у свой непаўторны я.
Родны Мінск, ты для кожнага з нас дарагі,
Мы натхнёны табой і задорныя.

Прыпеў.



## ВЁСКА МІХАЛЕВІЧЫ

Вёска Міхалевічы –
Шэсць дзесяткаў хат.
Рэчка Шача плешчацца,
Як сто год назад.

Вось у гэтай вёсачцы
Я калісьці рос.
Так прыехаць хочацца,
Зведаць свежасць рос.

Памялела рэчачка,
Парасла травой,
Успаміны вечныя,
Тут заўжды я свой.

Сваякі чакаюць тут,
І наўкол сябры,
Бо спрадвеку роды кут –
Поле, луг, бары.

Вечна ў Міхалевічах
Хто ні зойдзе – госць.
І надзейна лечацца
Зайздрасць там і злосць.

А кіруе вёскаю
Шацкі сельскі сельсавет,
І трымае моц сваю,
Быццам запавет.

Дружна вы працуеце
Усе, як ні кажы.
Подых часу чуеце,
Вам няма мяжы.

Славай заручоныя,
Добрыя наскрозь,
Выйшлі з вас вучоныя,
І паэты ёсць.

Вёска Міхалевічы,
Родны мой куток!
Успаміны вечныя
Я спляту ў вянок.

## ЛІНІЯ ЖЫЦЦЯ

Не проста жыў я – і зусім не лёгка.
Такіх, дарэчы, многа ёсць між нас.
І на плячах, тады даволі крохкіх,
Ляжаў такі суровы, жорсткі час.

Але, хлапчук дапытлівы і жвавы,
Я вырас, пасталеў і памужнеў,
Дапамаглі мне людзі і дзяржава,
Па-рознаму жылося ім і мне.

Ды ад жыцця куды было нам дзецца?
Я не рабіў вялікіх, важных спраў:
Галоднаму – заўжды даваў пад'есці,
Беднейшаму – якісь рубель даваў.

І дзве заслугі, думаю, што маю,
Бо лінія жыцця была свая:
Нікому не павінен ні рубля я,
І век нікога не пакрыўдзіў я.

Да ісціны імкнуся сам пры гэтым,
Рабіў, што мог, і зараз – што магу.
Усё жыццё стараўся быць паэтам,
А стаў ім – маладым дапамагу.

*1980 год*

# БЫЛЫМ ДЗЕТДОМАЎЦАМ

Дзетдомаўцы, браты і сёстры!
Дазвольце шчыра вас вітаць.
Было ў вас шмат праблемаў вострых,
Але змаглі людзьмі вы стаць.

Вайна ў адных бацькоў забрала,
А іншых – кінулі бацькі.
І бедаў стрэлася нямала –
Быў незайздросны лёс такі.

І сніўся вам кавалак хлеба,
І цёплы матчын бляск вачэй,
А ласкі бацькавай патрэба
Вас не пакінула яшчэ.



*Чацвёрты клас дзесяцігодкі. Трэці злева ў першым радзе – Коля Варшынін. У цэнтры другога рада – любімая настаўніца ўсяго класа Лідзія Дзмітрыеўна Шэлег. Пасёлак Шацк. 1951 год.*

Уратавала вас дзяржава,
І падтрымала, як магла,
Загартавалі праца, справы –
Дарога цяжкаю была.

Бывалі радасці не часта,
Ды не схілялі галавы.
Хоць абышло вас бокам шчасце,
А лепшыя за іншых – вы!

У кожнага – свой шлях уласны,
Рабілі самі вы свой лёс.
Пажар душы ў вас хай не згасне,
Не зломіць бура і мароз.

Цяпер свае мы сем'і маем,
І адышло ўжо тое зло,
Давайце дружна пажадаем,
Каб дзетдамоў больш не было!

## ПРА НАДВОР'Е

Прамінаюць поры года,
Мчаць падзеі чарадой.
Як мяняецца прырода,
Так мяняецца настрой.

Лета ўвысь глядзіць глыбока,
Цеплыня і птушак звон.
Толькі ж лета – гэта спёка,
Аж дурманіць нас азон.

Толк малы, калі ты ў поце,
Сумна можаш уздыхаць,
Цяжкавата на рабоце,
Цяжка ў зморы і кахаць...

Восень – сум, адна маркота,
Сапсуе не раз настрой,
І ісці няма ахвоты
Да адзінае сваёй...

А зіма – наскрозь лядоўня,
Тут імпэт адразу знік,
І зіма адна віноўна,
Што ў душы ўзнік ляднік...

А вясне я вельмі ўдзячны,
Ёй спяваю светлы гімн,
Бо вясна – заўсёды ўдача
І ў каханні, і ва ўсім.

Весялосці сэрца прагне,
Так і хочацца гукаць,
За руку каханне цягне
Разам з дожджыкам скакаць...

Хоць паверце, хоць не верце,
Толькі ўпэўнены я ўсё ж,
Што найлепш за ўсё на свеце –
Веснавы ласкавы дождж.



# ВЕСНАВОЕ

Эх, жанчыны, ну, дзяўчаты,
Гэта вы ў тым вінаваты,
Што навеялі вясну,
І што хлопцам не да сну.

Растрывожылі нас дужа,
Бо з вас кожная, як ружа,
Заглядзішся толькі ў вас –
Страціш свой спакой не раз.

Вы, дзяўчаты, вінаваты,
Што шмат хлопцаў нежанатых,
Скажам шчыра, без прыкрас:
Цяжка выбраць сярод вас.

Дык красуйце, быццам кветкі,
Спакушайце нас нярэдка,
Мы ж прыязна паглядзім,
І вам сэрцы аддадзім.




Малюнак Міколы ГІРГЕЛЯ.

Вось тады вы нас мілуйце,
Абдымайце і цалуйце.
А як з'явіцца ў вас страсць,
То яна вам многа дасць.

Кроў бурліць, віхурацць думкі,
Пацалункі, пацалункі.
А дзяўчаты ўсе – ха-ха!
Недалёка да граха.

А які, скажыце, грэх?
Раз вясна, дык жарты, смех,
Грэх увесну не кахаць,
А ў маркоце пазяхаць.

Дружна шчасце п'ем да дна!
Будзем разам давідна,
Не хавайце ж і пачуцці,
Лепш за ўсё вы іх пачуйце.

## БАЖЭНА

Успамінаю я цябе нязменна,
Я адыду ад непазбежных спраў,
Імя тваё чароўнае – Бажэна!
Як быццам бы сам Бог цябе паслаў.

Мы сустракаліся з табою мала,
Ці быў у нас, а ці не быў раман?
Цудоўная, ты слаўна так спявала!
Рамантыка была, а не падман.

Пяшчотна так твае шапталі губы,
Ад шэпту ад таго душа дрыжыць:
– Павел, што для мяне ты – самы любы!
Мне без цябе ніколі не пражыць.

Спаткаліся з табой і разышліся,
А цёпла нам было й сярод зімы.
Няўжо надзеі марныя былі ўсе,
Няўжо сысціся зноў не зможам мы?

Мне без цябе душою не сагрэцца,
Але твае згубіліся сляды.
Пачуй жа стук параненага сэрца!
Хай стане ўсё між намі, як тады.

Жыць без расстання – светла і прыемна!
І зоркі нашы хай гарэць ярчэй.
Успомні пра мяне, мая Бажэна.
І пазвані. Даклікайся хутчэй!



# ГІМН КАХАНАЙ

Рэдкай была сустрэча,
Спявала душа ўдвая.
Спаткаліся мы так дарэчы,
Любіменькая мая!

Птушак разнагалоссе
Чуйна ўлавіў тады я.
І мне адразу здалося:
Ты – мара шчаслівая.

Позірк спакойны, спагадны,
Голас, як спеў салаўя,
Вобраз твой ненаглядны,
Адзіная ты мая.

Ў радасці і нягодах
Быць бы хацеў з табой я,
Бачыць цябе заўсёды,
Ты – суджаная мая.

Хай цябе любяць мужчыны,
Першым каб быў з іх я.
І не сумуй без прычыны,
Светлая доля мая.

Я раўнаваць не буду,
Сумна не стану ўздыхаць.
Век цябе не забуду,
Толькі дазволь кахаць.

У адзіноце не трэба
Быць ні табе, ні мне.
Хай будзе чыстым неба,
Смутак нас абміне.

Тваёй лебядзінай песняй
Ніколі не буду я.
Усё для цябе я здзейсню,
Любіменькая мая.

Яркаю зоркаю свеціш
Дома і ў дальніх краях –
Лепшая ў цэлым свеце,
Каханая ты мая!



# СЯМЕЙНАЯ РАЗМОВА

Яны сустрэліся даўно,
І кожны быў бязмерна рад.
Пайшлі адночы ў кіно,
І на адзін пасёлі рад.

Галлё раскінулі сады,
Цвіла нявестаю вясна.
Ён быў прыгожы, малады –
І лепшая яшчэ – яна.

І тут звяло іх у адно
Іх трапяткое пачуццё,
О, гэта дзіўнае кіно,
Цудоўны фільм на ўсё жыццё!

Ляцелі птушкамі гады,
І прамінула часу шмат.
Не ўсё ўжо зараз, як тады,
І не заўжды ўсё йдзе на лад.

Бывае, раззлуе іх што,
Ды так – аж краю не відно.
Ён скажа ёй: – Нашто пайшоў
Тады я ў гэтае кіно?

А гамана ў яе свая:
– Ці ж вельмі рада я? Наўрад.
Чаму цябе сустрэла я,
Нашто на той жа села рад?

Ён кажа: – Мне – то ўсё адно,
І разысціся нам – не страх.
Давай зноў пойдзем у кіно,
На розных сядзем мы радах.

І пазнаёмімся там зноў:
З другою – я, а ты – з другім.
Паўторыцца для нас кіно,
І кожны стане маладым.

Яна зірне – ў вачах любоў:
– Ды дзе ж нам дзець сваё дзіця?
Наш самы першы фільм з табой
Давай дагледзім да канца.



## ЛЮБІМАЙ ЖОНЦЫ

Такая ты – і не такая,
А я – такі, і не такі.
І кожны кожнага прымае,
Мы – дзівакі, не працякі.

І хоць шалееш, як рэактар,
Са злосці быццам творыш здзек,
Ты свой паказваеш характар,
І на мяне так прэш, як трактар –

Чытач мой першы і рэдактар,
Бывала часам – і фундатар,
Зусім нядрэнны чалавек,
Цябе цярплю я ўрэшце нейк.

Я неправы – дык ты бушуеш,
Сама віноўна – то маўчыш.
Стук майго сэрца часта чуеш,
Тады ў сям'і – парадак, ціш.

А ціпіыня заўжды патрэбна,
Пачуццяў многа на дваіх,
Бо лаянка заўжды ганебна,
Лепш – пацалункаў лёгкі ўздых.

Быўаеш часта не ў гуморы,
Хаваеш ласку неўпрыкмет.
Ты не даводзь мяне да зморы,
Каб мне не стаў нямілым свет.

Пры ўсім пры тым ты – кветка-ружа,
А я, магчыма, як асот.
Цябе ніколі я не здужаў,
А ты мяне – наадварот.

Хоць мы спрачаемся нярэдка,
У душы спяваюць салаўі.
Не гавары мне злосна, едка,
Сябруй, кахайся і жыві.



# ПРА ЖАНЧЫН

Жаночы лёс зусім нялёгкі –
Мужчынам быць куды прасцей.
Груз на плячах даволі крохкіх
Не памяншаецца – расце.

Ад розных клопатаў дзе дзецца?
Круціцца трэба нездарма.
Тут гаспадарка, муж і дзеці.
Адно – памочнікаў няма.

Адпрацаваўшы на рабоце,
Па магазінах пабяжыць.
Аберуч сеткі цягне ў поце –
Не адпачне, не паляжыць.

Тым часам муж чакае казкі:
Будзь феяй, як узор красы,
Ён патрабуе ўвагі, ласкі,
Каб на руках яго насіць.



Эмансіпацыя таксама
Жанчыну ўсё ж не абміне.
Ісці на моду трэба прама,
І быць з мужчынам нараўне.

І ганарыцца ёсць прычына
Ад раўнапраўя аднаго:
Працуй не меней за мужчыну –
І даглядай яшчэ яго.

Зусім не просты лёс жаночы,
Ды не згінаецца яна,
Бо дасягне, чаго захоча,
Яна адна – і не адна.

Адкінь жа лішнія турботы,
Сумненням волі не давай.
Жыві, кахай, рабі работу –
І пра сябе не забывай.

## АХ, ВЫДАТНАЯ ЖАНЧЫНА!

Ну, Настасся, ах, Настуся,
Гаварыць з табой баюся.
Скажаш столькі мілых слоў –
Стрэцца хочацца ізноў.

На цябе ўсе пазіраюць,
Мужыкоў магутны збор.
Пакахаць яны жадаюць,
З-за цябе заўжды – разбор.

І такая вось увязка:
Дабрынёй бярэш і ласкай.
Падміргнеш – вядзеш у казку,
Ці то праўда, ці – падмазка?



Ты сабою ўсіх чаруеш,
І стараешся, шчыруеш.
Як абдымеш моцна хлопца –
Сіла ўздымецца ў малойца.

Абуджаюцца жаданні –
Да сустрэч і да кахання.
Дзе там сціпласць. Дзе там злосць?
Так бушуе маладосць!

Як мужык цябе прыцісне,
Прыгалубіць і прысвісне –
Супрацівішся? Чаму?
Аддасі душу яму.

Жартаўнік – ці невясёлы.
Хоць магутны сам – ці кволы.
Гэта – як на фотаздымках.
Патанаеш у абдымках.

Ці сур'ёзны, несур'ёзны,
А як вал пачуццяў грозны!
Позна думаць: ты – яго,
Будзеш рада ад таго!

Праўду з казкай не мяшай,
Ці кахай, ці спакушай.
Бо каханне – то не смех,
Не заводзь мужчын у грэх.
Ай, вой, эх!

## ДЗЯЎЧАТЫ БЕЛАРУСКІЯ!

Скажыце, дзе ёсць лепшыя,
Нявесты дзе найпершыя?
Не трэба нам французскія,
Найлепей – беларускія!

І самыя прыгожыя,
На ўсё на свеце гожыя,
Такія сакавітыя,
Як мёдам вы налітыя.

Як толькі ў вас загледзішся,
Забудзешся пра беды ўсе.
Настрой наш падымаецца,
Надзеі ўсе збываюцца.

Танклявыя і стройныя,
Характарам спакойныя.
Ніколі не бушуеце,
Стук сэрцаў нашых чуеце.

Бялявыя, русявыя,
Чарнявыя і жвавыя.
Найбольш вы светлавокія,
У марах жа – высокія.

У меру ганарыстыя,
Заўсёды сэрцам чыстыя,
Хоць часам і сваволіце,
Знявагі не дазволіце.

Душэўнасцю спавітыя,
У справах працавітыя.
Зусім жа непадманныя,
Сябры навек адданыя.

І вы ва ўсім шчыруеце,
Сабою нас чаруеце,
Вы як цукеркі хрумсткія –
Дзяўчаты беларускія!



# ПРА ЗГОДЫ І РАЗВОДЫ

Пад ручку ў ЗАГС ідуць належным чынам
Да шлюбу хлопец малады з дзяўчынай.
За імі крочаць сваякі і сведкі –
Выпадак і звычайны, і нярэдкі.

Але ў чым справа? Не прайшло і года –
Дайшло ў маладажонаў да развода.
І з сваякоў ніхто не дапаможа,
І суд іх прымірыць ніяк не можа.

Цікава ведаць нам, а ў чым прычына,
Што не зжыліся хлопец і дзяўчына?
Тут выклікае ў мяне здзіўленне
Сучасных шлюбных актаў афармленне.

Здаецца, трохі вінаваты ў гэтым
Пытанні нашай загсаўскай анкеты.
Пытаюцца: – Вы згодны йсці да шлюбу?
Раз так, то кожны з вас другому любы.




Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА.

Ды хіба ж толькі згоды дастаткова?
Не, больш да месца іншае тут слова.
Калі б распісваць даручылі мне,
Дык я б пытаў: – Кахаеце ці не?

І хай паспрабаваў бы хто зманіць!
Лягчэй было б рашэне іх змяніць.
І хто ад сполаху закрыў бы рот,
Тым ад варотаў быў бы паварот.

## ЖАНОЧЫ ГНЕЎ

Не вельмі мілыя жанчыны
Ў час гневу бурнага свайго.
Спрачацца рады без прычыны,
А па прычыне – ого-го!

Але ты сам трымайся з вухам,
І нервы беражы свае.
Узніме вэрхал – ты не слухай,
А пацалуй мацней яе.

Калі яна і забушуе –
Аж іскры сыплюцца з вачэй –
Не зазлуеш, бо сэрца чуе:
Марнеў па ёй ты шмат начэй.

Што ж, не бяда, калі папрокі,
А ў тых вачах – і гнеў, і злосць.
Ты думай і глядзі глыбока,
Упэўнен будзь: каханне ёсць.

Жанчына пашуміць – не ліха,
Я сумны вывад не раблю.
Бяда тады, як стане ціха,
Спакойна скажа: – Не люблю!

Заўсёды ласка дапаможа,
І я даўно ўжо зразумеў:
Каханне ціхім быць не можа.
Няхай жыве жаночы гнеў!



## СУЧАСНЫ ШЛЮБ

Пуцёўкі ўзяўшы, адпачыць мы едзем –
Я ў бок адзін, а жонка – у другі.
Вы, людцы, што? – жахаюцца суседкі –
Няўжо вам родны дом не дарагі?

Знаёмствы на курортах, бач, заводзяць.
Дом адпачынку – хітрыкі адны,
Бо несур'ёзна там сябе паводзяць.
Глядзіш – даходзіць дома да вайны.

...Што ж, дрэнны сем'янін і дома зверне.
Як жонка едзе – слова не скажу,
Бо і любоў у нас ёсць, і давер'е,
І можам ехаць мы хоць за мяжу...

Мінае водпуск. З радасцю і згодай
Жывём. Спрачацца нам няма прычын.
А жонцы йдуць паштоўкі па паўгода –
Дарэчы, і не толькі ад жанчын.

Я абыякава гляджу на гэта:
Знаёмых многа можа быць ва ўсіх.
Тым больш – і мне ідуць лісты нярэдка,
Не ад мужчын каля паловы з іх.

Нашто ў сям'і прыгон – адна пакута!
Навошта быць прывязаным заўжды?
У водпуск з жонкай зноў паедзем хутка,
Пуцёўкі ўжо купілі – хто куды.

## МУЖЧЫНСКІ ВЕРШ

Мой сардэчны неспакой
Ты ўсхвалявала,
І здалася мне такой,
Што бывае мала.

Пражылі мы шмат гадоў,
Ды без асалоды.
Хоць на ўсё я быў гатоў,
Не было ў нас згоды.

І цябе я зберагаў,
Не паказваў волі.
Пра цябе заўсёды дбаў,
Пра сябе – ніколі.

Не рабіў табе я зла:
Думаў – будзеш казкай.
Ды мяне ты не ўзяла
Дабрынёй і ласкай.

Слова б добрае сказаць!
Тваё ж сэрца – камень.
А мяне магла ты ўзяць
Голымі рукамі.

Церпялівы, малады –
Я быў воскам, гумай.
Я пайшоў, і назаўжды,
А вось зараз – думай...

## ТРАКТАРАЗАВОДСКІЯ ПРЫПЕЎКІ

Мы – заводскія рабяты,
А дзяўчаты ў нас – агонь!
І на выдумку багаты,
Шлём вам нізкі свой паклон.

Мы працуем на "выдатна",
Праца нам – не лішні груз.
Да ўсяго на свеце здатны
Слаўны трактар "Беларусь".

Як заўжды, пасля работы
Вельмі весела жывём.
І гуляем мы з ахвотай,
І танцуем, і пяём.

Чай мы п'ём, бывае – зелле,
Каб сустрэцца весялей.
Нараджэнне і вяселле,
Часам – слаўны юбілей.

Нашы трактаразаводцы
Добра свой праводзяць час.
І цалуюць моцна хлопцы,
І дзяўчаты любяць нас.

А сябе паводзім горда,
Фору мы ва ўсім даём,
І спартыўныя рэкорды,
Не саромячыся, б'ём.

А як толькі шчасце ўгледзім,
Не разгубімся мы ўраз.
І на трактары пад'едзем
Мы з каханай прама ў ЗАГС.

І на трактарным заводзе
Моладзь слаўная ўся ў нас.
Мы жывём заўсёды ў згодзе,
Дружна ў госці клічам вас!



## НАВАГОДНЯЯ СУСТРЭЧА

Новы год на падыходзе,
Наваліла снег гарой.
Мы нікуды не выходзім,
Дома толькі я з сятрой.

Што ж, і так не засумуем,
Правядзём цікава час.
Ды званок вось раптам чуем –
Нехта ўжо ідзе да нас.

Адчыняю хутка дзверы –
Там Снягурка. Дзед Мароз.
Я вачам сваім не веру,
Да падлогі як прырос.

– Вас віншуем з Новым годам,
Падарункі вам нясём.
Хай жа будуць тут заўсёды
Радасць, шчасце на ўвесь дом.

– Дзякуй! Добрых слоў багата,
На душы ад іх лягчэй.
Адзначайце з намі свята,
Распранайцеся хутчэй.

І не мог я не здзівіцца,
І раззявіў нават рот:
Дзед Мароз – гадоў пад трыццаць,
А Снягурцы – дваццаць год.

Нельга ёй не захапляцца,
Хлопец – проста як арол.
Хутка ўжо праб'е дванаццаць,
Дружна селі мы за стол.

Гамана бяжыць жывая,
Бачым, хто чаго з нас варт:
Хто лепш песню праспявае
Ці смяшнейшы выдасць жарт.

Дружбы клаліся падмуркі,
Весяліў усіх настрой.
Я гляджу ўсё на Снягурку,
"Дзед" цікуе за сятрой.

– Ты глядзі, – кажу я жартам, –
Дзед Мароз – Чырвоны нос!
Са сваім лядовым гартам
Мне сястру не замарозь.

– Не бядуй, – і ён мне кажа, –
За Снягуркай лепш глядзі,
Бо характар свой пакажа,
Пальцы ў рот ёй не кладзі.

Вынік стрэчы ўсім быў любы,
Шмат было вясёлых спраў:
"Дзед" павёў сятру да шлюбу,
А Снягурку – я забраў.



# ПРА ЗНАХОДКІ

Калі я з грашыма знайшоў кашалёк,
Аддаў невядама каму,
Другі раз узяў я свой рот на замок:
Нашто аддаваць і чаму?

Знайшоўся пасля кашалёк і пусты –
Не рад быў я ўдачы такой.
Сам, грошы згубіўшы, ад смутку не стыў,
Не страціў зусім свой спакой.

Хоць кажуць, што шчасце не толькі ў грашах,
Яны не пашкодзяць заўжды.
Ды прагі не мець бы да іх у вачах,
Набыць без чужое бяды.

А што, каб даляраў знайшоў я мільён,
Хоць гэтаму век і не быць?
Ці прагным бы стаў і забыўся пра сон,
Ці глупствы пачаў бы рабіць?



*Сяброўская юбілейная сустрэча былых выпускнікоў Мінскага аўтамеханічнага тэхнікума (група кавальска-штамповачнай вытворчасці).*

Да грошай не трапіў бы я ўжо ў палон,
Не біла б у скроні мне кроў.
Усе іх аддаў бы за ўсмешак мільён,
За тысячу добрых сяброў.

## МАЯ СЛАБАСЦЬ – МАЯ СІЛА

За сабою назіраю
Я праз даўнія гады.
Доўга ўражанні збіраю,
І здзіўляюся заўжды.

Не бярэ мяне гарэлка,
П'ю яе, нібы ваду,
Мне не трэба і пахмелка,
Кайф у гэтым не знайду.

Не бярэ мяне табака,
Цыгарэты вось смакчу.
Ні дурману, а ні смаку,
Дык нашто за дым плачу?

Не бярэ мяне каханне,
Я таму зусім не рад,
Хоць ад вечара да рання
Паглядаю на дзяўчат.

Не бярэ мяне бяссонне –
Ці цвярозы, ці ў хмялю.
Калі я стаміўся сёння,
Ці гуляў – забойна сплю.

Не бяруць мяне хваробы,
І не ведаю бальніц.
Сэрца, печань, мозг, вантробы –
Я ад іх не падаў ніц.

Не бярэ мяне і зайздрасць,
Злосць не тлуміць галаву.
Ад чужой бяды – не радасць,
А сваю – перажыву.

Зразумець як тыя з'явы?
Падуладнае мне зло.
Што за дзіўныя праявы?
Так ні ў кога не было.

Мо такі ў мяне быў продак,
Гены я яго нашу?
Ёсць супрацьатрудны сродак,
Бо сатыру я пішу.

Маю светлыя ідэі,
А душа – як чысты ліст.
І не трачу я надзеі,
Бо – вясёлы, гумарыст.

## МАЕ ГАДЫ, МАЁ КАХАННЕ

Ужо кахаць я развучыўся.
Мінулі даўнія гады,
Дзе кавалерам я лічыўся
І быў прыгожы, малады.

Тады мог падысці чын-чынам,
Пачуцці выказаць свае.
Мазгі туманіць мог дзяўчыне,
Калі пачуццяў нестае.

Красунямі я захапляўся,
Мог перад імі падаць ніц.
І ўдзень, і ўночы не стамляўся
Любіць дзяўчат і маладзіц.

Шукаў сваю я доўга зорку,
І ўсё баяўся аднаго:
Каб не было камусьці горка,
І не кахаў абы каго.

Вясна і лета прамінулі,
Жыцця сыходзіць зарапад.
І скроні сівізна кранула,
І валасоў не вельмі шмат.

Жыцця майго тут толькі восень,
Ды сумаваць было б дарма.
Час хутка бегчы мы не просім:
Не надышла яшчэ зіма.

Кахання шчасця хто ж ухопіць?
Пачуцці праймуць і мяне,
Калі хто лёд душы растопіць,
І сэрца бурна ўскалыхне.



## МАЁ ІМЯ

У мяне імя – Мікола,
І таму я вельмі рад,
Не сумую з ім ніколі,
І ў пашане ж – у дзяўчат.

І магу сказаць сур'ёзна,
Ганаруся нездарма:
У краінах самых розных
Носяць слаўнае імя.

Гэта перш за ўсё славяне –
Лёгка вымавіць язык.
Італьянцы, англічане –
Нікалас, Нікколо, Нік.

Як узімку, так і ўвесну
Весялюся я ўдвая.
Вершы лепшыя і песні
Пра Міколу чую я.

...Бог сядзіць сабе на небе –
Назіраць за ўсім прывык.
Дапамога, бачыць, трэба:
Трапіў у бяду мужык.

Бедалага на калёсах
Вёз дахаты дроваў воз.
Адвалілася атоса –
Дык ні з месца, як прырос.

Бог святога пасылае:
– Мужыку дапамажы.
Той зляцеў, пабегаў з краю
Па дарозе, па мяжы.

Не зрабіў зусім нічога,
Бо няздольным быў да спраў.
І падняўся зноў да Бога,
Толькі сумна паглядаў.

Пасылае Бог Міколу:
– Падвядзеш мяне – наўрад.
Ты старанны і не кволы,
Дык выконвай мой загад!



ХРЫСТОС, СВЯТЫ МІКОЛА І МАРЫЯ ДЗЕВА

Вы спраўдзіце жыцця майго надзеі.



Што ж, за працу ўзяўся ўзнёсла,
Паказаў ва ўсім напор:
І рамонт зрабіў калёсам,
І плячом яшчэ падпёр.

Бог сказаў: – Вось той – нягоднік,
І адпеты сам гультай.
Ты ж, Мікола, мой угоднік,
І падзяку ўжо прымай.

Па лайдацкай жа прычыне
Прасмяе таго народ,
Бо не будзе імянінаў,
А ў цябе – аж двойчы ў год!

...Мне ж у цяжкую гадзіну
Мой святы – як бацька, госць.
Выпадкова я не згіну:
Ад бяды – заступнік ёсць!

Вось таму я і вясёлы,
Што нашу імя Міколы.

## ДАЙЦЕ МНЕ ТРЫ ЖЫЦЦІ

Часам роздум навявае,
Бо імкліва час бяжыць –
Хто шчаслівы, той трывае,
Цягне час. Абы дажыць.

І які б ні быў асілак,
Як разумным бы ні быў –
Хто з нас не рабіў памылак,
І хто глупстваў не рабіў?

Клопатаў меў розных многа,
Як і шмат жыццёвых спраў,
Прад сабой і перад Богам
Шмат грахоў я назбіраў.

За жыццё, як мог, я брауся,
Мне было не ўсё адно.
Дзесьці добра разабраўся,
Недзе падаў аж на дно.

Паміраць жа ўсім патрэбна –
Зразумела стала мне.
І хоць жыў сам не ганебна –
Мала радасці я меў.

Дайце мне жыццё другое –
Буду верны шлях трымаць.
Не ступлю я ўбок нагою,
Мне б памылкі выпраўляць!

Гнуў бы горб я і ўпіраўся,
Каб цяжар свой зняць з душы,
І дабро рабіць стараўся –
Не наўмысна я грашыў...

Каб пажыць пасля надзіва
І начхаць на небыццё,
Паглядзець на свет зычліва –
Дайце трэцяе жыццё.

І збыліся б пажаданні,
І не быў ніводзін грэх,
А – сустрэчы і каханне,
Поспехі і звонкі смех –
Быў бы шчасця поўны мех!

## НАШ ГОНАР

Мая краіна – не з бязлікіх.
Я паўтараю часта ўслых:
Малая ты – сярод вялікіх,
Вялікая – сярод малых!

# АД ШЧЫРЫХ СЭРЦАЎ

## (пакрысе прыемных слоў ад надзейнейшых сяброў)



*Паважаны Мікола Вяршынін!*

Шчыра віншую ад свайго імя і літаб'яднання "Мар'інка" пры Пухавіцкай раённай газеце "Сцяг працы", у якой часта друкаваліся і Вы, як наш шаноўны зямляк – з Вашым слаўным юбілеем.

Здароўя, шчасця, натхнення!

Вы, можна сказаць, далі мне пуцёўку ў паэтычнае жыццё, як і некаторым іншым паэтам нашага раёна.

## ПОСВЯЩЕНИЕ К ЮБИЛЕЮ (50-ЛЕТИЕ)

Годам, поэт, не надо верить:
Где их начало, где итог?
Ведь только можно жизнь измерить
Ценою пройденных дорог.

А вами пройден путь тернистый,
Беда встречала Вас не раз.
Но оставалась совесть чистой,
И совесть чистая средь нас.

Любите Пуховичский край,
Леса, болота и озёра,
Луга и речки – просто рай!
Кладем на всё в природе взоры.

Через века и сквозь года
Свой край запомним навсегда.
Талантов много есть у нас,
Гордились ими мы не раз.

Художники есть и поэты.
Народ в труде – как важно это!
Возьмём мы новые вершины.
А вдохновите Вы – Вершинин.

***Асташевич Станислав Иосифович, учитель. Поселок Правдинский, Пуховичского района, Минской области. 20.05.1990 года.***

## НИКОЛАЮ ВЕРШИНИНУ – УЧИТЕЛЮ ОТ УЧЕНИКА

Я пришёл тебе желать
Никогда не унывать.
Чтобы было, что жевать.
А на сердце – благодать.

Чтобы пить с тобой вино,
И взбираться на Парнас...
Он заждался нас давно,
Не кого-нибудь, а нас.

Чтоб была твоя сатира
Так остра, как и секира.
Чтоб весёлым юмор был,
И чтоб нас не позабыл –
И как мы тебя – любил.

*Николай Подмогильный,*
*подполковник, литератор.*
*г. Минск. 20 мая 1992 года.*

## ПА ЭТУ – САТЫРЫКУ І ГУМАРЫСТУ МІКОЛУ ВЯРШІНІНУ – ПАСЛАННЕ ЮБІЛЕЙНАЕ

Ён лупцуе бюракратаў,
П’янюкоў і лайдакоў.
Ён не садзіць іх за краты –
Рыфмай б’е з усіх бакоў.

Шэсцьдзесят гадоў адзначыў –
Прывітаў яго народ.
І сябе не перайначыў
На дзесятку сёмым год.

Не сядзіць сабе ў зацішку,
Бо сатырык-гумарыст.
Вершы новыя і кніжкі,
Выступае, як артыст.

60 – пара сталення.
Твораў больш, паэт, пішы.
Новых планаў і здзяйсненняў
Зычым шчыра, ад душы!

*Казімір Канус, галоўны рэдактар газеты "Чудеса и сенсации". 2001 год.*

## С РОЖДЕНЬЕМ – НОВЫХ ВАШИХ КНИГ!

Вершиной айсберга сейчас
Плывёт Вершинин в добрый час.
Газеты, радио, программы,
Его ждут юмор, эпиграммы.

И вырос автор до вершины,
Всем негодяем ставит мины.
Но слышим взрывы мы от смеха,
Для всех читателей – потеха.

И литстраница процветает,
Вершинин многих приглашает.
В редакцию мы все спешим,
За чашкой чая не молчим.

Мы в этой школе – возмужали,
Стихов немало написали.
Здесь каждый вырос до поэта,
Литконсультант открыл секреты.

Здоровы будьте, всех вам сил,
В своём вы творчестве – кумир,
Вас с днём рожденья поздравляем,
Ваш новый сборник ожидаем.

Открыто ходите, без маски.
Вершинин – мудрый жнец из сказки.
Вы – наш учитель, наш маяк,
Быть рядом с вами – добрый знак.

Поэт всегда вы молодой,
Ведёте всех нас за собой.
Мы дня рожденья заждались,
И вот друзья все обнялись.

Талант ваш в творческом расцвете.
Придём на ваше мы столетье.
И ждём по книге каждый год.
Живите долго – и вперёд!

За вас бокал мы поднимаем,
И дружно, с радостью желаем
Достатка в дом, любви жены,
И всех вам почестей страны!

***Алла Зайцева,***
***Ветеран торговли, член литобъединения.***
***Посёлок Самохваловичи, Минский район.***
***20 мая 2004 года.***

## НАШАМУ НАСТАЎНІКУ І СЯБРУ ПА ПЯРУ МІКОЛУ ВЯРШЫНІНУ

Майскім днём, вясёлым і квяцістым,
Немаўляткам ты прыйшоў на свет.
Шлях жыцця нялёгкім быў, цярністым,
Ды ўсё ж вырас, і даўно – паэт.

Ты на гэты свет глядзіш з усмешкай:
Як бы тут паправіць, што не так.
Смела крочыш сатырычнай сцежкай,
Бо ў гэтым жанры ты – мастак.

І хоць сам вядомы ўжо сатырык,
На вышыні значныя ўзышоў,
А ў душы ты ўсё ж, Мікола, лірык,
З добраю і чулаю душой.

Маеш шмат сяброў, не менш – сябровак,
Можаш чарку з гумарам кульнуць,
Хай жа будзе вострым твой аловак,
Каб ад баек, гумарэсак – не заснуць.

Майскім днём, прыгожым і квяцістым,
Немаўляткам ты прыйшоў на свет.
У "Цяльцы" – сузор'і прамяністым
Зорачкай пазначаны твой след.

*Эльвіра Ярчак, старшыня літаб'яднання «Ручайкі» пры рэдакцыі Мінскай раённай газеты "Наша жыццё". Пас. Бараўляны, Мінскі раён. 20 траўня 2004 года.*



Літаратурнае аб'яднанне «РУЧАЙКІ»
Літкансультант Мікола ВЯРШЫНІН

## ПРАЗДНИЧНОЕ

### (почти поэма)

Поэты не рождаются случайно:
Они летят на землю с высоты.
Их жизнь покрыта вся великой тайной,
Хотя они открыты и просты.

---

Учитедь наш и друг Вершинин –
Ему уже – 65!
Однако жив-здоров поныне,
И сочиняет он опять.
(И не пойдёт по жизни вспять).

Он – сын войны. Дитя детдома.
Учился очень много лет,
С трудом сам – с юности знакомый,
Теперь – известный всем поэт.
(Коль нужно, мудрый даст совет).

И на прославленных заводах
Он был – ведущий инженер.
Душою чуток от природы,
И сам изведавший невзгоды,
Нам подаёт во всём пример.

Литконсультант учил нас много –
Тех, кто писать лишь начинал,
И относился очень строго,
Показывал пути-дороги,
От той работы не устал.

Я не слагаю панегирик,
А говорою вам всё, как есть:
И юморист он, и сатирик –
Ему за это – слава, честь.
(И это – правда, а не лесть.)

Чистильщик общества активный,
Всю жизнь он борется со злом.
Во всём же – инициативный,
Работает и в ночь, и днём.
Поддержку мы его найдём.

Живи, наш друг, и всех нас радуй.
Читателей любовь – награда.
Пиши всё, что народу надо.
Глаголом жги сердца людские,
Чтоб упразднять грехи земные.

---

Вам, Микола, шестьдесят,
Я пять лет решил отнять
Потому, как Вы – поэт,
И моложе на пять лет.
Открываете нам свет.

Много, остро сочинял,
И питомцам помогал.
А воспитанников много,
Все редакции узнал,
Нас избавил от тревоги.

Острые всегда слова,
Устоишь от них едва –
Аж кружится голова,
Так сказал бы Крапива.
Ясно всё, как дважды-два.

Чувства добрые поймите,
Поздравления примите!
Поживите – наш совет –
Хоть десятков восемь лет!
В Вашем творчестве – ответ.

*Валентин Панкевич, молодой поэт — солидных лет, ветеран — давно ушёл от бед, не уставший от труда, что в заботах — ныне и всегда. Заводской район. г. Минска. 20 мая 2005 года.*

## МІКОЛА – ХТО ТЫ ЁСЦЬ, ЯКІ ТЫ ЁСЦЬ

**(святочнае шанаванне)**

Бацькі яму жыццё далі,
Біялагічна – генны інтэлект,
Сябе ўвекавечваць па крыві
Праз сынаў творчы важны след.

Яны не ведалі, што будзе
І праз часы, і праз гады.
Што сын таксама не забудзе,
Іх светлы вобраз назаўжды.

Што будуць вершы ў ноч, і ў ранні
Праз шлях нялёгкі у жыцці,
Таму, што гэтае прызванне
Усё ж далі яму бацькі.

І цяжкае тваё сіроцтва,
Дзіцячы дом, здзяйсненне мар,
Пачатак творчага знаёмства,
Ўначы нязгаснуўшы ліхтар.

І тэхнікум, універсітэт,
І дзённае, вячэрняе вучэнне,
І многа недаедзеных катлет,
А ў сэрцы – незгасальнае натхненне.

Затым працоўнае ірвенне
З “Прагрэсам” звязана гадамі.
І ў працы скрозь паразуменне
З шматлікімі, цудоўнымі сябрамі.

Пісаць прыназіраннях вершы,
У гумарэсках ставіць ноты.
Крытыкаваць сур’ёзна, смешна,
Пра розныя пісаць турботы.

Літстаршыня пры трактарным заводзе,
Дзе талентаў раскрыў нямала.
Заўсёды быў з усімі ў згодзе,
Увагі да людзей заўжды хапала.

І ў "Ручайках" пяюн любімы,
Паэтаў вучыць паважаць.
На крытыку кладзе ён сілы,
Памылкі ўсе стараўся выпраўляць.

Паэт – пра меншае не скажаш,
Настаўнік мудры – не прасцяк,
Жыццё ўсё ў творчасці пакажа,
Цікавы чалавек-мастак.

У свой чарговы юбілей
Усходзь, Вяршынін, на вяршыні –
Напорыста, наперад – і смялей,
Пакінь сваё святое імя.

Табе ж ужо не трэба "ў шапку спаць",
Бо – ты даўно вядомы, не бязлікі.
Нарэшце, "стукнула" – 65,
Дык будзь жа сярод іншых ты – вялікі!

*Сяргей Кішко,*
*начальнік аддзела Мінскага фурнітурнага завода.*
*20 траўня 2005 года.*

## НАШ ДРУГ ПО ЖИЗНИ И НАВЕК!

**(трудовое – творческое – героическое)**

Мы давно Миколу знаем,
Свято чтим, не забываем.
Исключительный талант,
Он в поэзии – гигант!

Инженер на производстве –
Он всегда к работе рвётся.
Острый словом, меткий глаз –
Популярен среди нас.

Коль сатирою уколет,
Негодяй любой застонет.
Скажет правду, а не ложь,
Рассмешит – так упадёшь!

Он товарищ, друг отличный,
В жизни ко всему привычный.
К нам относится любя,
Не жалеет сам себя.

Летописец нашей фирмы,
Любит нас – и мы взаимны.
Труд – желанье, не приказ,
Помогал и нам не раз.

Заводной всегда оратор,
И отменный литератор.
Мысли высказать умеет,
Много книг давно имеет.
(Только хвастаться не смеет).

Ищет острые он темы:
Экономики проблемы,
И политика, и жизнь
Так покажет, что держись!

Вот что значит – есть талант,
Он отдать его нам рад.
Наш Вершинин – вот такой,
Целит острою строкой.

Каждый день и каждый час
И не в бровь, а прямо в глаз.
От его идей – светлей,
Больше бы таких друзей!

Он служил в погранвойсках,
Это славно, ох и ах!
Журналист и гражданин,
С принципами он – един.

Инженер, поэт, историк,
Социолог, в жизни – стоик,
Три диплома – у кого?
Очень ценим мы его.

Дело – не в образованье,
Дело – в творческом призванье.
«Божью искру» коль дал Бог,
То Микола много смог.

Не расстанется нигде
С нашей фирмой – «Воландэ».
Ведь сдружились мы в труде,
Будем вместе – и везде!

Пишет, добрый от природы,
Крепко, остро – для народа.
Кто умён, тот разберёт,
В чей он катит огород.
Вот-вот!

*Волчек Андрей Иванович,*
*директор фирмы «Воландэ – электосервис», ООО*
*г. Минск, 20 мая 2005 года.*

## САТЫРЫК СА СВЕТЛАЮ ДУШОЙ

Ты мяне называеш сястрой,
Значыць, ты – мой брат маладзейшы.
І прыгожаю майскай парой
Я табе прысвячаю вершы.

Мы з табою – дзеці вайны,
І павінны трымацца разам.
І няма ў тым нашай віны,
Што бацькоў мы згубілі да часу.

Ды не згінулі ў пекле тым,
Бо Радзіма нам стала домам.
Праімчалі жыцця гады,
Сёння ты ўжо – паэт вядомы.

І з усмешкай глядзіш на свет:
Што б у ім тут змяніць, паправіць?
Ты ж – сатырык, не проста паэт,
І крытычна ацэньваеш з'явы.

І ад пільнага зроку твайго
Не схаваецца злодзей, хапуга.
Бюракрат уцякае бягом,
Быццам нехта сцягнуў яго пугай.

Ты па вуліцы смела ідзеш,
І любуешся вечарам майскім.
І лірычныя песні пяеш,
Старадаўнія любіш рамансы.

І сяброў сустракаеш заўжды
Хітраватай і добрай усмешкай.
А гады…не лічы, брат, гады,
Кроч далей паэтычнаю сцежкай.

*Эльвіра Ярчак.*
*2005 год.*

## НАСТАЎНІКУ – СЯБРУ ГАДОЎ МАЛАДЫХ

### (Міколу Вяршыніну – у наш сціплы вянок да 65-годдзя)

Лічыць гады мужчыну не да твару,
Тым больш – паэту. То была б ганебна.
Ён – творца асаблівага тавару,
Стварае не на дзённую патрэбу.

Быў шлях жыццёвы цяжкі і адметны:
Дзятдом, вучоба, потым – вечна праца.
Каля яго гуртуюцца паэты,
Ён ім – настаўнік шчыры і дарадца.

Яго з гадамі талент расквітае,
Трапнейшы – гумар, з'едлівай – сатыра.
Жыццё Міколу тэмы падкідае,
Каб не пылілася ў закуцці ліра.

У ім віруюць думкі і памкненні,
Увысь нясуць на новае ўзвышша.
І ўдзень, і ўночы тузае натхненне,
А ён не спіць у шапку: піша, піша.

Ён выпякае вершы, як аладкі,
Гарачыя і вострыя – па густу.
Якія за душу хапаюць хвацка,
Дзе словам – вольна, толькі думак – густа.

Што пажадаць паэту? Даўгалецця!
Актыўнага і добрага настрою.
Няхай чытач да колікаў смяецца
З ягоных недарэчлівых "герояў".

Няхай сябрамі будзе ён багаты,
І побач з ім – каханая жанчына.
Хай будзе цёплай і ўтульнай хата,
І толькі ў сне пабачыць адпачынак.

Здароўе не бракуе хай Міколе,
Цябе ж чакаюць новыя вяршыні.
Шчаслівым будзь, і не сумуй ніколі –
Паэт, сатырык, гумарыст – Вяршынін!

*Сафія Макарэвіч, урач, кардыёлаг і тэрапеўт,*
*паэтка і празаік, лірык і гумарыст.*
*20 траўня 2005 года.*

## Я – І ТЫ

### (Не старому – маладому)

Мы з аднаго з табою года,
І парадніў нас месяц май.
І праз удачы і нягоды
З нас кожны кожнага – прымай.

Дваццатае чысло – удача,
Па гараскопу мы – цяльцы,
І мы ад цяжкасцей не плачам,
Ад іх ніяк нам не ўцячы.

Абое творчасцю заняты,
Грамадства тычым пад бакі:
Сатырык, гумарыст заўзяты,
Я ж – лірык, не абы які.

Аднак не пра сябе пішу я –
Цябе вітаю, сябар мой,
Стук твайго сэрца ўсюды чую
І сярод лета, і зімой.

Хоць цяжкасці былі нярэдка,
Іх, што ж рабіць – не абмінай,
Але былі ў душы ўсё ж кветкі,
Бо нас ратуе месяц май.

Адзначым разам нараджэнне,
І думкі выкажам услых.
Раздзелім разам мы натхненне,
І ўсе расходы – на дваіх!

***Казімір Канус, журналіст, паэт.***
***20 мая 2005 года.***

## ЧИТАЯ И СЛУШАЯ ВЕРШИНИНА

Разные болезни у людей бывают,
И от них, проклятых, люди так страдают!
Лечит врач микстурой, также и уколом,
Николай Вершинин лечит острым словом.

И летит то слово, как стрела, в пьянчугу,
Жить не даст спокойно Коля и ворюге.
Ну, а если ленью ты, как кот, болеешь,
Веника отведав, вмиг поздоровеешь.

Жгучий, как крапива, веник у Миколы,
Вылечит от лени быстро. Без уколов.
Словом, как компрессор, вам нажарит спинку,
Вылечит от спеси – не подложит свинку.

Дураку, конечно, никто не поможет,
И мозги тупые в голове не вложит.
Над кукушкой-мамой Коля посмеётся,
Среди нас немало и таких найдётся.

Бракоделам тоже по заслугам Коля
Пощекочет нервы – “Вожыкам” уколет,
Взяточники, стойте, руки уберите!
Наших честных граждан грабить прекратите.

“Пулемётной” строчкой по рукам, по жадным
Коля быстро строчит – вымогать не надо!
“Несуниха”– крыса хлеб чужой кусает.
Про неё Вершинин басню сочиняет.

Поперхнётся в злости “несуниха”-крыса,
Хлеба не захочет – может подавиться...
Ну, а если в праздник гостей собирает,
“Рвутся” все от смеха – Коля выступает.

Это – не Коклюшкин, это – не Шифрин,
Это – белорусский юморист один,
Николай Вершинин нам стихи читает –
Даже сам Жванецкий рядом “отдыхает”.

Смех, давно известно – лучшее лекарство,
Знать должно об этом наше государство.
Чтобы белорусы долго-долго жили,
Радовались жизни и здоровы были.

Чтоб свои болезни вовремя лечили,
О своих пороках навсегда забыли.
Ручейком весёлым льётся пусть в газеты
Юмор и сатира “тутэйшых” поэтов.

И ТВ, и радио, эстрада и журналы
Белорусский юмор чтоб не забывали.
А Вершинин в жанре – главный наш актив,
И работу тянет, как локомотив.

*Валентина Бурмистрова, педагог.*
*Пос. Аксаковщина, Минский р-н.*
*2005 г.*

## МІКОЛАЎ З ПТУШКАМІ ПАЛЁТ

Восень. Птахі змоўклі,
Дожджык церусіць.
З дрэваў ліст пажоўклы
Ціхенька ляціць.

Журавы паныла
Ў неба падняліся,
І на дужых крылах
Ў вырай падаліся.

І ляцяць клінамі,
Клёкатам галосяць,
Прабачэння з намі
І ў Міколы просяць.

Вернуцца ж у зморы,
Колькі б не блукалі.
За якім бы морам
З ім ні зімавалі.

З намі ім займацца
З першаю раллёю,
Песняй славіць працу –
І Міколы долю.

*Валеры Алісевіч, рабочы.*
*Пасёлак Курасоўшчына, г. Мінск, 2005 г.*

## ЗА ШЧЫРАСЦЬ ШЧЫРАСЦЮ ПЛАЧУ

**(Міколу Вяршыніну)**

Ад таго я сёння ў шчасці,
Што магу і я папасці
Ў кнігу слыннага паэта –
Мне прыемна вельмі гэта.

А яго імя вядома
Ў родным доме, каля дома,
У раёнах Беларусі,
Вось таму і ганаруся.

І мой след з ім побач будзе,
Прачытаюць дружна людзі,
Толькі ж ведаць будуць меру –
Не згубіць яго даверу.

Сеяць не хачу мякіну,
Лепей чысты ліст пакіну.
Засяваць не буду поле,
Сам засей яго, Міколе –

Найсвятлейшым дарам божым,
Талентам сваім прыгожым.
У цябе ён – не адзіны:
Ёсць і голас салаўіны.

Каб не стаў ты гумарыстам,
Слаўным мог бы стаць артыстам,
Спеваком, прытым – народным,
Бо душою ўсім ты родны.

Вечна цёпла ў чыстым сэрцы,
Хораша з табой сустрэцца.
Дабрыню дарыць ахвочы,
Васільковы светлы вочы.

* * *

Абдымеш кожнага, як брата,
Пасля ў сваю запросіш хату.
Там будзе на стале і чарка,
І да чаркі гожай скварка.

А сам ты песню заспяваеш –
Сляза скупая па шчацэ.
А нехта скажа: – Я сыграю,
А ты – спявай, спявай яшчэ.

Ласкавы голас твой шырокі,
Плыве і ў век, плыве і ў час,
Схаваўшы ў ім свой лёс сірочы.
Спяваеш тонка ты для нас.

І ты, не ўведаўшы магулі,
Не бачыў ласкі ад яе,
Душу сваю да песні туліш,
Яна цяпло табе дае.

О, як твой боль я адчуваю,
Бо і сама такі нясу.
Спявай, спявай, я падыграю
Аб нашым мілым родным краю,
Пра беларускую красу.

Душа твая, душа паэта,
У ёй заўсёды – толькі лета.
Няхай ідзе твая дарога
Яшчэ па летах многа, доўга.

Крынічкай нашай роднай мовай
Паі ты нашу ўсю зямлю.
А як твае пачую словы,
Замілавацца я гатова –
Міколу слухаць я люблю!

*Вера Крышталь, служачая,*
*г. Мінск 2005 год.*




## НА ЮБІЛЕЙ – ЖЫЦЦЁ СВЯТЛЕЙ МІКОЛУ ВЯРШЫНІНУ

**(паэту, сатырыку-гумарысту)**

**Ад удзячных чытачоў**

* * *

Юбилей, шестьдесят пять!
Что же лучше пожелать?
Чтоб ещё ничуть не меньше
По планете прошагать!

Счастья, радости, побед,
Чтобы в сердце тот же свет,
И, конечно, чтоб здоровье
Было, как в шестнадцать лет!..

Ну, не так уж молодым –
Не ушли б мечты, как дым,
Вознеслись вперёд мечты,
И свершенья, и цветы!

Пусть летят твои года,
Не старей же никогда!
Для тебя пределов нет,
Потому что ты – поэт!

***Нина Ющенко – Грецкая,***
***начальник планового отдела ЦСУ банковской системы.***
***20 мая 2005 года.***

## СВЕТЛЫЙ ПРАЗДНИК ДУШИ

Шестьдесят с пятёркой лет –
Вам ещё износа нет.
Рада я поздравить Вас –
С юбилеем, в самый раз.

Вы, Вершинин, на вершине –
Вам судьбою суждено.
И для юмора, сатиры
Острое перо дано.
(Пишете давным-давно).

И так метко Вы стреляете,
Что словами убиваете:
Разгильдяйство, зависть, лень.
Без них светлее каждый день.

Вы – маг, волшебник, чародей,
Сатирой лечите людей.
И слышала я Вас не раз.
Так было – в зале свет погас.

Но Вы такое рассказали,
Что даже стены хохотали.
А юмор – это сила, смех,
Всегда, везде Вас ждёт успех.

Для Беларуси всей родной
Все Ваши строки – до одной
Звучат значительно подряд,
И каждый Вас услышать рад,
Ведь вы – наш друг, и Вы – наш брат!

*Диана Мартынова, географ.*
*2005 год.*

## АД СЯРГЕЯ МІХОВІЧА

## (Нам. Галоўнага рэдактара газеты "Рэспубліка") – МІКОЛУ ВЯРШЫНІНУ

(Думкі – мае, рыфмы – твае,
Сэрца пачуццям спакою не дае).

Паважаны наш Мікола,
Не мінай ты нас ніколі.
Вострыя радкі складай,
І настрою нам паддай.
Нас адных – не пакідай.

Разгаворымся цікава,
Не дарэмная то справа –
Гамана цячэ не млява.
Завітаеш не ўпустую –
Свежанінкай пачастую.

Не абходзіш многа ям,
Нашы стрэчы – радасць нам.
Я дзетдомаўца шкадую,
Творы лепшыя друкую.
Як не зойдзеш – дык кукую.

Да цябе ж увага ёсць –
Даўні аўтар, добры госць.
За характар твой прамы
Ўсё цябе шануем мы –
Сярод лета і зімы.

## ДОБРЫ ДЗЯДЗЬКА – СЛАЎНЫ БАЦЬКА

Хто будуе, хто гандлюе,
Гідрастанцый круціць кола.
Ну, а дзядзька наш Мікола
На "драпежнікаў" палюе.

Дзе АБЭП не знойдзе рады,
Не дапетрыць, вось дык дзіва! –
Там б'е дзядзька ў хвост і ў грыву
Дармаедаў, казнакрадаў.

З працы цягне хтосьці – штосьці,
Пхае гонар у бутэльку,
Вой, нарвецца на камельку,
Будзе ў байках частым госцем.

Павучыць кабету ў краме
Чысціні магутнай мовы –
Тут мастак ён адмысловы,
Падзяліцца можа з намі.

Пра яго сказаць самога,
Дык дабрэй не знойдзеш дзядзькі.
Ад старога да малога
Дорыць вершы, быццам цацкі.

Дзень да вечара заняты.
Ну, а вечар толькі ў шкло –
Лезуць, быццам кураняты,
Вучні бацьку пад крыло.

Ён – бы дуб у рознalессі,
Голле ўскінуў да нябёс.
Хай жа сонца вершы песціць,
Бог яго вартуе лёс!

*Іван Пыка, будаўнік.*

## Я И ТЫ – И ВДОХНОВЕНЬЕ

Мариец – я, ты – белорус,
Моя супруга – белоруска.
Не давит жизни тяжкий груз,
Круг интересов наш не узкий.

Я на моторном инженером,
А ты на МТЗ им был,
Являлся ты для нас примером,
И я то время не забыл.

Встречались в литобъединеньи,
Писали прозу и стихи.
И нас встречало вдохновенье,
Мы были парни – неплохи.

Вперёд стремились мы при этом,
И каждый был душою чист.
Ты стал известнейшим поэтом –
Сатирик славный. Юморист.

Со славой личной не носился –
Судьбою трудной обделён.
К нам как наставник относился.
Прими учеников поклон!

Пусть наши встречи будут часто,
Пускай всегда бушует кровь.
С тобой приятно нам встречаться,
Живи, пиши, и будь здоров!

*Владислав Николаев,*
*инженер транспортной службы.*
*Выходец из Республики Мари — Эл.*



## З НАГОДЫ ЗНАЧНАЙ ДАТЫ

То “Пэр аспэра ад астра…
Ці з-пад пэра ад астры”…
Правяць музай хрыст да нахрыст
Падкалодныя майстры.

Хто слабейшы – той і тужыць,
А знямелы – больш чым так.
Ды вось ты, мой слаўны дружа,
Быў сабой і ёсць мастак.

І ў свае зямныя вёсны,
Без прыкрас і без прысмак
Тчэш пяром сатыры кросны,
Бо Спадар ты, не прымак.

Не прымак літаратуры,
А яе выдатны сын.
Пішаш проста, без халтуры,
Не сумуеш без прычын.

У гуморы і ў сатыры
Круціш свой груваскі млын.
Ты як рэзкі, так і шчыры –
Бо такі ты ў нас адзін!

*Аляксей Капцюг, каваль-мастак,*
*вёска Русакі, Мядзельскі раён.*

## М. ВЯРШЫНИНУ, ПАЭТУ-САТЫРЫКУ І ЧАЛАВЕКУ

Ты – выдатны суразмоўца,
І весёлы чалавек.
Часам так закінеш слоўца,
Што няўцям дзе грэх, дзе смех.

Гумарэскі, каламбуры,
Фельетон, дасціпны жарт,
Байкі і мініяцюры –
Гэта твой духоўны скарб.

Скарб, які ты нам ствараеш,
Каб дарыць яго ўсім нам.
А яшчэ ж і вучняў маеш,
Энергічна пішаш сам.

Ты не ведаеш ваганняў,
Не падлічваеш гадоў.
У цябе ёсць шмат выданняў –
І з паўгорада сяброў.

Узбадёрышся няцяжка,
Бо не ведаеш нуды.
А як трэба гахнуць пляшку,
Ці работай – лёгкай, цяжкай –
Дапаможаш нам заўжды.

Папулярны ты ў народзе,
Творыш без гнілога шва...
У мастацкім агародзе.
Вось што значыць – галава!

***Юрась Нераток, начальнік канструктарскага аддзела Навукова-вытворчага аб'яднання "Цэнтр". Паэт, празаік. Член расійскага Саюза пісьменнікаў. 2005 г.***



*Юрась Нераток і Мікола Вяршынін на 65-гадовым юбілее аўтара гэтай кнігі*

## ТАЛАНТЛИВОМУ ПОЭТУ – НИКОЛАЮ ВЕРШИНИНУ

По полной мельница кружится,
Зерно мельчают жернова.
Но на кого есть положится –
Сатира потому жива.

Не счесть красивых дел на свете,
Скажу тебе без лишних слов:
Спасибо, друг, тебе за это,
Что жить не можешь без стихов.

Пора тебе уже признаться
В таланте истинном своём.
И можешь смело зазнаваться,
Сравниться даже с соловьём,
Особо – в юморе твоём.

Но в клетку ты к нему не суйся:
Остаться трудно без хвоста!
За это на меня не дуйся –
Моя теория проста:

Бери ты новые вершины,
Отметив возраст мудрый свой.
Не зря фамилию – Вершинин
Несёшь ты с гордой головой.

Что ж, рифму складную, Вершинин,
Я повторю ещё не раз –
Ты с ней забрался на вершину,
Которую зовут Парнас.

Ты – самый славный среди нас,
И мчит тебя твой конь – Пегас!

*Иван Киселёв, журналист,*
*сценарист, поэт из Мордовии, 2005 год.*

## ШЧЫРАЕ, НАТХНЁНАЕ

З табой мы бачымся нярэдка –
Суседзі, добрыя сябры.
Гаворыш востра, трапна, едка,
З табой да трох не гавары.

Валодаеш вясёлым словам,
І разам дружна мы сядзім,
Як возьмеш ручку ці аловак,
Напішаш росчыркам сваім.

Я прачытаць заўсёды рады
Твае выдатныя радкі.
Чытаю сам, і жонка Ада,
І ведаем, што ты – такі.

Я – верны сябар твой Валодзя,
Мяне сумленне не шкрабе.
І праз гады, дзесяцігоддзі
Абое ведаем цябе.

Гамонім шчыра мы сам-насам.
Ты як напішаш – проста клас!
І сам папісваю я часам,
Дык ты ж – Вяршынін, я ж – Улас.

Стук твайго сэрца вечна чуем.
Табе ж ужо – 65.
Мы з жонкаю цябе віншуем,
І не стамляйся працаваць!

***Уладзімір Улас, галоўны рэвізор банкаўскай сістэмы.***

## МІКОЛУ

Бывает в нашей жизни совершенство –
Не для себя, а на века.
Коль хочешь получить блаженство –
Читай стихи Миколы–класси–
ка!

Не все мечты, отсюда и докуда,
Пусть нет отца, и матери не помнит,
Зато он знает, для чего, откуда
Растут его отеческие корни.

А он хотел, наверно, не награды,
Не занимается ведь чистописаньем модным.
И, может быть, судьба его не рада,
Зато он рад поэтом быть народным.

*Александр Ковалёнок, бизнесмен, поэт.*
*2005 г.*

## АД АЎТАРА – ЛЕПШЫМ СЯБРАМ

Два Сяргеі сэрца чуюць –
І Міховіч, і Кішко.
Без мяне яны сумуюць,
І дзетдомаўца шкадуюць,
Свежанінаю частуюць
Кожны Новы год – за што?

А за тое, што заўсёды
Творчасць аб'яднае нас.
Не разлучаць жа нягоды,
Найцяжэйшыя прыгоды –
Кожны дзень і кожны час.

І канструктар – Ігар слаўны,
Інжынер Лявон Казлоў.
І Васіль Нікіцін – знаны,
Дзелавы і пажаданы.
Лёня Бэкман зойдзе зноў,
Лепшы транспартнік – без слоў.

Барысевіч Валік бачыць,
І пляменнік Гена шчэ.
Шмат сястра Таіса значыць –
Як вучоная, прадбачыць,
Гаман бяжыць, цячэ.

І дырэктар фірмы мужны –
Волчак ёсць яшчэ Андрэй.
Прафундуе кнігу дружна –
Ты пішы злей, весялей!
Па жыцці ідзі смялей.

Журналіст Яўген Сямашка
І Курганскі – сябар, госць.
І Вільчынскі – з ім не цяжка
З Сашам вечна маладосць.
З імі радасць а не млосць.
У "Народнай" – Коля Дым.
Дружбакі даўно мы з ім.

Уладзімір Саламаха,
Толя Зэкаў – вось сябры!
І Шуваеў, што з размахам –
Кандыдат навук не ахаў,
Падтрымаюць адным махам –
Прыклад з іх заўжды бяры,
Так не згінеш да пары.

І газеты, "Вожык" родны,
Асабліва, скажам, ЛіМ.
Раз сатырык ты прыродны,
І як хочаш стаць народным –
Век пішы, стой на сваім!

А яшчэ так важны гумар,
Што дае нам весялосць –
Будзь мужчынам, а не гумай,
Пра найлепшае ты думай –
Будзеш лепшы ўсюды госць.

Сваякоў, сяброў, калегаў –
Я ўсіх не пералічу.
Стрэну іх, хто б не прыехаў –
Будзе радасць, многа смеху,
І размова, і пацеха –
Бачыць зноў я вас хачу!

## СПОНСОР ИЗДАНИЯ:

**ООО «Воландэ – электросервис».**

Фирма занимается реализацией электротехнической и кабельной продукции промышленного и бытового назначения, а также разнообразного инструмента. Кроме того, реализуется множество других предметов, вещей и товаров, необходимых на работе, в хозяйстве, на даче и дома – свего около 8000 наименований для любой надобности и на любой вкус.

Продукция отечественного производства и из стран ближнего зарубежья – России, Украины, Польши. Товары отпускаются в любых количествах. Цены умеренные. Доставка самовывозом и транспортом поставщика. Отпуск по предоплате и при получении.

**Адрес фирмы: г. Минск, ул. Гусовского, 6.**
**Тел. 2-52-55-27.**
**Директор: Волчек Андрей Иванович.**

**Особую благодарность автор выражает Рекутю Олегу Эдуардовичу.**

## ЗМЕСТ

ВЯСЁЛЫ КАЛАЎРОТ
Вершы з перцам і соллю ....... 4
Сваё – свайму ....... 5
Пра Мух і пра Зуброў ....... 6
Лес і прагрэс ....... 7
Кіраўнічы казёл ....... 8
Сваё месца ....... 10
Незвычайны юбілей ....... 11
Размова з-за куста ....... 12
Каза – Карова ....... 13
Вучоны Кіт ....... 15
Ахвяра гультайства ....... 16
Вераб'інае каханне ....... 17
Канцэрт ....... 18
Ахвяра характару ....... 19
Таўстаскурая Свіння ....... 20
Пра сваё і за сваё ....... 21
Міні-байкі ....... 22
Незалежнасць ....... 23
Сённяшні дзень ....... 25
Цэны ....... 26
Пра выдаткі на падаткі ....... 28
Пенсіі ....... 29
Маланка і гром ....... 30
Горш не будзе ....... 31
Сучасны партрэт ....... 32
Няўдалая будоўля ....... 33

План і падман ....................................................35
Пакаранне за старанне ..........................................36
Майстры развалу ................................................38
Адэкалон і пыл .................................................39
Рацыяналізацыя .................................................40
Пра культуру ...................................................41
Туляга на рабоце ...............................................42
Маналог бюракрата ..............................................43
"Дабрачынны" ...................................................45
Ухвала піву ....................................................46
Самаправерка ...................................................49
Змікіціў .......................................................49
Хто-каго .......................................................51
Пацярпеў .......................................................52
Наваліліся .....................................................54
Благое падабенства .............................................55
Я – і барада мая ...............................................56
Як я кінуў піць, курыць ........................................58
Аднойчы быў і я жанатым ........................................59
Мне б такога жаніха ............................................61
Як сват быў вінаватым ..........................................63
Перагрузілі ....................................................64
Усмешка ........................................................65
Вядзьмарка .....................................................67
Дрэнная схованка ...............................................69
Падабенствы ....................................................70
"Пазайздросцілі" ...............................................71
Правучыў .......................................................72
Бадзёрасць сам сабе шукай ......................................74
Замудрая жонка .................................................75
Папаўся... нізашто .............................................77
Не да жартаў ...................................................78

Не крыўдзі бліжняга .................................................80
"Настаўнік" .................................................82
Няўдалае рабаўніцтва .................................................83
Адпачынак та турбазе .................................................85
Наелася .................................................88
Пашкадавала .................................................89
Доля гультая .................................................91
Адкуль бамжы бяруцца .................................................92
А прычым прычоска тут .................................................94
Прэмія... за сквапнасць .................................................96
Па сакрэту ўсяму свету .................................................97
Прапанова і адмова .................................................99
Бабулька у аўтобусе .................................................99
Як спорт уратаваў .................................................99
Усё – наадварот ................................................. 100
Дзівак ................................................. 101
Навагодні "жарт" ................................................. 102
Пра цешчу ................................................. 103
Прапіўся ................................................. 105
Мае вусы ................................................. 106
Пра мужоў і жонак ................................................. 108
Споведзь п'янтоса .................................................110
Кара... за пацалунак .................................................112
Брыдкаслоўе .................................................114
Хатнія прыгоды .................................................116
Прыгоды дачніка .................................................118
Нашто мне рай .................................................119

ЭПІГРАМЫ – ШЧЫРА, ПРАМА ........................ 121

САТЫРЫЧНЫЯ ПАЭМЫ
Дача, дача – вось няўдача! ........................ 128
Дарога на Парнас ........................ 133
Наша "ІСЛАЧ" – родны дом ........................ 137
Як лячыўся ў Бруйску я ........................ 146
Чаму абраў я гэты жанр ........................ 151

МЕМУАРЫ (пісьменніцкія жартачкі) ........................ 153

АД СУСЕДЗЯЎ-БРАТОЎ (пераклады з украінскай мовы)
Людміла Зазуля. "Слаўны" палёт ........................ 242
Валянцін Лагада. Навагодні кур'ёз ........................ 243
Іван Неміровіч. "Адсталы" ........................ 246
Няўдалы эксперымент ........................ 247
Смерць ката ........................ 249
З хворай галавы на здаровую ........................ 250
Што – каму ........................ 250
Пагаварылі ........................ 252
Мікітава помста ........................ 252
Як забівалі парсюка ........................ 253
Заляцаўся Грыць Макуха ........................ 255
Як жанок мы сустракалі ........................ 257
Ігар Січавік. Хвілінка ........................ 259
Рэдкі голас ........................ 260
Шчасце ........................ 261
Абое рабое ........................ 262
Зачараваная шасцёрка ........................ 264

КАБ СПЯВАЛА ДУША (лірыка-сатырыка)

Натхненне .......... 266
Беларусь .......... 267
Балада пра Мінск .......... 268
Маё жыццё .......... 270
Мой край .......... 271
Жыццё і мары .......... 273
Песня пра Мінск .......... 274
Вёска Міхалевічы .......... 275
Лінія жыцця .......... 276
Былым дзетдомаўцам .......... 277
Пра надвор'е .......... 278
Веснавое .......... 280
Бажэна .......... 281
Гімн каханай .......... 283
Сямейная размова .......... 285
Любімай жонцы .......... 286
Пра жанчын .......... 288
Ах, выдатная жанчына .......... 289
Дзяўчаты беларускія .......... 291
Пра згоды і разводы .......... 293
Жаночы гнеў .......... 294
Сучасны шлюб .......... 295
Мужчынскі верш .......... 296
Трактаразаводскія прыпеўкі .......... 297
Навагодняя сустрэча .......... 299
Пра знаходкі .......... 301
Мая слабасць – мая сіла .......... 302
Мае гады – маё каханне .......... 303
Маё імя .......... 305
Дайце мне тры жыцці .......... 307
Наш гонар .......... 308

АД ШЧЫРЫХ СЭРЦАЎ
(пакрысе прыемных слоў ад шчырых сяброў)..... 309

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Вяршынін** Мікалай Пятровіч

**І роздум, і смех, і любоў...**

**Сатыра, гумар, мемуары, пераклады, лірыка; вершы, прысвечаныя аўтару**

Адказны за выпуск *Вячаслаў Корбут*
Рэдактар *Уладзімір Правасуд*
Карэктар *Андрэй Лоскутаў*
Камп'ютарная вёрстка *Павел Лоскутаў*

Падпісана ў друк 24.06.2006.
Фармат 84x108/32. Папера афсетная.
Гарнітура Times New Roman, AcademyC.
Ум. друк. арк. 16,2. Ул.-выд. арк. 17,5.
Тыраж 600 экз. Першы завод 100. Заказ 118.

Выдавецтва "Беллітфонд".
ЛВ № 02330/0056994 ад 30.04.2004.
220034, г. Мінск, вул. Фрунзе, 5.

Надрукавана на рызографе ООО «Мэджікбук»
ЛП № 02330/0056818 ад 2.03.2004 г.
220103, г. Мінск, вул. Кнорына, 50а.

Цана дагаварная





[illegible]

ISBN 985-6576-90-3

Мікалай Пятровіч Вяршынін нарадзіўся 20 траўня 1940 года ў горадзе Чэрвені Мінскай вобласці. Бацькі яго загінулі ў пачатку вайны. Выхоўваўся ў цёткі, [illegible] у дзіцячым доме. [illegible] таксама ў Пухавіцкім і Мінскім раёнах. Скончыў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум, гістарычны факультэт Белдзяржуніверсітэта, аддзяленне сацыялогіі факультэта партактыву універсітэта марксізму-ленінізму. Усяго [illegible] гадоў працаваў інжынерам Мінскага [illegible] завода, старшым інжынерам трактарнага завода, вядучым інжынерам аддзела маркетынгу Навукова-вытворчага аб'яднання «ПРАГРЭС». Працоўны стаж каля 46 гадоў. У працоўнай кніжцы [illegible] заахвочванняў.

Пісаць і друкавацца пачаў [illegible] у [illegible]. Але найбольшы [illegible] займеў, калі абраў родную мову і любімы жанр — сатыру і гумар. Выдаў [illegible] кніжак на роднай мове і [illegible] на рускай. Яго творы ўвайшлі ў [illegible] калектыўныя зборнікі сатыры, гумару і прозы. Гэта [illegible] кніга пісьменніка. Кіраваў літаратурным аб'яднаннем пры рэдакцыях газет, [illegible] абласной, рэспубліканскай [illegible]. Працаваў літкансультантам розных выданняў. Зараз — літкансультант газеты «Наша жыццё». [illegible] некалькі кніжак маладых аўтараў.